# ARCHE Зьмест № 3’2000 ГАБРЭЙСКІ НУМАР


1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE- Habrejski numar 3(8)-2000. Ад рэдакцыі: "...Габрэяў у Беларусі засталося няшмат — 28 тысяч. На паўнакроўнай беларускай мове таксама размаўляе не нашмат болей людзей. XX стагоддзе было стагоддзем нашага развітання..."
3. Толькі б яўрэі былі! Рыгор Барадулін у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Беларусь стала для яўрэяў цёплай хатай. У нас яўрэі ніколі не адчувалі сябе прыхаднямі. Для беларуса яўрэй гэтулькі свой, што ня кожны беларус ды яўрэй помніць пра ўцёкі яўрэяў у Беларусь ад перасьледу ў сярэднявечнай Эўропе..."
4. ARCHE- Habrejski numar 3(8)-2000. Апытаньне ARCHE: "...Ці ёсьць Рэспубліка Беларусь незалежнай дзяржавай? Пытаньне парадаксальнае..."
5. Жыды на Беларусі. Бытавыя штрыхі. Зьмітрок Бядуля ў ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...У часе пераваротy, калі беларусы ў Менску пачалі выступаць пад сваім уласным штандарам, то гарачэй усіх віталі іх жыды-нацыяналісты. У часе выбараў у меськую думу беларусы з жыдамі (нацыянальныя партыі) увайшлі ў кааліцыю і зрабілі адзін сьпіс кандыдатаў. А калі Ўсебеларускі Зьезд паказаў, што творыцца дзяржаўная сіла, у жыдоўскіх газэтах пачалі ўсё часьцей паказвацца артыкулы аб беларусах..."
6. Некалькі запозьненых і некалькі заўчасных думак пра гэбраяў і беларусоў. Віталь Зайка ў ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Для пачатку трохі фактаў — Беларусь мела найбольшую шчыльнасьць гэбрайскага насельніцтва ў сьвеце яшчэ на пачатку XX стагодзьдзя..."
7. Хрысціяне і габрэі Вялікага Княства Літоўскага. Ігар Марзалюк у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...У сучаснай еўрапейскай гістарыяграфіі даволі грунтоўна і

падрабязна вывучаны пытанні, звязаныя з праблемай узнікнення хрысціянскага антысемітызму; падкрэсліваецца той факт, што ён быў неад'емным элементам ментальнасці ўсіх хрысціянскіх народаў у эпоху сярэднявечча. Антысемітызм хрысціянскіх народаў меў розныя прычыны..."

8. Інтэрнэт, яўрэі і Беларусь. Вольф Рубінчык у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Пры дапамозе пошукавых праграм зусім нескладана адшукаць тысячы сайтаў (вузлоў), на якіх змяшчаюцца звесткі пра беларусаў і Беларусь, столькі ж, калі не больш, пра яўрэяў і яўрэйства..."
9. Народ Кнігі. Галіна Сініла ў ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Неяк Юры Лотман выступаў з публічнай лекцыяй у Ленінградскім універсітэце. Апроч усяго, у лекцыі прафесар закрануў тэму сувязяў рускай літаратуры з Бібліяй. Калі настаў час пытанняў, адзін са студэнтаў спытаўся: „А чаму гэта ў Біблііі — усё габрэі ды габрэі, ні слова пра рускіх?“. „З тэхнічных прычынаў“, — адказаў прафесар Лотман і з'ехаў у Тарту..."
10. Параўнаньне юдаізму з хрысьціянствам: некалькі прыкладаў. Станіслаў Краеўскі ў ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "Само параўнаньне юдаізму з хрысьціянствам вельмі спрэчнае. Доўгія стагодзьдзі жыды паглядалі на Царкву зь перасьцярогай, а ў хрысьціянстве бачылі сродак дыскрымінацыі. Пэўныя зрухі ў лепшы бок пачаліся тады, калі ў Эўропе паўсталі адкрытыя грамадзтвы..."
11. Такая доля. Гірш Рэлес у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Даўно ўжо дом пакінуў свой падмурак. / Даўно ніхто наўкола не жыве..."
12. Заблуканая зорка. Хаім-Нахман Бялік у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Зорка-заблуканка, ты глядзіш звысоку, / асьвяці мне, зорка, шлях сьляпы ад змроку. // Не! Пакут пякельных я ўжо не баюся, / ўшчэнт жыцьцё стаміла, выпетрыла ў скрусе..."
13. Нас гналі Адтуль спачатку. Сьвятлана Аксёнава-Штэйнгруд у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Нас гналі Адтуль спачатку, / Цяпер уганяюць Сюды! / А мы, бы вярблюды ў статку, / Рахмана чакаем вады...."

14. Мэнахем Мэндэль зь Віцебску. Марцін Бубэр у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Магід і іншыя вялікія вучні Баалшэма, рабін Якаў Ёсэф з Палоннага, прысталі перад сваім вучыцелем. Баалшэм загадаў хлопчыку стаць перад ім, доўга ўзіраўся ў яго і апавёў яму гісторыю пра валоў і плуг. Слухачом хутка адкрылася, што ў форме алегорыі падаецца гісторыя жыцьця Мэнахема; але хлопчык зразумеў зь яе толькі тое, што яму раней давялося перажыць, рабін з Польнага зразумеў палавіну, магід — усё..."
15. Што могуць ідыш, сучасны іўрыт, эсперанта, а таксама сербалужычане, палешукі і хазары сказаць пра паходжанне габрэяў-ашкеназі? Поль Вэкслер у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Дзесьці пасля XV ст. усходнеславянскія жыды — нашчадкі хазараў-юдэяў — рэлексіфікавалі сваю родную кіеўска-палескую гаворку (першааснову сучаснага паўднёвабеларускага і паўночнаўкраінскага дыялектаў) да ідышу, які імігранты-ашкеназі прынеслі на іхнюю тэрыторыю..."
16. Сэксуальная рэвалюцыя юдаізму. Дэніс Прэгер у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Прадпісаньне юдаізму, каб уся сэксуальная актыўнасьць была засяроджаная ў рамках шлюбу, зьмяніла сьвет. Забарона Тораю пазашлюбнага сэксу сталася неабходнаю перадумовай для ўтварэньня заходняй цывілізацыі. Грамадзтвы, дзе сэксуальнасьць нічым не абмяжоўвалася, ускладнялі тым самым працэс свайго развою. Панаваньне заходняга сьвету, якое настала пазьней, у значнай ступені можа быць вытлумачана сэксуальнай рэвалюцыяй, пакліканай да жыцьця юдаізмам і пасьля падхопленай хрысьціянствам..."
17. Усе мы патроху жыды. Сакрат Яновіч у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...А цяперашнім часам пра жыдоў зноў загаманілі. У гэты раз тэрцыяркі ды нямоглыя ўдаўцы, якім мус ужо мець гешэфт з Госпадам. Менавіта ад ксяндза дачуліся, што Хрыстос навучаў толькі па-жыдоўску (арамэйская мова), ды першаапосталы паходзілі з жыдоў, і таму ўсе мы патроху жыды. Гэтая навіна выклікала спавядальны настрой у дзядуляў з бабулямі, абгрунтаваны зусім не па-хрысьціянску..."
18. Тутэйшыя. Адам Глобус у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski

numar. "...Я зайздросціў Валіку. Ці бывае зайздрасць чорнай або белай? Канечне, не бывае. Або ты зайздросціш, або не. Напэўна, з-за той зайздрасці я добра напіўся на Валікавых провадах у Ізраіль. Там і прыдумаў новае беларускае свята — праводзіны тутэйшага габрэя ў Ерусалім..."

19. Карона зь пер'я. Ісак Башэвіс Зынгер у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Калі рэб Нафталі Халішыцэр зразумеў, што ўнучка паказвае на дзьверы ўсім, ён моцна затурбаваўся. Ахсе на той час ужо споўнілася васямнаццаць год. Людзі ў мястэчку пачалі пляткарыць, што ёй патрэбны прынц на белым кані, што яна хоча дастаць месяц зь неба, а таму й застанецца ў дзеўках. І тады рэб Нафталі вырашыў узяць справу ў свае рукі..."
20. Яўрэі ў БССР: ілюзіі і надзеі. Ілья Куркоў у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...ідыш стаўся адной з дзяржаўных моваў БССР, паслядоўна праводзілася кампанія па землеўладкаванні яўрэяў, некаторы час словы „антысеміт“ і „антыкамуніст“ лічыліся амаль сінонімамі. 24 ліпеня 1925 году Бюро ЦК КП(б)Б была прынята пастанова, у якой прызнана: „... считать необходимым — изживать из употребления в белорусском языке слова „жыд“, заменив его словом „яўрэй“..."
21. Контур у прасторы. Ізраіль Басаў. Ларыса Фінкельштэйн у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Усім яго жывапісным палотнам папярэднічалі малюнкі. Як заўсёды — завершаныя і самакаштоўныя кампазіцыі з амаль скульптурнай лепкай аб'ёмаў, упэўненай шырокай контур-лініяй-мазком, з асаблівай выразнасцю вялікіх паўзаў на аркушы. Графіка І.Басава — яшчэ наагул не адкрытая таямніца..."
22. Праграмны спэктакль яўрэйскага тэатру. Уладзімер Мальцаў у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Расфармаваны 18 чэрвеня 1949 году на пачатку палітычнай кампаніі па барацьбе зь „бязродным касмапалітызмам“, ён надоўга быў выкрасьлены з гісторыі культуры Беларусі. На працягу наступных дзесяцігодзьдзяў гаварыць аб тэатры было не прынята..."
23. Ня толькі шахматысты — у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Усім нам вядомая роля габрэйскага народу ў

мэдыцыне, літаратуры, філязофіі, навуцы ды тэхніцы. Многа меней мы ведаем аб іхных дасягненьнях у спорце: беларускі абываталь зьвязвае ўладальнікаў прозьвішчаў на -штэйн ці -ман хіба што зь беларускімі шашкамі ды шахматамі. Аднак гэта паскудны стэрэатып..."

24. Дыялектыка Асьветніцтва. Элемэнты антысэмітызму. Макс Горкгаймэр, Тэадор В.Адорна ў ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Сёньня антысэмітызм адным уяўляецца як лёсавызначальнае для чалавецтва пытаньне, іншым — як пустое месца. Для фашыстаў жыды — ня меншасьць, а антыраса, нэгатыўны прынцып як такі; ад іх выгубленьня беспасярэдне залежыць шчасьце сьвету. Абсалютна процілежнаю ёсьць тэза аб тым, што жыды безадносна да нацыянальных ці расавых прыкметаў утвараюць пэўную групу на падставе рэлігійных вераньняў ды традыцыі і нічога іншага..."
25. Лёс мірскай ешывы. Аляксандар Фрыдман у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Калі ў Заходняй Эўропе габрэйства ахапіла хваля асыміляцыі, на Ўсходзе кантынэнту працягвала панаваць традыцыя. Слынныя ешывы знаходзіліся ў Валожыне, Міры, Радуні, Слоніме, Клецку, Цельшах (сучасная Літва) і набылі вядомасьць у розных кутках габрэйскага сьвету..."
26. Разгром габрэйскай намэнклятуры. „Габрэйскае пытаньне“ ў Беларусі ў 40—50-я гады. Анатоль Вялікі ў ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Вырашэньне „габрэйскага пытаньня“ ў БССР пачалося адразу ж пасьля 1944 году з асновы асноваў таталітарнай сыстэмы — партыйна-савецкай намэнклятуры, „новай клясы“, паводле вядомага вызначэньня Мілавана Джыласа. У першае пасьляваеннае дзесяцігодзьдзе адбылася „ціхая намэнклятурная зачыстка“ сфармаванай за перадваенны пэрыяд беларускай габрэйскай „новай клясы“..."
27. Разьвітаньне з Будславам. Анеля Катковіч у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Запісалася адразу ў Беларускі Студэнцкі Саюз — кожны вечар хадзіла туды, на Завальную. Найлепшымі маімі прыяцелькамі на ўнівэрсытэце сталіся Іра й Люня — дочкі сп.Будзькі. Тварылі мы неразлучную тройку. Амаль кожную нядзелю праводзілі разам, штодня бачыліся ў памешканьні

Беларускага Студэнцкага Саюзу, дзе спатыкаліся зь Ленай Аніськай, Валяй і Раяй Жукоўскімі ды іншымі сябрамі — Пануцэвічам, Тумашам, Стаповічам, Войтанкам, Шчорсам, Смаршчком, Грышкевічам..."

28. Kasia. Віталь Стахіевіч у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Голас. / Самотны сіпаты голас. / Мяне непакоіць голас / Спадарыні Касі Камоцкай,..."
29. Готыка. Андрэй Хадановіч у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...але недасяжныя шпілі / ды вычварныя вітражы — / ўсё ў вялізарным стылю / даводзіць, што ты тут чужы. / Нават замак душы / не пакіне надзей на заручыны: / ты чужынец на мшы..."
30. Чарнавокая задумлёнка з Магілёва. І. Ліст з Магілёва. Джэрам Чарын у ARCHE 3(8)-2000. Habrejski numar. "...Час быў цьмяны і рамантычны. Бронкс не меў дамбы, якая б надзейна абараняла яго з боку Атлантычнага акіяну і, калі верыць чуткам, тут з нейкай падводнай лодкі меўся высесці на гумавых шлюпках варожы дэсант, заняць каналізацыю і пачаць жэрці нашу родную зямлю. Але цягам нашых праходак я ні разу не бачыў ніводнага нацыста..."

# Рэлігійны ўзрыў і юдаізм

[image]

**A R C H E**

[image]

**H a b r e j s k i n u m a r** **№ 3 (8) – 2000**

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

3[image]–[image]2000

Габрэйскі нумар

[image]

## З ь м е с т

---


*Ад рэдакцыі*

*Рыгор Барадулін.* Толькі б яўрэі былі!

**Апытаньне ARCHE**

Ці незалежная Беларусь? (ZIP: 19 K )

**тэма**

*Зьмітрок Бядуля.* Жыды на Беларусі

*Віталь Зайка.* Некалькі запозьненых і некалькі заўчасных думак пра гэбраяў і беларусоў

*Ігар Марзалюк.* Хрысціяне і габрэі Вялікага Княства Літоўскага (ZIP: 19 K )

*Вольф Рубінчык.* Інтэрнэт, яўрэі і Беларусь (ZIP: 29 K )

*Галіна Сініла.* Народ Кнігі

*Аляксандр Астравух.* Жыдоўскія прыказкі і прымаўкі

*Станіслаў Краеўскі.* Параўнаньне юдаізму з хрысьціянствам: некалькі прыкладаў

*Гірш Рэлес.* Такая доля

*Хаім-Нахман Бялік.* Заблуканая зорка

*Сьвятлана Аксёнава-Штэйнгруд.* „Нас гналі Адтуль спачатку...“

**прыпавесьці**

*Марцін Бубэр.* Мэнахем Мэндэль зь Віцебску

**гіпотэза**

*Поль Вэкслер.* Што могуць ідыш, сучасны іўрыт, эсперанта, а таксама сербалужычане, палешукі і хазары сказаць пра паходжанне габрэяў-ашкеназі? (ZIP: 18 K )

*Дэніс Прэгер.* Сэксуальная рэвалюцыя юдаізму

**гісторыі**

*Сакрат Яновіч.* Усе мы патроху жыды
*Адам Глобус.* Тутэйшыя
*Ісак Башэвіс Зынгер.* Карона зь пер'я (ZIP: 27 K )
**архіў**
*Ілья Куркоў.* Яўрэі ў БССР: ілюзіі і надзеі
**мастацтва**
*Ларыса Фінкельштэйн.*
Контур у прасторы. Ізраіль Басаў (ZIP: 65 K )
**тэатр**
*Уладзімер Мальцаў.*
Праграмны спэктакль яўрэйскага тэатру
**спорт**
Ня толькі шахматысты
**філязофія**
*Макс Горкгаймэр, Тэадор В.Адорна.* Дыялектыка Асьветніцтва. Элемэнты антысэмітызму (ZIP: 26 K )
**прабел**
*Аляксандар Фрыдман.* Лёс мірскай ешывы
*Анатоль Вялікі.* Разгром габрэйскай намэнклятуры
**успаміны пра XX стагодзьдзе**
*Анеля Катковіч.* Разьвітаньне з Будславам (ZIP: 39 K )
**лірыка**
*Віталь Стахіевіч.* Kasia
*Андрэй Хадановіч.* Готыка
**кніга**
*Джэрам Чарын.* Чарнавокая задумлёнка з Магілёва (ZIP: 144 K )
The publication was made possible through a generous contribution of the American Jewish Distribution Committee
Выданьне выйшла ў сьвет дзякуючы шчодраму фундушу арганізацыі „Джойнт"

[image]

---

**Прэмія ARCHE — Вінцуку Вячорку**
Сярод вылучаных на атрыманьне прэміі ARCHE-1999 „За сумленнае слова" былі:
**Уладзімер Арлоў**, **Генадзь Сагановіч** —
за кнігу „Дзесяць вякоў беларускай гісторыі",

праграма „Беларускі гіт-парад“

Беларускага
тэлебачаньня
—
за сумленную
працу на БТ,

**Вінцук Вячорка** — за сумленнае слова ў палітыцы,
**часопіс „Форум-Лямбда“** — за адстойваньне правоў меншасьці,
**Радыё „Свабода“** — за праграму „Слова Дня“,
**Уладзімер Ракіцкі** — за выставу „Хатні альбом“,
**Сяргей Шаўцоў** — за сэрыю артыкулаў у газэце „Звязда“,
**Сяргей Шупа** — за падрыхтоўку першага тому „Архіваў Беларускай Народнай Рэспублікі“.
Прэмія ARCHE-1999 „За сумленнае слова“ была прысуджаная **Вінцуку Вячорку**.

[image]
[image]

**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

---

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

## Ад рэдакцыі

**І** беларусы, і габрэі-літвакі ў XVIII ст. у вялікай масе сваёй усклалі надзею на далучэнне да Расеі як панацэю ад усіх заганаў позняй Рэчы Паспалітай, а ў XX ст. у такой сама вялікай масе паспадзяваліся на бальшавізм як вызваленне ад сацыяльнага й нацыянальнага прыгнёту.

Жорсткаю была плата.

Прыйшлі расейцы і на два стагоддзі замарозілі развіццё грамадзянскай супольнасці і вольнага рынку. Яны праводзілі каланіяльную палітыку „падзяляй і ўладаруй“. Праваслаўных падбухторвалі супраць каталікоў, хрысціянаў — супраць габрэяў. Прынцыповае адрозненне антысемітызму часоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, які даў справу Гаўрылы Беластоцкага, ад антысемітызму Расейскай Імперыі, які падрабіў „пратаколы сіёнскіх мудрацоў“, бачыцца ў пераважна эканамічным і рэлігійным характары першага і збольшага дзяржаўнай і свецкай існасці апошняга. Расейскі антысемітызм XIX—XX ст. быў абдуманай дзяржаўнай палітыкай, скіраванай на ўзмацненне кантролю над еўрапейскімі калоніямі Пецярбургу, межы якіх амаль супадалі з расісцкай рысай аселасці.

Бальшавіцкі выклік справакаваў фашысцкі адказ. Нацысты паставілі і габрэяў, і беларусаў на мяжу фізічнага вынішчэння. Савецкі камунізм давёў абедзве нацыі — куды толькі даставалі ягоныя рукі — да крайняй сацыяльнай дэградацыі і нацыянальнай асіміляцыі.

Пасля двух страчаных стагоддзяў эпоха Вялікага Княства Літоўскага здаецца сапраўдным Залатым векам і габрэям-

літвакам, і беларусам.
Сіянізм і стварэнне Дзяржавы Ізраіль былі збавеннымі для габрэйскага народу.
У парадаксальна псеўдабеларускай Рэспубліцы Беларусь пераследуюць аўтахтонаў і нішчаць культурную спадчыну. Беларускі нацыяналізм яшчэ толькі мае зрабіць ільвіную долю сваёй пачэснай стваральнай працы.

* * *

Габрэяў у Беларусі засталося няшмат — 28 тысяч. На паўнакроўнай беларускай мове таксама размаўляе не нашмат болей людзей. XX стагоддзе было стагоддзем нашага развітання. Цяпер нават цяжка ўявіць сабе, што яшчэ нямнога дзесяцігоддзяў таму беларус не мог камфортна жыць, не ведаючы трохі ідыш, а габрэй — беларускай.
Беларусам хочацца, каб габрэяў было болей. Беларусам карціць, каб габрэі пачалі вяртацца. Беларусы заўзята вышукваюць семіцкія рысы ў тварах сваіх супляменнікаў. Адчуваюць культурную пустку. „Толькі б яўрэі былі“, — піша Рыгор Барадулін. „Усе мы патроху жыды“, — прызнаецца Сакрат Яновіч. „Хоць ты, Жэня, і жыдовачка, а сала есьці трэба“, — паджыўляюць бабы гераіню Адама Глёбуса. Ясна, што палюбіць значыць прысабечыць. Не крыўдуйце, літвакі, што мы ўсіх вас хацелі б бачыць Бядулямі больш, чым Плаўнікамі. Бо беларусы нічога не маюць…
Сэрца баліць, калі ў парыскім Цэнтры Жоржа Пампіду побач бачыш карціны Марка Шагала і Хаіма Суціна. Под Шагалам на шыльдзе — „Марк Шагал, нар. Лёзна, Расея“. Пад Суціным — „Хаім Суцін, нар. Смілавічы, Літва“.
Беларусы хочуць прыўласціць сабе літвакоў. Беларусы хочуць мець „сваіх габрэяў“. Беларусам дужа падабаецца, што Горадня па-габрэйску „Гораднэ“, цешыць, што ў беларускай мове ёсць блізкія да габрэйскіх словы „цымес“ і „посік“. Усё, што адрознівае беларускіх габрэяў ад габрэяў Расеі ці Польшчы, старанна адзначаецца і калекцыянуецца беларускімі аўтарамі. Каб было. Габрэйства — важны элемент беларускай ідэнтычнасці. Сярод гэтых адметнасцяў і тое, што ў беларусаў для габрэяў ёсць цэлы шэраг раўнапраўных этнонімаў. І кожны з гэтых этнонімаў дарагі, з кожным шкада развітацца. Нават слова „жыды“, такое балючае для габрэяў расейскай культуры,

не хоча прападаць. Хоць Сяргей Шупа і пісаў у „Слове дня“ „Радыё Свабода“: „Гэтае слова загінула ў полымі Галакосту“, ды надта ж дарагі для нас той беларускі культурны кантэкст, што стаіць за ім — найперш маштабны верш Янкі Купалы з ягоным „я веру вам, жыды“.
Для тых беларусаў, што не думаюць па-расейску, слова „жыд“ не мае канатацый, якія яно мае для носьбітаў расейскай культуры. Уявіць сабе цяпер па-беларуску нацысцкі опус кшталту нашумелай сёлета кнігі „По законам подлости“, выдадзенай расейскай праваслаўнай царквой, немагчыма. Антысемітызм сёння не змог бы знайсці сабе беларускага моўнага выражэння.
У той жа час нельга цешыць сябе тым, што расейскія ультранацыяналісты, якія кіруюць цяпер Рэспублікай Беларусь, пакуль асцерагаюцца адкрыта нацысцкай рыторыкі. Гэтыя палітыканы дзеля захавання ўлады гатовыя на ўсё. Трэ будзе ахвярнага казла, будуць шукаць ахвярнага казла. Чачэнцаў у нас няма, ёсць каталікі, беларускамоўныя і габрэі.
У яднанні палітычнага патэнцыялу беларусаў і габрэяў мы бачым зарок умацавання грамадзянскай супольнасці ў Беларусі, неабходнага для глыбінных грамадскіх і эканамічных зменаў. Дзеля гэтага задумляўся й нумар, які вы трымаеце ў руках. Той факт, што беларускае лобі ў амерыканскім кангрэсе ўзначаліў Сэм Гейдэнсан, чыйго бацьку-габрэя ўратавалі падчас Галакосту сяляне вёскі Параф’янава пад Докшыцамі, і сімвалічны, і нясе надзею.
Моўныя спрэчкі не павінны ўставаць нам на перашкодзе. Апроч расейскага слова „жид“ ёсць расейскае слова „бэнээфовец“, якое таксама кардынальна мяняе значэнне ў вуснах людзей беларускай культуры. *Жидам* і *бэнээфовцам* самая пара палюбіць адно адно.

* * *

Беларусы шмат чытаюць пра Галакост. Гэта таму, што й сябе лёгка ўяўляюць ля ямаў.
Умбэрта Саба ў 1909 годзе па-прарочы пабачыў стагоддзе Галакосту, што надыходзіла, у пысе самотнай, мокрай, наеджанай, мэкаючай казы з сэміцкім тварам:

In una capra dal viso semita

sentiva querelarsi ogni altro male,
ogni altra vita.
Каб у Віцебску жылі зубры, Шагал маляваў бы зброў. Але ў Віцебску жылі козы. А зубры з беларускім абліччам жывуць у лясным рэзерваце пад пільным наглядам людзей.
***Андрэй Дынько***

[image]
[image]

**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

---

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

[image]

**A R C H E**

[image]

**H a b r e j s k i n u m a r** **№ 3 (8) – 2000**

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

[image]

[image]

» да Зьместу «

[image]

# Рыгор Барадулін
# Толькі б яўрэі былі!

---

Чакаюць, прыйдзе сьветлы год
І голас кожны будзе ўчуты
Яўрэі — праведны народ
Абраны Богам
На пакуты.
**І** такі чакаюць. Зь сівых вякоў.
Думаю, ня будзе кашчунствам, калі да Ўсявышняга суаднесьці зямную послаўку: хто каго любіць, той таго й чубіць.
Бог любіць яўрэяў, Бог ніколі не пакідаў іх, бо яўрэі заўсягды жылі з Богам у душы.
Выгнаньнем і валачомніцтвам правяраў іх ды гартаваў душы пабожныя, адлучаў ад спаконнае радзімы, каб жыло жаданьне вярнуцца на радзіму, мець сваю радзіму, а значыцца шанаваць яе, сьніць яе, не магчы жыць без радзімы.
Часам думаеш, а ці ня шкодзіла б і нам, беларусам, пабыць выгнанцамі, каб шанаваць сваю сьвятую зямлю. Пісаў жа вялікі сын Беларусі Адам Міцкевіч, што радзіма, як здароўе, толькі тады й вяльмуеш яго, калі страціш.
Беларусь стала для яўрэяў цёплай хатай. У нас яўрэі ніколі не адчувалі сябе прыхаднямі. Для беларуса яўрэй гэтулькі свой, што ня кожны беларус ды яўрэй помніць пра ўцёкі яўрэяў у Беларусь ад перасьледу ў сярэднявечнай Эўропе.
Зь Беларусі выйшла безьліч славутых дзеячоў культуры, літаратуры, палітыкі. Адзін толькі пералік назыўны заняў бы добры том.

Яўрэі захавалі сваю мову й добра засвоілі беларускую. Некаторыя да таго добра, што сталі клясыкамі беларускае культуры. Ня гэтак і шмат хто зь беларускіх пісьменьнікаў так глыбінна адчуваў беларускае слова, народны дух, як Зьмітрок Бядуля (у яўрэйстве — Самуіл Плаўнік).
Мовы нашыя ўзаемаабагачаліся. Словы, як тыя птушкі, пераляталі з-пад аднае страхі пад другую.
Гэта ў асноўным праз ідыш зь нямецкае мовы ў беларускую прыйшлі й цэгла, і дах, і цыбуля, і цьвік. Ды шмат іншых словаў, якія несьлі гандляры, майстры, дарожныя людзі.
А паколькі ідыш узьнікла на грунце пляцдорф, а клясыкі жылі ў перавазе сваёй на Беларусі, беларускія словы прыжыліся ў мове яўрэяў. Тут і татэ, і ласкэ, бульба й вечэрэ (вячэра), сажалкэ й самагон. Усяго не зьлічыць. Кажуць жа: жыдоўскі зараз, як беларускі пачакай.
І гэта і пра яўрэяў, і пра нас, браткоў-беларусаў. Час бяжыць хутка, а гісторыя зьмяняецца марудна. А калі й зьмяняецца, дык не на нашую карысьць, не на карысьць Бацькаўшчыны.

У Беларусі гістарычна ніколі не было антысэмітызму. Бо не па Хрыстовых запаветах гнаць гнаных, цкаваць прытуленых, рабаваць сваіх. А яўрэі сталіся беларусам сваімі. Папераблытаўся, перамяшаўся нават сам побыт. І дзяцей ад зьмяшаных шлюбаў так і звалі мяшанцамі. Без найменшае ноткі зьнявагі.
З усьмешлівай сур'ёзнасьцю даводзілі: хто жэніцца зь яўрэйкай, у таго сьвіньні вядуцца.
Кпіны заўсягды былі нязлосныя. Натуральна, што народ любіць пакепліваць з самога сябе дый са сваіх суседзяў, сяброў, пабрацімаў. Гэта не праява антысэмітызму, калі малыя забягалі ў краму дый пыталіся ў крамара-яўрэя, ці прадаюцца сьвіныя падкоўкі.
Па вуліцы йдзе беларуская маладзіца, а з адчыненых дзьвярэй крамы крамарка гукае:
— Сяроўка, сяроўка, хадзі да мяне!
Маладзіца не дачуе, што крамарка наўмысна прапускае адну літару ў слове „сяброўка“, зычліва кажа:
— А мая ты сяброўка, часу ня маю, шыю, мыю, печ палю.
І крамарцы наплывае анэкдот пра мытую шыю й гасьцей. Дагэтуль смачна мне ад салодкай тушанай морквы. Мама

тушыла яе амаль па рэцэпце цымесу. І калі на згоне стагодзьдзя быў я ў гасьцёх у былога рэжысэра тэатра імя Якуба Коласа спадара Казіміроўскага, частуючыся цымесам, узгадаў маміну тушаную моркву. Гэта ў Стакгольме жонка Казіміроўскага на чысьцюткай беларускай мове запрашала мяне за стол, успамінала, як працавала яна да вайны ў газэце „Піянэр Беларусі“. І ў Швэцыю бабруйчанін Казіміроўскі ды жонка ягоная ўзялі з сабою родную ім беларускую мову.
Дома ў нас, бывала, казалі, што трэба йсьці да шаўца й даць ботам асаюзкі. Бо так гаварылі шаўцы-яўрэі — асаюзкэ.
Пра дзяўчыну, у якой было багата кавалераў, казалася: у яе ахосалы завяліся. Пра маладзіцу асабліва папулярную ў мужыкоў заўважалі: да яе ўнаначкі бахары ходзяць. І на ідыш ахосэлэ — жаніх, бохэр — кавалер. Яшчэ было ў гэтым шэрагу й слова сюбар. Яно не яўрэйскага паходжаньня. Але таксама ад нейкіх нашых сужыхароў.
Як карані зялёных дубровaў, пераплялiся, перавязаліся беларускія й яўрэйскія песьні, казкі, паданьні, прыбабункі. Колькі да прыкладу іскрыстасьці ў папеўцы:

Гірша з Моўшам добра жыў,
Гірша кроіў, Моўша шыў.
Гірша з Моўшам дровы сек,
Гірша Моўшу х... адсек.
Альбо ўзор эратычнае народнай лірыкі:

У балоце пад кустом
Цяцера нясецца.
Жыд жыдоўку лябець,
Аж ярмолка трасецца.
Неапуджаны беларускі краявід. Беларуская рахманая птушка. І на гэтым тле трасецца экзатычны галаўны ўбор. Як сказалі б савецкія літаратуразнаўцы, паэзія сацыялістычная па зьмесьце й нацыянальная па форме.
Фальклёр зафіксаваў і сацыяльныя зьмены ў грамадзтве. Рыса аселасьці стрымлівала яўрэяў, не давала выйсьці за межы зачараванага кола ні думцы, ні слову. Адсюль і фанатызм. Адсюль, пры ўсёй мудрасьці, і празьмерная даверлівасьць яўрэяў. Бальшавікі сыгралі на даверлівасьці. Як бы размылі рысу аселасьці, нават дапусьцілі яўрэяў да нейкіх пасадаў. І

пяялася таму ў народзе:

Гоп мае, драчанікі,
Усе жыды начальнікі,
А ў калгасе дуракі
Дзеруць межы як быкі.

Сярод яўрэяў бытаваў такі як бы анэкдот. У яўрэйскае мястэчка прыехаў Борух ледзьве не камісарам. (Мама мая некалі называла камісараў камісараямі.) Борухава маці й хваліцца суседкам:

— Вой, прыехаў Борух міт партупей, міт наган, міт оп тваю маць!

Усё, што дала рэвалюцыя былому рысааселаўцу.

Гэта ўсё жарты-шмарты. Бязь іх яўрэй не яўрэй.

А глыбінная душа яўрэйства ў досьціпах, у казках, у песьнях, у зычэньнях, у заклёнах кшталту гэтага:

У чорным моры чорны камень маўчыць.
У горле вароніным костка тырчыць.
Паганая сьвечка з сала сьвінога.
Для п'яніц карчма,
Для праведнікаў сынагога.
Ляціць Гурмізах на перапудзе,
Дзе не стаялі ніколі людзі,
Дзе ня пасьвілася вясёла жывёла,
Дзе ўся з жалеза зямля наўкола,
Дзе неба зь медзі на сто зямель.
Ратуй мяне, Зэдыкіэль.
Ацалі мяне, Тафтыф'ях.
Бог праўдзівы, прымі мой страх.
Душа мая ў Тваёй правіцы.
Хай мне ўсё існае
Бачыцца й сьніцца,
Як аб сустрэчы з Табой
Напамін.
Амін.

Душа. На яе палююць усе ідэалёгіі, усе спадручныя дыктатараў рознага калібру.

Бальшавізм як працяг вялікадзяржаўнага шавінізму спачатку, калі трэба, вытварае й нязграбную альфабэту й мову

пераймяноўвае, а пасьля ўсё зачыняе цяжкім векам дамавіны русіфікацыі.
Яўрэям напачатку адчынілі школы, газэты, тэатры. Ідыш назвалі яўрэйскай мовай. (Як у Малдове вынайшлі малдаўскую мову.) А потым школы і ўсё друкаванае й вуснае яўрэйскае зачынілі.
Перад вайной 1941—1945 гадоў мне малому балюча запала жудаснае відовішча. Праз вокны зачыненых яўрэйскіх школаў ляцелі кнігі, як тыя птушкі з адарванымі крыламі. Літары, як птушыныя лапкі на сьнезе, на старонках гэтых бяздомных кніжак поўніліся лютай роспаччу, немым жалем.
Пазьней зразумеў, што яўрэйскія кнігі паўтарылі сумны лёс беларускіх старадрукаў, уніяцкіх і глыбінных крывіцкім духам нашых фаліянтаў.
Антысэмітызм і вялікадзяржаўны шавінізм, як пісаў пралетарскі паэт Маякоўскі, „близнецы-братья“.
Спрадвеку ў беларускай мове слова „жыд“ ня мела й слабога водценю абразы, прынізу.
Натуральна гучаць выслоўі:

Жывіце, як брацьці, а рухайцеся, як жыдзьдзі.
Пагавары зь ім, як цар з жыдам.
У яго грошы, як у жыда.
Нашыя жыдкі пайшлі ўгору.

Бальшавікі з Масквы прынесьлі ў слова „жыд“ значэньне абразы, непрыхаванай нянавісьці. Быў прыняты ўказ, па якім за слова „жыд“ давалі да пяці гадоў турмы. І гэта пачало мацаваць і без таго моцную сталінскую дружбу народаў.
Стахван ці Якута, ад прадзедаў сваіх засвоіўшы слова „жыд“ як самае нармальнае, не маглі зразумець, у чым тут тоіцца зло.
Зьбяруцца за чаркай, бывала, а Янкель і пад'юрлівае Івана:
— Ну, хто я? Скажы.
— Жыд! — вырываецца само з вуснаў Іванавых.
Так, далёка ня ходзячы, нявоглядзьдзю й заробіць рахманы беларус тэрмін. Адыходзячы ў турму, грозіцца, што, адседзеўшы, адпомсьціць. І гэтак чым далей у лес, тым меней дроў, бо дрэвы ўсе павысечаныя.
Пачаліся звадкі на пабытовым узроўні.
Згадваецца перадвайна. У нашага суседа Васілька было ажно

пяць дачок. Біўся як рыбіна аб лёд, зарабляў дзе мог на хлеб надзённы. За нешта схапіўся Васілёк з Іцкам, а той яму й кажа:
— Ну што, Васілёк, мы вас у торбачку пасадзілі, засталося толькі зашморгнуць.
А што сам Іцка сядзеў у савецкай торбачцы, яму і ў галаву не прыходзіла. Савецкая прапагандысцкая малатарня добра малаціла мазгі ўсім нацыям.
Прыйшлі немцы. Абгарадзілі некалькі вуліцаў, у асноўным тыя, дзе жылі яўрэі, абнесьлі калючым дротам, загналі туды ўсіх вушацкіх яўрэяў.
Ідзе Васілёк і бачыць за дротам Іцку. Дый пытае:
— Ну, хто каго пасадзіў, хто зашморгваць торбачку будзе?
Гэта абсурдна сумны дыялёг двух вырачэнцаў.
Немцы ў люты мароз рабілі пажар у гета, а пасьля бранспойтамі аблівалі ўсіх вязьняў, быццам тушачы пажар.
Рабілі герояў „камсамольскага білета“ Аркадзя Куляшова.
Бальшавікі ўвялі пятую графу ў анкеце, правакавалі справу крамлёўскіх лекараў, перад сьмерцю „бацькі ўсіх народаў“ забівалі апошнія цьвікі ў нары ў Бірабіджане, куды бацька гэны меўся зьвесьці яўрэяў з усяе савецкае імпэрыі.
Гітлераўцы ў Празе рабілі ўнікальны музэй зьніклай нацыі. Сталіністы да музэю не датумкалі.
І абаранялі бальшавікі жыдоў ад іхнага ж найменьня, душачы яўрэяў у сваіх гарачых абдоймах.
У народзе хадзілі розныя калямбуры, як:
Жыд доўга будзе жыць, яўрэй сканае скарэй.
Весялуны прапаноўвалі замест формы „жадаю“ „яўрэю“.
Прыкладам: яўрэю вам моцнага здароўя.
Шасьцідзясятыя гады. Дачка мая Ілона летуе ў бабы Куліны.
Маці ейная пайшла ў госьці да апошняй у Вушачы сям'і Допкінаў. Ілона й пытаецца:
— Дзе мама?
Мая мама адказвае:
— Пайшла к жыдам.
Малая перапытвае, да каго.
— К яўрэям, — удакладняе мая мама.
Тады Ілона зноў пытаецца:
— А кляўрэі кусаюцца?
У мамы блыталіся два назовы, адзін звычны, другі навязаны ўладамі. Адну зіму езьдзілі мы з Хаімам Мальцінскім да мамы

маёй у Вушачу. Я перакладаў вялікую па сучасных мерках паэму Мальцінскага „Двойра“. Дарэчы, аўтар прысьвяціў гэтую паэму маёй маме Куліне.
Хаім на мыліцах (на фронце пакінуў ногі), хадзіць яму цяжка, але ідзем, як у Вушачы кажуць, на той бок. Там ля Бутаўскага магільніка жудасная магіла з болей як дзьвюма тысячамі яўрэяў, расстраляных гітлераўцамі. Ніякага знаку, ня тое, каб помнік ставіць, савецкія ўлады забараняюць. (Не па-савецку загінулі няшчасныя.) Вяртаемся назад, поўныя жальбы й смутку, а насустрач нам вушацкая маці-гераіня, вострая на язык Грахольская. Спынілася, узрадавалася:
— Ай, як я рада, што хоць жывога жыдка ўбачыла! А то зьвялі зусім у нас, — і абдымаць Хаіма.
Узрадваўся й Хаім. І ў галаву яму не прыйшло крыўдаваць за слова „жыдок“.
Ішоў час. Засвойвалася, заганялася ў мазгі, што слова „жыд“ гучыць як лаянка, як абраза. І цяпер ужо цяжка ўжываць гэтае спаконнае законнае ў шмат якіх мовах Эўропы слова.
Яўрэй даслоўна перакладаецца як з таго берагу чалавек. А зь якога? Куды дзець юдаізм, вечнага жыда, ідыш?
Можа, слова „габрэй“ і прыжывецца. Гэта зноў жа пераагучаны яўрэй.
Слова „жыд“ мусіць заставацца ў гістарычным кантэксьце.
А мова, на якой мала ўжо хто зь яўрэяў размаўляе й піша, называецца „ідыш“.
Тут мне прыгадаўся анэкдот-побыль. Гэта яшчэ тады дзеялася, калі ў нашых рэчках было шмат рыбы, а ў местах ды мястэчках шмат яўрэяў.
Па тэлефоне доўга, як гэта любяць ня толькі яўрэі, размаўляюць удвох. Раптам у размову ўрываецца расійскі голас маладога гэбіста: — Перестаньте разговаривать на иностранном языке. Я ничего не понимаю.
У ранейшыя часы тэхніка падслухоўваньня была не такая дасканалая, як у нас цяпер. Усё рабілася, што завецца, уручную.
Сумна, але гэтая замежная мова амаль ужо не гучыць на беларускіх вуліцах. Яе вывелі з ужытку, як слова „жыд“. А яна ж пачувала сябе як дома ў нашай талерантнай Беларусі.
Сьледам за ёй ідзе й мова-гаспадыня. І гаспадыні сказалі гжэчна: не выганяем, але просім вон!

Няхай сабе жыд будзе называцца яўрэем.
Толькі б яўрэі былі.

[image]
[image]

**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

---

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

Habrejski numar № 3 (8) – 2000



# Беларусь — незалежная?

Адказы на наша пытаньне: „**Ці ёсьць Рэспубліка Беларусь незалежнай дзяржавай?**“ — прыйшлі зь Вялікай Брытаніі, Гішпаніі, Польшчы, Украіны, зь беларускіх гарадоў і вёсак. На жаль, ні ў водным з допісаў да канца яснага адказу мы так і не знайшлі. Усё ж, усім дзякуй.

**Алесь Анціпенка**,
філёзаф, дырэктар Беларускага калегіюму:
**П**ытаньне парадаксальнае. Фармальна краіна застаецца незалежнай дзяржавай, але незалежнасьць Беларусі ніяк не асацыюецца зь існымі ўладамі і палітычным рэжымам, якія рэпрэзэнтуюць Беларусь. Рэпрэзэнтацыя ў беларускім выпадку — гэткая ж сутнасная праблема, як і сама незалежнасьць. Сымбалі-рэпрэзэнтанты аддзеленыя ад дзяржавы, а сама дзяржава аддзеленая ад сутнасна-беларускага. Гэткі палітычны прывід, твор шыза-літаратурнага жанру, а калі разглядаць звонкі — змрочны суб’ект міжнароднага права.
…Беларуская незалежнасьць з пэрспэктывы адраджэнскай ідэалёгіі 90-х гадоў будзе іншай. Яна будзе там, дзе смаляць вепручка, дзе цётка Адася ставіць на стол аладкі, падае сьвежанінку і дзе мужчыны годна і цьвёрдай рукой разьліваюць па кілішках крышталёвую гарэлку хатняга вырабу. Але пры чым тут незалежная Беларусь? А проста ні пры чым, бо дзядзька Ядрусь, хоць і ня любіць палітыкі, але ж калі-нікалі скажа добрае слова пра Аляксандра Рыгоравіча. Дый наагул ня любяць беларусы браць у рукі сьцяг. Куды зь ім хадзіць на вёсцы? І хоць дзядзька Ядрусь ня мае ў хаце новага чырвона-

зялёнага сьцягу і гербу „зямная куля“, зь імі ўсё ж спакайней. Трэба трымацца ўлады й начальства.
У горадзе, як вядома, усе людзі разумнейшыя дый адукаванасьці болей. А таму й начальства тут рознага нашмат болей, чым на вёсцы. Яны, як той казаў, і вядуць рэй у справе незалежнасьці краіны.
Незалежнасьць — гэта калі ты падпарадкаваны, калі ёсьць парадак. І толькі вакол сымбаляў гэты парадак і можа паўстаць. Вось нехта зноў спаліў чырвона-зялёны сьцяг. Гэта — непарадак…
І нарэшце амаль што рэалістычны прагноз адносна існаваньня Беларусі як незалежнай краіны. Жэлю Жэлеў сьцьвярджаў, што шлях постсавецкіх краінаў да нармальнасьці і дэмакратычнага ўладкаваньня пралягае праз рэанімацыю посттаталітарных, аўтарытарных і нават прафашыстоўскіх ідэалёгіяў. І калі параўнаць незалежную Беларусь зь сёньняшняй цэласнай Расеяй, у якой рэанімацыя аўтарытарнага ладу толькі пачынаецца, дык мы, падаецца, знаходзімся крыху бліжэй да захаваньня нашага сувэрэнітэту, чымся Расея — да захаваньня сваёй імпэрскай і дзяржаўнай цэласьці.

**Юрась Беленькі**,
намесьнік старшыні партыі КХП-БНФ:
Да гэтага пытаньня, безумоўна, можна падыходзіць паводле розных крытэраў. Калі ўзяць палітычна, Беларусь знаходзіцца ў стане моцнай залежнасьці ад Расеі, стане, які можна назваць паўкаляніяльным, васальным. Залежнасьць жа ў эканамічным пляне стваралася штучна палітычным рэжымам на чале з Лукашэнкам, які нават фізычна залежыць ад усходніх уладных структураў, у першую чаргу спэцслужбаў, бо яны прывялі яго да ўлады. Нам адсякалі магчымасьць супрацоўніцтва з Захадам і штучна прывязвалі да Ўсходу, па некаторых момантах проста загадным чынам. Дастаткова моцная эканамічная залежнасьць існуе. Аднак, калі глядзець рэальна, то ўсё ж на тэрыторыі Беларусі дзейнічае сваё эканамічнае заканадаўства. У значнай ступені нашая эканоміка, нашыя „правілы гульні“ адрозьніваюцца ад таго, што існуе ў Расеі. Масква шмат намаганьняў зрабіла, каб інкарпараваць Беларусь, але жаданых вынікаў гэткая палітыка яшчэ не дала.

Наконт культуры. Тут, перш-наперш, трэба закрануць пытаньне інфармацыйнай прасторы, бо вядома, што мы жывем у інфармацыйным грамадзтве. Беларуская інфармацыйная прастора накрываецца расейскімі электроннымі сродкамі масавай інфармацыі. Зь цяжкасьцю можна назваць беларускае тэлебачаньне нацыянальным, але такія-сякія элемэнты нацыянальнага там ёсьць, зь якім бы скепсысам мы да БТ ня ставіліся. Часьцяком многія людзі там падсьвядома праводзяць адрозную ад расейскай, прынамсі, культурніцкую палітыку, бо яны жывуць у гэтай краіне, пераймаючы і манеры беларусаў, і нават тую ж трасянку, моўныя абароты.
Варта было б згадаць і пра беларускі мэнталітэт. Ня толькі нацыянальна сьвядомыя беларусы, а і замежнікі адзначаюць вельмі моцную розьніцу паміж нашым мэнталітэтам і расейскім. Гэта сьведчыць, што мы незалежныя ад іх у сваім сьветапоглядзе, сваіх адчуваньнях, філязофіі, асабліва што тычыцца філязофіі сялянства. Беларусь за савецкім часам жыла лепш, чым Расея, і ў гэтым была заслуга не савецкага ладу. Гэта была заслуга папярэдніх пакаленьняў беларусаў. Нашы людзі добра працавалі нават тады, калі ім не плацілі, бо прагнулі працы. Не зважаючы на тое, што Лукашэнкам былі адкрытыя ўсе шлюзы з Усходу, нас вельмі цяжка размыць, бо ня толькі мы, этнічныя беларусы, зьяўляемся носьбітамі беларускага мэнталітэту, а і тыя расійцы, палякі, габрэі, што жывуць на нашай зямлі.
Пагроза, бясспрэчна, існуе, бо Расея сьвядома праводзіць палітыку ліквідацыі Беларусі, ставячы найперш задачы русіфікацыі беларусаў і геапалітычнага ператварэньня Беларусі ў адзін з рэгіёнаў Расеі. Яна цудоўна разумее, што пакуль жыве культура, мэнталітэт, філязофія, яна так проста ня здолее зрабіць нас сваёй часткай, нават пры поўнай акупацыі. Агонія Расійскай імпэрыі можа цягнуцца не дзясяткі, а сотні гадоў. Даваць нейкія прагнозы ў часе, калі мы дасягнем незалежнасьці, несур'ёзна, бо працэсы камунікацыі, а значыць і разьвіцьця значна паскорыліся. Ужо ў XX стагодзьдзі гэтыя працэсы былі выразна хутчэйшыя, чым у XIX-м. Усё будзе залежаць ад таго, наколькі наш этнас захаваў генэтычныя сілы да змаганьня. Мы пакуль што іх маем. Заўважна, што моладзь нашмат радыкальнейшая, чым прадстаўнікі старэйшых пакаленьняў. Калі казаць пра час дасягненьня незалежнасьці,

дык можна правесьці клясычную біблійную паралель з Майсеевым ваджэньнем па пустэльні альбо з тысячагадовым расьсеяньнем габрэяў, якія, урэшце, аднавілі сваю дзяржаўнасьць. Калі мы народ, мы павінны настройвацца на гэта, на тысячу гадоў. Ясна, што набудзем мы незалежнасьць не праз тысячу гадоў, бо пры сёньняшніх камунікацыйных тэхналёгіях гісторыя паскорылася. Калісьці ў „Талацэ“ мы разважалі, ці дажывуць нашыя дзеці да незалежнасьці, а ўжо ў 91-м годзе беларусы яе атрымалі. Бог мне даў шчасьце непасрэдна галасаваць за гэтую незалежнасьць, калі я быў дэпутатам парлямэнту. Нацыянальная сымболіка прайшла зь перавагай у адзін голас. Не было б хоць аднога з нас, не былі б „Пагоня“ ды бел-чырвона-белы сьцяг дзяржаўнымі сымбалямі, не было б тых чатырох гадоў, якія, як бы хто ні хацеў, ужо ня выражаш з нашае гісторыі. Многія народы змагаюцца ў больш цяжкіх умовах, многім пагражае фізычнае вынішчэньне. Трэба працаваць, працаваць і верыць.

**Генадзь Бураўкін**,
паэт, былы прадстаўнік Беларусі ў ААН:
**Ф**армальна быццам бы Беларусь — незалежная дзяржава, гэта запісана ў Асноўным законе, а фактычна рэальнай незалежнасьці няма, бо палітыка краіны — у міжнародным пляне і ў нейкіх пытаньнях унутраных — цалкам падначаленая Расеі, не прымаецца сур'ёзных мераў у справе дасягненьня эканамічнай самастойнасьці. Стаўленьне ж кіраўнікоў дзяржавы, моцных гэтага сьвету, да нацыянальнай культуры ды мовы ня проста абыякавыя, а і грэблівыя часам. Ідзе непрыхаванае супрацьдзеяньне набыццю беларускай мовай статусу сапраўды дзяржаўнай ва ўсіх сфэрах жыцьця. Не відаць аніякай сур'ёзнай увагі з боку ўладаў да нацыянальнай літаратуры, культуры. Вельмі хацелася парадвацца і крыкнуць на ўвесь сьвет: „Беларусь сувэрэнная, незалежная!“, але, на жаль, тая рэальнасьць, у якой мы жывем, не дае на гэта права. Каб выправіць становішча, трэба абсалютна па-іншаму арганізаваць эканоміку — у Беларусі ёсьць база. Трэба перагледзець структуру нашай прамысловасьці ды арганізацыю сельскай гаспадаркі. Да гэтага часу разумна не выкарыстоўваецца геапалітычнае становішча краю. У Эўропе

тая ж Аўстрыя, якая ня мае ні энэргарэсурсаў, ні вялікіх запасаў мэталаў, жыве за кошт транзыту ва ўсіх яго відах: паветранага, наземнага, паліўнага і г. д., а таксама за кошт турызму. Гэта адносна эканомікі.
У палітычным жа пляне ўсё заяўлена, вельмі разумна і правільна, у нашай Канстытуцыі: Беларусь павінна быць нэўтральнай бязьядзернай дзяржавай. Калі гэта забясьпечыць, каб Беларусь ня лезла ў розныя вайсковыя групоўкі ды ваенныя саюзы, каб мы не імкнуліся некаму абавязкова супрацьстаяць, да некага далучацца, каб мы былі свабоднай эўрапейскай цывілізаванай дзяржавай, тады б быў у нас сувэрэнітэт.
І апошняе. Каб мы, зразумеўшы нашую гісторыю, адчуўшы яе, пакланіўшыся ёй за тыя вякі, што нас, беларусаў, утрымліваюць у сьвеце, каб мы бераглі сваё нацыянальна-адметнае, даражылі гэтым, а не арганізоўвалі розныя славянскія базары, ня клікалі розную папсу чужую і на гэта трацілі тыя невялічкія грошы, што маем, а падтрымлівалі б свае таленты, сваё мастацтва, а пасьля, калі б мы сталіся багатыя, калі ласка, на здароўе, клікалі каго б захацелі. Сьпярша ў сваёй хаце трэба навесьці лад, сваіх сьвятых акрыць рушніком, а не маліцца на партрэты нейкай набрыдзі. Дасягнуць гэтага цалкам рэальна, бо да Беларусі ў сьвеце стаўленьне вельмі добрае, наш народ ня могуць не любіць — яго любяць. Нашую прыроду ня могуць не любіць — яе любяць. У нас выдатная зямля, выдатны народ, адзінае, чаго нам не стае даўно і гэта вельмі трагічна, як казаў Валодзя Караткевіч, дык гэта разумнага начальства.

**Тарас Кузё**,
навуковы супрацоўнік Цэнтру расійскіх і ўсходнеэўрапейскіх студыяў Бірмінгемскага ўнівэрсытэту, былы кіраўнік інфармацыйнага цэнтру NATO ва Ўкраіне (Вялікая Брытанія):
Беларусь больш ня можа лічыцца незалежнай дзяржавай. Згодна з тэорыяй міжнародных адносінаў, яна можа быць параўнаная з дамініёнам, калі пануючым султанісцкім элітам дазваляецца займацца адно хатнімі, унутранымі справамі, у той час як замежная і абарончая палітыка знаходзіцца пад кантролем замежнай гегеманічнай сілы, у нашым выпадку — Расеі. Калі заплянаванае аб'яднаньне дзьвюх дзяржаваў будзе

разьвівацца ў палітычным ды эканамічным напрамках, пытаньні нават унутранай палітыкі Беларусі будуць усё часьцей вырашацца выключна ў Маскве. Добрым паказчыкам таго, што Беларусь больш ня можа ўважацца за незалежную дзяржаву, зьяўляецца той факт, што ніякая іншая краіна СНД, улучна з русафільскімі Казахстанам, Арменіяй ды Кіргізіяй, ня выказала жаданьня далучыцца да беларуска-расейскага саюзу. З тае прычыны, што гэты саюз — як унутры СНД (у тым ліку ў Расеі), так і ў вонкавым сьвеце — успрымаецца як падпарадкаваньне Беларусі расейскай гегемоніі. Гэта і тлумачыць, чаму Ўкраіна ніколі не далучыцца да гэткага саюзу, які не зьяўляецца супольнасьцю роўных. Раўнапраўны саюз усходніх славянаў немагчымы да тае пары, пакуль расейская большасьць у Расейскай Фэдэрацыі не пачне ўспрымаць беларусаў ды ўкраінцаў як асобныя этнічныя групы, а не як проста бела-росаў ці мала-росаў.
Жыве Вольная Беларусь!

**Уладзімер Мацкевіч**, філёзаф, палітоляг:
**Н**ад даволі простымі словамі „незалежнасьць“ і „сувэрэнітэт“ у савецкім навамоўі так доўга і многа зьдзекаваліся, што ў сучасным палітычным лексыконе „простага“ беларуса гэтыя словы страцілі сэнс і зьмест. Чым, як ня зьдзекам, лічыць сувэрэнітэт БССР, на які спасылаюцца сёньня ідэолягі лукашэнкаўскага рэжыму? Ці ня зьдзек сьцьвярджаць, як яны робяць, што далучэньне да Расеі — гэта гарантыя сапраўднай незалежнасьці?
Калі словы губляюць сваё значэньне, народ страчвае сваю свабоду. Гэтыя словы Канфуцыя, паўтораныя фон Гаекам, вызначаюць сутнасьць першага акту трагедыі кожнага народу, што трапляў у нашым стагодзьдзі пад прыгнёт таталітарызму. Розумам можна дапусьціць, што людзі пад гвалтам і прымусам кажуць і робяць нешта такое, што супярэчыць іх поглядам, веры, маралі і прынцыпам. Можна зразумець (не апраўдваючы) сьвядомы падман, калі чалавек кажа адно, а думае іншае. Але ж розум бясьсільны перад тлумачэньнем таго, што адбываецца ў сьвядомасьці чалавека, які адначасова выступае за незалежнасьць Беларусі і за саюз з Расеяй, а такіх людзей (паводле ўскосных зьвестак сацыялягічных апытаньняў, калі

супаставіць розныя дасьледаваньні) — да 25%, калі ня болей. Трэба прызнаць, што сьвядомасьць людзей разбураная савецкім навамоўем і навамысьленьнем. Пытаньне толькі ў тым, як глыбока зайшоў працэс разбурэньня, ці магчыма яшчэ нешта аднавіць. Мова, якой мы карыстаемся, і спосабы мысьленьня — гэта праграмы для сьвядомасьці, накшталт кампутарных праграмаў. Калі зламаны вінчэстэр, яго трэба выкінуць і замяніць. Пры парушэньні працы праграмы можна нешта выправіць антывірусам ці перапісаўшы праграму. Вірус савецкага навамоўя інфікаваў як расейскую, так і беларускую мовы. Таму моўнае пытаньне значна глыбейшае, чым простае распаўсюджваньне беларускай мовы. Мову трэба ратаваць ад вірусу, яе трэба лячыць. Калі таго ж Канфуцыя спыталі, з чаго патрэбна пачынаць рэформы, ён адказаў: „З выпраўленьня імёнаў“.

Антывіруснай праграмай для мовы можа стаць нацыянальная філязофія і крытыка. Крытыка ў філязофскім сэнсе, а не ў савецкім разуменьні — як абліваньне брудам усялякага іншадумства. Адсутнасьць нацыянальнай філязофіі і крытыкі ў правадыроў нацыянальнага адраджэньня і кіраўнікоў дзяржавы пасьля 1991 году — гэта зьмест другога акту трагедыі незалежнай Беларусі. Краіна амаль адразу ж пацягнулася за новым фюрэрам, што прыйшоў са старым ідэалягічным багажом.

Спрэчкі на пачатку 90-х гадоў пра тое, ці набыла Беларусь сапраўдную незалежнасьць, ці ёсьць абвяшчэньне Дэклярацыі аб сувэрэнітэце сапраўдным сувэрэнітэтам, ня мелі пад сабой іншых падставаў, акрамя страху, разгубленасьці ды невуцтва. Хочаш быць незалежным — будзь ім. Для гэтага патрэбна вельмі мала. Па-першае, абвешчаньне — дэклярацыя. Па-другое, прызнаньне незалежнасьці іншымі — дамова ў Віскулёх, рашэньні ААН, АБСЭ ды іншае. Па-трэцяе, самастойныя крокі, дзеяньні і ўчынкі. Па-чацьвертае, самастойная адказнасьць за хібы і памылкі, якіх шмат на першых самастойных кроках.

Першыя тры пункты выконваліся ў 1992-93 гадах. Былі дасягненьні, былі і памылкі. Не было толькі сьмеласьці самім адказваць за зробленыя памылкі. Памылкі рабілі „яны“, а ня мы, а „мы“ проста недастаткова незалежныя, у нас мала сувэрэнітэту. Кебіч уводзіў беларускія грошы, а калі пачалася

гіпэрінфляцыя, пабег прасіць паратунку ў Расеі: давайце аб'ядноўваць грашовыя сыстэмы.
Можна прыводзіць шмат прыкладаў памылак, шмат узораў агіднага пазьбяганьня адказнасьці — сэнс ня ў гэтым.
З памылак трэба рабіць высновы.
1. Мы абвесьцілі незалежнасьць — значыць, мы незалежныя. Хто ня згодны, той будзе мець справу з усёй магутнасьцю нашай дзяржавы і тых міжнародных арганізацыяў, якія прызналі нашу незалежнасьць і гарантуюць яе праз дамовы з сувэрэннымі ўладамі Рэспублікі Беларусь. На тое дзяржаве і належацца ўзброеныя сілы, каб са зброяй у руках абараняць свой сувэрэнітэт, усё тое, на што распаўсюджваецца сувэрэнітэт Рэспублікі. Нават Расея, якая так ня хоча лічыць нас незалежнымі, вымушаная лічыцца з гэтым *de jure*. А нам пакуль большага і не патрэбна.
2. Расея скарысталася нашымі памылкамі і знайшла ў кіраўніцтве краіны здраднікаў, якія гатовыя пайсьці на страту сувэрэнітэту і адмову ад незалежнасьці. Так, але ж Расея і не зьбіралася быць гарантам нашай незалежнасьці. Скарысталася нашымі памылкамі яна, а нам гэтыя памылкі выпраўляць. Калі ў кіраўніцтве дзяржавы здрада, народ мае права на непадпарадкаваньне. Бо па Канстытуцыі народ — вярхоўны сувэрэн у краіне, вышэйшы за ўрад. Хто адмаўляецца ад непадпарадкаваньня здрадліваму ўраду, той адмаўляецца ад адказнасьці. Адмова ад адказнасьці ёсьць стратай незалежнасьці яшчэ да здрады ўраду.
3. Як далёка мы гатовыя ісьці ў змаганьні за незалежнасьць нашай краіны, якая пакуль ня страчаная? Колькі каштуе нашая незалежнасьць?
Насамрэч пытаньне толькі ў гэтым — кошт нашай незалежнасьці. Усе астатнія разважаньні пра тое, мала ці многа ў нас сувэрэнітэту, ці дастаткова мы незалежныя — гэта індульгенцыі для слабых характараў, разбуранай сьвядомасьці, недахопу розуму, з аднаго боку, і ідэалягічная падтрымка рэжыму з другога.
Што кажуць тыя, хто прадае Беларусь? „Мы незалежныя *de jure*, але ж гэтага мала. *De facto* мы залежым ад паставак нафты і газу". Гэта хлусьня, але ж яна безадказна дзейнічае, і мы сваімі разважаньнямі дапамагаем гэтаму. „Мы незалежныя *de jure*, але ж нам бракуе розуму, каб самім уладкаваць сваё жыцьцё: увесь

інтэлект у Маскве, адтуль нам дасылаюць падручнікі для сярэдняй школы, ня кажучы ўжо пра вышэйшую“. І мы дапамагаем гэтай хлусьні, бо цікавімся толькі ўлёткамі, слёганамі, а ня працай беларускіх інтэлектуалаў ды навукоўцаў. Можна працягваць гэты шэраг далей, толькі ён мае канец. Канец яго там, дзе паўстае пытаньне пра ўзброенае непадпарадкаваньне.

Да гэтага пытаньня зноў жа трэба ставіцца па-філязофску. Першае: ці надышоў час ставіць гэтае пытаньне або можна яшчэ пачакаць? Другое: ці ёсьць у дзяржавы войска, гатовае абараняць незалежнасьць, або ў краіне прысутнічае толькі акупацыйнае зрадніцкае войска зь беларускімі рэкрутамі-шарагоўцамі ды сяржантамі? Трэцяе: ці неабходная сапраўдная грамадзянская вайна або дастаткова негвалтоўнага супраціву, бо ў шарагоўцаў беларускай арміі не падымецца рука застрэліць шмат людзей? Чацьвертае: хто пачне? Пятае: што пачынаць?

На пятую частку пытаньня я магу даць адказ. Трэба даць сучаснае тлумачэньне паняцьцю „незалежнасьць“ або беларусіфікаваць гэтае паняцьце (узгадайце Канфуцыя). Сэнс гэтага паняцьця пакрывае вельмі шырокае сэмантычнае поле. Вызначым неабходныя і дастатковыя межы ў гэтым полі: дастатковым сэнсам паняцьця „незалежнасьць“ зьяўляецца тое, што кошт яе большы за жыцьцё; калі не, дык размова ідзе пра нешта іншае. Неабходным сэнсам зьяўляецца жыцьцё беларуса. Як нельга здабыць незалежнасьць Курдыстану коштам жыцьця беларуса, так і не здабыць незалежнасьці Беларусі коштам жыцьця ірляндца з ІРА.

Зыходзячы з гэтага, можна адказваць на ўсе астатнія пытаньні. Пакуль выконваецца дастатковая частка сэнсавага паняцьця „незалежнасьць“, яна, увогуле, існуе ў сьвеце. Пакуль выконваецца неабходная частка, гарантуецца незалежнасьць Беларусі. Не загіне Беларусь, пакуль мы жывыя.

Не загіне Беларусь, пакуль мы жывыя. Але ж што гэта значыць? Можна тлумачыць гэта так, што нават тады, калі ворагі пазбавяць краіну незалежнасьці, незалежнасьць будзе жыць у нашых сэрцах. Можна тлумачыць і так, што, каб пазбавіць Беларусь незалежнасьці, трэба фізычна зьнішчыць нас. Не захаваць незалежнасьці Беларусі, калі адарваць гэтыя тлумачэньні адно ад аднога. Яны складаюць сапраўдны сэнс

незалежнасьці толькі разам.
Зьвернемся да першага пытаньня: ці надышоў час ставіць пытаньне пра незалежнасьць у поўным сэнсе гэтага слова? Калі мы спозьнімся з адказам на гэтае пытаньне, адбудзецца трэці акт сучаснай беларускай трагедыі. А сэнсам трэцяга акту будзе страта разуменьня таго, што мы ўсе павінны жыць, каб жыла Беларусь, але кожны з нас павінен быць гатовы ахвяраваць сабою, каб яна жыла. А як ня будзе гэтай ахвярнасьці, усе разважаньні пра незалежнасьць будуць весьціся на навамоўі, і тады ворагі ды здраднікі могуць з намі не лічыцца.

**Алесь Пушкін**, мастак:
**Б**еларусь, безумоўна, не зьяўляецца свабоднай і незалежнай дзяржавай. Аб якой незалежнасьці можа ісьці гаворка, калі дзяржава мае каляніяльную сымболіку, што засталася ў спадчыну ад сталінскага пэрыяду таталітарнай савецкай імпэрыі? Найбольш уразіла леташняя страта адных з асноўных паказчыкаў беларускай незалежнасьці — мытні і мяжы. Мытняй цяпер камандуе адзін расейскі генэрал, мяжой другі — генэрал Бардзюжа з Масквы, пасьля таго як Лукашэнка падпісаў пагадненьне аб агульнай мытнай і памежнай прасторы. І трэцім базавым паказчыкам нашае залежнасьці зьяўляецца тое, што мы ня маем выразнай замежнай палітыкі, няспынна ідучы ў фарватары палітыкі Расеі, па сутнасьці, адзінай краіны, што прызнала легітымнасьць Лукашэнкі пасьля 21 ліпеня. Мы, дакладней, ня мы, а цяперашні рэжым прызнае і падтрымлівае ўсе расейскія замежнапалітычныя ініцыятывы. Прыкладам тут і салідарнасьць афіцыйнага Менску з пазыцыяй Масквы ў пытаньні Чачэніі.
Нягледзячы на гэта, у Беларусі існуюць пэўныя чыньнікі незалежнасьці, якія варта разьвіваць. Па-першае, мы яшчэ маем уласнае Міністэрства абароны. Па-другое, гэта наш пакуль што бязьядзерны статус, хоць мяркуецца, што сэнс ягоны будзе губляцца з пачаткам функцыянаваньня станцыі сачэньня пад Баранавічамі, якая падстаўляе пад удар усё насельніцтва нашай краіны. Праяўляецца незалежнасьць і ў тым, што за час праўленьня Лукашэнкі Беларусь прызналі ў сьвеце, няхай і з адмоўнага боку, але ў нейкім такім амплюа яршыстай краіны, якая ўсё робіць насуперак. У гэтым пляне палітыка Лукашэнкі

сапраўды прыкметная і характарызуе Беларусь як незалежную дзяржаву, бо зьбіцьцё паветранага шару, прыкладам, заўсёды можа трактавацца як акт незалежніцкай рэакцыі. Да таго ж, ягоныя пагрозы вярнуць ракеты вызначаюць краіну з такога дурацкага, абсурднага, але зноў-ткі незалежніцкага боку. Нельга забывацца на незалежнасьць прадуктовую: Лукашэнка трымае калгасы, якія ледзь ліпяць, але Беларусь сяк-так забясьпечвае сябе харчамі, у адрозьненьне, напрыклад, ад Расеі, дзе ў гарадох прадукты на 90% завазныя. У нечым абсурдная палітыка Лукашэнкі стварае адмоўны імідж краіны, і ў гэтым мы падобныя да Іраку альбо Лібійскай Джамахірыі. Для мяне ідэалам незалежнай пазыцыі зьяўляецца палітыка Францыі, якая мае складаныя адносіны з NATO. Так і Беларусь не павінна ўваходзіць у Альянс, захоўваючы бязьядзернасьць, і адначасова прытрымліваючыся палітыкі харчовай незалежнасьці, не падпарадкоўваючыся краінам Эўразьвязу. У гэтым пляне можна пагадзіцца з Пазьняком, бо прыклад Літвы ды Латвіі сапраўды жахлівы: гэтыя краіны выконваюць усе патрабаваньні ЭЗ і губляюць свой твар. Але іхным жыхарам, зь іншага боку, добра жывецца. Беларусь — таксама маленькая краіна, ёй не патрэбная роля Расеі, Украіны ці хоць бы той Польшчы, бо існуе пэўная мяжа, калі насельніцтва перавальвае за 30 мільёнаў, і краіна пачынае адыгрываць нейкую салідную ролю, прыкладам, цяперашняя Турцыя. Тая ж Украіна дзейнічае насуперак усім пагадненьням, бо гэта салідная дзяржава з насельніцтвам больш як 50 мільёнаў чалавек. Беларусаў жа толькі 10 мільёнаў, і трэба раўняцца на сярэднеэўрапейскі стандарт невялікай краіны кшталту Бэльгіі. Няхай сабе мы будзем менш амбітнымі, але жыць будзем лепей. Лепей быць добрымі лёкаямі ў Нямеччыны, абслугоўваючы ейны шлях на Расею, і добра б жыць, чым драць нос і жыць бедна. Сьціплей, ды багацей. Лепей быць лёкаямі па абслугоўваньні нафтавай трубы ды транспартных шляхоў, быць трохі прыніжанымі, але заможнымі.

**Аляксандар Смоляр**,
гісторык, прэзыдэнт Фонду Сьцяпана Батуры (Польшча):
**Г**эта вельмі складанае пытаньне. Па-першае, у сучасным сьвеце вельмі шмат краінаў, што знаходзяцца нібы пасярэдзіне: на

сёньня, бадай, не існуе такіх дзяржаваў, якія можна было б назваць сувэрэннымі ў клясычным сэнсе гэтага слова, бо лёс гэткіх краінаў вызначаецца не тамтэйшым народам ці кіраўніцтвам дзяржавы. З самых сувэрэнных у гэтым пляне можна назваць Кітай, але ўжо, прыкладам, Злучаныя Штаты ладную частку свайго сувэрэнітэту згубілі. Лёсы сучасных дзяржаваў вырашаюцца ў іншых краінах. Гэта збольшага абумоўлена глябальна-рынкавымі ды глябальна-інфармацыйнымі працэсамі, што адбываюцца ў сьвеце.
Такім чынам, сувэрэннасьць набывае іншы сэнс.
Якое месца займае ў гэтай сувязі Беларусь? Хоць гэта і можа падацца парадоксам, я мяркую, што палітычна Беларусь зьяўляецца досыць незалежнай дзяржавай, у гаспадарчым жа ды вайсковым пляне — вельмі залежнай.
Праблему залежнасьці можна разглядаць у шматлікіх аспэктах. Важнейшым ёсьць вызначэньне выточнага пункту, выяўленьне тэндэнцыі: ці спрыяе гісторыя пашырэньню незалежнасьці беларускага народу альбо наадварот — ейнаму звужэньню? Тое, што робіць Лукашэнка, на першы погляд можа падацца выразным узмацненьнем нэгатыўнай тэндэнцыі да звужэньня незалежнасьці. Але разам з тым я абсалютна перакананы, што ягоная палітыка выклікае цалкам нечаканую рэакцыю ў грамадзтве. Парадаксальна, але я ўпэўнены, што Лукашэнка станецца бацькам новай нацыянальнай самасьвядомасьці беларусаў, якая будзе сфармаваная як антытэза да самасьвядомасьці іншага кшталту.
Я ня веру, што Беларусь можа калі-кольвечы зьнікнуць з сусьветнай мапы. Сучасныя тэндэнцыі цалкам процілеглыя, бо няспынна ствараюцца драбнейшыя тэрытарыяльныя адзінкі з абмежаваным сувэрэнітэтам, але якія могуць функцыянаваць дзякуючы сыстэме вольнага рынку. Раней выжывалі толькі буйныя дзяржавы, якія былі ў стане весьці пратэкцыянісцкую палітыку ды мець моцны рынак унутры сваёй краіны. Сёньня ж ва ўмовах лібэралізацыі міжнароднага гандлю мы бачым, як паўстаюць усё меншыя адзінкі на геапалітычнай мапе сьвету, якія могуць захоўваць свой сувэрэнітэт.
Зразумела, мая вера ў тое, што Беларусь ніколі ня зьнікне як незалежная дзяржава, палягае ня толькі на гэткіх эканамічных тэндэнцыях, але і на аналізе працэсаў, якія адбываюцца ў Эўропе. Сучасная эўрапейская культура заснаваная на

плюралізьме нацыянальных самасьвядомасьцяў, на павазе да кожнай з культураў-складнікаў. Такія глыбокія асновы эўрапейскага разьвіцьця перажывуць розных сатрапаў, фюрэраў ды дырэктараў саўгасаў.
Ні ад каго не залежыць Беларусь і культурна. Я ня згодны з тым, што беларусы — гэта носьбіты савецкай культуры, бо такой культуры не існавала ўвогуле. Савецкай была і ёсьць мэнтальнасьць, але толькі не культура. Савецкасьць, быўшы нэгатыўным гістарычным досьведам, не была творчай, ня ўнесла нічога новага. Пры гэтым беларуская культура, як і любая эўрапейская культура, захоўвае ўнівэрсальны характар. Але я не магу сказаць, наколькі адкрытай для вонкавага ўплыву ёсьць беларуская культура, ці падпадае яна — праз расейшчыну — пад сусьветны працэс амэрыканізацыі.
Наконт мэнтальнасьці беларусаў я б сказаў наступнае. Беларусь — гэта, па вялікім рахунку, калгасная супольнасьць, таму савецкая мэнтальнасьць будзе тут найтрывалейшай, прымаючы самыя небясьпечныя формы выраджэньня, робячыся субкультурай, якая зьнішчае працаўніка, у першую чаргу. Савецкая ідэалягічная афарбоўка, безумоўна, зьнікне вельмі хутка, але застанецца прага да Танатасу, да сьмерці, застанецца страх перад выклікам гісторыі, перад рызыкай, няпэўнасьцю, перад воляй да стварэньня чагосьці новага, перад той гістарычнай задачай, што стаіць перад усімі нашымі народамі.

**Максім Стрыха**,
доктар фізыка-матэматычных навук, палітоляг (Украіна):
Адказ на гэтае пытаньне наўрад ці можа быць сёньня адназначны. З фармальнага гледзішча Беларусь незалежная, бо ж усе фармальныя прыкметы сувэрэнітэту (сьцяг, гімн, войска, амбасады і г.д.) яна захоўвае і будзе захоўваць у найбліжэйшай будучыні. Я тут не закранаю пытаньня якасьці тых адзнак, бо хіба мала ёсьць у сьвеце дзяржаваў, асабліва новастварэных, чые сьцяг ды герб пазначаныя страшэннай эстэтычнай безгустоўнасьцю ды поўнай адарванасьцю ад традыцыяў, чыё войска кіруецца іншаземнымі дарадцамі і чые амбасадары карумпаваныя ды неадукаваныя? Хіба мала дзяржаваў, дзе мова карэннага насельніцтва існуе толькі фармальна, у чыста

„музэйным“ стане (згадайма, бадай, хрэстаматыйную Ірляндыю)? І нават адмова ў блізкай пэрспэктыве ад уласнага рубля не пазбавіць Беларусь фармальнай незалежнасьці, — бо тое самае сёньня робіць ня толькі які-небудзь далёкі Эквадор, але й большасьць уплывовых дзяржаваў старой добрай Эўропы…

Трагедыя Беларусі, відавочна, цалкам у іншым. Для сусьветнай супольнасьці сёньня Вялікабрытанія — гэта ня Тоні Блэр і не Яе Вялікасьць Каралева Лізавета ІІ. Францыя — гэта ня Жак Шырак. Амэрыка — гэта ня Біл Клінтан. Вялікабрытанія, Францыя, ЗША — гэта нашмат шырэйшы вобраз краіны зь яе эканамічнай магутнасьцю, інтэлектуальнымі здабыткамі ды гістарычнымі традыцыямі.

На жаль, з шэрагу аб’ектыўных ды суб’ектыўных прычынаў Беларусь для сусьветнай супольнасьці сёньня — гэта ППРБ і толькі ён. За вусікамі правінцыйнага лавэляса не відаць ані краіны, ані яе людзей (дакладней, і краіна, і яе людзі здалёк здаюцца тоесныя тым самым вусікам).

Гэтак, пытаньне, ці ёсьць незалежнаю дзяржавай Рэспубліка Беларусь, пераносіцца сёньня ў цалкам іншае рэчышча: ці ёсьць ППРБ толькі адыёзнаю марыянэткай у руках насельнікаў Крамля? Ці наадварот, ён сам вядзе зь імі вельмі складаную ды пасьпяховую гульню, ажыцьцяўляючы ўласныя далёкасяжныя пляны?

Наўрад ці хто адкажа на гэтае пытаньне адназначна, бо гісторыя апошніх гадоў утрымлівае досыць фактаў на пацьверджаньне як першага, так і другога прыпушчэньня. Аднак цалкам зразумелым ёсьць іншае. Беларусь сапраўды мае даўнюю й багатую, цалкам канкурэнтназдольную, паводле эўрапейскіх стандартаў, культуру. Інтэлектуальныя здабыткі беларусаў вялікія ды неаспрэчныя. Магчымасьць Беларусі быць адным з асноўных элемэнтаў цэнтральнаўсходнеэўрапейскіх пабудоваў, злучальным мастком паміж Украінай і Балтыяй, Расеяй ды Польшчай не падлягае сумневу.

Але пры гэтым пытаньне, якое паўстала перад Беларусьсю (як і перад Украінай), палягае ў тым, што, зыходзячы зь сёньняшніх геапалітычных рэаліяў, адна зь яе межаў — ці то заходняя, ці то ўсходняя — ня можа заставацца і надалей адкрытая. Эўропа дбае пра спакой ва ўласным будынку.

Украіна сёньня дужа павольна й балесна, але, падобна, робіць-

такі выбар на карысьць заходняга вэктару. У той час як у Беларусі сама мажлівасьць такога выбару можа быць пастаўлена на абмеркаваньне толькі тады, калі аблічча краіны ня будзе цалкам атаесамляцца зь фюрэрскім абліччам ППРБ.

**Ірына Шаблоўская**,
літаратуразнавец-кампаратывіст, прафэсар БДУ, цяпер выкладае ва ўнівэрсытэце Гранады (Гішпанія):
**…Н**ацыя, якая мае Скарыну, Купалу, Караткевіча, тысячы змагароў і пакутнікаў за незалежнасьць, ня можа мірыцца зь незалежнасьцю на паперы. Незалежнасьць ёсьць! Адпаведна эпосе, якую маем — Нацыянальнага адраджэньня. Іншыя славянскія народы, напрыклад, чэхі, перажылі сваё адраджэньне ў XVIII стагодзьдзі. Адрадзіліся, як незалежныя. Якім шляхам? Праз асьветніцтва, вывучэньне сваёй гісторыі, культуры, літаратуры, мовы. Ці не на першым месьце стаяла мова ў працах выдатных славістаў, у працах, якія, дарэчы, маглі быць напісаны і на іншай мове, але дасьледавалі сваю. Шляхам вывучэньня моваў народаў сьвету і пашырэньня перакладаў зь іх на родную. Усё гэта актуальна для беларусаў перад новым, трэцім тысячагодзьдзем.
Сёньня для Беларусі асьветніцтва набывае і новы аспэкт, так бы мовіць, парадаксальны: у эпоху TV, радыё (не кажу пра Інтэрнэт, бо ён пакуль не прыйшоў у кожную беларускую хату) большасьць беларусаў апынулася ў сытуацыі зэро. Інфармацыйнай ізаляцыі. Трэба гэта асэнсаваць — для большасьці беларусаў сёньня няма ані радыё, ані TV, няма праўдзівай, нэўтральнай, нарэшце, інфармацыі пра тое, што адбываецца ў сваёй краіне ды ў сьвеце. Ёсьць, на жаль, адна РЫТОРЫКА. Многа словаў, многа псэўдакрасамоўства… Камуфляж ісьціны. Абгортка для хлусьні. Простаму і шчыраму беларусу як не паверыць слову з экрану альбо па радыё? Сапраўды, у эфіры Беларусі Незалежнасьці Няма…
Цікава, што ў краіне, дзе просты чалавек ачмураны білінгвізмам, ня можа быць пісьменны ні на адной, ні на другой дзяржаўнай мове, квітнее рыторыка, выкладаецца шырока ў школах. А родная мова зьнікае. НАРОДУ ПАТРЭБНА ЖЫВОЕ СЛОВА ПРАЎДЫ. Толькі такое слова і можа прэтэндаваць на сапраўднае красамоўства. У гэтым, дарэчы,

пераконвае гісторыя самой рыторыкі, якою ня раз злоўжывалі цэзары і выкарыстоўвалі дыктатары.
Такім чынам, незалежнасьці быццам няма… Бо яе выціскаюць… Чужыя інтарэсы. Чужое слова.
Народ Скарыны ня ведае СВАІХ СЬВЯТЫХ. СВАЁЙ ГІСТОРЫІ. СВАЁЙ КУЛЬТУРЫ. СВАЁЙ МОВЫ. Ня ведае? Быццам. Часова. Пакуль.
Выратуе СЛОВА. Роднае. Праўдзівае! СА-ПРАЎДНАЕ.
* * *

**У наступным нумары:**
апытаньне ARCHE
**„Ці можа Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвілла стаць прэзыдэнтам Рэспублікі Беларусь?“**

[image]
[image]

**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

# Зьмітрок Бядуля
# Жыды на Беларусі*

**Бытавыя штрыхі**

*** Тэкст друкуецца паводле выданьня:**
**З.Бядуля. Жыды на Беларусі. Бытавыя штрыхі. Менск, 1918.**
**Пры публікацыі захаваныя асобныя стылёвыя і лексычныя асаблівасьці мовы аўтара.**

**Зьмітрок Бядуля** (сапраўднае імя Шмуэль Плаўнік, 1886—1941) — буйны беларускі пісьменьнік, гарачы патрыёт сваёй радзімы. За польскай акупацыяй у 1918—1920 гадох удзельнічаў у тварэньні беларускага войска. За сваю літаратурную і грамадзкую дзейнасьць неаднаразова перасьледаваўся расейскім урадам

## Ад аўтара

Ня маючы пад рукамі ніякага належачага да гэтага тэмату матэрыялу, я ні ўдаваўся ў грунтоўную і дэтальную апрацоўку свайго артыкулу, каторы быў напісаны для штодзённай газэты „Беларускі Шлях“ па просьбе рэдакцыі.
І вось, дзеля таго што да гэтага часу яшчэ аб жыдох на Беларусі не было напісана ніводнага радку ў беларускім друку, я чую патрэбным даць вышэйпамянёны газэтны артыкул асобнай брашуркай. А калі гэтая брашурка пакіруе на думку каго-кольвечы напісаць аб гэтым сталую працу з дэтальнымі гістарычнымі, эканамічнымі, этнаграфічнымі і статыстычнымі дадзенымі, то мэта мая будзе дасягнута.

## I

Некалькі сталецьцяў таму назад жыды перабраліся у наш край праз Заходнюю Эўропу і Польшчу. Да заняцьця нашага краю Расіяй, яны, апрача волі гандлю, рамесла і жыхарства усюды — і па вёсках — мелі яшчэ і сваё самаўпраўленьне — „кагал“. Значнейшыя рэпрэсіі над імі ў нашым краі расійскім урадам былі паўзяты каля 1820 г., хаця ўжо зараз жа пасьля „брацкага“ прылучэньня Беларусі да Масквы, што сталася пры апошнім разьдзеле Польшчы ў 1795 годзе, Беларусі надавалася роля

жыдоўскага „гета“. Кацярына Вялікая ўвяла „еврейский вопрос“ у ўнутраную палітыку Расіі, а ў 1800 року паэт Дзяржавін быў камандзіраваны імпэратарам Паўлам I на Беларусь, каб дэтальна пазнаёміцца са становішчам жыдоў і, падмануўшы фактычных дадзеных, апрацоўваць праект рэформаў адносна жыдоў. Дзяржавін пісаў свой праект у Віцебску.
Менскі „кагал“ уладжваў з гэтай прычыны сход у ратушы і хлапатаў перад Аляксандрам I аб памякчэньні рэжыму. Перашкаджаючы ўсякімі спосабамі расьсяленьню жыдоў скрозь, элемэнту ў карэнных расійскіх губ.[эрнях] за „шкоднасьць“ расійскі ўрад, лічыўшы Беларускі край чужым, зьбіраным паволі стварыў тут астрог для жыдоўскай люднасьці, уключыўшы Беларусь у ганебнейшую ў гісторыі царскай Расіі, прагрымеўшую на ўвесь сьвет, так званую „черту еврейской оседлости“.
Тут, на Беларусі, болей чым у сумежных краёх жыдоўскага гета, тварыўся іх эканамічны і культурна-нацыянальны быт доўгімі гадамі.
Зразумела, што гэтая творчасьць не магла ні рабіць уплыву на характар краю, як і сама яна павінна была пераняць некаторыя яго асобнасьці, праз што тварыўся натуральны абмен культурнымі вартасьцямі паміж жыдамі і беларусамі.
Суседзтва гэтых дзьвюх нацыяў тварыла такія жыцьцёвыя ўмовы і эканамічныя стасункі, у якіх адна нацыя без другой не магла абысьціся.

Гандаль і рамёствы ў нашым краі разьвівалі жыды. І трэба сказаць, што ў гэтым кірунку яны досыць ажывілі наш край і праз увесь час прыносілі яму шмат карысьці. Паміж іншым, яны тут часткова займаліся і хлебаробствам. З усіх губэрняў эўрапейскай Расіі толькі ў нашых беларускіх губэрнях былі жыды-сяляне, і да гэтага часу яшчэ захаваліся вёскі з адным жыдоўскім насяленьнем.
Месты і мястэчкі, у якіх салідную перавагу мела жыдоўскае насяленьне, давалі беларускім сялянам мажлівасьць нармальнага тавараабмену. Гандляры і рамесьнікі таксама былі неабходныя ў гэтым глухім (у бытнасьці пад Расіяй) краю, дзе не было ніякай эканамічнай культуры.
Кавалі, шаўцы, краўцы былі людзі першай важнасьці і пашаны ў вёсках. Да іх прыходзілі ў свой час, ня толькі па справах іх

спэцыяльнасьці, але так сабе: „пагутарыць з разумнымі людзьмі“, параіцца аб розных справах і г.д.
Жыды стараліся зьменшыць цэны на прадукты, як у рамёствах, таксама і ў гандлю; яны здавальняліся драбніцамі, бо фізычныя патрэбнасьці былі ў іх вельмі малыя. Дзякуючы пасярэдніцтву ўсюды бываючага жыда-скупшчыка, селянін збываў на мейсцы ўсе свае прадукты. А скупшчык-жыд пры ўсёй сваёй вялікай працы быў такі самы бедны, як яго сусед-селянін, хаця жыд і гарэлкі ня піў.
Прыпісваць толькі адным жыдом спэцыяльнасьць гандлёвага шахермахарства і ўпаіваньня народу гарэлкай нельга: мы добра ведаем, як у вялікарасійскіх губэрнях славянскія „купцы-кулаки“ і „целовальники“ эксплюатавалі тамтэйшых сялянаў у некалькі стопняў болей, чым тут жыдоўская гандлёвая кляса нашых сялянаў.
Ды наагул бравары ў Беларусі былі панскія, корчмы па трактах жыды арандавалі ад паноў, так што яны былі толькі той сьляпой прыладай у руках паноў, якія праз жыдоў сабе выпампоўвалі апошнія сялянскія грашы.
Нягледзячы на цкаваньне рознымі чарнасоценцамі з Масковіі нашых сялян на жыдоў, наш народ нічога кепскага не рабіў жыдом. У той час, калі ў Расіі чыніліся над жыдамі пагромы і страшэнныя зьдзекі, беларускія сяляне не паддаваліся цёмнай агітацыі. Хлебаробы нашыя не маглі рабіць кепскіх учынкаў над жыдамі, чуючы інстынктыўна ў душы штучнасьць і непраўдзівасьць чарнасоценных ідэяў. Так выходзіла, што вялікія грошы, высыпаныя дзеля пагромнай агітацыі расійскімі ісьцінна-рускімі ўрадамі, падобна сталыпінскаму, у нашым краю, — пайшлі на нішто.
Нідарма ўвосень 1917 г. на Ўсебеларускім зьезьдзе ў Менску прадстаўнікі розных жыдоўскіх партыяў, вітаючы беларусаў, са шчырай удзячнасьцю ўспаміналі аб тым, што на Беларусі ніколі жыдоўскіх пагромаў не было.

**II**

За ўвесь час сумеснага жыцьця беларусаў і жыдоў на Беларускай зямлі гэтыя дзьве нацыі псыхічна шмат перанялі адна ад аднэй. У мовах, у звычаях, у легендах, у будаўніцтве, у будзённым жыцьці — у іх формы так перамяшаліся, што (болей

усяго ў жыдоў) прынялі новую самабытную акрасу.
Ёсьць агульныя жыдоўска-беларускія народныя мэлёдыі, прыказкі, дзе жыдоўская і беларуская мовы перамяшаныя паміж сабою. У беларускай мове ёсьць словы: „хаўрус“, „хеўра“, „бахур“, „адхаіць“ і шмат іншых — чыста гэбрайскіх словаў. У жыдоўскай мове беларускіх словаў ёсьць тым болей.
У свой час, у 1911—12 гг., жыдоўскі журналіст і рэдактар розных жыдоўскіх часопісаў, п.Гурвіч, у Вільні зьвярнуў на гэтую справу ўвагу. Сабраўшы цэлы зборнік прыказак і дадаўшы да іх свае тлумачэньні, ён паслаў гэта да друку ў загранічны журнал.
Але гэтага мала. Ёсьць цэлая жыдоўска-беларуская этнаграфія, якая чакае свайго зьбіральніка. Такія прыказкі, як: „Ня добра *рэйдэлэ* (гаворыць), а добра *мэйнэлэ* (думае)“, — ёсьць соткі.
Вось па жыдоўскім альфабэце жабрацкае клянчаньне, якое жыды сьпяваюць на дзяды:
*„Ах, брацьця, галубцы, давайце галоднаму вашаму жабраку хлеба троху.*
Алеф, бойс, гімэль, далес, гой, вов, заін, хэс, тэс,
*Я — калека, ламака, мучальнік. Не магу служыць у пана. Чым-кольвек*
юд, коф, ламэд, мэм, нун самэх, айэн, цэй, цадык, куф,
*ратуйце сьляпога татуню.*
рэйш, шын, тоф“.
Ёсьць вельмі пекная беларуская песьня, якая заканчваецца па-гэбрайску і пяецца на хасыдзкую мэлёдыю:

Бацька, бацька!
Выкупі нашу матку...
Выстрай нашу хатку...
Бяз хаткі ня будзем,
Бяз маткі заблудзім.
Абрамуню, Абрамуню,
Абрамуню!
Дзедушак ты наш!
Чаго ж вы ня просіце,
Чаго ж вы ня моліце
Пана Бога за нас…
Што б вы нас асвабадзілі

Із голус (выгнаньне) вывадзілі,
Нашу матку (народ) выкупілі,
Нашу хатку (Палестыну) выстраілі,
Лэярцэйну (у нашу зямлю) прывадзілі —
Lejarcejnu, Lejarcejnu!
Адказваюць яму зь неба:
Ой ты, сынок, сынок, сынок,
Ня затрогай сваё сэрца.
Матка бэндзе выкуплена
Хатка бэндзе выстроена
Бондзь мондры, чэкай конца[1]
Wnejmar lefonow schoro chadoscho…
(І мы яму скажам новую песьню)
За другім разам:

Lejarcejnu!
Entwert men ihm won ejben.

[1] Увага: Тут словы песьні прымаюць акрасу польскай мовы. Гэта паказвае, што беларуская мова і ў большасьці жыдоў лічыцца „простай“. Знача, яны ня могуць сабе ўявіць, каб Пан Бог гаварыў іначай, як „па-панску“ — г.зн. па-польску.
Вось другая песьня да трох жыдоўскіх патрыярхаў — Абрама, Ісака і Якава:

Стары Абрам, сівы Абрам,
Што ты зажурыўся?
— Вёў сына да Акейдо (ахвяру) —
Дарма патрудзіўся!
Ісак, Ісак, наш ацец,
Быў зьвязан, як баранец:
Сталі ангелы плакаці,
Вялеў Бог адпусьціці.
Якаў, Якаў, бацька наш,
Чатырнаццаць гадоў авец пас.
.....
Сем за Рохэль, сем за нас.
Гэтакіх песьняў ёсьць шмат у жыдоў, як сур'ёзныя, таксама і лёгкія прыпеўкі.
Вось на манер талмудычнай сафістыкі ешыбацкі жарт:

„То, шма! (Ідзі паслухай!) Казачка піла пойла эй лэй (або не) піла пойла? Калі скажаш — піла пойла, то чаму бэрдэлэ (барада) суха? Калі скажаш — лэй (не) піла пойла, то чаму экелэ (хвосьцік) мокры? — Тэйка — блайбт акашэ“ (пытаньне астаецца неразгаданым).
На матыў „Кол Нідрэй“ (малітва на „Страшную ноч“) жыды пяюць беларускую песьню: „Як паехаў у карчомку“. На жаль, словаў ня памятаю.
У некаторых мейсцах Віленшчыны, па мястэчках, жыды, пераняўшыся забабонамі і міталёгіяй беларусаў, на Купальле сьцелюць хлявы крапівой і папаратнікам, каб ведзьмы малака не адбіралі ў кароў. Нешта падобнае да беларускай каляднай казы ёсьць і ў жыдоў. На Дзяды пры выпіўцы адзін адзяецца казою і пяе беларускія прыказкі ў парадку жыдоўскага альфабэта:

„(Алеф) Антон канцавы,
Мой родны Хведар
Балайло! (уначы).
(Бэйс) Браў ня браў —
Лаяць ня трэба.
Балайло!
(Гімэль) Гразамі горад ня браць,
Балайло!“ і г.д.
Жыды вельмі паважаюць беларускую народную мудрасьць. У іх ёсьць такая прыказка:
„Agojescher glajchwort ist wi aidocshe tojre“ (сялянская прыказка ўсё роўна, як жыдоўская Тора).
На першы погляд магло б здавацца, што ў пераняцьці культуры адной нацыяй у другой, жыды, як нацыя болей культурная, павінны былі мець перавагу над беларусамі і мець свой большы ўплыў над імі, але ў самай рэчы ёсьць іначай. Першая прычына гэтага тая, што ў гэтых дзьвюх нацыяў няма роднасьці мовы і плямёнаў і тут якраз палякі і расійцы занялі першае мейсца, асымілюючы беларусаў. Другая прычына — гэта беларуская зямля. Дэкарацыя мясцовай самабытнай прыроды мае ў сябе такую вялікую сілу, што на ўплывы ўсялякіх іншых культураў дзеіць адпорна ў адваротны бок. І тыя людзі з нашага краю, якія пісалі па-расійску або па-польску і нажылі сабе славу ў памянёных літаратурах, не маглі выкараніць у сабе духу

беларускай зямлі, каторы жыў у іх сэрцах. На кожным кроку чуецца, што гэтыя пісьменьнікі — беларусы. Моц беларускай зямлі зрабіла тое, што ў Беларуска-Літоўскім княстве законы пісаліся па-беларуску, прыдворная мова літоўскіх князёў была беларуская. А літвіны яшчэ цяпер наракаюць, што шмат літоўскіх сялян абеларусела. У цяперашняй выстаўцы старасьвецкіх памяткаў у Вільні пад назваю: „Вільня-Менск“ ёсьць каран беларускі, пісаны татарскімі літарамі. Гэта паказуе, да чаго можа даходзіць уплыў беларускай культуры!
Дзеля ўсяго гэтага, і ня дзіва, што жыды, жыўшы тут, на сваёй новай бацькаўшчыне, болей перанялі ад беларусаў, чымся беларусы ад іх. Магутная сіла беларускай зямлі дала асобны духоўны і вонкавы воблік беларускім жыдам. Цяпер яны адрозьніваюцца ад усіх другіх жыдоў, і іх па ўсім сьвеце называюць „літвакамі“.
З асобай сымпатыяй беларуская газэта ў Вільні „Наша Ніва“ друкавала тыпы беларускіх жыдоў і жыдоўскіх сынагог у беларускім стылю. Калі мы глянем на жыдоўскае мястэчка на Беларусі, то пабачым на кожным кроку нешта роднае, сваё, у будоўлях і ўва ўсёй абставе. Узяць жыдоўскіх пісьменьнікаў зь Беларусі, — то ў іх творах чуецца заўсёды беларуская прырода — „родныя зьявы“. Болей усіх гэта адбіваецца ў творах жыдоўскага клясыка Абрамовіча (Мэндэле Мойхэр Сфорым) з Капыля.
Жыдоўскі пісьменьнік Абраам Мапу, пісаўшы свой біблійны раман зь ідылічных часоў цара Хізкія і прарока Ісаі, маляваў ціхі Бэтляхам, быўшы натхнёным пекнымі ўзьбярэжжамі беларускага Нёмна. Знакаміты жыдоўскі пісьменьнік з часоў „haskola“ (адраджэньня) Перэц Смаленскін лічыцца таксама выхаванцам Беларусі.
І ў другіх галінах штукарства ў тутэйшых жыдоў чуецца беларускі дух.
Жыды, тры разы на дзень у малітвах сваіх успамінаючы Сыён, малявалі сабе ў думках гэты Сыён як нейкі ўзгорак-узвышку, якія акружаюць іх тут, на Беларусі. Жыдоўскае дзіця, аддаючы ўсе свае маладыя гады бібліі ў хедэрах, мела перад сабой жывую біблію беларускіх ратаяў, беларускай спакойнай, ціхай зямелькі зь лясамі, пушчамі, рэчкамі, лугамі. Бяз гэтай беларускай прыроды, што завалодала іхнай душой ад нараджэньня, яны б не маглі ў фантазіі сваёй маляваць

Палестыну, каторую яны малююць, маючы ўзорам беларускую зямлю.
Праўдзівымі і зразумелымі ёсьць апавяданьні жыдоўскіх эмігрантаў, выкінутых адгэтуль лёсам у Амэрыку і інш., аб іх суму па бацькаўшчыне. І не адпавядаюць праўдзе паказаньні большасьці антысэмітаў, што жыды ня маюць пачуцьця каханьня да тае зямлі, дзе яны жывуць... Гэта было б супраць законаў прыроды. Адно толькі — гэта цяга да бацькаўшчыны ў іх абвеяна асобым трагізмам. З аднэй стараны боку — жыцьцё на чужыне сотні гадоў, дзе даконвалі іх розныя антысэміты і жыдаеды, хочучы ня толькі зьнішчыць іх фізычна, як пагромамі і крадзяжамі, але таксама і апаганіць іх душу — рэлігію — пад відам розных крывавых нагавораў і крытыкі Тальмуду. З другой стараны — далёкая Палестына, зь якой яны выгнаны ўжо 2000 гадоў, — акрапляла самабытнай расою ў душы кожнага жыда тыя карэньні, якія зьвязваюць яго зь зямлёю, дзе ён жывець. Яго каханьне да новай бацькаўшчыны — нэрвовае, балючае і незразумелае прадстаўнікам іншых нацыяў.

**III**

У беларускіх вялікіх местах, як Вільня, Менск і інш., жыды мелі свае вялікшыя культурныя цэнтры: школы, абшчыны, прафэсіянальныя цэхі і інш.
У той час, калі другія нацыі на Беларусі былі страшэнна сьціснутыя расійскім урадам, калі беларусам зусім было забаронена друкаванае слова, жыды мелі ў гэтым нейкую свабоду — нацыянальная жыдоўская культура магла разьвівацца без усялякага, праве, тармозу. Тутэйшы „кагал“ быў свайго роду самаўпраўленьнем. З прычыны ўсіх гэтых абставінаў жыды зь Беларусі давалі жыдом усяго сьвету найвялікшых вучоных у рэлігійным і нацыянальным жыцьці. Крыніцай гэтаму было места Вільня, бацькаўшчына віленскага „гоэна“ — Равві Ільлі (памёр у 1797 р.) і другіх вялікіх тальмудыстаў. Там друкаваліся найлепшыя кнігі і быў да апошняга дня жыдоўскі вучыцельскі інстытут. Недарма Вільня называецца жыдамі „Літоўскім Ерузалімам“ („Ieruschalim dylito“). У той самы час славіўся кіраўнік хасыдызму на Беларусі, — Шнеер Зальман. Тут жа, на Беларусі, разыгралася тады вялікая барацьба паміж дзьвюма жыдоўскімі рэлігійнымі

партыямі: Хасыдым і Міснагдым. Гэта барацьба нарабіла вялікага неспакою ў віленскім „Кагале“.
У мястэчку Валожыне Віленскай губ. у 1803 року залажылася вучнем Гоэна, Хаімам Валожынэрам, жыдоўская духоўная акадэмія, скуль выходзілі вялікія жыдоўскія пісьменьнікі і рабіны для ўсяго сьвету жыдоў. (З валожынскага „Ешыботу“ выйшаў і знакаміты жыдоўскі паэт Х.Н.Бялік.) У Валожынскі „Ешыбот“ прыяжджалі вучыцца жыды з Каўказу, зь Нямеччыны, з Амэрыкі і г.д.
Тут, на Беларусі, меў сваё разьвіцьцё і жыдоўскі містыцызм (Кабала). Вядомы цадыкі ў Лібавічах, у Койданові, Пінску[2], да каторых прыяжджаюць веруючыя з усёй Расіі. І ня дзіва, што галоўнае разьвіцьцё жыдоўскай нацыянальнай рэлігійнай культуры мела мейсца тут, на Беларусі, дзе ім былі дадзены прывілеі яшчэ пры кн. Вітаўту. Яны жылі тут, як дзяржава ў дзяржаве, і іх „Кагал“ меў нават права судзіць сваіх пабрацімаў.

[2] Пінск у пачатку мінулага сталецьця быў вялікім цэнтрам хасыдызму.
У пэрыядзе амярцьвеньня беларускага нацыянальнага ўсьведамленьня, жыды, як і самі беларусы, хоць добра ведалі беларускую мову, але глядзелі на яе як на „мужыцкую“ і, русіфікуючыся самі, несьвядома служылі русіфікатарскай ідэі Вялікарасіі. Але гэта была тая багатая кляса, якая атрымала сваю навуку ў расійскіх школах, а што тычыцца простых местачковых жыхароў, то, апрача роднай мовы, яны ведаюць толькі беларускую.
Ад самага пачатку беларускага адраджэньня, амаль побач зь першымі піянэрамі беларускага руху, пайшлі, хоць і ў малым ліку, і жыды, якія выйшлі зь вёскі; хаця шырэйшыя інтэлігентныя масы жыдоўства, асабліва ў местах, ня могуць яшчэ пазбыцца кансэквэнцыяў расійскага тут уладаньня і ўсё яшчэ служаць праваднікамі русіфікацыі.

**IV**

У 1912 годзе, калі ў чарнасоценных газэтах „Северо-Западного края“ паміж другімі нападкамі на беларускую газэту „Наша Ніва“ ў Вільні, яе вінавацілі яшчэ і ў тым, нібыта яна выдаецца то на польскія, то на нямецкія, то на расійскія, а таксама і на жыдоўскія грошы, некаторыя зь віленскіх жыдоўскіх

журналістаў зацікавіліся гэтай „народнай“ газэтай на „мужыцкай мове“. Пазнаёміўшыся з гэтымі „дзіўнымі“ новымі нацыяналістамі са складу рэдакцыі „Нашай Нівы“, якія ня толькі не аказвалі нянавісьці да чужых нацыяў, але — наадварот — чым болей чужая нацыя нацыянальна ўсьвядомлена, тым болей яе шанавалі, жыдоўскія журналісты пачалі ў новаадкрытым для сябе руху знаходзіць усё новыя Амэрыкі і цуды. Аказалася, што беларусы-інтэлігенты ня толькі цікавяцца старасьвецкімі памяткамі культуры сваёй нацыі, але і культурамі другіх нацыяў, якія жывуць на Беларусі.
У беларускім музэі газэты „Наша Ніва“ жыдоўскія журналісты ўбачылі цэлую калекцыю малюнкаў старасьвецкіх жыдоўскіх сынагог у беларускім будаўніцкім стылі, калекцыю сынагагальных ліхтароў і пасудзіны масенжовыя і сярэбраныя зь мяйсцовай арнамэнтыкай, калекцыю стылёвых ярмолак. Яны былі зьдзіўлены тым, як гэта беларусы ўмеюць усё „чужое шанаваць…“.
Пры бліжэйшым знаёмстве жыдоўскія журналісты пачулі ад беларусаў і дакоры, чаму не стараюцца даць адпор жыдоўскай асыміляцыі, чаму жыдоўская інтэлігенцыя саромеецца свайго імені, усяго роднага, чаму не цікавяцца сваёй этнаграфіяй, тутэйшым краем і г.д.
У 1913 годзе паказаўся ў жыдоўскім часопісе „Ды Юдышэ Вэлт“ у Вільні першы артыкул аб беларускім адраджэньні. Пасьля гэтага гурток жыдоўскіх „краёўцаў“ надумаў выдаваць жыдоўскую краёвую газэту „Унзер Гегенд“ (Наш Край), каб знаёміць шырокую жыдоўскую публіку з тутэйшым краем, а ў гэтым і зь беларускім рухам, зь беларускай літаратурай і г.д., але з розных прычынаў гэта ім не ўдалося. У 1914 годзе гэты самы гурток выдаў па-жыдоўску зборнік „Літва“, дзе былі пераклады зь беларускай і літоўскай літаратур і артыкулы аб беларускім руху.
Вельмі горача адгукнулася на гэты зборнік уся жыдоўская краёвая прэса і ставіла ў прыклад рвеньне беларусаў да адраджэньня сваёй нацыянальнай культуры жыдоўскім асымілятарам. Як мы ўжо потым даведаліся, то гэты зборнік „Літва“ нарабіў вялікага шуму ў Амэрыцы, паміж інтэлігентнымі жыдамі зь Беларусі.
Да друку быў прыгатаваны і другі зборнік „Літва“ зь перакладамі вершаў Я.Купалы, апавяданьняў М.Гарэцкага і г.д.,

але хутка, у часе вайны, расійскі ўрад забараніў друкаваць па-жыдоўску.
Пачалася наагул паласа чорнай рэакцыі ў нашым краі, — калі расійскі ваенны штаб не дазволіў у Менску і па-беларуску друкаваць.

* * *

У часе пераварота, калі беларусы ў Менску пачалі выступаць пад сваім уласным штандарам, то гарачэй усіх віталі іх жыды-нацыяналісты. У часе выбараў у меськую думу беларусы з жыдамі (нацыянальныя партыі) увайшлі ў кааліцыю і зрабілі адзін сьпіс кандыдатаў. А калі Ўсебеларускі Зьезд паказаў, што творыцца дзяржаўная сіла, у жыдоўскіх газэтах пачалі ўсё часьцей паказвацца артыкулы аб беларусах. Пасьля разгону бальшавікамі памянёнага зьезду, жыдоўскія нацыянальныя партыі апублікавалі свой пратэст супраць гэтага гвалту.
Нельга казаць, каб паміж тутэйшых жыдоў не было праціўнікаў беларускага руху, — ёсьць і досыць многа. Галоўным чынам выступаюць супраць тыя з партыйнай моладзі, інтэрнацыяналістаў, якія маюць летуценьні аб тым, што некалі ніякіх нацыяў ня будзе — усё пойдзе па Бэлямі.
Другі род праціўнікаў беларускай справы зь непартыйных жыдоў мае яшчэ арыгінальнейшы матыў: жыдоўская нацыя расьсеяна па ўсім сьвеце, на сваё няшчасьце, падзелена на жыдоў розных іншых нацыяў, павінна ведаць розныя мовы тых нацыяў, дзе яна жыве. І вось бяруць яшчэ тут нанова дзяліць жыдоў: на беларускіх, украінскіх і г.д.
Гэты „новы разьдзел жыдоў“ ёсьць для іх інтарэсаў мінус — гэта рацыя. Але занадта наіўная і эгаістычная, крытыкі тут ніякай быць ня можа…
Дзеля гэтае прычыны ў часе збораў на Беларускі нацыянальны фонд у мястэчку Даўгінаве (Віленскай г.) жыдоўская моладзь адмовілася прыняць учасьце ў зборах, бо яны — праціўнікі „новага разьдзелу жыдоў“…
Але проці жыцьця нічога не зрабілі, і ў беларускіх школах жыдоўскія вучні вучацца па-беларуску і робяць гэта ахвотна.

* * *

Што датычыць далейшых адносінаў жыдоўскіх сьвядомых сфэраў да беларусаў, то гісторыя іх так вышкаліла, што, на

жаль, па большасьці яны арыентуюцца толькі грубай сілай: чый верх — таго і праўда…
Гэта паказаў іх першы энтузіязм да беларусаў у Менску ў часе ўцёкаў бальшавізму. Потым — пачалося ківаньне з боку ў бок, трымаючы нос па ветры…
Першы пасьля ўцёку бальшавікоў Беларускі Сакратарыят зь Менску меў у сваім складзе двух жыдоў: Гутмана (без партфэля) і Белкінда — сакратара фінансаў…
Пры гэтым прыпамінаецца, што ў Беларуска-Літоўскім княстве высокую дзяржаўную пасаду займаў пярэхрыст (у тых часох няма чаго дзівіцца, што няхрышчаных не прымалі на гэткія службы) Абрам Юзэфовіч Рэбічковіч, каторы быў здольным адміністратарам і фінансавым агентам, а потым, пры Жыгімонту I, дайшоў да пасады падскарбія земскага, г.зн. міністра фінансаў, і члена Гаспадарскай Рады.
Яшчэ адзін выпадак: на першым сялянскім зьезьдзе ў Менску, скліканым Беларускім Нацыянальным Камітэтам 04.04.1917 г., дэлегатам ад Паўловіцкай воласьці Магілёўскай губ. і павету быў жыд Мордух Янкелеў Зільбэрман. Ён там сельскім старастам ужо 30 гадоў (ня хрышчаны).
Як далей пойдуць нашыя стасункі з жыдамі — тут не бярэмся судзіць. Ува ўсялякім выпадку жыцьцё гэтых дзьвюх нацыяў так цесна зьвязана, што кожная зь іх прымушана цікавіцца другой, ужо хаця б з эканамічнага пункту. Эканамічная струна — вельмі чулая і шчокатная рэч. Да гэтай рэчы, як-ніяк кожны прыкладваецца шчыра зацікаўленым вухам. Недалёкая будучыня нашага краю мае перад сабою пэрспэктыву розных сялянскіх каапэрацыяў[3] і гандлёвых рэформаў, што можа зусім іначай паставіць увесь лад гандлю ў нашым краі. Вось дзеля гэтага варта жыдом болей уважна задумвацца над доляй сваіх блізкіх суседзяў, зь якімі яны так зьвязаныя эканамічна.
Мы пэўны, што адносіны будуць у нас самыя прыязныя. Варункі новага жыцьця, грамадзянская воля і роўныя правы ўсім, бяз розьніцы веры і нацыяў, так загладзяць няроўнасьці і ў эканамічных стасунках, што пакрыўджаных ня будзе.

[3] У цяперашніх сялянскіх каапэратывах ёсьць жыдоўскія прыказчыкі. Жыдоў сяляне ахвотна бяруць у прыказчыкі дзеля іх гандлёвай здольнасьці і практычнасьці. Таксама ёсьць каапэратывы, дзе членамі і хаўрусьнікамі нароўне і сяляне, і

жыды.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

---

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

## Віталь Зайка
## Некалькі запозьненых і некалькі заўчасных думак пра гэбраяў і беларусоў

---

„На беларускай зямлі год з 700 таму ўпала насеньне з дому Ізраілевага і, дзякуючы талерантнасьці беларусоў, хутка зарунела і закаласілася самабытнай і разгалінаванай гэбрайскай культурай“, — так можна было б пачаць выклад майго апавяданьня пра гэбраяў і беларусоў. Гучыць занадта патасна, але ў істоце справядліва.

Для пачатку трохі фактаў — Беларусь мела найбольшую шчыльнасьць гэбрайскага насельніцтва ў сьвеце ящчэ на пачатку XX стагодзьдзя. У мястэчках гэбраяў было звычайна больш паловы, а ў некаторых зь іх, паводле афіцыйнага перапісу 1897 году, не-гэбраяў было пару чалавек з тысячы. Адпаведна, гэткая шчыльная гэбрайская маса ўсьведамляла сябе натуральнымі й арганічнымі насельнікамі краю, нягледзячы на рэлігійную рыторыку пра *голус* (выгнаньне). І сапраўды так. Аб’ектыўна гэбрай зрабіўся гэткім жа тыповым кампанэнтам беларускага краявіду, як балоты, каўтун, пан, прыгон ды што іншае. Можна спрачацца аб правамоцнасьці параўнаньняў, але гэбрай быў і ўжо назаўсёды застанецца атрыбутам гістарычнай, сёньня шмат у чым ідэалізаванай Беларусі. Зьнікненьне частак гэтай самай Беларусі азначае скурчваньне беларускай прасторы, разбурэньне беларускага топасу. Багна балатоў дала месца калгасным роўным прастакутам, курныя хаты — бэтонным шэрым блёкам. Гэбраі — насланцам зь Пензы ды Башкіріі. Усё гэта можа розьніцца ў

Віталь Зайка — незалежны дасьледчык, гэбраіст, беларусіст, жыве ў Нью-Ёрку. Ягоныя апошнія публікацыі — „Гэбрайскія мэмарыяльныя кнігі пра гарады і мястэчкі Беларусі (Запісы ВІНіМ, 24, 1999) і „Праблемы расейскай нацыянальнай сьвядомасьці на Беларусі канца XIX — пачатку XX стагодзьдзя“

спэктры адзнакаў, але ясна, што зьмены значаць адмову ад (Запісы БіНіМ, 23, 1999). Беларусі. Мадэрнізм, фігуральна кажучы, абудзіў Беларусь да гістарычнага існаваньня й амаль адначасна перарваны ім. Зрабіўшыся спрычыніўся да яе зьнікненьня. Гэбраі, як найбольш кансэрватыўная група, энкапсулявалі тое паветра, якім яны 19-20-гадавой даўніны, якое нідзе ўжо не адчуеш. Далёкае адлюстраваньне, як заблукалае сьвятло (прабач за нежыццёвы мэтафару) ад згаслай зоркі.

Запісы БіНіМ, 23, 1999. Зрабіўшыся БіНіМ“, Інтэрнэт: members.xoom.com/_XMCM/libel/zapisy.htm

„На беларускім полі вашы грудзі знайшлі дняваньне, страву і начлег“. „Пара, Гэбраі, паны ўсёга сьвету, сплаціці доўг, які вам Беларусь дала“. Так пісаў некалі Янка Купала. Ён пэўна задумваўся над лёсамі гэбраяў, супастаўляў зь лёсамі беларусоў. На пачатку XX стагодзьдзя матар'ялы пра беларусоў зьяўляліся на старонках гэбрайскіх пэрыёдыкаў — „Ідышэр вэлт“, „Фолксцайтунг“ ды іншых. Сёе-тое пра гэбраяў трапляла на старонкі „Нашай Нівы“. Вульф Сосенскі, Шмуэль Плаўнік, пераняўшыся беларускімі ідэямі, супрацоўнічалі ў беларускім друку, Антон Луцкевіч — у гэбрайскім. Шмуэль Нігер (Чарны) з сымпатыяй назіраў за разьвіцьцём беларускага нацыянальнага руху. Ластоўскі, напрыклад, быў захоплены фактам, што ў гэбраяў ёсьць адмысловая назва для Беларусі — Райсн. Можна таму сказаць, што на пачатку таго стагодзьдзя накрэсьліўся працэс, які мог бы плённа ўзбагаціць абедзьве грамады. Два традыцыйныя грамадзтвы пачалі патрохі адчыняцца для зьнешніх уплываў, зь цікаўнасьцю пазіраць у бок адзін аднаго. Узаемнае рамантычнае ідэалізаваньне праз прызму гістарычнай аўры Вялікага Княства. Зьявіліся першыя спробы навуковага падыходу да гісторыі й культуры сваіх народаў, і аказалася, што ў тэй гісторыі й культуры ёсьць месца таксама і для суседзяў.

Але агульныя сілы адштурхоўваньня былі значна мацнейшыя за сілы прыцягненьня. Варта адчыніць любы несавецкі зборнік прыказак і прымавак, і гэбраі паўстаюць там у вельмі непрэзэнтабэльным выглядзе — глядзі Федароўскага, Насовіча. Карскі адзначае, што гэбраі быццам былі цалкам чужым, варожым элемэнтам у Беларусі. Ня кажучы ўжо пра трываласьць міту пра „хрысьціянскую кроў на мацу“ і нават культ „умученного от жидов“ сьвятога — Гаўрылы Беластоцкага. Наўзаем — мянушкі кшталту „фоне-ганэв“

(Афонька-злодзей), стэрэатып мужыка як зламыснага п'яніцы з інтэлектам на ўзроўні зямлі, які чакае нагоды для пагрому. Пад час абуджэньня беларускай нацыянальнай сьвядомасьці бальшыня беларускіх гэбраяў не былі гатовыя ўспрыняць новага гульца на нацыянальна-палітычным полі. Захапіўшыся веліччу й развоем расейскай культуры, мала хто быў, нават сярод этнічных беларусаў, гатовы да развою культуры беларускай. Беларускія гэбраі, халоднага глузду, рацыянальныя літвакі, часта лічылі, што „зрабіць жыцьцё" ў царскай Расеі выпадае няйначай як авалодаўшы „навукай" гэтай Расеі, улучна з мовай і ўсім астатнім. Рэлігія як стрыжань застаецца, але рэшту, традыцыйныя адзёжы гэбрайскай культуры — трэ скінуць. Так і рабілі, і потым нават пад польскай адміністрацыяй яшчэ ў 1920-я гады, а то й пазьней, адукаваныя літвацкія сем'і былі расейскамоўнымі. Таму не выпадкова, што гэбраі-радныя муніцыпалітэтаў і мясцовых радаў самакіраваньня спрычыніліся да таго, што ідэя незалежнасьці Беларусі не знайшла неабходнай падтрымкі ў органах мясцовай улады ў 1917—1918 гг., што адпаведна абумовіла слабасьць і непапулярнасьць структураў БНР, нягледзячы на міністраў-гэбраяў, і г.д. Палітыка тады (як і цяпер, дарэчы) рабілася ў горадзе, ня ў вёсцы, а горад быў гэбрайска-расейскі з польскім дамешкам. Сьпіс беларускіх нацыяналістычных прэтэнзіяў да гэбраяў можна доўжыць гэбрайскімі камуністамі ды функцыянэрамі ў 1920-я і 1930-я гг. Пытаньне толькі, наколькі гэбраямі былі тыя людзі, а наколькі робатамі новай ідэалёгіі, якая нібыта адкідала нацыянальную „абмежаванасьць".

Прэтэнзіі могуць быць толькі ўзаемнымі — ад часоў Івана Жахнога і Налівайкі ды ажно да сёньняшняга дня. Беларускія месьцічы часам вельмі лёгка былі гатовыя гандляваць з ворагам жыцьцямі і лёсамі іхных гэбрайскіх суграмадзянаў. Пагромы — хоць і менш, чым на поўдні Расейскай імпэрыі, але яны былі — Гомель, Магілёў, Ворша, дзясяткі іншых месцаў. А партызанская куля ў патыліцу гэбраяў за падазрэньне ў вэрбоўцы праз гэстапа, за файны габардзінавы строй ці проста за сэмітычны бляск уваччу? А гэбрайскія куфры і шафы ў сялянскіх хатах, а гэбрайскія хаты, што аднаго дня або ночы сталі не-гэбрайскімі?

Толькі наўрад ці плённа лічыць крыўды і круціць імі перад

носам апанэнта. Каму, як не гэбраю зь Беларусі, блізкія нашыя краявіды, нашыя гарады і вёскі, нашая мова ўрэшце? Каму яшчэ на зямлі і ў сусьвеце? Не вялікаму ж брату на ўсходзе, у самым дзеле!

**(уяўнае інтэрвію сябе з сабою)**
*Я выходжу ў этэр, раздвойваюся на Віталя і Файтла.*
**Віталь:** Здароў! Вос махстэ? Ладна часу ня бачыліся. Дзе ты, як?
**Файтл:** За акіянам. Змагаюся за жыцьцё. Цяжкавата. Чужы сярод чужых, чужы сярод сваіх. Ты?
**В.:** Кісла. Лукашызм, сьмешны заробак, праблема зь лёгкімі — ужо й паліць кінуў. Якога гэбрая вінаваціць за гэта ўсё...
**Ф.:** Ну што ж, шукай! Дарэчы, з 110 тытунёвых фабрык у былой рысе аселасьці 83 належалі гэбраям[1]. Гарадзенская фабрыка Шарашэўскага! Адтуль жа „Арбіта“, „Гродна“, — сам купляў паўжыцьця...
**В.:** Во-во, праваронілі факцік пра фабрыкі ў „Праваслаўнай ініцыятыве“. Цяпер, пэўна, паліш „Дангіл“ ды „Мальбара“? Пра гэбрая я жартую, можа, нязграбна — выбачай. Хаця ваш брат пераважна падаўся адсюль.

**Ф.:** „Свабодны дух лунае дзе хоча“ — памятаеш дэвіз адной газэты? Будзем шчырыя — тут няма чаго лавіць, і ўжо даўно. Таму людзі і павыяжджалі.
**В.:** О-го. Цябе паслухаць, дык тут няма што лавіць ажно з 1388 году.
**Ф.:** Ты б пажыў, каб кожны дзень нейкае фуфло мімаходзь не нагадала табе пра сэмітычныя рысы твару, або што дзеля такіх жыдкоў, як я, — „нармальным“ людзям дыхаць займае. У інстытуце абараніўся — кругом шыпяць: „Жыдава выцягнула свайго“. А гэбрай-начальнік усё зрабіў, каб патаіць. Каб не ўпікалі, што „свайго“ прытуліў. А брацішак-вадзіла просты!? Цукар у бэнзабаку, парэзаныя шлянгі, найпаскудныя маршруты — і так з тыдня ў тыдзень, з году ў год!

**Мадэратар** *(з моцным скачучым маскоўскім акцэнтам)*: Ціха, ціха!! *(У мікрафон.)* Нагадаем слухачам пра сяброўства абодвух народаў, пра Зьмітрака Бядулю.
**В.:** Во-во, Бядуля. Я беларусам стаў зь „Пяці лыжак заціркі“.

Сур’ёзна. За сваю беларускасьць мушу падзякаваць гэбраю.
**Ф.:** Ня маж сыропам. Я беларусам нарадзіўся. Бацька казаў: будзем беларусы, тут мы нарадзіліся, тут наш дом. Змушаў чытаць беларускага пісьменьніка Караленку. Пасьля выйшла, што ён не беларускі, а проста ў перакладзе.

**В.:** А скажы мне, Файтл, прымерна, як ты стаў гэбраем? У разе есьлі ты ім стаў.
**Ф.:** Прымерна як выпісалі мэтрыку. Там нацыянальнасьць бацькоў. А калі шчыра — у школе зрабілі. Нехта ў клясным журнале ўгледзеў імёны бацькоў. Ну й пайшлі каціныя канцэрты на пару гадоў — сам ведаеш.

**Мадэратар:** Памятаем пра культурнае ўзаемадзеяньне, пра пераклады гэбраямі Бібліі на старабеларускую мову. Дарэчы, ці ведаў Скарына гэбрайскую мову?
**В.:** Ясная рэч!
**Ф.:** Ясная рэч пакуль такая: Скарына ведаў, што гэбрайская мова існуе. Ня выключана, што ў часы Скарыны значная частка беларускага гэбрайства была беларускамоўная, і таму пераклады біблійных тэкстаў, як, прыкладам, славутыя манускрыпты 109, 262 у былой Віленскай публічнай бібліятэцы, былі зробленыя гэбраямі не для асьветы беларусоў, альбо каб навярнуць іх у юдаізм, а дзеля сваіх паўасымільваных адзінаверцаў. Дарэчы, шэраг навукоўцаў прызнае, што пытаньне юдаізантаў („гэбрайствуючых“) было штучна зьлепленае маскоўскімі клерыкальнымі й прыдворнымі коламі, каб пароць вочы Літве, вінаваціць у скажэньні веры й ідэалягічнай дывэрсіі. Мець падставы прыйсьці й абараніць „чысьціню веры“.
**В.:** А як жа рэальныя асобы кшталту гэбрая Зхарыі ў Маскве, што вёў протасыянісцкую, так бы мовіць, прапаганду?

**Мадэратар:** Перапрашаю, паступаюць званкі слухачоў, што інтэрвію прымае занадта спэцыяльна-навуковыя рысы. Папулярней, калі ласка. *(У мікрафон.)* Як наконт паходжаньня першых гэбраяў на беларускіх землях — з захаду ці з усходу?
**В.:** З усходу — з Хазарскага каганату. Нават князь Уладзімер Ясна-Сонейка быў каганам. Але не аб тое. Проста каганат быў

найбліжэйшым кампактным масівам юдаістаў. І чыста статыстычна верагоднасьць пранікненьня юдаістаў адтуль (назавем іх гэбраямі) значна большая, чымся з заходнеэўрапейскіх земляў, проста таму што гэта на тысячу кілямэтраў далей.

**Ф.:** Я не магу катэгарычна сказаць — усход, захад. Магло быць зь Бізантыі, праз Балканы. Гэта захад ці ўсход? Наагул, зашмальцавана ўжо гэтая дыхатомія: „Беларусь паміж усходам і захадам“, „Беларусь — мост з усходу на захад“. Мост ёсьць, руху няма. Далей. Засяленьне магло быць з захаду — Польшча, Чэхія. Тэадор Нарбут піша, спасылаючыся на Ратундуса, што ўжо ў 1150-м годзе ў Панямоньні была ладная гэбрайская грамада. Заўваж — не ў Прыдняпроўі.

**В.:** Нарбут быў добрым байкапісцам. А ладная грамада магла б і пакінуць нейкія больш сур’ёзныя згадкі аб сабе, і прытым у гэбрайскіх крыніцах — а гэтага няма. Затое ў сярэднявечных крыніцах ёсьць паведамленьні пра гэбрайскіх купцоў, званых *раданітамі*, якія гандлявалі пераважна нявольнікамі, і пераважна славянамі. Ці не адтуль ідзе моцнае падабенства словаў „славянін“ і „нявольнік, раб“ у эўрапейскіх мовах. І ці не адтуль карані антысэміцкіх мітаў аб гэбрайскім рабаўласьніцтве, аб паняволеньні чалавецтва гэбраямі? У кожным разе для мяне асабіста блізкасьць словаў „раб“ і „славянін“ дадае імпэту лічыць сябе балтам — дняпроўскім, прыпяцкім — абы не славянінам. Тым больш як у расейскім (і афіцыйным эр-бэшным) разуменьні славянства — расейцы плюс украінска-сэрбска-беларускія прыдаткі. Сэмантычная блізкасьсц рабства з славянствам робіцца яшчэ мацнейшай. Але назад да тэмы. Раданіты былі ўва Ўсходняй Эўропе ўжо ў IX—X стагодзьдзях, зьяўляліся часткай пэўнага гэбрайскага масіву, гандлявалі нявольнікамі, нявольнікі былі пераважна славяне. Спалучэньне гэтых фактаў робіць, на маю думку, Паўночнае Чарнамор’е, Хазарыю найбольш верагоднай прарадзімай беларускага гэбрайства.

**Ф.:** Зноў жа, я ня бачу сэнсу станоўка цьвердзіць, што гэбраі прыйшлі адтуль, а не адгэтуль, бо, магчыма, яны прыйшлі зь некалькіх кірункаў. Дарэчы, занатуй сабе ў сваю тэорыю — грамата Вітаўта гарадзенскай грамадзе паказвае, што гэта магла быць гандлёва-земляробчая грамада, а ня чыста гандлёвая, накшталт берасьцейскай. А земляробства сярод

ашкенаскіх гэбраяў у XIV стагодзьдзі — рэч зусім нечуваная, ergo — яны былі не ашкеназы. І яшчэ. Пасьля выгнаньня гэбраяў зь Літвы ў 1495 г., куды яны пераважна падаліся? Правільна, на поўдзень, у Крым — г.зн. туды, дзе мелі больш кантактаў і, напэўна, адкуль прыйшлі.

**Мадэратар:** Ці ж гэта ўсё ня частка беларускай гісторыі, цудоўнай і дасюль амаль не дасьледаванай? Паралельнае вымярэньне, як пісаў адзін выбітны культуроляг. *(Не ў мікрафон.)* Асьцярожней з славянскімі тэмамі. Званілі рознага кшталту апанэнты балцкай тэорыі, абяцалі праблемы — ад фізычнага ўзьдзеяньня да паўторнай перарэгістрацыі праграмы. Сканцэнтруемся на гэбраях.
**Ф.:** Сканцэнтруемся. Дык вось, у часы Вялікага Княства гэбраі адзін час мелі роўныя правы са шляхтай. А Шаўл Валь, Міхель Юзафовіч! Але і тады ня ўсё было проста і ясна. Наконт паралельнага вымярэньня — вельмі слушна, тэрыторыя-мова-ўрад-звычаі — усё гэта мелі беларускія гэбраі, званыя літвакамі (пэўна, таму, што іхны арэал збольшага супадаў з постлюблінскім Вялікім Княствам). Дарэчы, літвакі жылі пераважна ў межах беларускамоўнай тэрыторыі, амаль паводле Карскага — глядзі мапу беларускіх гаворак 1903 г.[2]
**В.:** Зразумела, што Беларусь была найбольш талерантным краем у сьвеце ў дачыненьні да гэбраяў. Менавіта тут споўніўся ідэал для вывучэньня Торы — бясьпека і спрыяльныя сацыяльна-эканамічныя ўмовы. І ня дзіва, што тут паўстала столькі інтэлектуальных рухаў і выгадавалася столькі рабінаў. Мысьляроў ды інтэлектуалаў кожнага кшталту (чытайце гісторыка Іофэ — пра Беларусь як айчыну гэбрайскіх сланоў).
**Ф.:** Найбольш талерантны край — так правамоцна казаць, калі ёсьць сьведамы выбар. Пра Нідэрлянды XVI стагодзьдзя, напрыклад, альбо сярэднявечную Андалюсію. Але ці былі б талерантнымі беларусы, каб ім павятовы маршалак, абшарнік, судзьдзя, ксёндз, станавы прыстаў, ды шчэ хто, далі свабодны выбар — біць гэбрая або талераваць? Невядома, як было б. Некаторыя прыкметы паказваюць на тое, што ня выключаны паўднёвы, пагромны, варыянт.

**Мадэратар:** Зьехалі ў мінор. *(У мікрафон.)* А што б такое пра беларускіх гэбраяў вы б нам узгадалі, каб можна было сказаць

„вось гэта — куул, мэн!“
**В.:** Мне падабаецца беларускае „ці“ ў мове ідыш, „годэвен“ — гадаваць. „Гораднэ“ — Горадня, „Наварадэк“ — Навагрудак. Дарэчы, тапонімы запазычаныя даўно, і гэта файны аргумант для адзысканьня іхнай сапраўдна-беларускай вэрсіі. Трэ глянуць у старых пінкасах — там можа быць і „Менск“ адшукаецца. А ўвогуле мне ўсё „куул“ — гэбрайская цывілізацыя ў Беларусі для мяне ўсё роўна як адшукаць блізкага крэўнага, брата, якога ніколі ня ведаў, а ён жыў сабе недзе побач і быў у курсе справаў сям’і.
**Ф.:** Беларускі гэбрай, літвак — сапраўдны „мачо-мэн“, стрыманы, несэнтымэтальны, упэўнены ў сваіх сілах, ці, хутчэй, ведах (Тальмуду). Калі больш сур’ёзна — мне падабаецца, што нашыя гэбраі, апынуўшыся ў Амэрыцы, закладалі ня розныя там таварыствы імя Пушкіна й клюбы імя Горкага, як іхныя землякі-беларусы, а, напрыклад, Валожынскую братэрскую асацыяцыю, Дабрачыннае задзіночаньне мужоў з Койданава, Бабруйскі зьвяз узаемадапамогі — так званыя ланцманшафты, зямляцкія арганізацыі[3]. А было іх сотні, сяньня дакладна наўрад ці даведаешся.
**В.:** Мне яшчэ літары падабаюцца — чорныя, прастакутныя, таямнічыя. Вось каб імі ды па-беларуску пісаць! Кірылка беларуская ёсьць, лацінка ёсьць, арабскімі літарамі таксама ёсьць. Хай і гэбрайскімі будзе!

**Мадэратар:** *(Не ў мікрафон.)* Вашаць, пэўна, ачмурэў.
**Ф.:** Было ўжо, пісалі. Глядзі З.Бядулю, „Рукапіс чарнакніжніка XVIII стагодзьдзя“[4]. Дарэчы, я таксама пісаў па-беларуску гэбрайскімі літарамі. Вёў дзёньнік, „бартавы журнал“. Найцяжэй было з гукам „ы“ — ніяк не складалася норма. Адзін раз так напішу, другі гэтак. Гуляў я тады ў сыянізм. Ладзілі сходы на кватэрах, вывучалі іўрыт, рабілі дэманстрацыі каля „Ямы“ на Мельнікайтэ. А потым завіталі да мяне з вобыскам трое ў цывільным, адзін, дарэчы, як сёньня памятаю — дужа да Пуціна падобны. Такое ж незапамінальнае „обшчае выражэньне ліца“. „А ністэ цурэ“. Дык вось, прыхапілі сярод іншага мой дзёньнік, кажуць — пачытай нам, што там. Я ім: не імеіця права. Усьміхнуліся ветліва й аддалі нейкаму экспэрту, а той заміж каб паспрабаваць разблытаць мае фаналягічныя экзэрсысы — напісаў свой раман. Выклікалі мяне — на чытку.

Далоні мокнуць, хвалююся. А як узяўся чытаць — рагачу, не магу спыніцца. Ня мой, кажу, дзёньнік. Рызыкаваць яны ня сталі, пачалі ламаць на стукача. Ня выйшла — прыкрылі ціха справу. Так гэтыя літаркі мяне ўратавалі!

Пара падсумоўваць. Вашыя апошнія словы на беларуска-гэбрайскую тэму, калі ласка.

Мадэратар:
**Ф.:** 1930 год. Ідзе вучэбная часіна (па-расейску — урок) у менскай гэбрайскай пралетарскай школе №1. Настаўнік пытаецца: „Дзеці, якая векапомная падзея адбылася ў 1799 г.?“
— Памёр віленскі гаоні.
— Сьціхні! Што тут за рэлігійная прапаганда!?.. Дзеці, у 1799 годзе нарадзіўся наш вялікі паэт Пушкін! А якая падзея адбылася ў 1812 годзе?
— У нашага Пушкіна было бар-міцве[5]!

**Мадэратар:** *(Пачырванеў, сплюнуў на падлогу.)*
**В.:** Праўда — найлепшая глеба для разьвіцьця адносінаў. Сёньня наўрад ці абодва бакі гатовыя працягнуць рукі і сказаць адзін аднаму — прабачаем і просім аб прабачэньні. Але ўсё ж, у будучыні гэта быў бы файны крок. Мы не сваты і не браты. Проста людзі. Вось як людзі і давай трактаваць адзін аднаго.

**Мадэратар:** Ура! Ваш час выйшаў, да новых сустрэч.
За гэта кароткае сама-інтэрвію я не пасьпеў сказаць галоўнага. Цудоўная каляровая экзатычная птушка заляцела калісьці пад нашу беларускую шэрую страху. Яна прамаўляла штосьці сваё, а мы, беларускія людзі, кідалі ў яе каменьнем. Гэтая птушка даўно ўжо паляцела прэч, і толькі цяпер здолелі разабраць ейныя словы. Птушка гэтая, як вы пэўна здагадаліся, — гэбрайская культура. Яна яшчэ абавязкова вернецца, забыўшыся на старыя крыўды, каб дапамагчы беларусам дывэрсыфікаваць сваю культуру, пераадолець гравітацыю

магутнай расейскай культуры, увесьці ў культурны зварот новыя імёны й канцэпты.

[1] Encyclopaedia Judaica, Vol.14. Jerusalem, 1971, p.456
[2] Я.Карскі. К вопросу об этнографической карте белорусского племени. ИОРЯС, т.VII, 1902, ст.219-234. Яго ж Белорусы. Т.1 Введение в изучение… С приложением двух карт. Варшава, 1903. 466 ст. Урыэль Вайнрайх. Геаграфічны лад беларускага ідыш// Форум. Інфармацыйна-культурны бюлетэнь. №4, 1996, ст.ст.24-37.
[3] Hannah Kliger. Jewish Hometown Associations and Family Circles in New York. Bloomington, 1992, pp.76-78
[4] Зьмітрок Бядуля. Рукапіс чарнакніжніка XVIII веку. „Вольны сьцяг“, Менск, 1921, №5, ст.ст.33-35.
[5] Бар-міцве — габр. „муж абавязкаў“, назва для хлопчыка, старэйшага за 13 гадоў.
[Ізраіль Басаў.
Сур'ёзная размова.]

[image]
[image]

**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

[image]


# Ігар Марзалюк
# Хрысціяне і габрэі Вялікага Княства Літоўскага

**Негатыўныя стэрэатыпы і здабыткі суіснавання**

Беларусы і габрэі... Нашае знаёмства і супольнае жыццё пачалося ў сярэднявеччы. У гэты час і сфармаваліся асновы нашых уяўленняў пра іх, дзяцей Сіёну, так не падобных да нашых продкаў мовай, адзеннем, рэлігіяй.

У беларускай гістарыяграфіі настойліва праводзіцца думка аб традыцыйнай талерантнасці беларусаў і ледзь не поўнай адсутнасці праяваў антысемітызму на нашых землях як у сярэднявеччы, гэтак і ў пазнейшыя эпохі. На жаль, падобныя ідэалізатарскія ўяўленні не зусім дакладна адлюстроўваюць рэаліі мінулага і грунтуюцца на досыць адвольнай выбарцы крыніц.

У сучаснай еўрапейскай гістарыяграфіі даволі грунтоўна і падрабязна вывучаны пытанні, звязаныя з праблемай узнікнення хрысціянскага антысемітызму; падкрэсліваецца той факт, што ён быў неад'емным элементам ментальнасці ўсіх хрысціянскіх народаў у эпоху сярэднявечча. Антысемітызм хрысціянскіх народаў меў розныя прычыны. Адной з галоўных з'яўлялася анахранічнае ўяўленне аб прыродзе чалавека. Лічылася, што ўсе людзі ва ўсіх пакаленнях нясуць адказнасць за першародны грэх, здзейснены Адамам і Евай, таксама як усе габрэі вінаватыя ва ўкрыжаванні Хрыста. Гэтыя падзеі ў разуменні сярэднявечнага чалавека не належалі толькі мінуламу, але вечна адбываліся і доўжыліся ў моманце.

**Ігар Марзалюк** — гісторык, дацэнт Магілёўскага універсытэту, дасьледнік гісторыі Магілева, аўтар кнігі „Магілёў у XII—XVIII стагоддзях: людзі і рэчы“ („Веды“, 1998), суаўтар двойчы перавыдадзенай кнігі „Магілёўская даўніна ў пытаннях і адказах“ („Магілёўская абласная друкарня“, 1997). Знаходзіць са

кожнага дня. Нянавісць хрысціян да габрэяў — гэта нянавісць не да нашчадкаў забойцаў Хрыста, а да саміх забойцаў, праклятых і адрынутых за гэта Богам [4, с.118]. Менавіта таму, згодна з сярэднявечнай антысеміцкай канцэпцыяй, „жыд“ разглядаўся ледзьве не як уцелаўлёны д’ябал, папярэднік антыхрыста, самы верны і адданы служка Апраметнай. Чорт заўсёды побач з габрэямі, таму тыя валодаюць незвычайнымі магічнымі здольнасцямі, амаль усе яны чараўнікі. У хрысціянскай сярэднявечнай дактрыне існавала ўстойлівае перакананне, быццам габрэі таемна даўно прызналі той факт, што Хрыстос быў Богам, прызналі ісцінай хрысціянскую дактрыну, але, як служкі Люцыпара, яны робяць усё магчымае, каб зняважыць веру Хрыстову і тых, хто яе спавядае. Менавіта для гэтага габрэі здзяйсняюць рытуальныя забойствы хрысціян і зневажаюць госцію. Лічылася, што, нібыта, дзякуючы гэтаму яны атрымліваюць дадатковую дапамогу ад д’ябла і здольныя ў любы час выклікаць нячыстую сілу [25].

Наколькі падобныя ўяўленні ды стэрэатыпы былі распаўсюджаны на беларускіх землях? Каб адказаць, трэба прааналізаваць факты, якія дазваляюць меркаваць пра распаўсюджанасць таго ці іншага элементу антысеміцкага стэрэатыпнага комплексу на нашых землях.

**Габрэі — хрыстапрадаўцы, праклятыя Богам народ, юдаізм — д’ябальская дактрына і ерась**

Антытэза „юдаізм—хрысціянства“, як адзначалася даследчыкамі, прысутнічае ўжо ў „Слове аб Законе і Благадаці“ кіеўскага мітрапаліта Іларыёна (XI ст). У „Аповесці мінулых гадоў“ падкрэсліваецца, што адным з найважнейшых аргументаў адмовы кіеўскага князя Уладзімера Хрысціцеля выбраць у якасці веры для Кіеўскай Русі юдаізм было праклятае юдэяў Богам [22, с.61]. Для Кірылы Тураўскага, як вынікае з яго „Слова аб сляпцу і аб завісці жыдоў“, паняцці „жыд“ і „бес“ практычна сінанімічныя. Іх вера і звычаі — не што іншае, як „юдэйскае злабесаванне“, а дактрына юдаізму — гэта просты шлях да пекла, бо закон Майсея „ўсіх аддасць пад грэх“ [13, с.176, 354—355, 359].

Падобныя ўяўленні былі шырока распаўсюджаны, прынамсі, у асяроддзі духавенства і інтэлектуальнай эліты, і ў XVI—XVII стагоддзях. Францішак Скарына пісаў аб „Зласлівым навеце

няверных жыдоў ежэ савешчашася на сына Божыя прэдаці яго без віны на распяцце“ [21, с.3]. Пра распаўсюджанасць негатыўнага стаўлення да юдэяў сведчыць і наступны прыклад. У 1539 годзе вялікакняскай уладай у ВКЛ быў ініцыяваны росшук „жыдоўствуючых“. Аднак пры выкананні гэтага загаду ва ўсім Вялікім Княстве пачаліся рэпрэсіі з боку мясцовых урадоўцаў і пасланых князем шляхціцаў не столькі супраць вераадступнікаў, як супраць „прыродных жыдоў“. Спатрэбіўся адмысловы каралеўскі прывілей, каб утаймаваць няўрымслівых прадстаўнікоў вялікакняскай адміністрацыі, „прыказуючы, абы ані вездзе, па замком і местом і дваром Нашым, оных жыдоў, прыражэньцаў тамашніх і прыходжых людзей, каторыі здаўна ў жыдоўстве се нарадзілі і цяпер закон свой стары жыдоўскі дзержаць, а аб тых людзей, каторыі бы з веры хрэсціянскае к закону жыдоўскаму прыступілі, нічога не ведаюць і ў сябе іх не пераховываюць, бязвінне не імалі і нікаторага бясправія і труднасці ім не чынілі“ [19, с.228].

Разгорнутае абгрунтаванне дактрыны аб праклятці юдэяў Богам было дадзена ў палемічным трактаце „Асобае мавене да жыдоў пад кароткімі словы ад усіх прарокаў а Хрысце; Помач да Ервана“, які быў створаны ў 1580 годзе ў Супрасльскім манастыры: „Слышы што рэчэ Малахія прарок: так глаголець Гасподзь: ужэ несць мі хаценія ў вас. Чуй і што ніжэй а нас язычніцэх мовіць, лепшае уфаніе маець у нас хрысціянех, ніжэ ў вас — панежэ рэчэ, ат васток і запад праславіцца імя маё ва языцэх... Той жэ Малахія рэчэ: така глаголець Гасподзь: паслю на вас клятву, і праклену вы, і благаславенія ваша разару, і не будзець ва вас благаславенія. Чуеш лі жыдавіне, якое цяпер у вас благаславенства? Гдзе святая святых, гдзе кадзіла, гдзе кіот, гдзе ручка, гдзе скрыжалі, гдзе ўсесажыжэнія?... Табе не вольна на чужой зямле празнаваці“. У гэтым творы ўвогуле адмаўляецца тэза аб богаабранасці габрэйскага народу, нават у старазапаветныя часы: „Усем вашэ жыдоўскае слова, іж ся вы хваліце паведаючы быці семя Сімава. Інася ў том табе нічым хваліці. Така Ной рэк сыну свайму Сіму: Благаславен Бог Сімаў. Бачышы лі жыдзе, іж благаславен Бог, а не вы, вам у там нішто жэ несць. А а нас языцэх така рэчана быці: да распрастраніць Бог Афета, да ўселіцца ў сёла Сімава. Віждзь жыдавіне, мы сыны Афетавы ўселіхамся ў сёла ваша“ [8, с.423]. Падобныя прыклады можна было б доўжыць і доўжыць. Як паказаў у свой

час акадэмік Я.Карскі, творы, скіраваныя супраць „жыдоў і жыдоўствуючых“, займалі значнае месца ў беларускіх зборніках XVI—XVII стагодзьдзяў [7, с.153—154].
На беларускіх землях у першай палове XVII стагоддзя быў добра вядомы сатырычны „Дышкурс жыдавіна з скамарохам“, дзе хрысціянін-скамарох паказваўся пераможцам „жыдоўскага філозафа“ у спрэчцы аб тым, чыя вера лепшая [8, с.558—561]. Цікава, што ў беларускім фальклоры існавала ўяўленне аб „Божай“ птушцы-ластаўцы, якая, згодна з паданнем, калі ўкрыжоўвалі Хрыста, скрала цвікі ў яго забойцаў-“жыдоў“ [16, с.76]. Ёй супрацьстаяла „жыдоўская“ птушка — верабей. „Віна“ вераб’я палягала ў тым, што ён „здзекваўся“ з укрыжаванага Збаўцы, памнажаў яго пакуты на крыжы. Менавіта таму вераб’я ў прастамоўі называлі „жыдам“. Гэта назва да сённяшняга дня ўжываецца ў Магілёўскім Падняпроўі. Не менш цікавае і беларускае паданне „Адкуль свінні?“. Паводле яго, пад час Крыжовага шляху адна з габрэек вельмі моцна біла і кляла Хрыста. За гэта яна была перавернута Богам у свінню [16, с.76].

**Габрэі — чараўнікі ды забойцы хрысціян**
Вера ў чарадзейства, у здзяйсненне юдэямі пэўных магічных рытуалаў, якія могуць прынесці шкоду добраму хрысціяніну, была вельмі ўстойлівай у насельніцтва беларускіх земляў у XVI—XVII стагоддзях. Трэба агаварыцца, што хрысціянскі антысемітызм быў у той час антысемітызмам менавіта канфесійным. Згодна з тагачаснымі ўяўленнямі, змена веры аўтаматычна прыводзіла і да змены стаўлення да габрэя. Жаданне габрэя прыняць хрысціянства разглядалася як яшчэ адно вялікае сведчанне праўдзівасці вучэння Хрыста, яшчэ адна вялікая перамога над д’яблам і фальшывай жыдоўскай верай. Паказальнай у сувязі з гэтым з’яўляецца стэрэатыпная фраза, з якой звычайна пачыналіся набілітацыйныя каралеўскія прывілеі габрэям-пярэхрыстам. Прывілей Жыгімонта Аўгуста ад 20 лютага 1565 году былому юдэю Ляўку Данавічу, а на той момант ужо рыма-каталіку Станіславу, пачынаўся наступнымі словамі: „...умысліў і пастанавіў сабе (Станіслаў), на сэрцу сваём, і на іншы час таго неадкладаючы, хвальшывае набажэнства і веру сваю жыдоўскую, у каторай ад продкаў сваіх нарадзіў і выхаваў, спусціці, а на тое местца праўдзівую

веру і набажэнства хрысціянскае прыняці“ [20, с.135].
Менавіта з гэтай прычыны астатнія габрэі, якія застаюцца пры сваім „памылковым“, „д’яблавым“ рэлігійным веравызнанні, імкнуцца зрабіць усё магчымае, каб нашкодзіць неафіту за яго адмову ад „д’ябальшчыны“. Вельмі паказальнае ў сувязі з гэтым змешчанае ў Баркулабаўскім летапісе апісанне габрэйкі „іменем Сцірка“, што пажадала прыняць хрышчэнне ў 1599 годзе. Яе маці, не жадаючы гэтага, паводле словаў летапісца, пачала насылаць чары на сваю дачку: „Яка ж некаторыя мяшчане відзелі многае чараванне онае Мар’ямкі, што ана паганскімі чарамі ягіпецкімі дачцэ сваёй чыніла. Яка была везена да іх міласцей князей да Буйніч, оная Мар’ямка, улезшы ў лазню студзёную, галаву адкрыўшы, валасы распусціўшы, печку размятала, чароўныя паганскія слава гаварыла, праклінала, абема рукамі назад ківала, ногі свае вязала, інога многа зла, паганства тварыла, праклінала, абы жыва не была“ [2, с.201].
Вельмі шырока была распаўсюджана вера ў рытуальныя забойствы юдэямі хрысціян. Ужо ў Кіева-Пячорскім Пацерыку, надзвычай папулярным творы не толькі на тэрыторыі сучаснай Украіны, але і Беларусі, змешчана апісанне пакутніцкай смерці блажэннага Яўстафія Посніка, які нібыта стаў ахвярай рытуальнага юдэйскага забойства. Габрэй „сяго блажэннага прыгваздзіша к крэсту... Жыдовін узем копіе, прабодзе яго, і так прадасць душу сваю Госпадзеві“. Здзекі над пакутнікам-манахам у дадзеным выпадку паўтараюць пакуты Хрыста — яго ўкрыжоўваюць і працінаюць дзідай.
У 1540 годзе з лёгкай рукі аднаго польскага габрэя-неафіта юдэі Вялікага княства Літоўскага былі абвінавачаныя ў тым, што яны збіраліся з усёй сваёй маёмасцю і скрадзенымі хрысціянскімі дзецьмі, навернутымі імі да жыдоўства, уцячы ў Турцыю. Акрамя гэтага, сцвярджалася, што яны мноства хрысціянскіх дзяцей па розных местах Княства „на смерць пабілі“. Спатрэбілася прамое ўмяшальніцтва караля і адмысловы прывілей для таго, каб адвесці ад іх гэткія закіды [19, с.241—242].
Дакументы дазваляюць меркаваць аб тым, як сабе ўяўлялі рытуальнае забойства хрысціянскага дзіцяці „...памянёныя Расошскія мяшчане“, якія абвінавацілі ў гэтым злачынстве ў 1566 годзе некалькіх юдэяў: „тот Нахім з Рабеем, другім

жыдам, у ночы тое дзіця зарэзалі… А па зарэзанню лупілі і сэрца, выняўшы, лізалі“. І зноў спатрэбілася непасрэднае ўмяшальніцтва караля, каб уратаваць габрэяў ад абвінавачанняў і смерці [20, с.169—174].

У Магілёве ў 1639 годзе сын горкай п’яніцы Доні Іванаўны, якая памерла ад перапою, пахаваў яе патаемна, без выканання царкоўнага рытуалу і паведамлення астатнім родзічам. Брат жанчыны адразу ж абвінаваціў у яе забойстве габрэйку Лею Езафову, у якой нябожчыца служыла. Аднак лёс абвінавачанай быў шчаслівым. Пасля апытання сведкаў факт смерці ад перапою быў прызнаны магістратам [6, с.371—373]. У магілёўскай хроніцы Трафіма Сурты і Трубніцкіх прыводзяцца апісанні рытуальных забойстваў юдэямі хрысціян-магілёўцаў. Напрыклад, Трафім Сурта апісвае падзею, што нібыта мела месца ў 1696 годзе, калі „…смярдзючыя жыды-магілёўцы на чале са сваім пэйсахам Азікам Габрыяловічам, жонка якога некалі нарадзіла пачвару, угаварылі пазументніцу Алону і завялі яе, як бы на гандаль, у свой дом, дзе яе замардавалі і грудзі абадралі, нажамі ў некалькіх месцах глыбока пакалолі і пад фарны касцёл, у пусты дамок, як бы не імі замардаваную падкінулі“ [2, с.309].

Наколькі распаўсюджаная была ў Беларусі вера ў рытуальныя забойствы хрысціян юдэямі, сведчыць і факт ушанавання да сённяшняга дня праваслаўнай царквой Беларусі як святога пакутніка немаўляці Гаўрылу Беластоцкага (Заблудаўскага). Ён нарадзіўся ў 1684 годзе ў вёсцы Звяркі Гарадзенскага павету, а ў 1694 годзе нібыта быў скрадзены ў бацькоў габрэям-арандатарам, завезены ў Беласток, дзе і прыняў пакутніцкую смерць ад рук юдэяў [14, с.10]. Не менш красамоўна аб укаранёнасці гэтага стэрэатыпу сведчыць і беларуская дзіцячая гульня „Ў жыда“, распаўсюджаная на Магілёўшчыне ў XIX і пачатку XX стагоддзяў: „На каго скажуць „выйдзі вон“, тэй і стане за жыда. Усі бягуць ат яго, а ён ганяіцца і ловя, і каго паймая, дык таму рэжыць *рукою па горлу* (курсіў наш. — І.М.) і яму трэба станавіцца жыдам“ [15, с.93].

Акрамя гэтага існавалі, паводле глыбокіх пераканаанняў хрысціян, таксама і іншыя спосабы блюзнерства „няверных жыдоў“ над Хрыстовай верай. На тэрыторыі Беларусі і Украіны ў XVI—XVII стагоддзях шырока была распаўсюджаная вера ў тое, што ў габрэйскіх мяснікоў-рэзнікаў ні ў якім разе добры

хрысціянін не павінен набываць мяса. Лічылася, што габрэі апаганьваюць тушы жывёлаў, абразаючы іх перад продажам, і гэтак апасродкавана ўводзяць хрысціян у грэх, наводзяць на іх чары. Паказальна, што ў статуце магілёўскіх рэзнікаў (мяснікоў) зафіксавана забарона набываць і прадаваць купленае ў габрэяў мяса свойскай жывёлы: „браце наша рэзніцы, так мескія і замковыя, у крамах мяса жыдоўскага прадаваці не маюць, а кгды бы з нас каторы колвек то мяса прадаваў, або бы і ў каморах дзяржаў і прадаваў і ўтом бы каго перасвечанага было, тэды без жаднае віны такавога ўрад мескі магілёўскі і з тым мясам за места выправадзіці маець; а еслі бы тэж каторы колвек рэзнік замкавы хацеў бы тым се бавіці і тое мяса прадаваці, тэды меж брацею нашаю ў раду на лаўках стаяці не маець, але стаяці сабе маець праціўка жыдавы, гдзе і жыдава, рэзніцы становічэсе з мясам жыдоўскім, прадаюць“ [5, с.373]. Аб тым, што гэтая і падобныя забароны былі абумоўлены менавіта антысеміцкай хрысціянскай дактрынай, недвухсэнсоўна сведчыць пастанова Кіеўскага праваслаўнага сабору 1640 году: „…читали правила, чтобы Руския кухарки не служили жидам, и чтобы Русь не покупала мяса у жидов, которые, обрезав и осквернив его, продают христианам“ [17, сс.34, 36].

**Габрэй — эканамічны шкоднік, разбуральнік дабрабыту і крымінальны злачынца**

Паколькі лічылася, што для юдэя галоўны сэнс жыцця — здзек з хрысціянства, то і ягоныя дзеянні ў будзённым жыцці скіраваныя на разбурэнне хрысціянскага дабрабыту, на давядзенне да жабрацтва і галечы хрысціян.

Найбольш разгорнута падобная характарыстыка габрэйства выкладзена Міхалонам Літвінам у трактаце „Аб норавах татар, літоўцаў і масквічян“ (XVI ст.). „У гэтую краіну сабраўся адусюль… народ крывадушны, хітры, шкодны, каторы псуе нашыя тавары, падрабляе грошы, подпісы, пячаткі, на ўсіх рынках адымае ў хрысціян сродкі да жыцця, не ведае іншага мастацтва, акрамя падману і паклёпу“ [9, с.47]. Не менш эмацыйна выказваўся яго сучаснік, паэт Кляновіч, у паэме „Roxolania“: „Ты спытаешся, што робіць жыд у гэтым галоўным горадзе? А тое самае, што робіць воўк, патрапіўшы ў поўную аўчарню. Праз пазыку да яго трапляюць у заклад цэлыя гарады;

ён уціскае іх працэнтамі і сее галечу. Чарвяк павольна точыць дрэва і патроху з'ядае дуб. Ад молі гінуць тканіны, ад іржы псуецца жалеза. Так і жыд-дармаед з'ядае прыватную маёмасць, спусташае грамадскія багацці" [10, с.119—120]. Вельмі яскрава перадаў гэтую раздражнёнасць грамадства Рэчы Паспалітай пашырэннем габрэйскай актыўнасці аўтар Мінчынскі. У 1618 годзе ён пісаў аб гэтым так: „Пайдзі на Літву, Русь, Валынь, Падолле, Беларусь, — габрэі на мытных заставах, габрэі — арандатарамі местаў і вёсак, цэлых правінцый і княстваў, габрэі — адкупшчыкі мытаў, саляных капальняў, габрэі ў падарожных дамах трымаюць манаполіі, так што нідзе нічога дастаць нельга і не дазволена, акрамя як у габрэя" [3, с.118—119].

У беларускіх мяшчан з'яўленне іншаверных канкурэнтаў у гарадах не выклікала захаплення. Прадстаўнікі магістратаў розных беларускіх местаў імкнуліся ўсялякім чынам абмяжоўваць іх гандлёвую актыўнасць. Той факт, што насельніцтва гарадоў ВКЛ актыўна супрацьдзеяла габрэям набываць нерухомасць у гарадах, будаваць сінагогі, адзначалі і габрэйскія гісторыкі [11, с.166]. Гарадзенцы ў траўні 1549 году дамагліся ад каралевы Боны судовага выраку, згодна з якім „жыдава жаднага дому месцкага ў Горадне, без асаблівага нашага дазвалення не маюць купаваці" [19, с.334]. У лістападзе 1564 году наваградцы перамаглі юдэйскую гарадскую грамаду ў спрэчцы па аналагічным пытанні. Вайна за „тэрыторыі" ў Наваградку на той момант доўжылася ўжо 10 год. Паводле каралеўскага дэкрэту габрэям забаранялася сяліцца на Падляшскай вуліцы і жыць сярод хрысціян. Уся Падляшская вуліца была адсуджана на карысць магістрату, габрэі мусілі выплаціць штраф у памеры 1600 чырвоных злотых за захоп мяшчанскай уласнасці. У выпадку, калі б яны не перабраліся ў адведзены для гэтага тэрмін на вуліцы Віленскую ці Трусаўскую, тады, згодна з каралеўскім загадам, іх будынкі павінны былі быць знесеныя і раскіданыя [20, с.133—134]. У жніўні 1551 году да Жыгімонта Аўгуста са скаргай на віленскіх мяшчан звярнуліся кракаўскія купцы-габрэі Сымон Дактаровіч і Ізраіль Язэфовіч. Віленскі магістрат не дазваляў ім наймаць дамы, лаўкі, весці гандаль. Вырак быў не на карысць мяшчан. Кароль, „бачачы на то, іж Туркове, Татарове, Урмянове, Масквічы і іныя госці прыежчыі ў том месце нашам Віленскам

усякімі куплямі і таварамі сваімі дабраволне таргуют, дамы, склепы ку злажэню рэчэй і тавараў маюць“, талерантна дазволіў тое самае рабіць і кракаўскім купцам-юдэям [20, с.19—20]. Віленскі магістрат таксама вёў барацьбу за абмежаванне габрэйскай прысутнасці. Згодна з камісарскім рашэннем, зацверджаным каралём Уладзіславам IV у 1633 годзе, габрэям Вільні дазвалялася жыць толькі на трох вуліцах: Жыдоўскай, Яткавай і ў завулку, які ішоў ад Нямецкай вуліцы да царквы Св.Мікалая. Але месцічы рана святкавалі перамогу. Даволі хутка справа набыла анекдатычны характар. На падставе судовых выракаў 1636 і 1644 гадоў юдэям было дазволена, да часу набыцця новага жытла на адведзеных для іх вуліцах, жыць па-ранейшаму. Быў прызначаны і тэрмін для набыцця дамоў — 25 год. Аднак адтэрміноўкі па 20 год кожная доўжыліся аж да 1741 году, калі магістрат урэшце кінуў настойваць на высяленні [3, с.7].

Магілёўскае мяшчанства ў XVI—XVII стагоддзях шмат высілкаў прыкладала да абмежавання росту габрэйскага насельніцтва і яго гандлёвай актыўнасці, няспынна выпрошваючы ў каралеўскай улады прывілеяў на забарону габрэям сяліцца ў Старым горадзе. Вельмі цікава, чым яны абгрунтоўвалі свае просьбы. Так, у дадзенай гораду каралеўскай грамаце ад 5 сакавіка 1585 году казалася: „Білі нам чалом ...усё паспольства мяшчане нашага места Магілёўскага, абыхма ...жыдам дамамі сяліцца не дапусцілі, даючы тую прычыну, іж ат ніх нікаторага бы пажытку і парадку ў месце том быці не магло, а ім бы ся вялікая пераказа ў гандлях і таргоўлях іх ат ніх дзеяла“ [1, с.296].

Узорнымі ў гэтым сэнсе з’яўляюцца і прасякнутыя антысемітызмам разважанні магілёўскага храніста XVII стагоддзя Трафіма Сурты. З-за габрэйскіх падпалаў пагарэлі купецкія крамы ў Полацку, габрэі крадуць, вырабляюць фальшывую манету, рабуюць хрысціян. Больш за тое, для Трафіма Сурты менавіта дзейнасць арандатараў і адкупшчыкаў габрэяў з’яўляецца галоўнай прычынай заняпаду дабрабыту насельніцтва ва ўсёй Рэчы Паспалітай: „У год 1699 ...прыехалі... з Саксоніі як бы немцы, а між іншым, жыды, імёнамі Бейман і Лейман, браты, якія пазычылі каралю ягамосці некалькі мільёнаў гатовых грошай і якім, пасля прыезду, паводле прывілею ягонай каралеўскай міласці, былі

аддадзены замак і эканомія, з якіх жыды бралі розныя грошы, таксама заарандавалі на некалькі гадоў, пакуль выбралі свае грошы і з наварам, і іншыя эканоміі ў Літве і Жмудзі. Доўга не забудзе Магілёў гэтай саранчы, і таксама ва ўсёй Польшчы і ў Вялікім Княстве Літоўскім ліха будуць іх згадваць, горш за тых немцаў, што ішлі з-пад Смаленску пад час Шэйнаўскай вайны" [2, с.312].

Усё тое, аб чым ішла размова, тычылася менавіта стэрэатыпаў і ўяўленняў. Але наколькі царкоўная антысеміцкая дактрына і звязаныя з ёй уяўленні суадносіліся з дзяржаўнай палітыкай у гэтым пытанні? Пра іх поўнае супадзенне за ўсю гісторыю існавання ВКЛ можна казаць толькі аднойчы. Мы маем на ўвазе трагічныя для габрэйскай грамады Княства падзеі, якія адбыліся ў 1495 годзе, калі вялікі князь Аляксандр Ягелончык загадаў габрэяў „з зямлі нашае вон выбіці". Даследчыкі неаднаразова адзначалі, што найважнейшым патрабаваннем, невыкананне якога абумовіла выгнанне ўсяго габрэйскага насельніцтва з тэрыторыі ВКЛ, было патрабаванне рэлігійнае. Усе юдэі мусілі прыняць хрышчэнне. Лічыцца, што на прыняцце гэтага рашэння паўплывалі аналагічныя падзеі ў Іспаніі ў 1492 годзе, а таксама актыўнае намаўленне вялікага князя да такіх дзеянняў з боку прадстаўнікоў дамініканскага ордэну [24, с.161—163].

Праўда, выгнанне доўжылася не надта доўга, ужо ў 1503 годзе габрэям было дазволена вярнуцца, былі пацверджаны іх прывілеі, вернута іх уласнасць. Ад гэтага часу і да знікнення Рэчы Паспалітай з палітычнай мапы свету дзяржаўная палітыка ў дачыненні да іх характарызавалася куды большай цярпімасцю, чым у іншых краінах Еўропы. Габрэям гарантавалі недатыкальнасць уласнасці, іх забаранялася абвінавачваць у рытуальных забойствах хрысціян, ім дазвалялася спавядаць юдаізм, мець сваю асобную сістэму самакіравання. Забойства габрэя каралася смерцю. Навязка за раны і пабоі плацілася габрэю, як і шляхціцу [10, с.117—118; 23, с.315].

Разам з гэтым Статуты Вялікага Княства Літоўскага ўтрымлівалі і пэўныя дыскрымінацыйныя нормы ў дачыненні да юдэяў. Усе яны былі абумоўлены менавіта рэлігійнымі матывамі. Так, Статут 1529 году забараняў габрэям мець закупаў і нявольнікаў. Статут 1566 году вызначаў, якую вопратку яны павінны былі насіць, ім забаранялася мець

хрысціян у няволі. Гэтыя нормы паўтараліся і ў Статуце 1588 году. Юдэям забаранялася займаць якія-небудзь пасады. Смерць чакала габрэя ў выпадку спробы намаўлення хрысціян да пераходу ў юдаізм [23, с.315—316, 545—546]. Змяшаныя шлюбы з хрысціянамі без папярэдняй змены веры былі таксама забаронены.

Правядзенне падобнай палітыкі спрыяла ўсталяванню адноснай верацярплівасці паміж хрысціянамі і юдэямі на нашых землях, але, як мы бачылі, казаць аб знікненні антысеміцкіх стэрэатыпаў з масавай свядомасці насельніцтва Беларусі ў той час не выпадае. Палітыка абмежаванай канфесійнай талеранцыі, што праводзілася дзяржавай, суседнічала з пабытовым антысемітызмам. Аб гэтым сведчаць і літаратурныя помнікі Беларусі XII—XVIII стагоддзяў, і фальклор. Мелі месца на нашых землях і пагромы. Самы першы з іх у Магілёве адбыўся ў 1645 годзе [12, с.81—82]. Паўстанне пад кіраўніцтвам В.Вашчылы праходзіла не толькі пад антыфеадальнымі, але і пад антысеміцкімі лозунгамі [18, с.483]. Пасля яго ў Крычаўскім старостве амаль не засталося габрэяў. Каму пашэнціла не патрапіць у рукі паўстанцаў, той ратаваўся ўцёкамі. Але памеры выступаў супраць габрэяў і іх колькасць не ідуць ні ў якае параўнанне з тымі жахамі, якія адбываліся ў сярэднявеччы ў Нямеччыне ці Іспаніі.

Але нельга думаць, нібыта габрэі і беларусы жылі абсалютна ізалявана адны ад адных, унікаючы любых формаў стасункаў. Наадварот, гэта было плённае суіснаванне. Не выпадае і разглядаць габрэяў Княства як загнаных, запалоханых істотаў, не здольных абараніць сваёй годнасці.

Выбітны габрэйскі гісторык Бяршадскі лічыў найлепшымі часамі ў стасунках паміж юдэямі і хрысціянамі ВКЛ перыяд каралявання Жыгімонта Старога. У гэты час габрэі вядуць супольныя гандлёвыя аперацыі з хрысціянамі, іх можна пабачыць за адным сталом альбо нават барукаючыся. На сілу і гвалт з боку хрысціян яны адказваюць той самай манетай [3, с.395—396, 411]. Падобная сітуацыя трывала і пазней. Больш за тое, даволі часта габрэі самі выступалі ініцыятарамі канфліктаў з хрысціянамі. Так, у студзені 1538 году берасцейскі габрэй Гошка Кожчыч мусіў быў заплаціць „бясчэсця“ шляхціцу Багдану Пронкавічу Лышчынскаму, служэбніку намесніка слонімскага за тое, што без скаргі і суду

пасадзіў яго ў вязніцу [19, с.102]. У снежні 1540-га Юрка Спекуновіч, цівун каплічны „князя біскупа Жамоіцкага“, быў збіты на горкі яблык гарадзенскім габрэем Крывонем Мойшавічам. Прычынаю бойкі стала вядро, якое Юрка першым выгандляваў на кірмашы ў бондара. Паводле сведчанняў бондара, калі цівун „пачаў каліту тут жа, стоячы, варашыць, хоцячы мі тое вядро заплаціці“, падышоў габрэй і пачаў гандляваць тое самае вядро. Цівун заплаціў грошы, а потым пачаў, жартуючы, з габрэем гандлявацца. Але калі ён паспрабаваў пайсці з упадабаным Крывонем Мойшавічам таварам, дык адразу атрымаў ад апошняга колькі добрых удараў [19, с.267]. Не пашанцавала ў лютым 1541 году і каралеўскаму селяніну Мацею Марціновічу ў сутычцы з гарадзенскім млынаром Мошкам. Калі Мацей „прывёз іж для памола жыта із замка“, то ён пабачыў Мошку, які засыпаў пад камень млына бочку жыта. Селянін цярпліва чакаў, пакуль гэтае жыта змалолася, але калі ён зразумеў, што млынар мае намер засыпаць чарговую бочку, не зважаючы на яго, то запатрабаваў, каб Мошка перш-наперш змалоў зерне на патрэбы каралеўскага замку, а потым ужо сваё. Але ў адказ на гэтую прапанову Мацей дастаў добрых кухталёў і з разбітым да крыві носам мусіў рэтыравацца ад раз’юшанага млынара. Нягледзячы на тое, што Мошка ўсё адмаўляў, шматлікія сведкі давялі слушнасць абвінавачванняў селяніна. Суд прызнаў Мошку вінаватым „і прысудзіў на нём тому Мацейцу палціну грошай“ [19, с.288—289]. 27 чэрвеня 1542 году баярын Грышка Катшэвіч скардзіўся на клецкага габрэя Захар’я Маркавіча, які „гнаў валы скупленыі сваі з Клецка да Кгданска прамежку жыта маяго, і жыта мі нямала патапталі. І я за то быў узяў у ніх вала за шкоду тую, што мі збожжа папсавалі, і ён з маладцы сваімі мяне збіў“ [19, с.312—313].

Габрэі і беларусы таксама поплеч абаранялі сваю супольную Радзіму пад час войнаў. Асабліва паказальныя ў сувязі з гэтым падзеі часоў крывавага „Патопу“ сярэдзіны XVII стагоддзя, калі габрэі стаялі побач з беларусамі на мурах гарадскіх умацаванняў, баронячы іх ад войскаў „Найцішэйшага“ і ўкраінскіх казакаў. Ацалелая пасля крывавага пагрому рэшта магілёўскага габрэйства, дарэчы, брала чынны ўдзел у антымаскоўскім лютаўскім паўстанні 1661 году. Але было і іншае. Бо шмат каму з беларускіх месцічаў на першым этапе

той вайны была даспадобы тэза Аляксея Міхайлавіча аб выгнанні габрэйскага насельніцтва з Беларусі…

**Які малюнак мы атрымоўваем у выніку ўсяго вышэйвыкладзенага?**

Можна казаць, што для нашых земляў быў характэрны мяккі варыянт антысемітызму. Мы яго ўмоўна назвалі б „абарончым". З аднаго боку, для антысеміцкіх уяўленняў насельніцтва Беларусі характэрны практычна той жа самы набор негатыўных стэрэатыпных вобразаў „жыда", што бытаваў і ва ўсім хрысціянскім свеце. З другога боку, нейкія „прэвентыўныя" масавыя акцыі, самасуд супраць габрэяў без доказу іх віны на працягу XVI—XVIII стагоддзяў не толькі амаль не праводзіліся, але і асуджаліся людзьмі, якія ў той самы час былі носьбітамі антысеміцкіх стэрэатыпаў.

Найяскравейшы прыклад — Трафім Сурта. Як вынікае з выказванняў і ацэнак магілёўскага храніста — ён шчыры антысеміт. Але калі Трафім Сурта апісвае вынішчэнне габрэйскага насельніцтва Магілёва ў 1654 годзе казакамі Канстанціна Паклонскага, то яго сімпатыі не на баку магілёўскага шляхціца і яго хрысціянскага войска. Ён асуджае не матываванае нічым, акрамя прагі да нажывы, масавае забойства габрэяў [2, с.292].

Такое стаўленне да сваіх суграмадзян іншай крыві і веры трывала і ў пазнейшы час. Адмаўляючы гэта, мы ніколі не зразумеем матывацый учынкаў тых беларусаў, якія бралі ўдзел у габрэйскіх пагромах пад час першай і трэцяй расейскіх рэвалюцый, грамадзянскай і другой сусветнай войнаў. А не ўлічваючы спецыфікі беларускага антысемітызму, мы не здолеем рацыянальна растлумачыць, чаму на беларускай зямлі падобныя ганебныя ўчынкі ніколі не дасягалі такіх маштабаў, як у нашых найбліжэйшых суседзяў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссиею. Спб., 1848. Т.3.
2. Беларускія летапісы і хронікі. Мн., 1997.
3. Бершадский С.А. Литовские евреи. История их юридического и общественного положения в Литве от Витовта до Люблинской унии. Спб., 1883.

4. Гуревич А.Я. Категории средневековой культуры. М., 1972.
5. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящиеся в центральном архиве в Витебске и изданные под ред. архивариуса сего архива Сазонова (далей — ИЮМ). Витебск. 1877. Вып.8
6. ИЮМ. Витебск. 1878. Вып.9.
7. Карский Е.Ф. Белорусы. Т.III. Очерки словесности белорусского племени. Ч.2: Старая западнорусская письменность. Петроград. 1921.
8. Ластоўскі В. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі. Коўна. 1926.
9. Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян // Архив историко-юридических сведений, относящихся до России, издаваемый Николаем Калачовым. М., 1854. Кн.2, вторая половина. Отд.V. С.1—77.
10. Любавский М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. М., 1913.
11. Марек П. Белоруссия // Еврейская энциклопедия в 16 томах. Спб., Т.5. — С. 165—168.
12. Марзалюк І. А. Магілёў у XII—XVIII стст. Людзі і рэчы. Мн., 1998.
13. Мельнікаў А.А. Кірыл, епіскап Тураўскі: Жыццё. Спадчына. Светапогляд. Мн., 1997.
14. Могилевские епархиальные ведомости. Могилев. 1998. № 4—6.
15. Могилевская Старина. Могилев. Вып.3.
16. Нікольскі Н.М. Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераньнях беларускага сялянства. Менск. 1933.
17. Памятники полемической литературы в Западной Руси. Спб., 1878. Кн.1 (Русская историческая библиотека. Т.4).
18. Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. Спб., 1905. Т.9.
19. Русско-еврейский архив. Документы и материалы для истории евреев в России. Т.1. Спб., 1882.
20. Русско-еврейский архив. Документы и материалы для истории евреев в России. Т.2. Спб., 1882.
21. Скарына Ф. Творы: Прадмовы, казанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. Мн., 1990.
22. Старостенко В.В. Общественно-философская мысль и

национальное самосознание белорусов XVI—XVII вв. Очерки истории. Могилев. 1999.
23. Статут Вялікага княства Літоўскага. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мн., 1989.
24. Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Aleksandra Jagiełłonczyka. Poznań. 1995.
25. Trachtenberg J. Djabeł i żydzi. Średniowieczna koncepcja żyda a współczesny antysemityzm. Gdynia. 1997.



Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

## Вольф Рубінчык
## Інтэрнэт, яўрэі і Беларусь

---

Свет сам прыходзіў да яго, і гэта быў свет не ў ягонай грубай матэрыяльнасці, а свет як уяўленне, як адмыты да белага касцяк.
П.Брукнэр *„Боскае дзіцё“*

Апошнім часам у Беларусі пра Інтэрнэт як прэстыжную крыніцу інфармацыі гавораць усе. Пра яго раз-пораз узгадваюць традыцыйныя СМІ, уключаючы папулярную беларускую прэсу ад „Нашай Нівы“ да „Советской Белоруссии“. Безумоўна, мае рацыю сп.Станішэўскі, калі заўважае: „Сёньня ў Беларусі няшмат хто ходзіць у Інтэрнэт, але цікавасьць да яго вялікая — як да дзіва... Самая пара казаць пра „Інтэрнэтаманію“[1]. Банальным ужо падасца наступнае сцвярджэнне: той, хто мае што сказаць — адміністрацыя прэзідэнта, часопіс ARCHE ці Беларускі дзяржаўны універсітэт — скарыстае для гэтага Інтэрнэт, заводзячы ўласны сервер[2] (www.president.gov.by; arche.home.by; www.bsu.unibel.by). Як быццам, нічога дзіўнага, тым больш падазронага. Але, як кожны складаны феномен, сусветная сетка WWW (зараз гэта найбольш папулярны абсяг Інтэрнэту) абрастае масай міфаў. Вось аўтар(ка) рэкламнага артыкулу ў рэкламнай газеце параўноўвае Інтэрнэт, „вялізарную даведачную сістэму“, з комплексам бібліятэк: „Пытанне: кнігу якой тэмы магчыма знайсці ў гэтых бібліятэках. Адказ: любую. Што ў галаву прыйшло, тое і знайшлі“[3].

На самой жа справе, у *Interconnected Networks* — „сетку сетак“ —

трапляе не ўсё. Ці не тое. Ці не зусім тое, што мае быць. Інтэрнэт ёсць люстэркам, што адлюстроўвае найчасцей ужо адлюстраванае (у прэсе, даследаваннях), трэцяй рэальнасцю, якая можа мець даволі слабыя сувязі з рэальнасцю „першай“, а значыць, рызыкуе, як, зрэшты, кожны сродак масавай інфармацыі, зрабіцца фабрыкай ілюзій.

Пры дапамозе пошукавых праграм зусім нескладана адшукаць тысячы сайтаў (вузлоў), на якіх змяшчаюцца звесткі пра беларусаў і Беларусь, столькі ж, калі не больш, пра яўрэяў і яўрэйства. Скрыжаванні ж лёсаў людзей і народаў (яўрэі Беларусі; беларусы аб яўрэях *et vice versa*; беларускія яўрэі ў Ізраілі) прэзентаваны ўжо значна бяднейшым чынам. Гэта, як быццам, і палягчае задачу шукальніка, але, калі ён імкнецца да глыбокага вывучэння праблемы, то ўсё роўна будзе вымушаны звярнуцца да іншых, традыцыйных крыніц інфармацыі, а што да Інтэрнэту — праглядзець шмат сайтаў, рэлевантнасць якіх пакідае жадаць лепшага. Справа яшчэ і ў тым, што беларускіх яўрэяў мінулага нельга разглядаць як зусім самастойную групу, у адрыве ад расійскіх, польскіх і ашкеназскіх увогуле, а да таго ж беларускае яўрэйства стала часткай савецкага. Паколькі інфармацыя аб усім гэтым, тэарэтычна, не мае межаў, яна пагражае захліснуць карыстальніка.

Ідэя сусветнай сеткі, існуючай там, дзе ёсць кампутарная сувязь, аддае перавагу колькасці, якая не заўсёды пераходзіць у якасць. Так, гэта трыумф плюралізму: кожны ахвочы можа заявіць пра сябе *urbi et orbi*[4], ствараючы ўласную старонку[5] ці іншым чынам прымаючы ўдзел у павелічэнні агульнага аб’ёму віртуальнага свету — шляхам ліставання праз электронную пошту, напрыклад. Але вынікам будзе безупынная інфляцыя словаў[6]. Інтэрнэт — звышбібліятэка, у якой, аднак, кніжкі могуць знікнуць назаўсёды ці быць цалкам перапісанымі, што, калі б Інтэрнэт застаўся адзіным сродкам інфармацыі, прывяло б, верагодна, да страты гістарычнай (сама)свядомасці, поўнай рэлятывізацыі паняццяў праўды і хлусні — узгадайма „1984“ Оруэла, дзе гісторыя перапісваецца проста, як палімпсест.

У Інтэрнэце, канечне, няма адзінай кіраўнічай сілы і тым болей ідэалогіі, але ўсё ж „некаторыя больш роўныя, чым іншыя“. Гэта ўжо з іншага класічнага оруэлаўскага твору — *Animal Farm*[7].

Нават калі б Інтэрнэт быў раптам закансерваваны, агляд,

зроблены адным чалавекам (тут і цяпер — мною) не мог бы прэтэндаваць на бездакорнае асвятленне таго ці іншага прадмету, але ж у тым і асаблівасць Інтэрнэту, што віртуальная Вавілонская вежа расце з агромністай нават для канца XX ст. хуткасцю, і ці будзе гэты агляд цікавы каму праз год, два, пяць? Нездарма Інтэрнэт (гэта пазначана ва ўсіх нарысах ягонай гісторыі) утвараўся як сістэма, што здольная захавацца, нават калі яе часткі пашкодзіць вораг. Клеткі гэтай сістэмы, сайты ды старонкі, могуць быць лёгка прынесены ў ахвяру: Інтэрнэт ёсць апафеозам суцэльнасці. Такім чынам, аглядальнік рызыкуе апынуцца ў добра вядомым з прытчы становішчы, дзе сляпцы мацаюць ногі ці хвост слана і падаюць частку за цэлае, парушаючы, так бы мовіць, прынцып рэпрэзентатыўнасці.

Людзям, што з Інтэрнэтам зусім не знаёмыя, апісанні сайтаў (гэта будзе ўжо чацвертая рэальнасць), дадуць няшмат, бо „лепей аднойчы пабачыць...“ І ўсё ж не выключана, што камусьці гэты агляд у чымсьці дапаможа: калі так, я буду рады пачуць ці прачытаць на яго водгукі[8].
На што б я раіў звярнуць увагу беларускім чытачам, якія жадаюць праз Інтэрнэт даведацца аб прадстаўніках народу, што жыве побач — і не побач? Не настойваю (гэта было б абсурдна), але тры галоўныя накірункі маглі б ахапіць наступнае:

Юдаізм; яўрэйская гісторыя; сучасны Ізраіль[9].
Класіфікацыя гэтая болей чым умоўная, другое паняцце часткова абдымае й першае, і наадварот.
Колькі словаў аб яўрэйскай гісторыі — замест уступу.
У мяне няма сумневаў, што чытачоў ARCHE зацікавіць перадусім гісторыя яўрэяў Беларусі, аднак тут трэба ўлічваць, што гэта не толькі гісторыя Беларусі, але й гісторыя яўрэяў. Таўталогія? Не зусім. Вось жа спецыфіка яўрэйскай гісторыі ў тым, што яна значны кавалак часу працякала ў недзяржаўнай форме без пэўнай лакалізацыі ў прасторы і сталася гісторыяй збольшага духоўнай, гісторыяй яўрэйскай культуры, але таксама й эканамічнай, час ад часу палітычнай — праўда, гэтыя апошнія аспекты ў галіне ведаў, што завецца „юдаікай“ (назва таксама ўмоўная) прадстаўлены меней. Адказ на фундаментальнае пытанне: чаму народ захаваўся без дзяржавы, без адзінай тэрыторыі і г.д. — гісторыкі часцей шукаюць у

спецыфіцы ўнутранага ладу яўрэйскіх грамад (які рэгуляваўся юдаізмам), чым у іхніх узаемаадносінах з вонкавым светам, а ў разглядзе гэтых адносінаў на першы план выходзіць менавіта тое, што нібыта дапамагае адказаць на вышэйцытаванае пытанне — варожасць суседзяў, якая змацоўвала ўнутраныя сувязі ў грамадах.

На своеасаблівым і зусім не кепскім сайце „Рыса аселасці“ (www.friends-partners.org/partners/beyond-the-pale; існуе з 1995 г.) гісторыя яўрэйскага народу разглядаецца і тлумачыцца перадусім з гэтых пазіцый: „Мэта нашай выставы — прадставіць гісторыю юдафобіі і асабліва сучаснага антысемітызму, з-за якога ў нашым шматпакутным стагоддзі былі прынесеныя ў ахвяру мільёны людзей... Мы хацелі даць гістарычны зрэз жыцця яўрэяў у Еўропе, каб магчыма было лепей зразумець яўрэйскі побыт, рэлігію і культуру“ (тамсама). Аўтары выконваюць сваю задачу, прапануючы шырокую панараму жыцця расійскага, а таксама ўсходнееўрапейскага яўрэйства. Тэкст не перагружаны падрабязнасцямі, а, як і патрабуецца на выставе, ненавязліва каментуе той ці іншы фотаздымак ці малюнак. Напэўна, таму ў ім няма відавочных памылак, што, як мы ўбачым далей, само па сабе — з’ява незвычайная, і даступны гэты сайт кожнаму. Карацей кажучы, гэта варта пабачыць. Дадамо, што ў гэтай выставы ёсць расійскамоўная і англамоўная версіі.

Здараецца, аднак, што даследчыкі, свядома ці несвядома, шукаюць антысемітызм там, дзе яго няма ці не было, альбо перабольшваюць ягоную ролю. Вось, напрыклад, што піша дацэнт Б.Кантаровіч з Віцебску: „Сацыяльныя сілы, што змагаліся ў рэвалюцыях [у XVI—XVIII стст. у Еўропе] у адносінах з яўрэямі аднолькава жадалі аднаго: пажывіцца яўрэйскімі грашыма, адначасова паздзекавацца з іх уладальнікаў, а пагатоў з яўрэйскай беднаты“[10]. Пра гэткія спробы пісаць „плаксівую гісторыю“ ўзгадваецца ў Ганны Арэнт, якая даволі з’едліва зазначала: „...Яўрэйскія і неяўрэйскія гістарыёграфы, часцей за ўсё выходзячы з процілеглых матываў, рабілі тую ж памылку, калі ізалявалі элементы варожасці ў яўрэйскіх і хрысціянскіх крыніцах, акцэнтавалі бедствы, выгнанні і масавыя забойствы, якія ўсейваюць яўрэйскую гісторыю падобна да таго, як... войны, перыяды голаду і эпідэміі ўсейваюць гісторыю Еўропы“[11].

Канечне ж, катастрофы — і перадусім Катастрофа другой сусветнай вайны з мільёнамі ахвяраў — не маглі не адбіцца на гістарычнай свядомасці яўрэяў, але крыху павярхоўнымі падаюцца разважанні знанага польскага рэжысёра Кшыштафа Занусі: „Зараз існуе вялікая праблема нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, бо, на маю думку, сучасных яўрэяў ва ўсім свеце аб'ядноўвае сёння памяць аб Шоа (Галакосце), а не юдаізм“12. Аб'ядноўвае і тое, і іншае. Сефардскія (усходнія) яўрэі ў большасці Галакосту, дзякуй Богу, не бачылі, але засталіся яўрэямі. Карэнным, хоць і не заўжды відавочным чыннікам інтэграцыі застаецца ўсё ж юдэйская рэлігія з усімі яе разгалінаваннямі ды супярэчнасцямі, а значыць, народ не проста *захаваў-ся*, але й *захаваў сябе*. І гісторыя, і дзяржава, і мова могуць быць яўрэйскімі альбо не, што ж да юдаізму, ён, паводле азначэння13, неяўрэйскім быць не можа14. З яго і пачнем.

Канечне, любая пошуковая праграма, папулярная сёння (гл. www.rambler.ru, www.yahoo.com і да г.п.) знойдзе тысячы сайтаў, дзе сустракаецца слова „иудаизм“ ці „judaism“ — на беларускай жа мове адшукаць што-небудзь будзе складана. Англамоўным чытачам я шчыра раю спачатку зайсці на вельмі добры даведачны сайт www.jstudies.org, які падтрымліваецца Эв'ятарам Марыенбэргам (Парыж) і ў „*Links*“ знайсці тое, што іх цікавіць. Там згрупаваныя спасылкі на найбольш аўтарытэтныя, рэпрэзентатыўныя сайты як у катэгорыі „Сучасны юдаізм“, так і ў больш спецыфічных, прыкладам, „Талмудычная літаратура“, „Яўрэйская літургія“, „Яўрэйскія святы“, „Галаха“ (рэлігійнае заканадаўства, у тым ліку для штодзённага жыцця), „Хасідызм“, „Хрысціянства і юдаізм“. Асобна вылучаныя юдаізм канадскі, расійскі, іранскі і нават эфіопскі. Амаль кожны сайт, у сваю чаргу, заклікае да яшчэ больш нечаканых падарожжаў. Напрыклад, з сайту „хазарскага інфармацыйнага цэнтру“, прысвечанага „Цюркскай і яўрэйскай гісторыі ў Расіі і на Украіне“ (www.khazaria.com; заснавальнік — Кевін Брук), дзе ўвазе наведвальнікаў прапануецца ілюстраваная гісторыя Хазарскага каганату15, можна перайсці не толькі да ўласна яўрэйскіх сайтаў — напрыклад, да міжнароднага электроннага часопіса www.jewishworldreview.com, але й да агляду жыцця сучасных цюркскіх краін СНД (www.khazaria.com/turkic/index.html). Магчыма трапіць у старажытны Крым, дзе таксама

калісьці сяліліся хазары (members.xoom.com/Rushistory/crimea/crimea2.htm), паглядзець змест кнігі Амялляна Прыцака „Пачаткі старажытнарускай сістэмы вагаў і грашовага абарачэння“, выдадзенай у ЗША (www.khazaria.com/pritsak.html), якая, напэўна, зацікавіць нумізматаў.
А кагосьці, мабыць, зацікавіць на www.jstudies.org рубрыка „Кабала16 і містыцызм“. На англійскай і французскай мовах выходзіць „Journal of Kabbalah studies“ (www.multimania.com/jec/index.htm), на англійскай — часопіс яўрэйскай філасофіі і кабалістыкі „Daat“ („Веды“ — гэбр.), што выдаецца Бар-Іланскім універсітэтам Ізраілю (www.biu.ac.il/HU/pg/daat/engindex.html). Існуюць, вядома, і кабалістычныя старонкі на расійскай мове. На сайце kabbalah-web.org да нядаўнага часу размяшчаліся выключна расійскамоўныя ўрыўкі з вучэння рабіна Лайтмана. Сайт падтрымліваецца ягонымі вучнямі, якія жывуць у ізраільскім горадзе Бней-Браку, адным з цэнтраў артадаксальнага юдаізму. Зараз ужо даступныя версіі на ўсіх галоўных еўрапейскіх мовах, а таксама на арабскай і японскай. Наведнікам прапануюць зрабіць першыя крокі ў засваенні ведаў аб будучым свеце, заняцца „ўнутраным сузіраннем“, што мусіць дапамагчы „ўбачыць добрае“. На сайце распавядаецца пра адзін з цьмяных эзатэрычных твораў, складзеных у сярэднявеччы, які паўплываў і на развіццё хрысціянскай містыкі, кнігу „Загар“ („Ззянне“ — гэбр.) Тым не менш, у знаёмстве з юдаізмам — ды, зрэшты, з кожнай рэлігійнай сістэмай — непажадана чапляцца за адгалінаванні, не ведаючы каранёў17. Таму знаёмства карысней пачынаць з атрымання больш агульнай інфармацыі, якую можна знайсці, напрыклад, на афіцыйным сайце сусветнага руху „ХаБаД“18 (www.chabad.org). Хабад, альбо „любавіцкі хасідызм“, зарадзіўся ў Магілёўскай губерні пры канцы XVIII ст. і быў даволі папулярным сярод яўрэяў Беларусі, асабліва на магілёўскіх і віцебскіх землях — хоць і сустрэў супраціў рабінаў традыцыйнага веравызнання і іхніх прыхільнікаў, г.зн. „мітнагдым“. Зараз цэнтрам Хабаду з’яўляюцца ЗША. Хабад — адна з найбольш дынамічных плыняў сучаснага хасідызму, ейная прысутнасць адзначана і ў Таіландзе (www.jewishthailand.com), і ў Ганконгу (www.chabadhk.org). Адрас „Хабад-Любавіч ва Усходняй Еўропе — www.glasnet.ru/~jns/index.htm. У Менску даўно ўжо дзейнічае хасідская

сінагога з рабінам Ісраэлем-Ёсефам Грузманам на чале. Пра прысутнасць Хабаду ў Беларусі можна даведацца на старонцы www.glasnet.ru/~jns/russian/cis/belarus/belarus/belarus.htm, праўда, пакуль што толькі пра месца знаходжання сінагогі і пра яе выгляд. Што ж да сайту www.chabad.org, ён падрабязна распавядае пра ўсё, што можна: адказвае на пытанні аб Мэсіі (крэда Хабаду якраз у тым, што „вось-вось прыйдзе Мэсія“ — гл. www.chabad.org/moshiach), змяшчае біяграфіі заснавальнікаў руху, больш-менш цікавыя гістарычна-тэалагічныя нарысы. Тут жа знаходзіцца поўны спіс 613 запаведзяў, абавязковых для юдэяў (248 станоўчых, 365 адмоўных), матэрыялы пра суадносіны рэлігіі і навукі, аб яўрэйскай жанчыне (у тым ліку споведзь „хасідскай феміністкі“ Рыўкі Слонім: www.chabad.org/gopher/woman/slonim2.doc.htm), тут жа спасылка на кнігу, дзе падрабязна разглядаецца сакраментальнае пытанне: „Who is a Jew?“ (www.jewish.to). Сайт Хабаду ўвесь час абнаўляецца, бо на кожны дзень ёсць асобны ўрывак з Торы і хасідскі каментар да яго.

Іншая галіна хасідызму, што бярэ пачатак ва Ўкраіне, „брацлаўскія хасіды“, таксама мае ўласны сервер (адрас — www.breslov.org). Заснаваны гэты рух быў вялікім кабалістам і містыкам рабі Нахманам. Аднак па колькасці матэрыялаў дый па якасці гэты сайт саступае любавіцкаму.

Той, хто нязгодны з артадоксамі, якімі з'яўляюцца хасіды, можа зазірнуць, напрыклад, на сайт „Таварыства гуманістычнага юдаізму“ www.shj.org , заснаванага ў ЗША ў 1969 г. „Гуманістычны юдаізм“ імкнецца быць „нетэістычным“ яўрэйскім рухам. Ці апраўданыя гэткія спробы абысціся без догматаў, назапашаных за стагоддзі і нават тысячагоддзі — цяжка сказаць, але робяцца яны нярэдка, асабліва яўрэямі англамоўных краінаў. Ёсць і іншыя варыянты мадэрнізаванага юдаізму: рэфармісцкі, альбо прагрэсіўны, што пашыраецца і сярод яўрэяў Беларусі (www.clickonjudaism.org), і кансерватыўны, што спрабуе спалучыць станоўчае стаўленне да сучаснай культуры і выкананне большасці запаведзяў (www.uscj.org; www.pacific.net/~faigin/SCJ/faq/02-03.html — тут чытач знойдзе адказы на „пытанні, што часта задаюцца“). Рух за „яўрэйскае аднаўленне“ прапануе інтэгратыўны падыход, спалучэнне філасофіі неахасідызму (М.Бубэра і інш.)

з „сучаснымі дэмакратычнымі вартасцямі“, напрыклад, з поўнай роўнасцю правоў мужчыны і жанчыны. Ён жадае наладзіць дыялог з будызмам, экалагічнымі рухамі… (гл. www.jewishrenewal.org; www.aleph.org). І ўсё ж артадаксальны юдаізм захоўвае, у некаторым сэнсе, „правы першародства“ — асабліва ў Ізраілі. Нездарма значная колькасць расійскамоўных сайтаў, што маюць на ўвазе распаўсюджванне ведаў аб яўрэйскай рэлігіі, належаць ізраільскім арганізацыям. Няблага зроблены дзвюхмоўны (расійская, англійская версіі) сайт культурна-рэлігійнай арганізацыі „Маханаім“19 (http://machanaim.org.il). Каб прыцягнуць расійскамоўных яўрэяў, аўтары пішуць вельмі даступнай, жывой мовай. Тут можна пачытаць Тору з каментарамі20, атрымаць больш чым падрабязную інфармацыю аб усіх яўрэйскіх святах. Сцвярджаецца таксама, што — на жаль — хрысціянства і юдаізм выкарыстоўваюць несумяшчальныя падыходы да свету і тлумачыцца, чаму яўрэі не могуць прызнаць Ісуса Мэсіям (machanaim.org.il/philosof/in_chris.htm). Аб няпростых у мінулым міжканфесійных стасунках, аб спробах дыялогу мажліва прачытаць і на сайце Фрыца Вола www.jcrelations.com. Гэта англамоўны сайт, некаторыя артыкулы ёсць і на нямецкай.

Сайт, які б прадстаўляў юдаізм у сучаснай Беларусі, знаходзіцца хіба не ў адным месцы — www.beljews.minsk.by. Ён расійскамоўны і належыць менскай філіі ізраільскай ешывы (вышэйшай духоўнай вучэльні) „Эш га-Тара“, што значыць „Агонь Торы“21. У 1996 г. гэтая арганізацыя стварыла ў Менску „Коледж яўрэйскіх ведаў“, выдае свой бюлетэнь, супрацоўнічае з Міжнародным гуманітарным інстытутам, што летась адкрыўся ў складзе БДУ22. У сетцы кожны жадаючы можа пазнаёміцца з праграмамі „Эш га-Тары“, што прапануе сваім удзельнікам разнастайныя сустрэчы, паездкі ў Мір, Валожын — месцы, дзе знаходзіліся славутыя ешывы. Тут жа — яўрэйскі каляндар на бягучы год, тут жа — перыядычныя выданні „Дайджэст“ і „Шабат Шалом“. Першае закранае не толькі тэму рэлігійнага адраджэння, хоць яна і галоўная23. У „Дайджэсце“ можна прачытаць, напрыклад, цікавыя гістарычныя артыкулы А.Фрыдмана, які зрабіў ужо і ўласны сайт beljewshist.virtualave.net (гл. далей). Вось як пачынаюцца ягоныя „Фрагменты эканамічнай гісторыі яўрэяў Беларусі“

(www.beljews.minsk.by:8101/digest/sh4.htm): „Больш чым 600 год жыцця яўрэяў на землях Беларусі нельга лічыць часам безупыннага прыгнёту… Жыццё яўрэяў у Вялікім Княстве Літоўскім дае нам бадай што ўнікальны прыклад адносна спакойнага, мірнага і свабоднага жыцця. Нельга сказаць, каб яўрэяў у гэтай дзяржаве любілі: але ж вельмі цяжка назваць хоць адну дзяржаву, дзе б яўрэйскі народ калі-небудзь любілі…“

І ўсё ж, нягледзячы на багацце зместу і прывабны дызайн, сайту чагосьці бракуе. Мусібыць, „гасцёвай кнігі“, але, перадусім, актуальнасці: абнаўляецца ён рэдка. У лютым 2000 г. размешчаны яшчэ абвесткі на студзень. Дый агульная назва сайту „Жыццё грамады“ ёсць крыху прэтэнцыёзнай, бо „Эш га-Тара“ ў Менску — гэта зусім не ўся юдэйская (ці яўрэйская) грамада Беларусі. Проста іншыя суполкі яшчэ не выйшлі ў Інтэрнэт. Але ж гэта толькі адна з першых спробаў кампутарызацыі беларускага яўрэйства. Будзе попыт, будзе й адпаведная прапанова. Ва ўсялякім разе, на гэта хочацца спадзявацца.

Сайт „Гісторыя беларускага яўрэйства“ патрабуе больш дэталёвага разгляду. Як на мой погляд, ён не проста цікавы, а надзвычай цікавы. Да таго ж, гэта даволі важна, робіцца маладымі людзьмі, якія жывуць у Беларусі: Аляксандрам Фрыдманам (студэнт БДУ, гісторык24; выкладчык у беларускім аддзяленні Адкрытага ўніверсітэту Ізраілю) і яго братам Віталем (web-дызайнер). Сваю годную місію — прэч, іронія! — Аляксандр бачыць у адраджэнні й захаванні памяці пра „перакрэсленую цывілізацыю“ літоўска-беларускіх яўрэяў, аб якой кагадзе пісала „Наша Ніва“25. Таму і ўзяў сабе за дэвіз словы выдатнага яўрэйскага гісторыка пачатку XX ст. Сямёна Дубнава, родам з Амсціслава: „У мінуўшчыне яўрэйскага народу захоўваюцца дзіўныя гаючыя сілы для стомленай яўрэйскай душы…“ Пра Беларусь у свеце ведаюць мала, пра беларускіх яўрэяў — яшчэ меней, і вось сайт, паводле думкі А.Фрыдмана, мусіць у некаторай ступені запоўніць прабел. Аўтар свядома робіць акцэнт менавіта на духоўнай гісторыі беларускага яўрэйства — ізноў жа, гісторыя і рэлігія йдуць поруч. Канечне, культурна-асветніцкія мэты чымсьці й абмяжоўваюць далягляды сайту, але ж і тое, што атрымалася, уражвае. Як слушна заўважаюць на www.jstudies.org, у раздзеле

„Russian Judaism“ — „*A very impressive site*“. Заходзяць да Фрыдмана пакуль што 10—15 чалавек на дзень. Для новага сайту — а існуе ён прыкладна год, у ліпені 1999 г. быў дапоўнены і перароблены ў лепшы бок — гэта зусім нядрэнны паказчык, тым болей, што сайт робіцца невялікімі сіламі. Адрас ягоны — beljewhist.virtualave.net, але можна зайсці і праз www1.rambler.ru/sites/187000/187931. Сайт падзелены на дзве няроўныя часткі — англамоўную і расійскамоўную. Першая з'явілася адносна нядаўна. У расійскамоўнай версіі, дзе ёсць і матэрыялы на беларускай мове, разнастайнасці больш. Тут мы можам убачыць наступныя раздзелы: „Яны нарадзіліся ў Беларусі“, „Адметныя яўрэйскія гісторыкі“, „Лёсы“, „Галерэя“, „Галакост: памятайце пра гэта“, „Гарады“, „Дынастыі“, „Паэзія“, „Без рэтушы“, „Рознае“, „Мае работы“, „Публікацыі“, „Сіянізм“, „Праекты“, „Гісторыя Беларусі“, „Сусветная гісторыя“. Простае пералічэнне паказвае, наколькі каштоўны гэты сайт. Некаторыя з раздзелаў ужо запоўненыя цалкам, некаторыя яшчэ чакаюць рэканструкцыі. Аўтар абяцае, што матэрыялаў на беларускай мове хутка будзе болей, таксама ж паболее ілюстрацый (напрыклад, выяваў старажытных сінагог Беларусі). Адылі ж і цяпер ілюстрацый багата. У „Галерэі“ размешчана цэлая выстава карцін Шагала як дарэвалюцыйнага перыяду, так і пазнейшых, калі мастак пасяліўся ў Францыі. У артыкулах пра ВКЛ не абышлося без партрэтаў князёў. Заслугоўвае павагі тое, што аўтар адкрывае расійскамоўную частку матэрыялам пра свайго дзеда, Залмана Гарэліка, вядомага геолага, які быў адным з першаадкрывальнікаў нафты ў Беларусі (артыкул Айзберга і Галубцова „Унёсак З.Гарэліка ў развіццё геалогіі Беларусі“). На сайце ствараецца энцыклапедыя штэтлаў — г.зн. „мястэчак“. Праўду кажучы, пакуль што яна зусім небагатая, але ёсць ужо наступныя спасылкі: „Бабруйск“, „Лунінец“, „Лёс вёскі Эрштэрмай“ (паводле матэрыялаў беларускіх даследчыкаў Л.Лыча і В.Шура), „Возера Князь (Жыд)“, „Менск яўрэйскі“, „Пінск яўрэйскі“. У апошніх двух матэрыялах аўтар даводзіць расповед да 1941 году: яны не прэтэндуюць на ўсебаковае асвятленне прадмету, аднак іх не варта абмінаць нікому, хто цікавіцца гісторыяй гарадоў Беларусі. У А.Фрыдмана йдзецца аб малавядомай старонцы іхняй гісторыі, а менавіта аб гісторыі сінагог.

Крыху меней сур'ёзным, але ад таго не меней значным, выглядае раздзел „Рознае“: тут і „Замовы“26, і „Загадкі літоўскіх хедэраў [школ для яўрэйскіх дзяцей]“, і гістарычныя анекдоты. Адзін з іх заслугоўвае цытаты, бо, як кажуць, „не страціў вартасці й да сённяшняга дня“: „Цар Мікалай I запытаўся ў любавіцкага цадыка [святога, праведнага] рабі Мэндэля: чаму гэта ў яўрэяў гэтак развітае даказніцтва, што сведчыць аб узаемнай варожасці ў іхнім асяроддзі? Рабі адказаў на гэта: рыбы ядуць адна адну часцей, чымся іншыя жывёліны, бо ім адведзена толькі рака або мора, на сушу яны не могуць выйсці. Гэтак і яўрэі: з-за абмежаванняў у выбары месца жыхарства яны вымушаны сустракацца й сутыкацца паміж сабою і міжволі злуюць адзін на аднаго…“ Зараз, здаецца, і абмежаванняў (сумна вядомай „рысы аселасці“) няма, аднак унутрыяўрэйскіх канфліктаў, насуперак распаўсюджанаму міфу, дагэтуль хапае — дастаткова паглядзець на Ізраіль. Ды і ў Беларусі не ўсё добра з „яўрэйскім адзінствам“.

Пад рубрыкай „Паэзія“ знаходзіцца на сённяшні дзень (пачатак сакавіка) толькі адзін верш: купалаўскія „Жыды“ ў скарочаным выглядзе, у якім верш быў надрукаваны ў зборніку „Жыве Беларусь“ (Менск, 1993). Вось каментар А.Фрыдмана: „Глыбокія, філасофскія радкі гэтага верша, безумоўна, павінны заняць пачэснае месца ў літаратурнай спадчыне беларускага песняра“27. Тут жа даецца гіперспасылка на „А хто там ідзе?“. У раздзеле „Без рэтушы“ — тры матэрыялы, што дэманструюць выказванні аб яўрэях У.Леніна, П.Сталыпіна, У.Салаўёва. Вось жа, калі першы ў сваім не надта вядомым выступе „Аб пагромным цкаванні яўрэяў“28 заклікаў змагацца супраць антысемітызму, спадчыны „старога часу“ (калі б гэта так было!), то другі, упэўнены ў прыроднай непаўнавартасці „яўрэйскай расы“, па сутнасці, гэткім цкаваннем і займаўся. Цяпер у Расіі робяць актыўныя высілкі ідэалізаваць цара Мікалая II і ягонага паплечніка Сталыпіна. Цікава, ці збіраюцца прыхільнікі „России, которую мы потеряли“, адрадзіць і антыяўрэйскія абмежаванні ды пагромы? Пытанне рытарычнае. Найбольш інфарматыўнымі на сайце з'яўляюцца, відавочна, работы самога А.Фрыдмана. Некаторыя з іх ужо друкаваліся ў газеце Юдэйскага рэлігійнага аб'яднання „Берега“ (Менск): „Францішак Скарына і праскі голем“, „Жыццё дзеля ідэі“ (пра

тое, як літоўскі шляхціц перайшоў у юдаізм і чым гэта скончылася). Але гэта якраз той выпадак, калі лепей аднойчы ўбачыць.
Змест англамоўнай часткі значна адрозніваецца, у чымсьці ён бяднейшы, але трапна дапаўняе вышэйпералічаныя матэрыялы. Тут знаходзяцца збольшага вытрымкі з энцыклапедый: артыкулы пра славутага духоўнага настаўніка беларускіх яўрэяў, віленскага гаона (генія) Эліягу, „апошняга вялікага тэолага класічнага рабінізму“, які жыў у XVIII ст. і, дарэчы, супрацьстаяў хасідам, пра Валожынскую ешыву, вядомую ва ўсім яўрэйскім свеце. Багата месца адведзена гэтак званым „*Special projects*“ — адказам на звароты амерыканскіх яўрэяў. Апошнія адразу ж па стварэнні сайту пачалі прасіць расказаць ім пра беларускія мястэчкі, адкуль родам іхнія сваякі ці продкі. А.Фрыдман зрабіў вялікую працу, падрыхтаваўшы звесткі аб некалькіх тузінах мястэчкаў. Звесткі гэтыя маюць энцыклапедычны характар і грунтуюцца, у прыватнасці, на выніках расійскага перапісу 1897 г. У „Форуме“ і „Гасцёвай кнізе“ сайту можна прачытаць лісты складальніку. Збольшага гэта падзякі з-за акіяну — цалкам заслужаныя.
Трэба зазначыць, што ўсім згаданым каштоўнасць сайту не вычэрпваецца. Вось, напрыклад, каб англамоўнаму наведніку было лягчэй арыентавацца ў беларускім топасе, для яго створаны спецыяльны раздзел „Belarusian maps“. Вось такі ці не першы сайт па гісторыі яўрэяў Беларусі.

Англамоўны сайт www.jewishgen.org — „Дом яўрэйскай генеалогіі“ — найбуйнейшы ў сваёй сфэры. Штодзень на яго заходзяць некалькі соцень наведнікаў, збольшага яўрэі ЗША, Канады, Ізраілю, якія шукаюць свае карані. Склалася *special interest group* — нешта накшталт форуму для тых, хто родам з Беларусі (www.jewishgen.org/Belarus). Людзі дапамагаюць адзін аднаму скласці радаводы і даведацца пра краіну іхнай настальгіі: на гэтай жа старонцы прапануюцца спасылкі на адрасы беларускіх архіваў, гістарычныя нарысы аб Менску, Горадні, Навагрудку, Слуцку, мапа сучаснай Беларусі і карты беларускіх губерняў сярэдзіны XIX ст. На сайце ёсць матэрыялы агульнага характару, ёсць такія, што тычацца асобных мястэчкаў: www.jewishgen.org/ShtetLinks/Belarus.html. Тут большасць мястэчкаў вывучаецца ў межах „Лідскага праекту

рэгіянальнага даследавання“. Але асабліва ўражвае старонка www.jewishgen.org/Belarus/Shtetls/Belarus.htm, дзе, дзякуючы намаганням не аднаго дзесятка людзей, сабраны найбагацейшы тэзаўрус інфармацыі пра бадай усе мястэчкі беларускіх земляў. У лютым 2000 г. сябры форуму пачалі перакладаць спісы выбарцаў Думы з Менскай губерні, ужо складзены спісы тых, хто ў 1906 г. галасаваў у Рэчыцы. Прапануюцца таксама „ревизские сказки“ ранейшага перыяду. Хоць інфармацыя гэтая даволі спецыфічная, яна, безумоўна, можа быць карысная руплівым даследчыкам і аматарам беларускай гісторыі. Як і праца беларускага ідышыста і гэбраіста Віталя Зайкі (жыве ў Нью-Ёрку). Ягоны артыкул „Габрайскія мэмарыяльныя кнігі пра гарады й мястэчкі Беларусі“, што ў мінулым годзе з’явіўся ў „Запісах БІНІМ“ (Беларускі інстытут навукі і мастацтва, ЗША), ёсць, верагодна, першай спробай пазнаёміць чытача з „цэлым пластом літаратуры, якая зьяўляецца малавядомай для беларускіх дасьледнікаў“. Гл. members.xoom.com/_XMCM/litbel/24.09.htm. Кнігі памяці на гэбрайскай і ідыш выходзілі й выходзяць у Ізраілі, ЗША, Аргенціне. Іх складалі эмігранты з беларускіх мястэчкаў — ад Антопалю да Браслава. Да артыкулу В.Зайкі дададзены спіс амаль што ўсіх гэтага кшталту выданняў, які займае некалькі старонак. „Няма сумневу, — піша аўтар, — што гэтыя багатыя матэрыялы могуць і мусяць быць скарыстаныя беларускімі гісторыкамі, краязнаўцамі, культуролягамі“. Што ж, кнігі ёсць і ў Беларусі. Некаторыя з іх захоўваюцца ў мінскім Навукова-асветніцкім цэнтры імя Ф.Скарыны. Праўда, чытачоў на іх, з розных прычынаў, пакуль што вельмі і вельмі мала.

На тым жа серверы, што і „Запісы БІНІМ“, знаходзіцца сайт газеты „Наша Ніва“, якая часта звяртаецца да „яўрэйскага пытання“, а значыць, аматару гісторыі беларускіх яўрэяў тут ёсць на што звярнуць увагу. Цікавы, хоць і не бясспрэчны, атрымаўся „жыдоўскі нумар“ (№33 за 1999 г.) — http://members.xoom.com/Nasa_Niva/1999/33/nn33.htm. Апрача публіцыстычных матэрыялаў, у ім можна натрапіць на дастаткова грунтоўны нарыс А.Шпунта „Габраі Вялікага Княства Літоўскага ад Вітаўта да Станіслава-Аўгуста“. Варта адзначыць, што да сайту „Нашай Нівы“ можна перайсці з www.jewishgen.org/Belarus/resources.htm#Archives праз

пасярэдніцтва беларускага даведачнага сайту www.ac.by/country. Атрымліваецца своеасаблівы віртуальны шлях да дыялогу. На апошнім сайце ягоны складальнік, сп.Касцюковіч, прапануе таксама web-адрасы іншых беларускіх выданняў. Некаторыя з іх, асабліва „Белорусская деловая газета“ (www.bdg.minsk.by) і „Белорусская газета“ (www.open.by/bg-weekly), таксама рэгулярна пішуць пра беларускіх яўрэяў. Час ад часу звяртаецца да беларускіх падзей „Международная еврейская газета“, што выдаецца ў Маскве (www.aha.ru/~tankred). Але гэта ўжо асобная тэма.

Дзе яшчэ можна ў Інтэрнэце прачытаць пра сучаснае беларускае яўрэйства? Мала дзе. Існуе сайт Федэрацыі яўрэйскіх арганізацый і грамад СНД з раздзелам „Беларусь“ (www.fjc.ru/belarusfr.htm), аднак гэтая старонка на англійскай мове добрай якасцю не вылучаецца. Колькасць яўрэяў у Беларусі (95000) перабольшаная, зашмат арфаграфічных памылак там, дзе іх быць не павінна (назвы гарадоў). Усё ж старонка цікавая тым, што дае каардынаты лідэраў яўрэйскіх арганізацый у 19 гарадах Беларусі, хоць і тут звесткі часам састарэлі.

Больш дакладныя і падрабязныя звесткі з новай гісторыі ёсць на англамоўнай старонцы www.virtual.co.il/communities/wjcbook, на якую магчыма перайсці й праз www.jewishgen.org, і праз „хазарскі“ сайт www.khazaria.com. Тут колькасць яўрэяў у Беларусі выглядае больш рэалістычнай: 45000, з якіх, паводле аўтара, 20000 жыве ў Менску, па 6000 у Бабруйску й Магілёве... Можна пагадзіцца з тым, што „існуе каля 100 культурных арганізацый, але большасць з іх невялічкія і нестабільныя“, а таксама й з тым, што „хаця антысемітызм у Беларусі — не такая вострая праблема, як у Расіі ці на Ўкраіне, адбыўся шэраг інцыдэнтаў, што даюць падставу для хвалявання“.

І ўсё ж гэты агляд становішча яўрэяў у сучаснай Беларусі застаецца павярхоўны. Няма храналогіі. Не названыя прозвішчы людзей, што ўплываюць на жыццё грамады. Зрэшты, аўтарства гэтай старонкі належыць Сусветнаму яўрэйскаму кангрэсу, які ад Беларусі даволі далёка знаходзіцца й сачыць за зменамі не паспявае. Можа, з тых самых прычынаў сцісла напісана пра беларускіх яўрэяў і на сайце Амерыканскага размеркавальнага камітэту „Джойнт“ (яго прадстаўніцтва дзейнічае ў Мінску з пачатку 1990-х): www.jdc.org.il/fsu/

english/countries/belarus.html. Тут тры маленькія раздзелы: „Статыстыка“, „Кароткая гісторыя“, „Дзейнасць Джойнту“. З першага можна даведацца, што яўрэяў у Беларусі — 35—40 тысяч, што ў маленькіх гарадах людзей сталага ўзросту сярод іх каля 70% і што ім патрабуецца дапамога. У „Гісторыі“ згадваюцца Хаім Вейцман, Перас, Шагал і іншыя ўраджэнцы Беларусі, вядомыя ў свеце, аптымістычна сцвярджаецца, што, нягледзячы на ўсе цяжкасці, беларускія яўрэі адраджаюць сваё культурнае і грамадскае жыццё. У трэцім раздзеле пералічаны некаторыя вынікі гэтага адраджэння, у прыватнасці, школы, Народны ўніверсітэт, дабрачынны фонд „Хесэд“, што спансаруецца Джойнтам.

Найбольш удалай спробай напісання кароткай гісторыі беларускага яўрэйства мне падаецца артыкул па адрасе www.heritagefilms.com/BELARUS.html (на яго спасылаецца „хазарскі“ сайт), плён творчасці некалькіх аўтараў. Дзеля зручнасці дададзена карта Беларусі і храналогія асноўных падзей беларускай гісторыі. Падыход жа да гісторыі яўрэйскай тут даволі традыцыйны: „Яўрэі ў дарэвалюцыйныя часіны“, „Пад савецкай уладай да 1941 г.“ і г.д. Разглядаецца асобна й жыццё яўрэяў Заходняй Беларусі, што сведчыць на карысць сайту. Канечне, уключаны й сучасны перыяд гісторыі беларускага яўрэйства. Праўда, ён даведзены толькі да сярэдзіны 1990-х і інфармацыя не паднаўляецца ўжо, відаць, гады 3—4.

Такім чынам, абагульняючы і аналізуючы дадзеныя ўсіх узгаданых сайтаў, адкідаючы памылкі і яўныя недарэчнасці, любы карыстальнік Інтэрнэту можа скласці для сябе прыблізную карціну таго, чым было яўрэйскае жыццё на Беларусі ўчора (і пазаўчора) і чым яно ёсць сёння. Паўтаруся: толькі прыблізную. Найбуйнейшыя яўрэйскія структуры на Беларусі, „Саюз яўрэйскіх грамадскіх аб’яднанняў і суполак“ і „Юдэйскае рэлігійнае аб’яднанне“ сваіх сайтаў не мелі й не маюць, гэтаксама, як іхнія перыядычныя выданні, адпаведна „Авив“ (тыраж 2000 ас.) і „Берега“ (5000 ас.), і як Асацыяцыя грамад прагрэсіўнага юдаізму, што выдае газету „Мезуза“. Вось-вось мусіць з’явіцца сайт тоўстага гісторыка-літаратурнага часопіса „Мишпоха“ (выходзіць у Віцебску на расійскай мове), але на пачатак сакавіка 2000 г. пра часопіс у Інтэрнэце толькі згадвалася: напрыклад, па адрасе www.ort.spb.ru/(Win)/friend/

mishpro/mishpro.htm. У часопіса, адна з мэтаў якога — дапамога ў вышуку сваякоў і знаёмых, ёсць адрас электроннай пошты: mishpoha@aport.ru.
У СНД беларускае яўрэйства вывучаецца не дужа актыўна: прынамсі, аб гэтым сведчыць бадай што поўная адсутнасць работ пра Беларусь на сайце навуковага таварыства „Яўрэйская спадчына“, што ў Маскве (www.jewish-heritage.org). Праўда, прыведзены спіс даследчыкаў з Беларусі, яўрэяў і неяўрэяў, якія цікавяцца юдаікай: www.jewish-heritage.org/mmblstru.htm. Спіс гэты даўно не паднаўляўся, вось жа, „иных уж нет, а те далече“. Нехта ўсё ж і застаўся: ад Я.Анішчанкі да З.Пінхасіка, Г.Сінілы, Л.Фінкельштэйн.

Цяпер пяройдзем да кароткага агляду ізраільскіх сайтаў. У Ізраілі жыве болей за 35% яўрэяў свету, і доля гэтая павялічваецца. Пра гэтую дзяржаву ў Інтэрнэце знайсці можна ўсё, што заўгодна. У тым, напрыклад, што датычыцца палітыкі, найбольш аўтарытэтнымі будуць сайт ізраільскага парламенту — Кнэсэту (www.knesset.gov.il), дзе ўхіл робіцца ў бок інстытуцый і юрыдычных дакументаў, і сайт Міністэрства замежных спраў Ізраіля (www.israel.org & www.israel-mfa.gov.il), дзе, апрача пытанняў замежнай палітыкі, праблемаў міру на Блізкім Усходзе, дзейнасці амбасадаў і г.д., аглядаецца з крыху афіцыёзных пазіцый і ўнутранае становішча краіны. Тут ёсць матэрыялы на англійскай, іспанскай, французскай і іншых мовах.
Аднак да Беларусі ўсё пералічанае мае невялікае дачыненне. Увогуле, у Ізраілі, як і ў іншых „індустрыяльна развітых краінах“, пра Беларусь ведаюць мала — хоць Ізраіль і быў заснаваны не без дапамогі беларускіх яўрэяў — праўда, тады яны лічыліся, і лічылі сябе, ураджэнцамі Расіі ці Польшчы. Пра Беларусь ведаюць перадусім, канечне, імігранты з былога СССР, якіх з 1989 г. прыехала каля 840 тысяч чалавек[29]. Эмігрантаў з Беларусі сярод іх 66 тысяч, альбо 7,9%[30]. Часам — і часта — яны неяк губляюцца ў агульнай масе, пагатоў што, як піша былы жыхар Беларусі, літаратар А.Каштанаў, „нас тут усіх клічуць „рускімі“, хоць бы мы прыехалі з Украіны, Беларусі ці Сярэдняй Азіі...“[31] Беларускае зямляцтва ў Ізраілі, як слушна заўважыў А.Дынько[32], большае, чым яўрэйская супольнасць у Беларусі, аднак уласнага сайту ў Інтэрнэце не мае, тады як

украінскае зямляцтва мае, прынамсі, два: read.at/uzi і www.isrus.co.il/win_d/obs_d/obs_novuk.html. Не дзіва, бо з Украіны прыехала больш за 267 тысяч імігрантаў — у 4 разы болей, чым з Беларусі.

Расійскамоўныя імігранты ў апошнія гады актыўна пашыраюць сваю прысутнасць у сусветнай сетцы. На пошукавым сайце www.interface.co.il знаходзяцца тузіны спасылак; добрым дапаможнікам у вандроўках па віртуальным расійска-ізраільскім свеце будуць таксама каталог „Расійскія рэсурсы Ізраілю“ — www.fortunecity.com/meltingpot/melwood/1087/israel.htm, каталог ізраільскіх сайтаў (не выключна расійскамоўных) з гучнай назвай „Мята-партал“ russian.nana.co.il, новы цікавы каталог www.isrus.co.il... Ад багацця сайтаў на самыя розныя тэмы — турызм, бізнес, ахова здароўя, палітыка, рэлігія, культура, студэнцкае жыццё (тут варта паглядзець сайт студэнтаў Хайфы — olim.da.ru) разбягаюцца вочы, што для Інтэрнэту, зрэшты, ёсць нармальнай з’явай. Засяродзіць жа ўвагу можна на тым ці іншым напрамку: прыкладам, на міжземнаморскім горадзе Ашдодзе, дзе са 160-тысячнага насельніцтва імігранты складаюць ледзь не трэцюю частку. Да таго ж менавіта ў Ашдодзе жыве значная колькасць імігрантаў з Беларусі. У мінулым годзе тут быў адчынены першы Міжнародны цэнтр культурных і дзелавых сувязяў „Ізраіль-Беларусь“ (дырэктар — былы віцьбіч Аркадзь Крумер). У каталогах магчыма натрапіць на сайт намесніка мэра Ашдоду Шымона Кацнельсона, які, хоць і эміграваў з Украіны ў 1970-я гады, па словах А.Крумера, „паходзіць з вядомай дынастыі Кацнельсонаў, якая жыла калісьці ў Бабруйску“, а яшчэ ён „аказвае вялікую дапамогу Цэнтру“[33]. Аднак сайт Кацнельсона www.ashdod-beitenu.luckynet.co.il (сама)рэкламны. Ён быў створаны напярэдадні муніцыпальных выбараў 1998 г. і распавядае пра мэты руху „Наш дом Ашдод“, які ўзначаліў Кацнельсон, пра біяграфію лідэра і г.д. Значна цікавейшы новы сайт пра Ашдод: www.comfree.co.il/ashdod/index.html. Тут гасцінна прапанаваныя карта гораду, фотаздымкі ягоных кварталаў, звесткі пра арганізацыі і нават расклад руху аўтобусаў. Як ні дзіўна, але найбуйнейшыя расійскамоўныя газеты Ізраіля „Вести“ і „Новости недели“ ўласных сайтаў не маюць. Адзін з аглядаў ізраільскай прэсы на расійскай мове робіць нейкі

Міхалыч: www.geocities.com/SiliconValley/Lab/3187.htm. Дзеля знаёмства з непрыгладжаным вобразам Ізраілю раю наведаць. Ёсць яшчэ й проста „НепрыЛІЗАныя навіны“, іх рыхтуе Ліза: israel.ezhe.ru/news. Побач знаходзіцца, нечакана, Дэкларацыя незалежнасці Ізраілю на расійскай мове: israel.ezhe.ru/glossary/extra/declaration.html і, больш чакана, старонка ізраільскіх камандаў КВЗ: israel.ezhe.ru/kvn/index.html

Акрамя ашдодскага, у Ізраілі на пачатку 1999-га заснаваны быў яшчэ адзін палітычны рух, назва якога імітуе расійскую „НДР“. Гэта — невялікая правая партыя „Наш дом Ізраіль“, што абапіраецца ў асноўным на галасы расійскамоўных імігрантаў і мае ў Кнэсэце 4 месцы са 120. Яе лідэр, Авігдор Ліберман, былы імігрант з савецкай Малдавіі, фігура цікавая і супярэчлівая. Ён яўна неабыякавы да Беларусі і не аднойчы наведваў Мінск і наваколле. У 1995-м, прыехаўшы ў якасці генеральнага сакратара найбуйнейшай апазіцыйнай партыі „Лікуд“ (адкуль пазней сышоў), у інтэрв'ю зазначыў, што Беларусь магла б стаць добрым міжнародным турыстычным цэнтрам, калі б тут крыху шырэй выкарыстоўвалася англійская мова34. Летась ізноў прыязджаў і сустракаўся з дырэктарам Інстытуту сацыяльных і палітычных даследаванняў пры адміністрацыі прэзідэнта. Восенню ж 1999 г. Ізраіль, па запрашэнні партыі Лібермана, наведала група беларускіх членаў Нацыянальнага Сходу. У праграму партыі „Наш дом Ізраіль“ (1999 г.) былі ўключаны, паміж іншым, і наступныя тэзісы: „Увядзенне прэзідэнцкай формы праўлення; абранне прэзідэнта ўсеагульным непасрэдным волевыяўленнем; стварэнне рады нацыянальнай бяспекі пры прэзідэнту…“35. Ці не скарыстаў сп. Ліберман беларускі досвед? Кожны інтэрэсант можа ў яго пра гэта запытацца, калі звернецца на сайт y-liberman.net , што зроблены на трох мовах: на расійскай, англійскай і на гэбрайскай.

Сярод шматлікіх ізраільскіх расійскамоўных сайтаў увагі заслугоўвае цікавы, амаль постмадэрнісцкі віртуальны часопіс пра Ізраіль „Сонечны востраў“, заснаваны ў 1998 г. (kulichki.rambler.ru/sunisland). У ім, як распавядае анатацыя, „вершы, апавяданні, ўражанні, навіны, музыка…“ Дадам яшчэ — гісторыя Ізраілю, пераклады. Пазначана таксама наступнае: „Незалежна ад Вашай нацыянальнасці, веравызнання і месца жыхарства, мы будзем радыя выслухаць Вас і апублікаваць

Вашыя матэрыялы“.
Аматарам чорнага гумару, часопіса „Вожык“ і газеты „Навінкі“ прыйдзецца, верагодна, даспадобы газета для „тых, каму яшчэ смешна“ „Бесэдар?“ („Усё добра?“ — габр.). Адрасы: www.beseder.sharat.co.il; www.vesti.ru/beseder або www.israel.ru/beseder. Тут з пераменным поспехам высмейваецца жыццё ў Ізраілі дый ва ўсім свеце. Вось узор больш-менш бяскрыўднага жарту: „Прадаецца 32-пакаёвая кватэра ў цэнтры Масквы. 12 санвузлоў, 15 крытых стаянак. Падыходзіць для дзвюх сем'яў! Для сям'і Беразоўскага і сям'і Гусінскага“.
Карысна зайсці й на расійскамоўны сайт Ізраільскіх культурна-інфармацыйных цэнтраў у СНД www.il4u.org.il, дзе адразу ж можна даведацца пра надвор'е ў Ерусаліме і курс даляра адносна шэкеля. Акрамя таго, вам распавядуць пра адукацыю, культуру, гэбрайскую мову, армію і шмат чаго іншага. Усё гэта найчасцей інфармацыя агульнага плану: хто жадае большага, мае магчымасць прыняць удзел у „Дыялогах“ альбо распачаць „Пошук“, а таксама атрымліваць па электроннай пошце бюлетэнь навінаў. Што ж да Беларусі, існуе старонка адзінага Ізраільскага цэнтру ў Менску: www.il4u.org.il:8101/cultcent/Minsk. Тут пазначана, калі ён адкрыўся (у 1992 г.), навошта (каб „інфармаваць насельніцтва Беларусі пра ўсе аспекты жыцця сучаснага Ізраілю“), пералічаны ягоныя праграмы і праекты. Прапануецца расійскамоўны бюлетэнь цэнтру „*Анахну бадэрэх*“ („Мы ў дарозе“ — гэбр.). Ён асвятляе збольшага падзеі ў Ізраілі, часам закранаючы і жыццё беларускіх яўрэяў.
Так, мы ўсе ў дарозе. Толькі вось куды ідзем?
На гэтым і скончым.

1 В.Станішэўскі „Без чаго БНФ — не перадавая партыя“ // *Наша Ніва*, 31.01.2000, с.3. (назад)
2 Сервер — гэта „кампутар, які дазваляе адпраўляць інфармацыю кліентам“ (P.Moreau „L'extreme droite et Internet“ // *Pouvoirs*, #87, 1998, p.130.) (назад)
3 Джой. Параллельные миры Интернет“ // *АлВит пресс*, 6.01.2000, с.3. (назад)
4 „Гораду і свету“ (лац.). У дадзеным выпадку хутчэй „усім і

нікому“. (назад)
5 „Кожны дзень колькасць старонак павялічваецца на 1,5 мільёна ці 3 тэтрабайты інфармацыі“ — паводле *CompuServe*, 10.09.1998. Цыт у: P.Moreau, op. cit. (назад)
6 Не выключана, што менавіта з вынаходніцтвам сусветнай сеткі канчаткова ўсталявалася „эпоха фельетонаў“, пра якую пісаў Г.Гесэ ў „*Гульні шкляных перлаў*“ (1943). (назад)
7 „*Ферма жывёлаў*“ (1945), у беларускім перакладзе С.Шупы (Мінск, „Маст. літ.“, 1992) проста „*Ферма*“. Можа, гэта й мавэтон, два разы запар спасылацца на даўно памерлага пісьменніка, які з яўрэямі ці Беларуссю бадай нічога супольнага не меў, але што ж зробіш, калі Оруэл і Інтэрнэт гэтак добра рыфмуюцца. Жаргон кампутарнікаў, у прыватнасці карыстальнікаў Інтэрнэту — ці ж гэта не оруэлаўскі „newspeak“ — „навамова“? (назад)
8 Дасылайце, калі ласка, на адрас электроннай пошты: rubinchik@mailcity.com. (назад)
9 Гэта цалкам справа густу. Аматарам яўрэйскай музыкі, напрыклад, чаму б не зайсці на www.argus-x.com/berry і не паслухаць песні на ідышы ў выкананні славутых сясцёр Беры? (назад)
10 Б.Канторович „Евреи и революция“ // *Мишпоха* (Віцебск), №4, 1998. С.89. (назад)
11 H.Arendt „*Sur l’antisemitisme*“ (1951) // Paris, Calmann-Levy, 1984, p.12. (назад)
12 Е.Лукашевич „Режиссёр и его заповеди“ (інтэрв’ю) // *Белорусская газета*, 26.10.1998, с.24. (назад)
13 Паводле „*Беларускай энцыклапедыі*“ (т.7, Мінск, 1998, с.365) — „рэлігійны, нацыянальны і этычны светапогляд, які традыцыйна вызначаў вераванні і жыццёвы ўклад яўрэяў… У больш вузкім сэнсе — нацыянальная рэлігія яўрэяў…“ Часам у англійскай мове „*judaism*“ з’яўляецца сінонімам „яўрэйства“. (назад)
14 Зрэшты, нельга пагадзіцца са сцвярджэннем: „Паводле догмаў юдаізму — вузкай, нацыянальнай рэлігіі — іншапляменнікі не могуць быць сапраўднымі юдэямі…“ (С.Асиновский, Э.Иоффе „*Евреи. По страницам истории*“ Минск, 1997, с.139.). Могуць перайсці ў юдаізм і стаць „сапраўднымі…“, абы шчыра гэтага хацелі. Іншая справа, што ў сучасным юдаізме няма тэндэнцыі займацца місіянерствам

сярод неяўрэяў. Гэты агляд таксама не дзеля місіянерства зроблены. (назад)

15 Дзяржава, што існавала ў VII—VIII стагоддзях на тэрыторыі паміж Чорным і Каспійскім морамі. Ейнай дзяржаўнай рэлігіяй быў юдаізм. Нярэдка высоўваюцца версіі, што хазары былі продкамі сучасных усходнееўрапейскіх яўрэяў. Гл. таксама артыкул Поля Вэкслера ў гэтым нумары. (назад)

16 Кабала — літаральна „атрыманне“ (гэбр.) — ёсць, паводле „Беларускай энцыклапедыі“, „містычнай плынню ў юдаізме“. Калі больш падрабязна, гэта „эзатэрычнае яўрэйскае тэасофскае вучэнне з выразнымі элементамі містыкі і магіі“ (*Краткая еврейская энциклопедия*, т.4. Иерусалим, 1988, к.2). (назад)

17 Што, як мне падалося, зрабілі стваральнікі сайту „Паўлікіянскага камандорства ордэну тампліераў“ (members.tripod.com/~tamplier/kab/html). На жахлівым чорным тле месяцца матэрыялы рабіна Штэйнзальца і інш., відавочна, пазычаныя з сайту ізраільскіх кабалістаў. (назад)

18 Абрэвіятура ад „Хахма, біна, даат“ („Мудрасць, розум, веды“ — гэбр.). (назад)

19 Адзін з ейных завадатараў, вядомы ў Ізраілі грамадскі дзеяч Пінхас Палонскі, прыязджаў быў у Беларусь, выступаў у Ізраільскім культурна-інфармацыйным цэнтры ў Менску. (назад)

20 Гэтак жа, як і на расійскамоўным сайце „Падарожжа ў свет яўрэйскай Бібліі“ bible.ort.org. (назад)

21 Гл. таксама сайт „Эш га-Тары“ www.jew.ru (на расійскай мове). (назад)

22 Інстытут, дарэчы, атрымаў грант ад хабадніцкага фонду „Ор Аўнэр“. Гэта пазначана на www.fjc.ru/belarusfr.htm. (назад)

23 Змяшчаюцца адказы на пытанні кшталту: „Чаму ў яўрэяў дзень пачынаецца з вечара папярэдняга дня?“, „Ці можна спалучыць выкананне запаведзяў Торы з жыццём сучаснага чалавека?“ і ўсё такое. (назад)

24 Гл. электронную версію ягонай навуковай працы „*Рэч Паспалітая і Францыя на шляху да эмансіпацыі яўрэяў у другой палове XVIII ст.*“ па адрасе: www.jewish-heritage.org/prep51.htm. (назад)

25 №33 за 1999 г.: members.xoom.com/Nasa_Niva/1999/33/nn33.htm (назад)

26 Пададзеныя паводле вядомага літаратара і фальклярыста пачатку XX ст. С.Ан-скага. Гл. яго артыкул „Заговоры от дурного глаза… среди евреев Северо-Западного края“ у: *Мишпоха*, №5, 1999, сс.44—45. (назад)
27 На жаль, арыгінальны тэкст гэтага верша (1919 г.) вінаваціць яўрэяў у забойстве Хрыста ды ў спробе захопу ўлады ў свеце. Гл. пра гэта мой артыкул (памылкова прыпісаны І.Рэзніку) у газеце „*Еврейский камертон*“ (Тэль-Авіў), 21.10.1999, с.14. (назад)
28 Быў запісаны на кружэлку. А.Фрыдман цытуе яго паводле кніжкі Л.Лядава „*Аб варожасці да яўрэяў*“ (Менск, 1928, с.41). (назад)
29 Нагадаю, што агульнае насельніцтва Ізраілю перавышае 6 мільёнаў чалавек. (назад)
30 Больш дакладныя лічбы можна адшукаць на сайце Міністэрства абсорбцыі Ізраілю www.moia.gov.il. Там жа знаходзяцца й бягучыя звесткі па іміграцыі ў Ізраіль (www.moia.gov.il/active-rus). (назад)
31 А.Каштанов „Человек без свойств?“ // *Нёман* (Мінск), №8, 1996, с.173. (назад)
32 А.Дынько „Беларусы і жыды ў паралельным вымярэньні“ // *Наша Ніва*, №33/1999, с.7. (назад)
33 „Нас связывают аисты и 800 лет...“ (інтэрв’ю) // Мишпоха, №6, 1999, с.140. (назад)
34 Гл. газету „*Звязда*“ за 14.09.1995. (назад)
35 Гэта я бачыў на ранейшым сайце партыі „Наш дом Ізраіль“: www.beytenu.org.il. Традыцыйна прэзідэнт у Ізраілі выконвае сімвалічную ролю. Галоўная асоба краіны фактычна — прэм’ер-міністр. (назад)



Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

# Галіна Сініла
# Народ Кнігі

**Г**абрэі — хто яны такія? Адкуль прыйшлі? Куды ідуць? Гісторыя гэтага народу нясе ў сабе вялікую таямніцу. Паводле логікі, габрэі павінны былі ўжо знікнуць. Чаму ж яны жывуць і працягваюць ствараць сваю культуру? На думку многіх, габрэйскі лёс мае трансцэндэнтную прыроду, з'яўляецца не толькі феноменам, але ноўменам…

Галіна Сініла — дацэнт БДУ, спэцыяліст у германістыцы і гэбраістыцы, аўтар дысэртацыі па лірыцы Гёльдэрліна. У 1998 годзе выйшла яе кніга „Древние литературы Ближнего Востока и мир ТаНаХу (Ветхого Завета)“ (Эканомпрэс). Родам з-пад Лагойску.

**ТаНаХ і спецыфіка габрэйскае ментальнасці**

Неяк Юры Лотман выступаў з публічнай лекцыяй у Ленінградскім універсітэце. Апроч усяго, у лекцыі прафесар закрануў тэму сувязяў рускай літаратуры з Бібліяй. Калі настаў час пытанняў, адзін са студэнтаў спытаўся: „А чаму гэта ў Бібліі — усё габрэі ды габрэі, ні слова пра рускіх з тэхнічных прычынаў“, — адказаў прафесар Лотман і з'ехаў у Тарту. Сапраўды, хто можа „выправіць“ тое, што габрэі першыя навучыліся размаўляць з Адзіным Богам, што ў Бібліі назаўсёды замацаваны духоўны і гістарычны досвед менавіта габрэйскага народу — досвед, які стаўся такім значным для сусветнай цывілізацыі?

Каран вызначае габрэяў як першы „народ Кнігі“. Так, першая рыса габрэйскай культуры і цывілізацыі — гэта тое, што яны грунтуюцца на непахісным аўтарытэце Святога Пісання, на харызме Кнігі, уладзе якой аднойчы і назаўжды падпарадкаваліся габрэі. Уся наступная культура вырастае як своеасаблівы каментар да тэкстаў Святога Пісання (часта ў самым канкрэтным сэнсе гэтага слова, як у выпадку з

Талмудам). Нельга ўявіць сабе габрэйскую культуру без Торы — ТаНаХу і Талмуду (Вуснай Торы).

Першакнігай габрэйскай культуры стаў ТаНаХ, які ўвабраў у сябе гісторыю і духоўныя адкрыцці народу на этапе Старажытнасці — ад яго з'яўлення на гістарычнай арэне на пачатку II тыс. да н.э. да трагічных выпрабаванняў II ст. да н.э. Пісьмовая фіксацыя тэкстаў ТаНаХу адбывалася на працягу XIII —II ст. да н.э., канчаткова вырашылася пытанне аб складзе трэцяй часткі толькі ў II ст. н.э., а затым яшчэ на працягу некалькіх стагоддзяў ішоў складаны працэс кадыфікацыі, выпрацоўкі адзінай, дакладна замацаванай да апошняй літары версіі канону — так званай Масоры, або Масарэцкай Бібліі (масора — на іўрыце „пераемнасць", „традыцыя"). Такім чынам, унікальнасць старагабрэйскай культуры ў тым, што ўсё галоўнае, што яна напрацавала за два тысячагоддзі да н.э., сканцэнтравана ў адзінай Кнізе — у ТаНаХу, або габрэйскай Бібліі (*Biblia Hebraica*). Замацаваўшыся на пачатку эры ад Нараджэння Хрыстова, габрэйская Біблія цалкам увайшла ў склад Бібліі хрысціянскай, атрымаўшы ў ёй новую назву — Стары Запавет. Канечне, у змене назвы праявілася новая тэалагічная канцэпцыя: на змену Старому Запавету прыходзіць Новы, Стары Запавет толькі абгрунтоўвае сэнсы Новага, з'яўляецца пэўным Пралогам да Новага. З другога боку, для хрысціянскай свядомасці з самага пачатку было ясна, што Новы Запавет немагчыма адарваць ад Старога, што гэта можа павесці толькі да адрыву ад хрысціянства ў цэлым. Невыпадкова Св.Аўгусцін пісаў: „Новы Запавет хаваецца ў Старым, Стары адкрываецца ў Новым". З пункту ж гледжання габрэйскае традыцыі, ТаНаХ ніколі не можа „састарэць", ён заўсёды ўражвае асляпляльнай навіной, у ім ёсць усё для спасціжэння Бога, свету і чалавека. Патрэбна заўважыць, што і Новы Запавет — уласна хрысціянская частка Бібліі — узнік як заканамерны працяг пэўных тэндэнцый габрэйскай культуры, хоць і дайшоў да нас запісаным на грэцкай мове (гэта адбылося ў інтэрвале паміж 50 і 120 гг. н.э.). Да таго ж, праз усе тэксты ТаНаХу праходзіць лейтматыў бясконцага аднаўлення Запавету, і само з'яўленне Новага Запавету немагчыма без ідэі Запавету — Саюзу паміж Богам і чаловекам, — ідэі, на якой грунтуецца светаадчуванне габрэйскай, а ўслед за ёй і хрысціянскай

цывілізацыі.
У складзе хрысціянскай Бібліі глыбокія сэнсы, адкрытыя старагабрэйскай цывілізацыяй, сталі набыткам многіх народаў, якія прынялі хрысціянства. У VII ст. н.э. тэксты ТаНаХу часткова, у моцна перапрацаваным выглядзе, увайшлі і ў Каран. Таму тры канфесіі — юдаізм, хрысціянства, іслам — называюць аўраамітычнымі, бо само іх узнікненне было абумоўлена духоўным подзвігам праайца габрэйскага народу Аўраама.
Для галоўнай Кнігі габрэйскае культуры мала аднаго імя — нават у той традыцыі, што яе спарадзіла. Так, яна мянуецца ў множным ліку *Сфарым* — „Кнігі“. Дарэчы, менавіта адсюль грэцкая калька, вядомая ўсім, — *biblia* — з тым жа значэннем, а ад яе — усе вытворныя ў еўрапейскіх мовах, дзе гэтае слова набыло адзіночны лік. Множнасць у адзінстве, еднасць у множнасці — у гэтым адна з таямніц вялікай Кнігі. Мянуецца яна таксама *га-Сэфэр га-кадош* — „Святая Кніга“ з падвойным пэўным артыклем, які падкрэслівае яе ўнікальнасць. Таксама яна называецца *Сіфрэй га-кодэш* — „Святыя Кнігі“. А яшчэ — з вялікай пашанай — *Сэфэр га-Сфарым* — „Кніга Кніг“. А яшчэ — *га-Мікра* — „Чытанне“, прычым ізноў з пэўным артыклем: галоўнае і свайго кшталту адзінае ў свеце Чытанне для чалавека. Але найчасцей ужываецца вельмі ёмістая назва *ТаНаХ*. Гэта своеасаблівая абрэвіятура, у якой зычныя *ТНХ* паказваюць на тры часткі габрэйскай Бібліі, з’яўляюцца першымі літарамі назваў трох частак Святога канону: Тора (Закон), або Пяцікніжжа Майсеева, Нэвіім (Прарокі), Кетувім (Пісанні). Пры гэтым апошняе [к] напрыканцы слова адпаведна фаналагічным законам іўрыту пераходзіць у [х], таму вымаўляецца *ТаНаХ*. Менавіта дзве першыя часткі канону, якія ўжо канчаткова склаліся ў той час, меў на ўвазе прапаведнік з Галілеі (паўночнай Юдэі) Ешуа га-Ноцры, вядомы ўсяму свету як Ісус з Назарэту, або Ісус Хрыстос, у Нагорнай Пропаведзі: „Не думайце, што Я прыйшоў парушыць Закон або Прарокаў, не парушыць прыйшоў Я, але здзейсніць“ (*Мц., 5:17*). Габрэйскае Святое Пісанне было і Ягоным Святым Пісаннем. Пытанне ж наконт трэцяй часткі канону канчаткова вырашылася толькі ў II ст. (з гэтых кніг Ісус успамінае толькі псальмы).
У канон ТаНаХу ўвайшлі 39 кніг, адабраных з цягам часу

габрэйскімі кніжнікамі, адрэдагаваных і замацаваных да апошняй літары. Яны падзяляюцца, як сведчыць сама назва канону, на тры раздзелы (сакральная лічба тры, што сімвалізуе ўсе дынамічныя працэсы — кожны мае, так ці інакш, пачатак, сярэдзіну і канец — і, урэшце, само жыццё, пакладзена ў фундамент канону). Тора ўключае пяць эпічных і адначасова заканадаўчых кніг, аўтарства якіх рэлігійная традыцыя звязвае з імем прарока Майсея: *Бэрэшыт, Шэмот, Ваікра, Бэмідбар, Дэварым*, або ў славянскай традыцыі *Быццё, Выхад, Левіт, Лічбы, Другазаконне* (гэтыя назвы не з'яўляюцца перакладам назваў на іўрыце, але склаліся пад уплывам грэцкага перакладу). У другі раздзел ТаНаХу — Прарокі — увайшла 21 кніга, і склад гэтага раздзелу больш разнастайны па сваіх жанрах, чым Тора. Але пачынаюць яго таксама кнігі хранікальна-эпічныя, з элементамі перш-наперш гераічнага эпасу: Кніга Егошуа бін Нуна (Ісуса Навіна), Кніга Суддзяў, 1-я і 2-я Кнігі Шэмуэля (Самуіла), яны ж — 1-я і 2-я Кнігі Царстваў у грэцкай і славянскай Біблііі, гэтаксама 1-я і 2-я Кнігі Цароў — 3-я і 4-я Кнігі Царстваў. Далей ідуць творы, што не ведаюць аналагаў у суседніх культурах, — праройкія кнігі. Традыцыйна пятнаццаць праройкіх кніг падзяляюцца на трох вялікіх прарокаў — гэта кнігі Ешаягу (Ісаі), Ірмеягу (Ераміі), Ехэзкэля (Езэкііля) — і дванаццаць астатніх (*трэй-асар*), якія ў хрысціянскай традыцыі мянуюцца „малымі" прарокамі (перш за ўсё за невялікія памеры кніг). Назва трэцяга раздзелу — Пісанні — падкрэслівае, што ён складаецца з адносна самадастатковых, менш звязаных паміж сабою кніг. Гэты раздзел — самы цікавы ў сваёй жанравай разнастайнасці і ўключае творы, натхнёныя, згодна з рэлігійным поглядам, *Руах га-кодэш* — Духам Святым. У Пісанні ўваходзяць шэдэўры старагабрэйскай лірыкі ў розных яе мадыфікацыях: Псалтыр, што стала фундаментам габрэйскае і хрысціянскае літургіі; Песня Песняў (або, як у перакладзе Ф.Скарыны, — Песня Песням); Эклезіяст (дакладней, Эклесіаст — грэцкая калька з іўрыцкага *Когэлет* — „Той, хто прапаведуе ў сабранні", г.зн. — перад рэлігійнай суполкай); Кніга Плачу (або Плач Ераміі); Кніга Ёва (Іова). Гэтая кніга, як і Эклезіяст, мае дачыненне да так званай літаратуры мудрасці, што ўзнімае ў першую чаргу складаныя, часта амаль невырашальныя маральна-этычныя і філасофскія праблемы быцця і чалавечай свядомасці.

Літаратуру мудрасці прадстаўляе таксама вялікая кніга афарыстыкі — Кніга Прыпавесцяў Саламонавых. З прыпавесці-афарызму вырастае аповесць-прыпавесць, у якой сюжэт служыць для ілюстрацыі таго ці іншага рэлігійна-філасофскага і маральнага тэзісу або падводзіць чытача да гэтага тэзісу. Да жанру аповесці-прыпавесці адносяцца Кніга Рут (Руф), Кніга Эстэр (Эсфір), гэтаксама і Кніга Ёны (прарока Ёны, або Іоны), хоць яна і апынулася ў складзе пароцкіх кніг. За межамі канону гэты жанр прадстаўляюць слынныя кнігі, якія з розных прычынаў былі выключаны габрэйскімі мудрацамі, але засталіся на правах неканонічных (дэйтэракананічных) у хрысціянскай Бібліі, — Кніга Егудзіт (Юдзіф), Кніга Товія (Товіта). Выключна важнае значэнне як для габрэйскай, так і для хрысціянскай свядомасці мае Кніга Даніэля (Кніга прарока Данііла), бо ў ёй упершыню крышталізуюцца рысы своеасаблівага жанру, які вынікае з пароцкіх кніг, — рысы апакаліпсісу — Адкрыцця пра апошнія дні нашай зямной гісторыі, яе выбух і пераход у эсхаталогію, пра Найвышэйшы Суд і надыход царства Машыяха (Месіі).

У хрысціянскім Пісанні Кніга прарока Данііла залічана да кніг вялікіх прарокаў, яе літаратурная топіка і стылістыка сталіся вельмі важнымі для новазапаветных тэкстаў, асабліва для Адкрыцця Яна Багаслова. У трэцюю частку габрэйскай Бібліі ўвайшлі таксама Кнігі Эзры (Ездры) і Нехем'і (Неэміі), напісаныя ад першай асобы іх аўтарамі, якія ўзначалілі вяртанне юдэяў з вавілонскага палону. Завяршаюць канон 1-я і 2-я Кнігі Хронік, за якімі ў славянскай Бібліі замацавалася грэцкая назва — Кнігі Параліпоменан, што азначае па-грэцку „запаўненне прабелаў". І сапраўды, гэтыя кнігі апавядаюць пра тыя ж гістарычныя падзеі, што і Кнігі Царстваў, але падаюць іх скарочана, адпаведна прынцыпу аналаў, а некаторыя, наадварот, дапаўняюць, разгортваюць (у хрысціянскай Бібліі Кнігі Параліпоменан і размешчаны адразу пасля Кніг Царстваў).

ТаНаХ злучае ў адзінае цэлае, у адзіны рэлігійна-гістарычны эпас дыялог паміж чалавекам і Богам, Я і Вечным Ты — у тэрміналогіі Марціна Бубэра. Гэты дыялог з'яўляецца стрыжнем Святоўнай гісторыі, якая ёсць адначасова самай сапраўднай гісторыяй габрэйскага народу. ТаНаХ упершыню адкрывае гісторыю як мэтаскіраваны працэс — як рух свету ад яго

Стварэння Вышнім да яго канчатковай гарманізацыі напрыканцы няправеднай гісторыі і надыходу Царства Мэсіі. Сам народ разглядае сябе як свайго кшталту інструмент у Боскіх руках дзеля здзяйснення Ягонай задумы. Гістарычны рух асэнсоўваецца як паступовае раскрыццё душы чалавечай перад Богам, як здольнасць прыняць у сябе і несці вобраз Божы.

**Нябачны свет Талмуду,**
**або**
**Народ Ізраілю на шляхах выгнання і вяртання на радзіму**

У першыя стагоддзі Новай эры пасля разбурэння Ерусаліму рымлянамі і выгнання народу Ізраілю з ягонай старадаўняй радзімы габрэі ўсё больш рассейваюцца па розных кантынентах. Частка апынаецца ў Месапатаміі, Афрыцы, на Іберыйскім паўвостраве (так званыя *сфарадзім* — сефарды, ад *Сфарад* — сярэднявечнай габрэйскай назвы мусульманскай Іспаніі), частка — у Заходняй і Цэнтральнай Еўропе (так званыя *ашкеназім* — ашкеназы, ад сярэднявечнай назвы Германіі — *Ашкеназ*). У розных арэалах габрэйская культура набывае новыя рысы, на якія ўплывае культура народаў, побач з якімі жывуць габрэі. Як у такой сітуацыі можна было захаваць адзінства? Безумоўна, з дапамогаю Торы. Але як не развучыцца разумець Тору? Тут выявілася велізарная роля ў захаванні народу як цэлага яшчэ адной найгалоўнай кнігі, на гэты раз толькі для габрэяў — Талмуду.

У масавай свядомасці слова выклікае асацыяцыі з нечым цьмяным і калі не нячыстым, дык ужо дакладна — занадта заблытаным і цяжкім для разумення. Нездарма ж слова *талмуд* ужываецца ў нас як агульны назоўнік для ўсяго таго, што мае вялізны памер і ў чым няма надзеі знайсці сэнс. Так, памер сапраўды не маленькі — больш за шэсцьдзесят трактатаў, якія займаюць прыблізна трыццаць тамоў энцыклапедычнага фармату, да таго ж — на дзвюх мовах, іўрыце і араміце (арамейскай). Дагэтуль няма ніводнага поўнага перакладу на іншыя мовы, перакладаліся толькі фрагменты, якія не могуць даць уяўлення пра цэлае.

Зараз над перакладам Талмуду на ангельскую мову працуе ў Ізраілі цэлы Інстытут праблемаў юдаізму. Сапраўды, як перакласці простае слова „пытанне“, бо на іўрыце каля дваццаці сінонімаў гэтага слова, дваццаць відаў пытанняў, па-

ангельску ж — адно-адзінае слова... У Талмудзе перад намі паўстае культура, якая яшчэ ў сівой Старажытнасці пачала задаваць пытанні, добра ведаючы, што не на ўсе з іх можна знайсці адказы.

*Талмуд* на іўрыце азначае „вучэнне“ (як працэс), „вывучэнне“ (*талмід* — вучань). Вывучэнне чаго? Торы. Талмуд ёсць практычным увасабленнем, можа, самай значнай для юдаізму канцэпцыі *міцват талмуд Тора* — „запаведзі вывучаць Тору“, прычым само гэтае вывучэнне нясе ў сабе і мэту, і ўзнагароду. Як сказаў адзін з мудрацоў Талмуду, „зноў і зноў гартай яе (Тору), бо ў ёй змяшчаецца ўсё. Углядайся ў яе, і састарся ў ёй, і ніколі не разлучайся з ёю, бо няма ў свеце дабрадзейнасці, большай за гэтую“. Талмуд узнікае як пісьмовая фіксацыя шматвяковай традыцыі вуснага тлумачэння ТаНаХу, як разгорнуты каментар на палях Вечнай Кнігі.

Талмуд падзяляецца на дзве часткі: першая — Мішна (на іўрыце — „паўтарэнне“) — уяўляе сабою ўласна тэкст, і напісаная яна на іўрыце, другая — Гемара (на араміце — „завяршэнне“ і адначасова „ўспрынятае ад настаўніка“) — каментар і тлумачэнні да Мішны, і яна існуе на арамейскай мове. Мішна складалася танаямі (*тана* — па-арамейску „той, хто паўтарае“ — першым пакаленнем габрэйскіх мудрацоў пасля завяршэння ТаНаХу, Гемара — амараямі (*амора* — па-арамейску „той, хто гаворыць“), якія давалі сваё разуменне выказанага танаямі. Мішна існуе ў адной кананічнай версіі, тады як Гемара — у дзвюх: у Ерусалімскім Талмудзе (*Талмуд Ерушалмі*) і Вавілонскім Талмудзе (*Талмуд Баўлі*). Апошні больш аўтарытэтны.

За Талмудам, як і за ТаНаХам, стаіць велізарны час — амаль дзесяць стагоддзяў, з V ст. да н.э. па V ст. н.э. Паступова традыцыя вуснага тлумачэння, гібкага разумення Закону стала справай нумар адзін для такой плыні ў юдэйскай традыцыі, як *перушым* — фарысеі. Гэтае іўрыцкае слова ў грэцкай абалонцы набыло ў еўрапейскіх мовах сэнс „крывадушнікі“ — дзякуючы Евангеллям. Гістарычныя фарысеі былі ў гэтым вінаватыя не больш за іншых. *Перушым* („тыя, што аддзяліліся“, бо яны сапраўды аддзяліліся ад поглядаў кансерватыўных садукеяў) верылі, што жывая пераемная сувязь, духоўная традыцыя значыць не менш за кананічнае Святое Пісанне. Традыцыя асэнсоўвалася імі як Адкрыццё, што даруецца ўвесь час. Ад

прарока Майсея — а яму Бог адкрыў не толькі Пісьмовую, але і Вусную Тору — Адкрыццё было перададзенае прарокам, ад іх — мудрацам, якія тлумачылі Закон, духоўным настаўнікам народу. Шматлікія пакаленні мудрацоў-кніжнікаў распрацавалі прынцыпы *мідот* — шляхоў тлумачэння тэкстаў ТаНаХу. Яны выводзілі, абапіраючыся на тору, новыя законы, якія павінны былі вызначаць жыццё народу ў новых умовах. Таму Мішна вызначаецца яшчэ як Галаха — практычныя законы, правілы паводзінаў у тых ці іншых жыццёвых умовах. Як часта жартуюць габрэі, усё, што ў Талмудзе не Галаха, ёсць Агада. Агада — у перакладзе з іўрыту „паданне“, „аповед“ — апавядальная частка Талмуду — паданні і прыпавесці. Бадай што асноўным жанрам Агады з'яўляецца *ма'асэ* — аповед пра ўчынкі праведніка. Але ма'асэ — толькі сродак абгрунтавання і вывядзення новых *галахот* — практычных законаў. Акрамя таго, у Талмудзе прысутнічае адзін з самых спецыфічных жанраў габрэйскай рэлігійна-філасофскай літаратуры — *мідраш* (ад кораню са значэннем „дапытвацца“, „дашуквацца сэнсу“), які таксама падзяляецца на Мідраш Галаха і Мідраш Агада. Мідраш — гэта каментар да асабліва складанага фрагменту, ці радка, ці нават слова Святога Пісання. Па сутнасці, гэта пачатак герменеўтыкі.

Талмуд пабудаваны як дыскусіі мудрацоў, якія абмяркоўваюць той ці іншы фрагмент тэксту, той ці іншы закон і выказваюць розныя пункты гледжання, спрачаюцца і дапаўняюць адзін аднаго. І нават тая думка, якая засталася ў меншасці, запісваецца: як ведаць, можа пройдзе час, і стане зразумелым, што яна мела рацыю. Гэта адкрыты дыскурс, у якім пануюць плюралізм і адзінства духу, талерантнасць і парадаксальнасць мыслення, дзе думка разгортваецца па асацыяцыі, дзе тэкст Святога Пісання бачыцца не толькі па гарызанталі, але і па вертыкалі — усе падобныя кантэксты адразу.

Напачатку Талмуд уяўляў сабою Вуснае Вучэнне ў прамым сэнсе гэтага слова: шматлікія тлумачэнні не запісваліся, а завучваліся напамяць, перадаваліся ад настаўніка (рава) да вучня. Танаі, спадчыннікі Ёханана бэн Закая, гадаванцы заснаванай ім духоўнай Акадэміі ў Яўнэ, уяўлялі сабою у некаторым сэнсе жывыя кнігі — столькі тысячаў і нават мільёнаў радкоў каментару да Святога Пісання яны ведалі напамяць. Але на мяжы II—III ст. у Палестыне склалася пагроза

жыццю многіх славутых рабі. І тады вялікі знаўца Вуснай Торы, лідэр габрэйскай суполкі, якая з вялікай цяжкасцю, але ўсё яшчэ існавала ў Святой Зямлі, Егуда га-Насі, запісаў і кадыфікаваў Мішну. Так традыцыя парушыла сама сябе, каб сябе захаваць. Потым ужо ў славутых ешывах Суры і Пумбедыты на прасторах былой Вавілоніі, куды перасунуліся цэнтры габрэйскае культуры ў IV—V ст., складаецца спачатку вусна, а потым запісваецца Гемара.
Талмуд ёсць універсумам. У ім падлягаюць дэбатам і асэнсаванню практычна ўсе сферы чалавечага быцця. У выніку дзесяці-пятнаццаці гадоў вывучэня Талмуду ў ешыве габрэі атрымлівалі сапраўды ўніверсальную адукацыю, каб жыць не толькі адпаведна габрэйскім законам, але і адпаведна законам універсальнага чалавецтва.
Кадыфікацыю ТаНаХу і складанне і запісванне Талмуду паскорыла палеміка юдаізму з узніклым хрысціянствам, якое прэтэндавала на адзіна правільнае разуменне Святога Пісання. Вусная Тора выступала як спецыфічны ключ для сапраўднага чытання Бібліі — ключ, якім валодаюць габрэі. У хрысціянстве ж складаецца дактрына, згодна з якой народ Ізраілю перастаў быць выбраным народам і саступіў дарогу „новаму Ізраілю“ — хрысціянскай суполцы. Габрэі былі абвешчаныя нашчадкамі не Майсея, Аарона, Давіда, Ераміі, Ісаі, але Датана і Авірама, Ахава і Манасіі — самых негатыўных персанажаў ТаНаХу. Дакорлівыя словы прарокаў былі зразуметыя як бясспрэчнае сведчанне супраць габрэйскага народу. Ніводзін народ не заплаціў такой высокай цаны за веліч сваіх рэлігійных правадыроў, як сказаў Джэймс Паркер.

**Беларускія старонкі габрэйскай культуры**
У Польшчы габрэям прытулак і прывілеі даў Казімір Вялікі. Паданне кажа, што калі габрэі рухаліся з Заходняй Еўропы ва Ўсходнюю, уцякаючы ад ганенняў пад час Крыжовых паходаў і абвінавачванняў у распаўсюджванні чумы, з неба ўпала запіска з двума словамі — *по лін*, што значыць „тут жыві“. І яны пасяліліся тут і назвалі Польшчу *Палін*. Але праз стагоддзе і тут пачаліся прыцясненні. У 1389 г. для іх адчыніў браму Вялікага Княства Літоўскага Вітаўт — і габрэі пасяліліся ў Горадні, Берасці і іншых гарадах і мястэчках Літвы-Беларусі. Ясна, што і тут былі абмежаванні і выгнанні, як сумна вядомае

выгнанне вялікім князем Аляксандрам у 1495 г. Але габрэі вярталіся і адраджалі сваё жыццё. І тут былі пагромы, але радзей і найбольш — справакаваныя царскім рэжымам. Так, Беларусі не датыкнулася жудасная хваля пагромаў 1880—81 гадоў, але ў 1904 годзе адбыўся — пасля крывавага пагрому ў Кішынёве — пагром у Гомелі, пад час якога габрэі стварылі аддзелы самаабароны. Тут, у Беларусі, было менш крыві, больш талерантнасці. Можа таму Беларусь і стала адным з найбуйнейшых у Еўропе цэнтраў габрэйскай духоўнасці ў XVIII — пачатку XX ст. Менавіта тут разгортваецца вялікая дыскусія і вялікая спрэчка хасідаў і міснагідаў — паборнікаў класічнага равіністычнага юдаізму.

У другой палове XVIII ст. рабі Аарон Вялікі, услед за славутым Баал Шэм Товам, пачаў прапаведаваць хасідызм — служэнне Богу ў радасці сэрца — у мястэчку Каралін каля Пінску. Хасідаў у Беларусі доўга называлі карлінерамі. Рабі Аарон Вялікі памёр вельмі маладым, але заснаваная ім суполка карлінераў існуе і зараз у Ізраілі і ЗША. Пад ягоным уплывам невялічкія суполкі хасідаў утварыліся ў Пінску, Мінску, Шклове. У 1772 г. барацьбу супраць хасідаў з іх „ерэтычным“ вучэннем пачаў віленскі равін Эліягу бен Шлома Залман, ці Эліягу Гаон — славуты Віленскі Гаон (апошняе слова можна перакласці як „геній“), увасабленне класічнай равіністычнай вучонасці. Віленскі Гаон абараняў аўтарытэт Божай Торы і Талмуду, нагадваў, што служэнне Вышняму немагчымае без упартай працы над вялікімі кнігамі габрэйскае культуры. Супярэчнасці паспрабаваў прымірыць у сваім вучэнні Шнэур Залман родам з Лёзна, празваны Алтэр Рэбе — Стары Рэбе, пачынальнік дынастыі хасідскіх цадзікаў і равінаў Шнэерсонаў і заснавальнік Хабаду — адной з самых магутных плыняў унутры хасідызму. Яшчэ хлопчыкам Шнэур Залман выявіў вялікія здольнасці і вялікія веды ў тэкстах ТаНаХу і Талмуду. З пятнаццаці гадоў ён жыў у Віцебску, але яго так і цягнула адначасова ў Вільню, да Вялікага Гаона, і ў Межырыч, да славутага Вялікага магіда (прапаведніка) — рава Дова Бэра, самага таленавітага вучня Баал Шэм Това і духоўнага лідэра ўсіх хасідаў. Рабі Доў Бэр і прадказаў, што Шнэур Залман, „гэты будзе рабінам усёй Беларусі“. Так і адбылося. Слова Хабад створана як абрэвіятура з трох пачатковых літараў словаў *хохма* — „мудрасць“, *біна* — „разуменне“, *даат* —

„веды“. Згодна з гэтай канцэпцыяй, вытокам веры з’яўляецца не рэлігійны экстаз, як лічылі іншыя хасіды, але розум. Розум павінен кіраваць пачуццямі. Шнэур Залман лічыў добрай толькі тую экзальтацыю, якая ёсць вынікам вучэння, разважання, сузірання, да якой не прымешваюцца пачуццёвае і цялеснае ўзрушэнне. У чалавеку існуюць дзве душы: жывёльная, крыніца фізічнай энергіі і эмоцый, і Боская — крыніца духу. Апошняя ёсць часткаю Бога, яна існавала яшчэ да таго, як трапіла ў цела чалавека, яна працягвае існаваць і пасля смерці. Кожная з дзвюх душаў мае свой розум і сваю волю, і „чалавечы розум“ першай выяўляе сябе ў навуках, мастацтвах, рамёствах, а „Боскі розум“ другой — у пошуках Вышняга, у духоўнай чысціні і святасці. „Жывёльная душа“ хоць і не ёсць злом, але валодае „цягаю да зла“, „Боская душа“ валодае „цягаю да дабра“, імкнецца пераўтварыць пачуцці і страсці чалавека ў любоў да Таго, хто стварыў свет. Дзве душы суадносяцца як цемра і святло. У праведніку перамагае Боская душа, і таму ён здольны ператварыць зло ў дабро, цемру ў свет, горыч у слодыч. Адзінства з Вышнім забяспечваюць толькі добрыя справы, сілу для якіх дае Боская, разумная душа. Яна мае тры асноўныя ўласцівасці: мудрасць — патэнцыйны розум, разуменне — дзейсны розум, веды — злучэнне суб’екта і аб’екта пазнання, пераўтварэнне думак у намеры, сінтэз інтэлекту і эмоцый. Задача чалавека — вывучаць Закон, які даў Вышні, выконваць запаведзі Яго з разуменнем. Толькі тады ўся істота чалавека будзе аддана служыць Богу.

Менавіта ў Беларусі нараджаецца вялікая культура на мове ідыш, якая, на жаль, будзе вынішчаная фашызмам разам са штэтламі — габрэйскімі мястэчкамі. Пачынальнікам літаратурнага ідышу стаў славуты Мендэле Мойхер-Сфорым (Мендэле-Кніганоша), які нарадзіўся ў мястэчку Копыль і зваўся на самой справе Шаломам Якавам Рабіновічам (1835(?)—1917).

Тут, на зямлі Беларусі, і нарадзілася наноў гэтая прага вяртання на Святую Зямлю. Адсюль накіраваўся ў Эрэц-Ісраэль Бэн-Ягуда, каб аднавіць іўрыт. Тут мужнеў у Валожынскай ешыве талент Хаіма Нахмана Бяліка, які загаварыў у сваіх вершах моваю прарокаў. Менавіта тут склалася асаблівая атмасфера, каб старажытны народ зразумеў патрэбу нацыянальнага аднаўлення. Таму і парыванне беларускага

народу да нацыянальнага адраджэння зразумелае габрэйскай душы.

[image]
[image]

**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

---

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

# Станіслаў Краеўскі Параўнаньне юдаізму з хрысьціянствам: некалькі прыкладаў

Само параўнаньне юдаізму з хрысьціянствам вельмі спрэчнае. Доўгія стагодзьдзі жыды паглядалі на Царкву зь перасьцярогай, а ў хрысьціянстве бачылі сродак дыскрымінацыі. Пэўныя зрухі ў лепшы бок пачаліся тады, калі ў Эўропе паўсталі адкрытыя грамадзтвы. Да гэтага ўсе магчымыя супадзеньні або падабенствы трактаваліся як неістотныя, бо найгалаўнейшым лічылася тое, што хрысьціянства ўтрымлівае элемэнты ідалапаклонства (абагаўленьне Хрыста, культ абразоў) і мае ўзурпатарскія схільнасьці (прысабечыла жыдоўскае Пісаньне, назвалася „праўдзівым Ізраілем“). Некаторыя жыды, праўда, і раней прызнавалі пазытыўную ролю хрысьціянства, і лічылі, што яно насамрэч зьяўляецца спосабам судакрананьня з сапраўдным Богам, аднак аб’ектыўнае параўнаньне юдаізму з хрысьціянствам сталася мажлівым толькі ў наш час.
Усе мы жывем у вялікай меры ў сьвецкай прасторы і маем шмат супольных выклікаў, таму ўсё больш і сярод жыдоў, і сярод хрысьціянаў зьяўляецца тых, хто добра разумее другі бок. І хоць спасярод жыдоў і далей пераважае вобраз Царквы як сілы, якая ўяўляе сабой пагрозу, аднак ня толькі сярод „рэфармаваных“, але і сярод „артадаксальных“ жыдоў ёсьць тыя, хто лічыць, што дыялёг між юдаізмам і хрысьціянствам ёсьць нечым большым, чымся спаўненьнем пэўнае дыпляматычнае фармальнасьці, што ён можа спрычыніцца да

пабудовы рэальнага партнэрства.
У жыдоўскім асяродзьдзі, як і ў хрысьціянскім, традыцыйна існавала супрацьстаўленьне юдаізму і хрысьціянства як сутнасна адрозных, адасобленых спосабаў мысьленьня, якія „застаюцца ў фундамэнтальнай апазыцыі“. Прыхільнікі гэтае думкі робяць акцэнт на адрозьненьнях; яны наперад адкідаюць нават саму магчымасьць існаваньня важных падабенстваў, насуперак тым адрозненьням. Мяркую, што дрэнна, калі адсутнасьць падабенстваў закладаецца загадзя.
Найважнейшай крыніцай падабенстваў і супадзеньняў між юдаізмам і хрысьціянствам зьяўляецца супольная крыніца (Гэбрайская Біблія), зь якой таксама вынікае пэўная агульнасьць у поглядах на сьвет і чалавека. Гэта надзвычай яскрава бачна здалёк, напрыклад, зь Індыі. На індыйскай тэалягічнай мапе, што фіксуе ўсе магчымыя рэлігійныя канцэпцыі, юдаізм і хрысьціянства зьмешчаныя побач. Зь іншага боку, гэтая агульнасьць выклікае вострыя супярэчнасьці: сваркі паміж сямейнікамі — найгоршыя. Яны, аднак, не пазбаўляюць сямейнага падабенства і не адмаўляюць таго факту, што сварыцца лёгка, бо абодва бакі па сутнасьці гавораць на адной і той жа мове.
Трэба прызнаць, што мне гэтае сямейнае падабенства падаецца нашмат больш важлівым за адрозьненьні. Шкада, што жыды часта яго ня бачаць. Не, гаворка ня йдзе пра сьціраньне адметнасьцяў. Адрозьненьняў, якія прывялі да іншага тлумачэньня прыроды Хрыста, нельга нэўтралізаваць. Для хрысьціянаў Ісус — звышчалавек, для жыдоў — калі яны маюць хоць найменшую сувязь з традыцыяй — ён ня можа быць гэткі. Мы наўмысна не разглядаем тут пытаньне „мэсіянскіх жыдоў“, бо яны ўтвараюць, у прынцыпе, хрысьціянскія групы, якія ня ўпісваюцца ў кантэкст юдаізму.
Аб’ектыўна параўнаць юдаізм і хрысьціянства вельмі складана. Пад час такога параўнаньня звычайна ствараецца сынтэтычны вобраз абодвух бакоў — такі сабе ўзорны юдаізм або чыстае хрысьціянства — і ігнаруюцца нутраныя адметнасьці кожнага зь іх. Прыкладам выхаду за межы схемы можа стацца параўнаньне юдаізму з індуізмам, больш прыдатнае для спакойнага аналізу з прычыны неабцяжаранасьці гістарычнымі перадумовамі і палітычнымі эмоцыямі. Дык вось, адным з базавых элемэнтаў у індыйскім бачаньні сьвету зьяўляецца

перасяленьне душаў. Гэта, аднак, ніяк не прапісана ў юдаізьме. Вядома, аднак, што ў жыдоўскіх містычных плынях часам фармулявалася вера пра перасяленьне душаў *(gilgul neszamot)*. Сярод кабалістаў, якія прытрымліваліся гэтай веры, былі такія людзі, як Ізаак Люрыя, якія вельмі паўплывалі на пазьнейшы юдаізм. Гэта сьведчыць пра тое, што ў межах фактычна існуючага юдаізму магчыма было — і ёсьць — больш, чым дапускаюць стандартныя падыходы. Адрозьненьне паміж юдаізмам і індуізмам у пытаньні перасяленьня душаў не зьнікае, але перастае быць такім выразным і абсалютным. Параўнаць юдаізм і хрысьціянства на першы погляд вельмі проста, бо большасьць паняцьцяў — супольныя. Аднак гэта часам можа ўводзіць у аблуду, бо тэрміны ўжываюцца адны й тыя ж самыя, але значэньні яны маглі набыць адрозныя. За падабенствам крыецца адрозьненьне.
Ніжэй пададзеныя сем прыкладаў пошуку адрознасьцяў за падабенствамі, і наадварот. Яны не спрабуюць вычарпаць тэму, а толькі паказваюць, зь якімі праблемамі мы сутыкаемся, параўноўваючы.

**Адрозьненьні, нягледзячы на падабенствы: дзьве рэлігіі?**
Лічыцца, што хрысьціянства і юдаізм, нягледзячы на адрозьненьні, маюць падобны характар, бо зьяўляюцца рэлігіямі. Хрысьціянства — гэта рэлігія *par excellence.* Аднак ёсьць жыды, якія сумняюцца, ці можна юдаізм назваць рэлігіяй. Альбэрт Айнштайн так сфармуляваў гэтае сумненьне: „ад жыда патрабуецца ня столькі „вера“, колькі асьвячэньне жыцьця ў звышасабовым значэньні“. Кідаецца ў вочы і тое, што калі хрысьціянства — гэта супольнасьць аднаверцаў, то жыдам ты ёсьць з прычыны нараджэньня.
Супрацьстаўленьне веры і паходжаньня вельмі выразнае ў тэорыі, аднак на практыцы — не зусім абавязковае. Так, дзеці хрысьціянаў, як і юдэяў, аўтаматычна пераймаюць рэлігію бацькоў. Зь іншага боку, можна прыняць юдаізм і ўвайсьці ў супольнасьць Ізраілю. То бок ні з аднаго, ні з другога боку няма аўтаматычнага перайманьня веравызнаньня бацькоў. У сёньняшняй Польшчы можна знайсьці багата прыкладаў на гэтыя выняткі: шмат дзяцей жыдоў становяцца каталікамі, часам здараецца і наадварот. Нягледзячы на гэта, адрозьніваньне „веры і паходжаньня“ абсалютна рэальнае:

можна адысьці ад Царквы, але, у пэўным сэнсе, перастаць быць жыдам увогуле немагчыма. Такім чынам, гэбрайскі падыход парадаксальны. З аднаго боку — прыняўшы іншую веру, перастаеш быць жыдам. Зь іншага — вяртаньне да юдаізму вымагае толькі дэкларацыі, што ты вяртаешся. Некаторыя рабіны вымагаюць пэўных рытуалаў, аднак працэдуры, прадугледжаныя для тых, хто ўпершыню навяртаецца ў юдаізм, не зьяўляюцца неабходнымі. А гэта значыць, што, нягледзячы ні на што, нават зьмяняючы рэлігію, застаешся жыдам!
Гэтую парадаксальнасьць можна разглядаць як аргумэнт на карысьць сутнаснае адрознасьці паміж юдаізмам і хрысьціянствам. Структура юдаізму іншая, чымся хрысьціянства. Царкву нельга поўнасьцю параўнаць з Сынагогай. Адпаведнікам Царквы, хутчэй, будзе супольнасьць жыдоў — жыдоўскі народ або нацыя. Такім чынам, адрознасьць між хрысьціянствам і юдаізмам у гэтым пытаньні відавочная, але яна не выключае супольных вытокаў і зьязанай з гэтым глыбокай роднаснасьці.

**Адрозьненьні сярод падабенстваў: супольны Бог?**
Бог адзін. І таму супольны. Калі сказаць толькі гэта, усе рэлігіі акажуцца аднолькавыя. Наступны крок — гэта пытаньне, што мы маем на ўвазе, калі кажам пра Бога. Калі параўнаць канцэпцыі Бога, то блізіня юдаізму і хрысьціянства, якая вынікае з вызнаваньня Бога адзінага, перастае быць такой відавочнай.
Аднак тэзы і канцэпцыі, датычныя Бога, не выражаюць найважнейшага. Бог „у сабе“ нам недаступны. У жыдоўскай традыцыі дамінуюць не разважаньні пра Творцу, а пастулят, каб жыць згодна зь Яго прыказаньнямі і з усьведамленьнем Ягонае прысутнасьці. Ёсьць гэткі матыў і ў хрысьціянстве. Усе малітвы, як бы яны не былі сфармуляваныя і якія б у іх не былі выкарыстаныя імёны, скіраваныя ў той самы бок. Рабэну Там, галахічны аўтарытэт Францыі XII стагодзьдзя, дазваляў жыдом нават слухаць укладзеныя хрысьціянскімі партнэрамі прысягі да хрысьціянскіх сьвятых. Хоць, на першы погляд, такія прысягі гучаць для жыдоў па-ідалапаклонску, яны могуць быць зразуметыя як зварот да праўдзівага Бога.
Калі мы ня хочам згубіць таго вымярэньня, у якім сутыкаюцца хрысьціянскае й гэбрайскае бачаньне Бога, трэба

адштурхоўвацца ня столькі ад тэалягічных тэзаў, колькі ад крыніцаў нашых рэлігійных уяўленьняў. Юдаізм — гэта пэўнае бачаньне гісторыі чалавецтва і пакліканьня жыдоў. Ягоныя ключавыя аб'яўленьні запісаныя ў Біблііі, а пасьля былі ўвабраныя ў жыдоўскую традыцыю. Тэксты, што апісваюць Выйсьце з Эгіпту, падзеі ў Сынаі, прадказаньні прарокаў прынятыя ў якасьці выточных таксама і хрысьціянамі. Нягледзячы на шматлікія інтэрпрэтацыі, якія бытуюць у народзе, мы прызнаем, што праўдзівы Бог апісаны ў падзеях гэбрайскай Біблііі і вядомы як Бог Ізраілю. Гэта ня толькі супольны Бог, але й супольнае ў сутнасьці бачаньне Бога. Майманід увогуле лічыў, што Біблію варта вывучаць разам з хрысьціянамі.

Закцэнтаваўшы ўвагу на супольных вытоках, мы мусім адначасова падкрэсьліць і адрозьненьні ў канцэпцыях. Найважнейшыя зь іх зьвязаныя з хрысьціянскімі дагматамі ўцелаўленьня і Тройцы. Паводле юдаізму, чалавек створаны на вобраз і падобнасьць Бога. Акрамя таго нам уяўляецца, што „найвышэйшы валадар над валадарамі" мае рысы асобы: разьлічвае на нас, чагосьці ад нас чакае, пакутуе з намі. Ягонае ж увасабленьне ў канкрэтнага чалавека выглядае абсурдам. Уяўнае супадзеньне палягае і ў тым, што і юдэі, і хрысьціяне кажуць пра Бога „Айцец". Парадак ужываньня вызначэньня „Айцец" пры гэтым істотна розьніцца. Для юдаізму гэта мэтафара. Яна не найважнейшая і страчаецца, як правіла, разам зь іншымі вызначэньнямі. Яна ўжываецца зазвычай для таго, каб выразіць бацькоўскі клопат або вялікадушнасьць. Хрысьціянства, у сваю чаргу, да мэтафарычнага ўжываньня дадало штосьці прынцыпова іншае: яно перайшло да апісаньня прыроды Бога. Прыменены да яго тэрмін „Айцец" у сутнасьці азначае „Айца Ісуса". Гэткая асацыяцыйная сувязь стала дамінуючай. Дзякуючы гэтаму вызначэньне „Айцец" набыло спэцыфічны зьмест. Тое, што было толькі сродкам набліжэньня невымоўнае сапраўднасьці, прытарнаваньнем штодзённага досьведу і культурных рэаліяў, стала сьцьверджаньнем аб сутнасьці Бога. У адрозьненьне ад жыдоўскага мэтафарычнага ўжываньня, у мове хрысьціянскае тэалёгіі „айцоўства" належыць да дэфініцыі Творцы. Яно непарыўна спалучана з канцэпцыяй Тройцы.

**Адрозьненьні сярод падабенстваў: мэсіянскія чаканьні**

Ісус — Мэсія? У гэтым пытаньні адрозьненьне навідавоку. Хрысьціяне заўжды спасылаліся на прамовы прарокаў, спрабуючы давесьці, што Ісус ёсьць абяцаным Мэсіем, так і ня здолелі, аднак, пераканаць у гэтым пераважную большасьць жыдоў. Усе аргумэнты даўно прагучэлі, і мы можам толькі ў чарговы раз безвынікова іх паўтараць. Мяркую, што зварот да дыскусіі вакол радкоў з Ісаі, каб адмовіць (або сьцьвердзіць) факт, што ў іх гаворыцца пра нараджэньне ад нявіньніцы, ня мае ўжо сэнсу. Калі б яшчэ было можна нешта давесьці, то гэта ўжо даўно было б зроблена. Адрознасьць інтэрпрэтацыяў застаецца.

Аднак сам той факт, што зноў і зноў зьяўляецца жаданьне ўжываць гэтыя радкі дзеля навярненьня жыдоў, сьведчыць пра тое, што мы апэруем у рамках супольных катэгорыяў. Мяркую, што гэтае адзінства зьяўляецца для нас, жыдоў, надзвычай важным: менавіта дзякуючы хрысьціянству (а таксама ісламу) сьвет даведаўся пра ідэю Мэсіі, пра мэсіянскую надзею. Хоць адбылося гэта ў форме, пад якой мы, жыды, не падпішамся, аднак гэта пазытыўны бок экспансіі хрысьціянства: ужо старавечныя рабіны бачылі, што тут можна гаварыць пра пракладаньне дарогі Мэсію. Як пісаў у XI стагодзьдзі Ягуда Галеві, „народы“ (то бок хрысьціяне і мусульмане), упалі ў аблуду, але „брукуюць шлях“ для чаканага Мэсіі. Майманід, які ў раньні пэрыяд сваёй дзейнасьці лічыў хрысьціянства ідалапаклонствам, напісаў пазьней, што мы ня ў стане „агарнуць думкі Творцы сьвету“, а словы Ісуса (і Магамэта) былі пакліканыя „толькі пракласьці дарогу для Караля Мэсіі, а таксама падрыхтаваць сьвет для служэньня Госпаду“.

Апісаныя супольныя рысы абумоўленыя пэўным глыбокім падабенствам. Спрэчка пра асобу Мэсіі і мэсіянскія чаканьні — розныя рэчы. У філязофскім пляне, калі мова заходзіць пра чаканьні, паміж юдаізмам і хрысьціянствам існуе падабенства, нават тоеснасьць. Чаканьне Мэсіі — гэта пэўны спосаб экзыстэнцыі. Як філязофская катэгорыя, яно не адрозьніваецца ад чаканьня другога прышэсьця Ісуса. Гэта зварот да будучыні, але не асабістай, а калектыўнай. Зрэшты, тэолягі (напрыклад, Міхал Чайкоўскі) сьцьвярджаюць, што ў Новым Запавеце йдзецца не пра „другое прышэсьце“, а проста пра прышэсьце. Чаканьне зьяўляецца супольным.

Гэта не зьмяняе факту, што хрысьціянская вера ў тое, што сьвет выкуплены, супярэчыць жыдоўскаму падыходу. Мы, жыды, як ніхто адчуваем тое, што ён ня выкуплены, сьцьвярджаў Марцін Бубэр. Вельмі трапная фармулёўка. Таксама й таму, што перадае і манеру мысьленьня нерэлігійных жыдоў. Мушу прызнацца, што ня дужа разумею погляд хрысьціян — што гэты сьвет быў збаўлены дзякуючы падзеям, апісаным у Эвангельлях. Калі яны маюць на ўвазе пераадоленьне вынікаў першароднага граху, то тым больш я адчуваю адчужанасьць: першародны грэх ёсьць асноватворным фактам для хрысьціянскае тэалёгіі, але не для юдаізму. Калі ж гаворка йдзе пра тое, што насуперак трагічнай прыродзе экзыстэнцыі і нягледзячы на нашыя слабасьці, для нас існуе нейкая надзея, то, натуральна, згаджаюся, бо гэткая надзея прасякае ўсю жыдоўскую традыцыю, безадносна да Ісуса.

**Падабенствы сярод адрозьненьняў: Мэсія**

Паводле жыдоўскай традыцыі, прышэсьце Мэсіі ня можа быць незразумелай падзеяй, якая не выходзіць за абсяг душы. Дагэтуль жыды, пачуўшы, што Мэсія прыйшоў, выглядаюць у акно. Што зьмянілася навокал нас? Нічога, таму няма пра што гаварыць. Ісус — гэта не жыдоўскі мэсія. Апошні пакліканы пакласьці канец гвалту і несправядлівасьці на гэтым сьвеце. Леў будзе ляжаць побач зь ягнём, а мячы будуць перакутыя на нарогі. Незалежна ад інтэрпрэтацыі гэтых уяўленьняў, наўрад ці можна сьцьвярджаць, што з часоў сьмерці Ісуса мы пасунуліся ў гэтым кірунку. Аднак толькі на выгляд пытаньне такое простае. У гісторыі юдаізму былі так званыя фальшывыя мэсіі. І ў гэтым няма нічога дзіўнага — у літургіі штохвіліну паўтараюцца словы надзеі, што Ён прыйдзе „борзда, у нашы дні“. Ня толькі ў далёкім мінулым гэта ўспрымалі літаральна. У 80-х гадох нашага стагодзьдзя ў ЗША пачалі зьяўляцца плякаты з надпісамі „Хочам Мэсію ўжо цяпер!“. Гэта не было паўтарэньнем радкоў зь літургіі. Іх распаўсюджвалі хасыды з дынамічнае экспансіўнае плыні Хабад. Яе харызматычны лідэр, рэбэ Мэнахем Мэндэль Шнэерсон, вучыў, што мы стаім на парозе мэсіянскае эры. Усё большая і большая група прыхільнікаў Шнэерсона лічыла, што акурат ён і зьяўляецца Мэсіем! Сам ён гэтага не сьцьвярджаў, але гэтаму й не пярэчыў. А ў апошнія гады жыцьця — разьбіты паралюшам — ня здолеў

бы гэта зрабіць, нават калі б захацеў. Нават сьмерць рэбэ ў 1994 годзе нічога не зьмяніла! У кнізе пра яго, напісанай нядаўна сакратаром настаўніка, а цяпер афіцыйным рэдактарам ягонае спадчыны, чытаем: „Ці сапраўды рэбэ зьяўляецца Мэсіем? Кожны мусіць сам адказаць на гэтае пытаньне“. Тут няма адназначнасьці, аднак дапускаецца пазытыўны адказ.
Іншыя жыды ні трохі ня схільныя бачыць у Шнэерсону Мэсію. Аднак ухіленьне прыхільнікаў гэтага цадыка за межы юдаізму ня мела б сэнсу. Яны складаюць істотную і надзвычай паказальную частку жыдоўскае артадоксіі. Выяўляецца, што сучасныя артадаксальныя ды традыцыяналісцкія жыды могуць лічыць, нібыта Мэсія ўжо прыйшоў, верыць, што Мэсіем ёсьць чалавек, які ўжо памёр! Падабенства да хрысьціянства проста надзвычайнае. Гэта сьведчыць пра тое, якім блізкім хрысьціянству можа быць жыдоўскі спосаб разуменьня мэсіянскай ідэі. Адкрываецца парадаксальная агульнасьць — на ўзровень глыбейшая за спрэчкі пра тое, хто канкрэтна мае мэсіянскі статус.

**Падабенствы сярод адрозьненьняў: пасярэдніцтва**
Хрысьціянскі Новы Закон бачыць Ісуса адзіным пасярэднікам у збаўленьні. Жыды гэткіх поглядаў не падзяляюць: ня толькі асоба Ісуса, але і ўвогуле пасярэднікі паміж намі і Творцам непатрэбныя. Так жа справа стаіць зь літургіяй. Кожны жыд сам стаіць побач з Госпадам; кожны можа таксама весьці калектыўныя малітвы. У сваю чаргу, ксёндз для каталікоў ёсьць немінучым пасярэднікам, што для юдаізму чужое (чаго няма і ў пратэстанцкай царкве). Ксёндз абавязковы для спаўненьня, прынамсі, некаторых тайніцаў.
На першы погляд можа падацца, што тут існуе толькі адрознасьць. Але гэткае пераканаьне можа пахіснуцца, калі зьвярнуць увагу на рэлігійнасьць хасыдаў. Цадык у сапраўднасьці ёсьць своеасаблівым пасярэднікам. Яшчэ дзьвесьце год таму гэта адкрыта сьцьвердзіў адзін з найвялікшых хасыдзкіх настаўнікаў, Нахман з Брацлава: „Пад час малітвы належыцца настройвацца на сувязь з цадыкамі свайго пакаленьня, бо толькі яны ведаюць, як узьняць малітву да прызначанага ёй месца“. Пасярэдніцтва, да таго ж, не абавязкова супярэчыць вельмі традыцыйнаму юдаізму.

Зразумела, жыдоўскія праціўнікі хасыдаў крытыкавалі іх за адыход ад традыцыі. Аднак хасыдызм ніколі не выходзіў па-за межы рэальнага юдаізму, наадварот, ён здаўна зрабіўся апірышчам жыдоўскага традыцыяналізму. Зноўку перад намі парадокс: найлепш кансэрватыўныя на гэты момант плыні юдаізму нечакана ўтрымліваюць элемэнты, якія супадаюць з хрысьціянствам.

**Падабенствы сярод адрозьненьняў: канцэпцыі Бога**
Дагмат пра Тройцу супярэчыць юдаізму, бо, акрамя веры ўва Ўвасабленьне, утрымлівае яшчэ і элемэнт расколу абсалютнае Еднасьці. Паводле юдаізму, Творца не складаецца з розных „асобаў“, больш таго — наагул ня можа мець складовых частак, бо становіць сабой еднасьць. Аднак на містычным узроўні некаторыя жыдоўскія вераньні супадаюць з хрысьціянскімі. Так, сярэднявечная Кабала распрацавала канцэпцыю *sefirot* — дзесяці Божых эманацыяў. Гэта структуры, празь якія выяўляецца Творца ці, хутчэй, ягоная стваральная моц. Паводле Гершама Шолема, у гэтай канцэпцыі прадстаўлена тое, „што філёзафы і тэолягі называюць боскімі атрыбутамі“. Адначасна сэфіратычны сьвет „для містыкаў якраз і быў боскім жыцьцём, у той меры, у якой яно ймкнецца да Стварэньня“. Падабенства кабалістычнага разуменьня Бога да хрысьціянскага бачаньня Тройцы не засталося па-за ўвагай жыдоўскіх крытыкаў кабалістычнае традыцыі. Рабін Ізаак бэн Шэшэт Парфат пісаў у XIV стагодзьдзі: „Ідалапаклоньнікі вераць у тройцу, а кабалісты — у дзесяціасобнага Бога“. Безумоўна, *сэфіры* — гэта не асобы з боскім статусам, якім для хрысьціянаў ёсьць Ісус як асоба Тройцы. Аднак паводле Давіда Новака контрааргумэнты кабалістаў гучалі ня дужа пераканаўча для тагачасных жыдоўскіх філёзафаў. Да таго ж кабалісты складаюць важную і неад'емную частку традыцыі юдаізму. Ад яе да спэцыфічных хрысьціянскіх тэзаў ня так ужо й далёка.

**Падабенствы сярод адрозьненьняў: абранасьць Ізраілю**
Доўгія стагодзьдзі Царква вучыла, што супольнасьць яе вернікаў ёсьць новым абраным народам, а ад жыдоў Бог адвярнуўся. Гэта, безумоўна, супрацьстаўляла хрысьціянства юдаізму. Аднак сытуацыя зьмянілася. Каталіцкі касьцёл з часоў

Другога Ватыканскага сабору (60-я гады) і найбуйнейшыя пратэстанцкія цэрквы не сьцьвярджаюць ужо, што „стары“ Ізраіль быў зьменены на новы. Гэта сьведчыць пра тое, што абранасьць трывае вечна. Іншымі словамі гэта выказаў Ян Павал II, згаджаючыся з думкай а.Даніэля Руфайзэна: „У сутнасьці ня правільна называць Царкву новым Ізраілем, (...) хутчэй трэба гаварыць пра Ізраіль пашыраны“. Адбылася глыбокая зьмена, якой не заўважылі або не ацанілі шматлікія жыдоўскія аўтары, асабліва ультраартадаксальныя жыды, падыходы якіх цалкам дамадэрныя і базуюцца на прынцыпе, што ў рэлігійных пытаньнях нічога не зьмянілася з часоў сярэднявечча.

Безумоўна, што і зусім ня ўсе хрысьціяне прызнаюць сталасьць ролі Ізраілю. Аднак царкоўныя дакумэнты сьведчаць, што сутнасны пералом ужо адбыўся. Стаўленьне да абранасьці Ізраілю не павінна нас падзяляць.

Затое застаецца адкрытым пытаньне, у якой меры юдаізм можа ўзяць пад увагу хрысьціянскую тэзу пра Царкву як „новы“ або, хутчэй, „другі Ізраіль“. Існуюць плыні жыдоўскае думкі, якія бачаць пазытыўную ролю хрысьціянства ў вандроўцы паміж Сынаем і Мэсіем. Сваю кульмінацыю яны знайшлі ў канцэпцыях Франца Розэнцвайга, які зрабіў вялікі ўплыў на юдаізм новага часу, г.зн. спалучыў у сабе сучасную (навуковую і крытычную) думку з насьледаваньнем жыдоўскае традыцыі. Паводле яго, хрысьціянства мае права сьцьвярджаць, што — кажучы хрысьціянскай мовай — прыводзіць людзей да Айца, калі яно зразумее, што гэта ня тычыцца жыдоў, якія як спадкаемцы жыдоўскае традыцыі „ўжо з Айцом“. Ён мяркуе, што мэтай тых жыдоў, да якіх скіравана такая пазыцыя, павінна быць стварэньне жыдоўскае канцэпцыі гісторыі, якая — не абмінаючы адрозьненьняў і пагрозаў, якія нясе Царква жыдом — возьме пад увагу пазытыўную ролю хрысьціянства.

*Пераклаў з польскай Андрэй Скурко паводле* Midrasz. 9(29).1999.
*Тэкст друкуецца з ласкавага дазволу гэтага польскага часопіса.*

[image]
[image]

**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

[illegible] [illegible] [illegible] [

**№ 3 (8) – 2000**


Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

# Хаім-Нахман Бялік
# Заблуканая зорка

---

## Заблуканая зорка

**Хаім-Нахман Бялік** (1873, мястэчка Рады на Валыні — 1934, Вена) — жыдоўскі паэт-клясык, адзін з заснавальнікаў сучаснай літаратуры на гэбрайскай мове. Вучыўся ў Валожынскай ешыве. Максім Горкі называў яго „рэдкім і дасканалым увасабленьнем духу свайго народу. Ён любіць свой народ да роспачы, ён гаворыць зь ім моваю мсьціўца, зьневажае яго…“ — пісаў Горкі.

**Арон Скір**, з дапамогай якога быў ажыцьцёўлены гэты пераклад, быў легендарным выкладчыкам францускай літаратуры ў Інстытуце замежных моваў (цяпер Лінгвістычны ўнівэрсытэт). Ён аўтар кнігі „Еврейская духовная культура в Беларуси“ (1995).

Памёр у Ізраілі.

Зорка-заблуканка, ты глядзіш звысоку,
асьвяці мне, зорка, шлях сьляпы ад змроку.
Не! Пакут пякельных я ўжо не баюся,
ўшчэнт жыцьцё стаміла, выпетрыла ў скрусе.
Я — жабрак убогі, ермавы вучомнік,
кутнік дому бедных, вечны валачомнік.
Бацька — крык выгнаньня, маці — чахласьць плахі,
кія не баюся, торба мне ня ў страхі.
Бо жыцьцё жахае ў лютасьці ва ўладзе
безь цяпла надзеі, безь сьвятла ў паглядзе.
Ціснуць тлен і мукі — ім ня скажаш хопіць,
як сьвінец цяжкія, лёгка ў цемру топяць.
Быццам той сабака, не ўцячэш галодны,
горам навязаны на ланцуг халодны.
Вызвалі душу мне, зорка, ад адчаю,
ад чужое працы, ад чужога краю.
Дык сьвяці, каб зьніклі змрокавы аковы,
я ісьці рашучы, я чакаць гатовы.
Знаць каму, калі ўжо ноч мая прыстане,
колькі Бог паслаў мне цемры ды блуканьня.
Будзе час — і з ночы гляну небу ў вочы,
каб сьвятло пабачыць і пагляд прарочы.
І пакуль іскрыцца кропля сьлёз на веі,
напаі сьвятліста цьвет маёй надзеі.

Даўнюю іскрынку сэрца захавала —
тое, што ня згасла, загарыцца дбала.
Рэштка сілы зноўку запульсуе ў сыне
і яна дарэшты ў барацьбе загіне.
*1888*

* * *

Мора цішыні шпурляе
таямніцы, змоўкнуў сьвет;
за млыном не заціхае
цёмнай рэчкі мокры сьлед.
Чарната начы гусьцее,
цені йдуць, нібы з гасьцей;
толькі моўчкі ў мора цемры
зоркі падаюць гусьцей.
І калі ўвесь сьвет змаўкае,
сэрца рвецца зь цішыні,
адчуваю: ў ім крыніца
б'ецца ў яснай чысьціні.
Сэрца мне таемна кажа:
ссохне сноў благіх палын,
зорка ўпала зь неба — гэта
не твая — павер, мой сын!
А твая яшчэ трывала
зьзяе ў сьветлай варажбе;
вочы падымі — міргае,
суцяшэньне шле табе.
І калі ўвесь сьвет замоўкне,
буду я сачыць маю
зорку, сьвет адзіны маю,
свой, што ў сэрцы я таю.
*1901*

**Ахіні крылом зь любоўю…**

Ахіні крылом зь любоўю,
будзь сястрою і матуляй,
галаву ўлюляй — гняздоўе
маіх модлаў беспрытульных.

Шчырасьці даверу грудзі,
выдам тайну ўсіх пакутаў:
маладосьць ёсьць, кажуць людзі,
дзе мая і кім пачута?
Патлумачу не ў сакрэце,
што душа згарэла ўраньні:
кажуць, ёсьць каханьне ў сьвеце,
што такое ёсьць каханьне?
Верыў зорам — ашукалі,
быў і сон — дык зьнік нябога:
і цяпер у сьвеце жалю
у мяне няма нікога.
Ахіні крылом зь любоўю,
будзь сястрою і матуляй,
галаву ўлюляй — гняздоўе
маіх модлаў беспрытульных.
*1905*

**Над ракою вырастае...**

Над ракою вырастае
піхта гонкая, густая.
У вадзе пытае сум свой,
як яна закончыць шум свой?
Вырасла, зірнула ў далі,
леты коцяцца, як хвалі;
сонца стыне, глухнуць сьпевы,
шчабятушкі-птушкі, дзе вы?
У сьвятліцы неадхлынна
ўжо даўно стаіць дзяўчына,
і ў люстэрка ўсё пытае,
як свой сум закончыць мае?
Вырасла, зірнула ў далі,
леты коцяцца, як хвалі.
Сьлёзы льюцца, як залевы.
Заляцанцы-хлопцы, дзе вы?

**Адлятае пава залатая**

Адлятае пава залатая.

— У якую ты ляціш мясьціну?
— Я лячу праз акіян вялікі...
— Жаніху ты занясеш вясьціну?
— Добра, прынясу табе пісьмо я,
Твой жаніх напіша, поўны ласкі:
„Тысячу цалункаў і вянчаньне,
калі Бог дазволіць, пасьля Паскі…“

**Тым ня вер...**

Тым ня вер, што абяцаюць
гэтак шчодра зоркі.
Ашуканцы і манюкі,
іхны вырак горкі.
Над маёй страхою зорка
мне даўно міргала,
золатам маю надзею
зь неба асыпала.
Абяцала мне сусьветы,
мёду поўны келіх.
Я й сягоньня жалю варты,
за душой каб шэлег.
Як табе ня сорам, зорка,
кпіць з майго намеру?
Гожа... хіба ж гэтак плоцяць
за надзею й веру?
Тым ня вер, што абяцаюць
гэтак шчодра зоркі.
Ашуканцы і манюкі,
іхны вырак горкі.

*З гэбрайскай пераклаў Рыгор Барадулін*
*з падрадкоўнікаў Арона Скіра*

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

# Сьвятлана Аксёнава-Штэйнгруд
# Нас гналі Адтуль спачатку

---

* * *

Нас гналі Адтуль спачатку,
Цяпер уганяюць Сюды!
А мы, бы вярблюды ў статку,
Рахмана чакаем вады.
Міраж абяцанай стрэчы,
Якая — яшчэ калі.

І мы свае цягнем рэчы
Па рэчышчах нашай зямлі…

* * *

Тагасьветнага ветру горыч.
Тагасьветна-счужэлы сьвет.
Мы яшчэ — не ўнутры, мы — поруч,
Па-сабачы шукаем сьлед.

Гаспадар з ланцугом і кіем —
Наш карміцель — сышоў без пары.
Мы гукаем яго і выем,
Толькі зьніклі гаспадары!

Забуяў ля будкі шыпшыньнік,
Не рыпяць прыступкі наўзрыд.

Сьвятлана Аксёнава-Штэйнгруд — паэтка, піша па-расейску, кіраўніца культурных праграмаў у Беларускім прадстаўніцтве Амэрыканскага яўрэйскага разьмеркавальнага камітэту Джойнт.

І сумуе расійскі ашыйнік
Па табе. Па табе, вечны жыд!
*Студзень 1993*

*Пераклаў з расейскай Андрэй Хадановіч*

[image]
[image]

**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
---
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

# Марцін Бубэр
# Мэнахем Мэндэль зь Віцебску

**Марцін Бубэр** (1878—1965) — габрэйскі філезаф, тэолаг, перакладнік Бібліі і выдаўца хасыдзкіх тэкстаў. Нарадзіўся ў Вене ў габрэйскай сям'і, якая паходзіла з Галіччыны. У доме свайго дзеда ў Львове правёў вялікую частку свайго маленства. Вучыўся ў Вене, Ляйпцыгу, Бэрліне, Цюрыху. Рана прымкнуў да сыянісцкага

## Маленства

З сваіх адзінаццацёх Мэнахем вучыўся ў доме вялікага магіда[1] і быў яму любы. У суботу па абедзе магід пабачыў яго з гарэзьлівым выразам твару, ярмолка сядзела на ім коса, крокамі ён адмерваў пакой. Магід ступіў на парог, руку паклаў на клямку і запытаўся: „Колькі старонак з Гемары[2] ты сёньня вывучыў?“ „Шэсьць“, — сказаў хлопчык. „Калі пасьля шасьцёх старонак, — сказаў магід, — ярмолка ссунулася на край, колькі яшчэ будзе патрэбна, каб яна ўпала?“[3]

Пасьля ён зачыніў дзьверы. Мэнахем пачаў стукаць і плакаць наўзрыд: „Адчыні і памажы мне, вучыцелю“. Магід адчыніў. „Я хачу“, — сказаў ён, — „зьезьдзіць з табой да майго настаўніка, сьвятога Баалшэма“. Калі ў пятніцу яны прыехалі ў Меджыбіж, магід адразу пайшоў у дом Баалшэма. Хлопчык Мэнахем прыбраўся і прычасаўся зь вялікай рупнасьцю, быццам гэта было і будзе яму ўласьціва да канца жыцьця. Баалшэм чакаў, стоячы ля катэдры, пакуль прыйдзе хлопчык, і толькі пасьля гэтага пачаў маліцца. Аднак толькі пасьля заканчэньня сыботы ён наважыў гукнуць Мэнахема. Магід і іншыя вялікія вучні Баалшэма, рабін Якаў Ёсэф з Палоннага, прысталі перад сваім вучыцелем. Баалшэм загадаў хлопчыку стаць перад ім, доўга ўзіраўся ў яго і апавёў яму гісторыю пра валоў і плуг. Слухачом хутка адкрылася, што ў форме алегорыі падаецца гісторыя жыцьця Мэнахема; але хлопчык зразумеў зь яе толькі тое, што яму раней давялося перажыць, рабін з Польнага зразумеў палавіну, магід — усё.

Пасьлей Баалшэм сказаў магіду: „Гэты гарэзьлівы хлапец у ісьце сваёй рахманы“.

[1] Магід (літаральна: той, хто апавядае пасхальную гісторыю) — духоўная асоба ў юдаізьме. *(Зацем перакладніка.)*
[2] Гемара — дадаткі да Мішны, распрацаваныя рабінамі на працягу стагодзьдзяў. Існуе два варыянты Гемары: бабілёнскі і ерузалімскі. Залежна ад таго, якая Гемара друкуецца разам з Мішнай, адрозьніваюць Бабілёнскі або Ерузалімскі Талмуд. *(Зацем перакладніка.)*
[3] Агульнавядома, што высакамернасьць прыводзіць да нявернасьці боскаму закону. Хаджэньне зь непакрытай галавой лічыцца парушэньнем рэлігійнай пачэсьлівасьці. *(Зацем аўтара.)*

**Праява**

Вялікі магід у дзень Новага году ня проста граў на шофары[4], але чыніў гэта ў прысутнасьці свайго вучня рабіна Мэнахема Мэндэля і дзяліўся зь ім сваім майстэрствам граць: у апошнія гады свайго жыцьця, калі хворыя ногі больш не магьлі яго насіць, ён рабіў гэта ў сваім пакоі.

Аднойчы рабіна Мэнахема Мэндэля не было ў Межырычы, і рабін Леві Іцхак мусіў яго замяняць. Ён паднёс шофар да рота. Аднак калі магід пачаў выдаваць першыя гукі, Леві Іцхак абачыў вялікае сьвятло і паваліўся ў непрытомнасьць. „Што так уразіла цябе? — спытаўся магід, — Мэндэль бачыў больш і не лякаўся“.

[4] Шофар — традыцыйны жыдоўскі духавы інструмэнт. *(Зацем перакладніка.)*

рукі, як у ісьце адзначаюць дасьледнікі, хутчэй па рэлігійных і культурных, а не палітычных матывах. З 1924 па 1933 год ува ўнівэрсытэце Франкфурту на Майне выкладаў жыдоўскую рэлігійную філязофію. У той жа самы час ажыцьцявіў разам з Францам Розэнцвайгам пераклад Старога Закону з габрэйскай на нямецкую мову. У 1938 годзе эміграваў зь Нямеччыны і пасьля цяжкіх выпрабаваньняў уладкаваўся прафэсарам у Жыдоўскім унівэрсытэце Ерузаліму. Здабыў сусьветнае рэнамэ сваімі студыямі ў

галіне хасыдызму, філязофіі дыялёгу і рэлігійнай філязофіі. Асноўныя працы: „Die Geschichten des Rabbi Nachman“ („Гісторыі рабіна Нахмана“) (1906), „Die Legende des Baalschem“ (Легенды Баальшэма) (1907), „Vom Leben der Chassidim“ („Аб жыццьці хасыдаў“) (1908), „Die jüdische Mystik“ („Жыдоўская містыка“) (1909), „Mein Weg zum Chassidismus“ („Мой шлях да хасыдызму“) (1918), „Der große Maggid und seine Nachfolge“ („Вялікі магід і яго наступнікі“) (1921), „Ich und Du“ („Я і ты“)

(1923) „Deutung des Chassidismus“ („Выясьненьне хасыдызму“) (1935), „Die Forderung des Geistes und die geschichtliche Wirklichkeit“ („Вымогі духу і гістарычная рэальнасьць“) (1938), „Das Problem des Menschen“ (Праблема чалавека) (1943), „Zur Geschichte des dialogischen Prinzips“ („Да гісторыі дыялягічнага прынцыпу“) (1954). Больш інфармацыі наконт асобы і творчасьці Марціна Бубэра, улучна з электроннымі варыянтамі тэкстаў на нямецкай і ангельскай мовах, можна атрымаць на інтэрнэтаўскай старонцы

**Перасьледаваная пашана**
Магід зь Межырычу паслаў аднаго разу свайго вучня Мэнахема Мэндэля ў падарожжа па вялікай колькасьці грамадаў, каб шляхам публічных прамоваў пераканаць самога сябе ў тым, што ёсьць сэнс навучацца Торы. У адным зь мястоў шмат вучоных мужоў прыйшло грудам у гасподу рабіна Мэндэля і аказала яму асаблівую пашану. У размове зь імі ён узьняў пытаньне, чаму кажуць[5], што слава перасьлядуе таго, хто яе пазьбягае. „Гэта добра і выдатна — карыстацца пашанай, — сказаў ён, — чаму ж тады той, хто пазьбягае славы, узнагароджваецца за сваё нягоднае пазьбяганьне тым, што яна яго перасьлядуе? А калі ўніканьне вартае асуджэньня, чаму тады ён караецца за сваё бясслаўнае ўніканьне гэтым? Сапраўды, сумленны чалавек павінен у прынцыпе ўнікаць услаўленьня; але ж ён, як і кожны іншы, нараджаецца з прагай славы і мусіць змагацца зь ёй. Адно тады, калі ён доўгі час і з усёй адданасьцю навучаўся згодна з духам Торы і толькі ім, ён будзе ў стане пераадолець гэтую агульнапашыраную прагу і больш не адчувае задавальненьня нават тады, калі яго пасьвецяць у рабіны, і гэтак далей. Усё ж на самым дне яго душы перахоўваецца гэтае сябелюбства маладосьці, якое ён пераадолеў; і, хаця ён здае сабе справу зь яго, яно перасьлядуе яго, як навязьлівы ўспамін, і ўводзіць яго ў аблуду. Гэта таўро эдэмскага гада, ад якога яму ўсё ж давядзецца ачысьціцца“.

[5] Народная прымаўка (спасылка на адно месца ў тальмудзе). *(Зацем аўтара.)*

**Чарвяк**
Рабін Мэнахем Мэндэль казаў: „Я ня ведаю, чым я лепшы за чарвяка. Я ня ведаю, што я выглядаю гэтак добра, як ён. Гляньце, ён выконвае волю свайго стварыцеля і нічога не псуе“.

**Запросіны**
Колькі хасыдаў з Ружына прыехала да вялікага магіда і наракала яму, што доўгая дарога зьнясільвае іх і што ім надта часта даводзіцца езьдзіць да яго ў Межырыч, і да таго ж у доўгіх паўзах паміж гэтымі падарожжамі ім даводзіцца

перабываць без вучыцеля і кіраўніка. Магід даў ім свой пояс і свой кій і сказаў: „Перадайце гэта чалавеку Мэндэлю ў месьце Віцебску“. Прыбыўшы ў Віцебск, хасыды ўсіх пыталіся пра рабіна Мэндэля; але ўсюды ім адказвалі, што тутака такога ня ведаюць. Адна жанчына, пільна ўзорыўшыся ў іх, спыталася іх, каго яны шукаюць. „Рабіна Мэндэля“, — адказалі яны. „Ніводнага рабіна з гэткім прозьвішчам, — сказала яна, — у нас тут няма; але Мэндэляў тут у нас, мабыць, больш як досыць; мой уласны зяць мае прозьвішча Мэндэле“. Тут хасыды зразумелі, што іх паслалі да яго. Разам з жанчынай яны рушылі ў дом і перадалі ейнаму зяцю пояс і кій. Ён склаў пояс на дзьве палавіны і абхапіў сваёй рукой дзяржальна кія. Яны паглядзелі на яго і не маглі яго пазнаць. Іншы чалавек стаяў перад імі, агорнуты боскай магутой, і божы страх працяў іх сэрцы.

**Характарыстыка**

Характарыстыка, якую грамада ў Менску дала рабіну Мэндэлю пасьля яго служэньня казаньнікам, пачыналася з воклічу „Сьвятому цадыку, сьвятому самотнаму сьветачу“ і гэдак далей. Пад ёй стаяла больш як сто подпісаў ведамых асобаў. Калі яна лучыла ў рукі рабіна Мэндэля і ён прачытаў усе ўсхваленьні і ганаровыя годнасьці, ён сказаў: „Гэта, здаецца, добрая дэклярацыя, гэта нібы ўводзіць у сьвет праўды. Але калі яны спытаюць мяне, я ўсё-ткі мушу прызнаць праўду. А прызнаньне падсуднага ўраўнаважвае сотню сьведчаньняў. Вось жа, якая карысьць ад усёй гэтай пахвалы?“

**Прылівы і адлівы**

Аднойчы рабін Мэнахем пачуўся цяжка хворым і ня мог больш гаварыць. Плачучы, ягоныя хасыды сталі ля пасьцелі. Тут ён сабраў усе свае сілы і прашаптаў: „Мне ня страшна. З гісторыі, якую апавёў мне сьвяты Баальшэмтоў, я ведаю, што я паеду ў зямлю Ізраілю“.

Калі рабін Мэнахем перад сваім падарожжам у зямлю Ізраілю наведаў [рабіна] у Палонным, апошні спытаўся ў яго: „Ці не прыпомніць вам гісторыю пра валоў і плуг?“ „Я прыпамінаю яе“, — адказаў ён. „І вам ведама, — працягваў Пальноер, — якая навука для вас зьмешчана ў ёй?“ Зь лёгкім уздыхам рабін Мэнахем сказаў: „Большую палавіну я ўжо засвоіў“.

**У кучы попелу**

Перш як паехаць у зямлю Ізраілю, Мэнахем Мэндэль наведаў вялікага вучня Баалшэма, старога рабіна Якава Ёсэфа ў Палонным. Ён прыехаў тройкаю ў заезны дом і ўжо гэтым выклікаў абурэньне хасыдаў Палоннага, якія дзякуючы свайму вучыцелю вялі строгі лад жыцьця. Калі ён без капелюша і бяз пояса, з доўгай люлькай у роце, пайшоў з заезнага дому ў дом цадыка, усе чакалі, што рабін Якаў Ёсэф, пра гняўлівасьць якога складалі легенды, зганіць госьця за яго непрыстойныя і недарэчныя паводзіны. Але стары прыняў яго моўчкі і зь вялікай любасьцю і правёў колькі гадзінаў у размове зь ім. Калі рабін Мэндэль ад'ехаў, у Пальноера ягоныя вучні спыталіся: „Што гэта за чалавек, які насьмеліўся з голай галавой, у ботах зь сярэбранымі зашпілкамі, з доўгай люлькай у роце ўвайсьці ў ваш дом?" Цадык сказаў: „Адзін кароль, які скіраваўся на вайну, схаваў свае скарбы ў бясьпечных хованках. Але самыя каштоўныя пэрліны, якія ён насіў каля свайго сэрца, ён закапаў у кучу попелу, бо ён ведаў, што там іх ніхто ня будзе шукаць. Так і рабін Мэндэль хавае сваю вялікую пакорлівасьць з тым, каб ліхія сілы не маглі дакрануцца да яе, у попельнай кучы франтаўства".

**Параўнаньне**

Рабін Ізраіль з Ружына казаў: „Вандроўка рабіна Мэндэля ў сьвятую зямлю была таго ж самага роду, што і вандроўка нашага айца Абрагама. Яны імкнуліся пракласьці шлях Богу і Ізраілю".

**Для Азазалі**

Калі рабіна Ізраіля з Ружына спыталі, чаму ён ня едзе ў Эрэц-Ісраэль[6], ён сказаў: „Што атрымаў бы такі нехлямяжы дзяцюк, як я, ад Эрэц-Ісраэль? Так, рабін Мэндэль зь Віцебску — ён атрымаў Эрэц-Ісраэль, а Эрэц-Ісраэль — яго". І ён пачаў апавядаць: „Перш як рабін Мэндэль паехаў у Эрэц-Ісраэль, ён запрасіў служак караля ў губэрнскае места Віцебск на бяседу. І як у іх было прынята, яны ўзялі з сабой сваіх жанок. Рабін Мэндэль паставіў колькі маладых хасыдаў пры браме, каб, калі служкі палічаць гэта дарэчным і неабходным, яны дапамагалі гасьцём, мужчынам і жанчынам, спускацца з экіпажаў. І ён паабяцаў юнаком, што, калі яны будуць трымаць прыгожых

жанчын за рукі, іх сэрцы не кране цень гальлівасьці. Гэта так: калі хочуць у Эрэц-Ісраэль, да пары мусяць скіроўваць інтэнцыю душы на таямніцу ахвярнага казла, які для Азазалі быў выпраўлены ў пустыню[7].
Гэта меў на ўвазе рабін Мэндэль, ладзячы сваю бяседу. Ён быў здольны на гэта! Але я нехлямяжы дзяцюк, і калі б я прыехаў у Эрэц-Ісраэль, у мяне б спыталіся: „Чаму ты прыехаў без сваіх жыдоў?“

[6] Г.зн. у зямлю Ізраілю. *(Зацем аўтара.)*
[7] Левіт 16. *(Зацем аўтара.)*

**Ля акна**
У той час, калі рабін Мэнахем жыў у зямлі Ізраілю, здарылася так, што адзін безразважны чалавек, ні пра што ня думаючы, узьлез на Аліўную гару і зь яе верхавіны зайграў на шофары. Спалоханы народ раптоўна агарнула вестка, што, маўляў, гэтае граньне вястуе выбаўленьне. Калі гэтая пагалоска дайшла да вушэй рабіна Мэнахема, ён адчыніў акно, вызірнуў у сьвет і сказаў: „Тут няма нічога новага“.

**Паветра краіны**
Рабін Мэнахем любіў казаць: „Праўду кажучы, я пачаў верыць у паветра зямлі Ізраілю. Пакуль я быў вонках краіны, мае пачуцьці і жаданьні трымцелі, каб хоць раз прамовіць малітву правільным чынам. З таго часу, як я знаходжуся ў краіне, я жадаю толькі таго, каб хоць раз правільным чынам сказаць „Амэн“[8].
І ён працягваў апавядаць: „Я дасяг гэтага ў зямлі Ізраілю: калі бачу, што на вуліцы ляжыць абярэмак саломы, у тым, што ён выцягнуты ўдоўжкі, а ня ўшыркі, я адчуваю праяву прысутнасьці Бога“.

[8] Гл. Тальмуд (Баба Батра 158). *(Зацем аўтара.)*

**Подпіс**
Свае лісты зь зямлі Ізраілю рабін Мэнахем любіў падпісваць так: „Той, хто сапраўды пакорлівы“.
Аднойчы ў Ружынера запыталіся: „Калі рабін Мэнахем сапраўды пакорлівы, нашто яму трэба самога сябе так

называць?“ „Ён быў нагэтуль пакорлівы, — адказаў Ружынер, — што ягоная пакорлівасьць, паколькі яна была ўнутрана ўласьцівая яму, больш не лічылася цнотай“.

**Падарожжа на Ляйпцыгскі кірмаш**

Расказваюць: „Спасярод хасыдаў, якія з рабінам Мэнахемам Мэндэлем вырушылі ў Эрэц-Ісраэль, быў адзін кемлівы чалавек, собсьнік гандлёвага дому, які так цесна сышоўся з цадыкам, што пачаў прыкладаць усе намаганьні, каб суправаджаць яго і ў паездках па Сьвятой зямлі. Калі за некаторы час узьнікла неабходнасьць паслаць надзейнага пасланца да засталых дома хасыдаў і выбіць зь іх грашавую дапамогу, для гэтага быў прызначаны гэты чалавек. Але пад час падарожжа на караблі яго напаткала раптоўная нямогласьць, і ён памёр. Яны нічога ня ведалі аб гэтым у Эрэц-Ісраэль. Гэта, аднак, здарылася зь ім пасьля ягонай сьмерці, калі ён, як і раней, ехаў у сваёй карэце на Ляйпцыгскі кірмаш і размаўляў са сваім старым памачніком, якога ён заўсёды браў з сабой у гэткае падарожжа, а таксама з фурманом, які меў даўно знаёмае аблічча. Тым часам яго агарнула вялікая туга за сваім вучыцелем. Жаданьне зноў пабачыцца зь ім рабілася ўсё больш моцным, аж да таго, што ён наважыўся зараз жа разьвярнуцца і паехаць да рабіна. Абодва ягоныя спадарожнікі, якіх ён узяў з сабой, рэзка запярэчылі яму: было б безразважна адмаўляцца ад гэткай вялікай гандлёвай угоды, якая іх чакае наперадзе, дзеля нейкай хімэры. Калі ён нягледзячы на ўсе іхныя пярэчаньні настаяў на сваёй волі, яны прызналіся яму, што ён быў памёр і што яны злыя анялы, якім ён быў даверaны. Аднак ён запатрабаваў іх ад нябёснага суду, і яму не маглі адмовіць. Суд рассудзіў, што анялы павінны прывесьці яго да рабіна Мэнахема Мэндэля. Калі ён прыбыў у места Тыбэрыйскае ў дом цадыка, адзін з анялоў, гэтым разам у сваім сапраўдным жахлівым абліччы, увайшоў разам зь ім. Рабін спалохаўся пры ягоным выглядзе, а пасьля ён загадаў яму пачакаць, пакуль зробіць працу. Цэлы тыдзень ён дбаў і рупіўся пра сваю душу, аж пакуль не прывёў яе ў парадак“.

Гэтую гісторыю сваім хасыдам апавёў рабін Нахман з Брацлава.

**Усе сьвечкі**

У хасыдаў, якія навучаліся ў „клясе“ рабіна зь Любавічаў, зяця

сына рабіна Шноера Залмана, існаваў абычай, што ўвечары, калі яны сядалі ў малітоўным доме перад кнігамі, перад кожным стаяла запаленая сьвечка; калі ж яны ўжо былі гатовыя і пачыналі апавядаць гісторыі цадыку, то яны гасілі ўсе сьвечкі, апрача адной. Неяк калі аднойчы яны так сядзелі разам каля адной запаленай сьвечкі, увайшоў рабін, каб прынесьці кнігу. Ён спытаўся, пра каго яны апавядаюць. „Пра рабіна Мэндэля зь Віцебску“, — абвясьцілі яны. „У яго гонар, — сказаў ён, — вы павінны запаліць усе сьвечкі. Бо калі ён выкладаў вучэньне, у ягоным сэрцы не было самалюбаваньня, і „іншы бок“[9] ня меў доступу да яго. Так што ён заслугоўвае, каб вы, калі апавядаеце пра яго, запалілі ўсе сьвечкі, быццам вы навучаецеся Сьвятой Торы“.

[9] Г.зн. дэманы. *(Зацем аўтара.)*

*Зь нямецкай мовы пераклаў Валерка Булгакаў паводле*
Martin Buber. Erzählungen der Chassidim. Manesse Verlag Zürich 1949.



Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

## Поль Вэкслер
## Што могуць ідыш, сучасны іўрыт, эсперанта, а таксама сербалужычане, палешукі і хазары сказаць пра паходжанне габрэяў-ашкеназі?

---

**Поль Вэксьлер** — знаны ізраільскі лінгвіст, прафэсар Тэль-Авіўскага ўнівэрсытэту, аўтар грунтоўных манаграфіяў „Пурызм і мова: Дасьледаваньне ў галіне сучаснага ўкраінскага і беларускага нацыяналізму: 1840—1967“ (Блумінгтан, 1974) і „Гістарычная фаналёгія беларускае мовы“ (Гайдэльбэрг, 1977). Апошняе дзесяцігодзьдзе займаецца пытаньнямі этнагенэзу габрэяў-ашкеназі ды паходжаньня дзьвюх жыдоўскіх моваў: ідышу і сучаснага іўрыту. Вучоны прапануе свой арыгінальны погляд на гэтую праблему, які часьцяком супярэчыць агульнапрынятым меркаваньням.

**У** сатыры Лесінга *„Малады шкаляр“ („Der junge Gelehre“*), якая ўпершыню была прадстаўленая ў Ляйпцыгу ў 1748 г., а ўпершыню апублікаваная ў 1754 г. (перадрук у ягоных *Werke* 1:285, Мюнхен, 1970), Даміс, поўны пыхі малады студэнт, хваліўся перад сваім служкам, Антонам, што яму толькі-толькі стукнула дваццаць год, а ён ужо валодае некалькімі мовамі. Антон паведаміў, што сам ён можа размаўляць на славянскай сербалужыцкай мове, невядомай ягонаму гаспадару. Гэта справакавала Даміса на заўвагу, што названая славянская мова мае блізкія дачыненні да габрэйскай, і многія асаблівасці, страчаныя першаю, могуць быць раскрытыя ў другой. Усе гледачы, без сумнення, пагаджаліся з тым, што Лесінг

(народжаны ў 1729 г. у Каменцы, дзе размаўлялі па-верхнялужыцку) адшукаў выдатны спосаб высмейвання ганарыстага Даміса.

Аднак невядома было Лесінгу і большасці ягоных гледачоў, што сапраўды можна паказаць сувязь верхнялужыцкай мовы з дзвюма формамі „габрэйскай“ — сярэднявечнаю ашкеназі (паўночнаеўрапейскаю мовай) і сучасным ізраільскім іўрытам. Генетычная сувязь паміж сербалужыцкай і гэтымі дзвюма формамі „габрэйскай“ сягае ў сярэднявечча. Першым паўстаў ідыш прыблізна паміж IX—XII стст., калі юдэі, што размаўлялі па-сербалужыцку (заходнеславянскаю мовай, якой карысталася мяшанае насельніцтва на германска-славянскіх землях), „рэлексіфікавалі“ сваю мову верхненямецкім і ў меншай ступені габрэйскім альбо „габроідным“ фанетычным радам (пра **рэлексіфікацыю** гл. ніжэй). Я мяркую, што габрэі на нямецка-лужыцкіх землях сучаснай Германіі — гэта нашчадкі балканскіх славяна-аваараў і нямецкіх славянаў, што перайшлі ў юдаізм. Акт рэлексіфікацыі азначаў, што ідыш, будучы сербалужыцкай, застаецца заходнеславянскаю мовай з нетыповаю рысай дамінавання пераважна нямецкага лексікону. Ідышамоўныя габрэі, якія стваралі арыгінальную літаратуру на іўрыце пры поўнай адсутнасці аўтэнтычных яго носьбітаў, вымушаныя былі, каб пісаць на гэтым іўрыце, выкарыстоўваць сваю родную заходнеславянскую граматыку, на якую накладаўся класічны габрэйскі слоўнік. Усё гэта рабіла пісьмовы іўрыт габрэяў, што самі размаўлялі на ідышы, дзіўнаю (рэлексіфікаванаю) славянскаю мовай той жа вартасці, што й сам ідыш.

Дзесьці пасля XV ст. усходнеславянскія жыды — нашчадкі хазараў-юдэяў — рэлексіфікавалі сваю родную кіеўска-палескую гаворку (першааснову сучаснага паўднёвабеларускага і паўночнаўкраінскага дыялектаў) да ідышу, які імігранты-ашкеназі прынеслі на іхнюю тэрыторыю. Ідыш жа, у сваю чаргу, стаў лексіфікаванаю мовай для кіеўска-палескіх гаворак. (Калі хазарскія юдэі, як вядома, мігравалі на захад як да, так і пасля распаду Хазарскай імперыі ў канцы X ст., праўдападобна, іхнія паслядоўнікі, што таксама размаўлялі на кіеўска-палескіх гаворках і мелі кантакты з носьбітамі ідышу, ужо да міграцыі ашкеназі на Палессе маглі рэлексіфікаваць гэтыя гаворкі да ідышу.)

Такім чынам, мова, на якой размаўляла бальшыня жыдоў у Расейскай імперыі ў мінулым стагоддзі (дзесяць мільёнаў жыдоў было раскідана па ўсім свеце напярэдадні II сусветнай вайны), з канца XVI ст. вядомая як ідыш, уключае заходнюю альбо ўсходнюю ці заходне-ўсходнюю славянскую граматыку і пераважна рэлексіфікаваны нямецкі лексічны кампанент. У некаторых рэгіёнах рэлексіфікаваная верхнялужыцкая і рэлексіфікаваная кіеўска-палеская мовы, магчыма, маглі суіснаваць, у той час як у іншых рэгіёнах яны маглі мець дадатковае геаграфічнае размеркаванне (напрыклад, рэлексіфікаваная верхнялужыцкая мова магла б прэваляваць у Польшчы і часткова ва Ўкраіне, пры тым што ў Беларусі і на некаторых украінскіх тэрыторыях асноўнымі былі рэлексіфікаваныя кіеўска-палескія гаворкі). І, урэшце, на некаторых тэрыторыях абодва славянскія ідышы, якія ўзніклі на базе такім чынам рэлексіфікаванага нямецкага лексікону і падобных славянскіх граматык, маглі зліцца ў адно (гл. *Вэкслер* 1991, 1993).

Вельмі важна зразумець прыроду феномену, вядомага як „рэлексіфікацыя“ (дэталі і прыклады з шэрагу моваў гл. *Горват і Вэкслер* 1997). Рэлексіфікацыю часам блытаюць з шырока распаўсюджаным пазычаннем, але гэтыя два працэсы маюць паміж сабою вельмі мала агульнага. Пры пазычанні носьбіт бярэ словы з іншай мовы і ўжывае іх у неадаптаваным выглядзе (хаця пазней мова, якая пазычае, можа ўносіць карэктывы ва ўжыванне пазычанняў). Звычайна аб’ём пазычанай лексікі досыць сціплы, хаця ён часам можа стаць і асноўным кампанентам (сведчанне таму — раманскі кампанент у ангельскай мове альбо арабска-іранскі кампанент у дарэформавай турэцкай). Пры рэлексіфікацыі носьбіт мовы пераўтварае амаль увесь родны слоўнік у іншамоўныя словы, але выкарыстоўвае толькі тыя значэнні і словаўтваральныя мадэлі, што вядомыя роднай мове. Не адбываецца ўспрыняцця чужых значэнняў разам з чужымі словамі, як не адбываецца й зменаў у граматыцы рэлексіфікаванай мовы. Такім чынам, больш дакладна рэлексіфікацыю можна было б вызначыць хутчэй як пазычанне найперш „чужых гукавых камбінацыяў“, чымся чужых словаў і іхніх значэнняў. На першы погляд, рэлексіфікаваная мова выглядае роднаснай той мове, якая

пазычыла ёй свой слоўнік, таму й не дзіўна, што ідыш заўсёды ўспрымаўся большасцю простых носьбітаў мовы, а таксама вонкавымі назіральнікамі як дэфармаваная форма верхненямецкай мовы.
Яшчэ адна рыса пазычання ў кантэксце моўных кантактаў праяўляецца ў немагчымасці прадбачыць, якія элементы лексікону, фаналогіі альбо граматыкі будуць пазычацца.
З іншага боку, адметнай асаблівасцю рэлексіфікацыі выступае тое, што мы здольныя прадбачыць, якія словы будуць прынятыя рэлексіфікаванаю мовай. Гэта магчыма таму, што мова-рэлексіфікатар звычайна прымае толькі тыя іншамоўныя словы, якія могуць быць адабраныя ў адпаведнасці з яе арыгінальнымі элементамі. Іншымі словамі, лужыцка- і беларуска-/украінскамоўныя жыды могуць браць з нямецкай толькі тыя словы, што не парушаюць граматычных нормаў лужыцкай і беларускай/украінскай моваў (прыклады гл. ніжэй).
Двухроўневы працэс рэлексіфікацыі прывёў да надзвычай ідыясінкрэтычнага ўжывання ідышам запазычаных нямецкіх кампанентаў. Аднак наўрад ці хто-кольвечы з носьбітаў мовы альбо вонкавы назіральнік калі-небудзь задаваўся пытаннем, чаму так адбываецца. Большасць людзей меркавала, што ідыш быў альбо „дэфармацыяй“, альбо „творчым жыдоўскім атожылкам“ верхненямецкай мовы, тым часам як усе сведчанні постмішнаіцкай габрэйскай мовы (мовы пасля III ст. нашай эры, калі яна страціла сваіх носьбітаў) слепа трактаваліся як рэалізацыі класічнага семіцкага іўрыту.
У канцы XIX ст. група ўсходнееўрапейскіх жыдоўскіх нацыяналістаў на чале з беларускім габрэем Эліэзэрам бэн Егудам прапанавала замяніць амаль што ўвесь лексічны кампанент свайго роднага ідышу класічнымі іўрыцкімі фанетычнымі камбінацыямі, у той час як меншая група носьбітаў ідышу, якіх таксама ачольваў беларускі жыд Людвік Замэнгоф, адначасова адстойвала замену ідышскага лексікону лаціноідным лексіконам свайго ўласнага стварэння. Вынік першапачатковага акту рэлексіфікацыі (што цяпер ужываецца 6 мільёнамі ізраільскіх жыдоў і палестынскіх арабаў як першая альбо другая мова) паўсюдна вядомы ў якасці „сучаснага іўрыту“. Выбар імя для гэтага тыпу „рэлексіфікаванага ідышу“ дыктаваўся жаданнем узмацніць сувязь з класічным іўрытам

(які стаў мёртваю мовай прыблізна ў 200 годзе н.э.). Вынікам другога акту рэлексіфікацыі сталася эсперанта (гл. *Вэкслер* 1990).
Адсюль вынікае, што ідыш і тры яго нашчадкі: сучасны іўрыт, пісьмовы дасучасны паўночнаеўрапейскі іўрыт і эсперанта — генетычна звязаныя між сабою праз выкарыстанне агульнаславянскай граматыкі. Большасць першых габрэйскіх „адраджэнцаў“ і амаль што ўсе носьбіты мовы з тых часоў прастадушна верылі, што яны змогуць узнавіць размоўныя (калаквіяльныя) функцыі мовы, якая на працягу стагоддзяў была толькі сродкам пісьмовага і літургічнага выражэння, шляхам „адраджэння“ граматыкі пазбаўленага вуснай формы семіцкага іўрыту. З цягам часу павелічэнне колькасці носьбітаў толькі адной мовы, адроджанага іўрыту, значна памацняла ўражанне таго, што стары іўрыт быў паспяхова „адроджаны“. У нашыя дні большасць носьбітаў іўрыту рэагуе альбо звышэмацыйна, альбо са смехам на сцверджанне, што сучасны іўрыт генетычна не звязаны са старым семіцкім іўрытам, альбо на згадкі пра тое, што сучасны носьбіт мовы — далёка не беспасярэдні нашчадак носьбітаў класічнага іўрыту. Выбар варыянтаў назову (стары *versus* сучасны „іўрыт“) не можа зняпраўдзіць таго факту, што сучасны іўрыт — гэта толькі беспасярэдні працяг ідышу, які ў сваю чаргу выступае беспасярэднім працягам лужыцкай мовы тысячагадовай даўніны і/альбо кіеўска-палескіх гаворак апошніх 500 гадоў. Носьбіты ідышу, які цяпер знаходзіцца ўжо ў стадыі адмірання, у асноўным рэагуюць з жахам (але без асаблівай агрэсіі) на тое, што іхняя мова — гэта мешанка хутчэй заходне- і ўсходнеславянскіх моваў, чымся нямецкай. Бальшыня носьбітаў лужыцкай і нямецкай моваў (у прыватнасці, лінгвістаў), калі бачыць, што іх нацыяналістычныя і акадэмічныя пазіцыі ставяцца пад сумнеў, рэагуюць у найлепшым выпадку з недаверам. Нічога дзіўнага, што толькі тыя, хто размаўляе на эсперанта (для якіх яна таксама амаль ніколі не з’яўляецца першаю мовай) і займае хутчэй міжнародныя экуменічныя, чым нацыяналістычныя, пазіцыі, лічаць генетычную прыналежнасць эсперанта не вельмі істотнаю.

У выпадку з Лесінгавым *„Маладым шкаляром“* падрабязнае вывучэнне ідышу і сучаснага іўрыту можа зменшыць

сатырычны эфект дыялогу Даміса з ягоным лужыцкамоўным служкам пра габрэйска-лужыцкія сувязі, але сама сатыра Лесінгава пры гэтым не страціць ні кроплі сваёй прыцягальнасці нават праз два з чвэрцю стагоддзі.
Магчымасць, што носьбіты кіеўска-палескіх гаворак рэлексіфікавалі сваю мову да ідышскага слоўніку ў XV—XVI стст., дапускае існаванне ўплывовых усходнеславянскамоўных габрэйскіх асяродкаў. Большасць апошніх, у сваю чаргу, магла паходзіць пераважна толькі ад цюркскіх хазараў, што прынялі юдаізм і перайшлі на славянскія мовы пасля распаду легендарнай Хазарскай імперыі ў канцы X ст. Такім чынам, ідыш мае быць адбіткам лёсу „страчанага“ хазарскага габрэйства і дае бясспрэчныя сведчанні таго, што сучасныя габрэі-ашкеназі не ёсць асноўнымі нашчадкамі палестынскіх габрэяў.
З распадам Савецкага Саюзу вывучэнне юдаізаваных хазараў больш не забароненая тэма. Сучасныя даследаванні хазараў вяртаюцца да двух сваіх традыцыйных напрамкаў — да археалогіі і да пераасэнсавання наяўных гістарычных дакументаў, што не залежаць ад расейскага шавіністычнага ідэалагічнага дыктату. Даследнікі хазарскай праблематыкі маюць дзве асноўныя мэты: а) дасягнуць лепшага разумення хазарскай культуры і б) даведацца пра далейшы лёс хазарскага насельніцтва пасля распаду Хазарскай імперыі ў канцы X ст. па сутычцы з Кіеўскай Руссю. Пры вырашэнні другой задачы неабходна вызначыць, ці зрабілі хазарскія габрэі свой унёсак у этнагенез габрэяў-ашкеназі.
Меркаванне пра сувязь ашкеназі і хазараў можа здацца нечаканым, бо ў ідышы адсутнічаюць цюркскія моўныя рысы — такія, як сінгарманізм і базавыя аглютынацыйныя структуры. Лексікон ідышу таксама не ўключае багатага корпусу ўнікальных цюркскіх элементаў, якіх бы не было ў суседніх усходнеславянскіх і польскай мовах. У найлепшым выпадку можна казаць толькі пра так званыя „перыфрастычныя“ спалучэнні, дзе нескланяльныя габрэйскія вербальныя элементы камбінуюцца з дзеясловамі ідышу са значэннем ‘быць, станавіцца’, напр., ідышск. *bojdek zajn* ‘даследаваць’ магло, па вялікім рахунку, мець хазарскае цюркскае паходжанне, бо ў цюркскіх і іранскіх мовах таксама існуе такое спалучэнне для адаптацыі арабскага вербальнага матэрыялу;

яно адсутнічае ў нямецкай, але з'яўляецца ў габраізаваных варыянтах славянскіх моваў у XVII ст.
Каштоўнасць ідышу для хазарскіх даследаванняў заключаецца, пэўна, у тым факце, што граматыка і фанатактыка ідышу (таксама агульныя для яго нашчадкаў — сучаснага іўрыту і эсперанта), як даказана, маюць **славянскае паходжанне**; толькі слоўнік ідышу — пераважна нямецкі. Паколькі малапраўдападобна, што ўсходнеславянскія граматычныя рысы ў ідышы прыйшлі разам з аўтэнтычнымі носьбітамі нямецкай мовы, якія падпалі пад моцны славянскі ўплыў (больш падрабязна гл. ніжэй), я мяркую, што існаваў досыць вялікі асяродак габрэяў у Беларусі і ва Ўкраіне, што размаўлялі на адной з усходнеславянскіх моваў і маглі радыкальна паўплываць на імпартаваную „лужыцкую" граматыку ідышу.
І гэта гіпатэтычна вялікае ўсходнеславянскае габрэйскае жыхарства магло паходзіць толькі ад славянскамоўных нашчадкаў хазарскіх жыдоў. Іншымі словамі, ідыш дае нам ускосныя доказы таго, што хазарскія жыды былі асіміляваныя ўсходнеславянскаю мовай у канцы X ст. і, відавочна, шырока рассяліліся па Кіеўскай Русі ў часы сваёй міграцыі ў Цэнтральную Еўропу (гл. *Лявіцкі* 1988). Вялікая колькасць хазарскіх жыдоў працягвала існаваць як супольнасць у той час, калі ашкеназі каланізавалі Ўсходнюю Еўропу.
Калі „лужыцкі ідыш" у XV ст. патрапіў на кіеўска-палескія землі, мясцовыя славянскія жыды не ўспрынялі яго слепа, а хутчэй перанялі яго шляхам другаснай рэлексіфікацыі, гэтым разам ад усходнеславянскага слоўніку ў ідыш. У той самы час яны таксама пазычылі новыя нямецкія словы, не заакцэптаваныя раней ідышам, і вызваліліся ад вядомых ім германізмаў, што не адпавядалі спецыфічным запатрабаванням кіеўска-палескіх гаворак — продка сучасных паўночнаўкраінскага і паўднёвабеларускага дыялектаў.
Усходнеславянскіх хазарскіх жыдоў магло схіліць да ідышу перакананне ў тым, што гэта форма нямецкай — мовы высокага прэстыжу ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе, і/альбо павага да культуры ашкеназі. Яны таксама маглі шукаць магчымасці адасобіцца ад суседняй нежыдоўскай бальшыні. Хазарскія габрэі аддалі перавагу рэлексіфікацыі да ідышу, таму што адносна нескладана было папросту вывучыць новыя словы, пераважна захаваўшы родную ўсходнеславянскую граматыку,

якая была досыць блізкая паходжаннем да арыгінальнай заходнеславянскай граматыкі ідышу. Як ужо было прадэманстравана вышэй, магчымасць рэлексіфікацыі кіеўска-палескіх гаворак мае на ўвазе, што ўсходнеславянскія жыды колькасна пераважалі над эмігрантамі ашкеназі, якія прыйшлі з Захаду, нягледзячы на тое, што гісторыкі заўсёды сцвярджалі процілеглае, не прыводзячы якіх-кольвечы фактычных доказаў. Больш за тое, сучасныя дыялектныя факты ідышу могуць даць доказы таго, куды павінныя былі рушыць славянскамоўныя нашчадкі хазараў пасля распаду іхняй імперыі альбо, паводле апошніх звестак, пасля захопу манголамі Кіева ў 1240 г. — а менавіта на поўнач Беларусі, на захад і поўдзень Галіччыны (Украіна) і ва ўсходнюю Польшчу — тыя тэрыторыі, якім манголы пагражалі ў меншай ступені.
Як было намі адзначана вышэй, магчымасць аднавіць лексікон мовы можа быць асноўным тэстам для вызначэння папярэдняй рэлексіфікацыі ў дадзенай мове. Для таго, каб патэставаць такім чынам ідыш, я абраў корпус з 600 нямецкіх асноваў, які ўключаў 3500 асобных словаў. Я параўнаў гэты корпус з лужыцкімі і беларускімі/украінскімі адпаведнікамі, не прымаючы пад увагу фактаў лексічнай сістэмы ідышу. Калі б сапраўды ідыш быў славянскаю мовай, якая рэлексіфікавала да верхненямецкага слоўніку, то было б мажліва вызначыць, якія нямецкія словы сярод тых 3500 прыкладаў маглі быць успрынятыя ідышам, а якія адхіленыя. Замест тых незапатрабаваных германізмаў жыды маглі б выкарыстаць 5 альтэрнатыўных крыніцаў лексічнага ўзбагачэння:
а) стварыць унікальныя нямецкія словы, б) ужыць іншыя нямецкія словы, якія не былі адхіленыя мовай, в) захаваць арыгінальныя лужыцкія, беларускія і ўкраінскія словы, г) запазычыць словы з іўрыту альбо д) пры адсутнасці адпаведнага габрэйскага слова стварыць такое габрэйскае („габроіднае“) слова. Усе гэтыя крыніцы й былі выкарыстаныя ідышам у той ці іншы час на працягу сваёй гісторыі, перавага ўсё ж такі аддавалася мажлівасцям г) і д). Сапраўды, сярод амаль усіх 24 вядомых варыянтаў габрэйскай мовы (напр., габрэйска-гішпанскага, габрэйска-арабскага, габрэйска-кітайскага, габрэйска-грэцкага і інш.) ідыш у найбольшай ступені валодае габрэйскім і габроідным кампанентам. Зразумела, што тлумачэнне таго непраўдападобнага факту

палягае ў тым, што ідыш быў „створаны“ шляхам рэлексіфікацыі ад славянскай. Габраізмы спатрэбіліся для замены тысячаў закамянелых германізмаў (гэта тлумачыць, чаму ідыш мае значна меней нямецкіх словаў, чымся любы з нямецкіх дыялектаў; асабліва ж збедненай выглядае сфера нямецкіх сінонімаў).

Узброены сваімі ўласнымі прадказаннямі, я звярнуўся да найбольш пурыстычна арыентаванага слоўніка ідышу (*Вайнрайх* 1968) па пацверджанне і быў уражаны тым, што каля 95% маіх прадказанняў спраўдзіліся (*Вэкслер*, рукапіс). Возьмем толькі два прыклады:
1. Нямецкая мова мае дзве формы простай асновы са значэннем ‘імя’ і ‘называць’: *Name* і *nennen*. Я прадбачыў, што лужыцкія габрэі возьмуць толькі адзін з тэрмінаў, таму што ў лужыцкай і ўсходнеславянскіх мовах першапачаткова ‘імя’ і ‘называць’ выражаліся рознымі каранямі, параўн. бел. *імя*, але *зваць, звацца.* Так насамарэч і адбылося: ідыш бярэ толькі нямецкае *Name* (гл. ідышск. *nomen)*. Замест *nennen* ідыш выкарыстоўвае іншы германізм, *rufn (zix*), дзе зваротная часцінка *zix* імітуе ўжыванне ў беларускай мове сінанімічнай часцінкі *-ца*.
2. Я прадбачыў, што ням. *Zweifel* ‘сумненне’ (<*zwei* ‘два’) не магло быць запазычанае ідышам, паколькі славянскія мовы (калі толькі яны не знаходзяцца пад уплывам нямецкай, як сучасныя лужыцкія і харвацкая) не ўтвараюць слова са значэннем ‘сумненне’ ад лексемы са значэннем ‘два’. Параўн. для прыкладу бел. *сумненне, сумнявацца* з *два, дзве.* Такім чынам, у ідышы не павінна быць ням. *Zweifel* (і сапраўды, толькі германізаваныя носьбіты ідышу ў мінулым стагоддзі ўспрынялі апошняе ў форме *cvejfl*). І тады я дапускаю, што ідышскае слова са значэннем ‘сумненне’ будзе сапраўдным іўрыцкім, псеўда-іўрыцкім („габроід“), славянскім альбо нямецкім неалагізмам. Напраўду ж яно аказваецца іўрыцкім *safek* (мн. *sfekot*)>ідышск. *sofek* (мн. *sfejkes*) ‘сумненне’, *zajn mesupek*, *zajn in sofek, sofken* ‘сумнявацца’.
Ёсць яшчэ цэлы шэраг дыягнастычных тэстаў, якія настойліва паказваюць на існаванне рэлексіфікацыі. Адзін з такіх важных тэстаў — праверка на тое, ці адрозніваецца граматыка і фаналогія мовы сваім паходжаннем ад большай часткі

слоўніку. Гэты тэст досыць актуальны для ідышу, бо германскі кампанент знаходзіцца амаль выключна ў слоўніку (славянскі лексічны кампанент любога з дыялектаў ідышу ніколі не перавышае 10% ад усяе лексікі), тым часам як фаналогія і граматыка ідышу маюць тэндэнцыю адпавядаць славянскім нормам. Магчымасць прадказаць лексічную структуру ідышу і той факт, што граматыка/фаналогія ідышу, з аднаго боку, і лексікон, з другога боку, маюць рознае паходжанне, ёсць найлепшым пацверджаннем таго, што ідыш быў створаны шляхам рэлексіфікацыі славянскай мовы да нямецкага слоўніку, а не выступіў формаю надзвычай славянізаванай нямецкай мовы. Ніякая іншая тэорыя, апрача гіпотэзы рэлексіфікацыі, не можа навукова растлумачыць крытэраў адбору ідышам усіх трох яго асноўных кампанентаў: нямецкага, габрэйскага і славянскага.

Апрача таго, у ідышы род нямецкім назоўнікам надаецца зусім іншым шляхам, чым у нямецкай адпаведным нямецкім словам. Неадпаведнасць паміж ідышам і нямецкаю мовай цалкам можа быць растлумачаная толькі праз спасылкі на лужыцкую і беларускую/украінскую граматыкі. Такім чынам, ідышск. *tejl(n)* ‘частка’ <ням. *Teil(e)* мае альбо мужчынскі род (як у нямецкай), альбо жаночы, як у славянскіх адпаведніках, напр., бел. *частка*. Прыкметай рэлексіфікацыі выступае тое, што іншамоўныя словы, якія выпадкова нагадваюць роднасныя словы з падобным значэннем, не падыходзяць для рэлексіфікацыі. Таму, мяркую, роднаснае лужыцкае *duel* ‘частка’, мужчынскага роду, павінна было быць заблакавана ў сувязі з засваеннем ідышам ням. *Teil* і дзякуючы фанетычнаму падабенству. У гэтым выпадку ідышск. *tejl* лепш разглядаць як вынік другой фазы рэлексіфікацыі.

Асаблівую перавагу ідыш надае двум нямецкім канчаткам множнага ліку *-(e)n, -er* і габрэйскаму *-ot* (>ідышск. *-[e]s*). Паралельнае адхіленне іншых нямецкіх канчаткаў і спосабаў утварэння множнага ліку (напр., *-e,* агучванне фінальнага зычнага, унутраныя чаргаванні галосных) таксама знаходзіць прывабнае тлумачэнне ў тым, што славянскія мовы мелі малы набор аднолькавых гучаннем непрадукцыйных інфіксаў у асновах назоўнікаў, якія цяпер часта асацыююцца з множналікаваю асновай, гл., напр., бел. *маці* — мн. *мацеры* (з *-ер-*), *неба* — мн. *нябёсы* (з *-ёс-* ад *-ес-*), *імя* — мн. *імёны* (з *-ён-* ад

*-ен-*). Непрадукцыйнасць альбо адсутнасць іншых нямецкіх суфіксаў і спосабаў утварэння множнага ліку ў ідышы можа быць патлумачаная адсутнасцю славянскіх паралеляў (што датычыць граматычных маркераў, такіх, як суфіксы множнага ліку, то выпадак падабенства хутчэй спрыяе, чым замінае рэлексіфікацыі).

У гэтым кантэксце я таксама магу адзначыць, што ідыш некалі, праўдападобна, меў падвойны лік, які ён атрымаў у спадчыну ад лужыцкага субстрату (лужыцкая разам са славенскай застаюцца адзінымі славянскімі мовамі, якія захавалі праславянскую катэгорыю падвойнага ліку без сур'ёзных зменаў), але які стаў вельмі прадукцыйным ва ўсходнеславянскім асяроддзі. У нашыя дні ідыш ужо не мае падвойнага ліку. Гэтая катэгорыя таксама не сустракаецца і ў нямецкіх дыялектах. Падставай для маёй думкі служыць той факт, што размеркаванне суфіксу множнага ліку *-(e)n* у нямецкіх дыялектах радыкальным чынам адрозніваецца ад ідышскіх назоўнікаў нямецкага паходжання. Ідышск. *-(e)n* мае абсалютна іншае размеркаванне. Цікава, што ўжыванне *-(e)n* у нямецкіх і некаторых габрэйскіх назоўніках (толькі некаторыя з іх называюць парны аб'ект, такія, як 'вочы', 'вушы' і інш.) можа карэляваць з размеркаваннем украінскага і беларускага „псеўдападвойнага ліку" — спецыяльнага множнага суфіксу, які ўжываўся пасля лічэбнікаў 2, 3, 4 з тыповым канчаткам множнага ліку і націскам, як у адзіночналікавай аснове. Псеўдападвойны лік значна больш прадукцыйны ў сучаснай украінскай мове, чымся ў беларускай, і корпус ідышскіх назоўнікаў нямецкага паходжання, якія цяпер утвараюць множны лік з дапамогай *-(e)n* (дзе нямецкая патрабуе іншага суфіксу множнага ліку), у значна большай ступені адпавядае ўкраінскай, чым беларускай мове. Звернемся зноў да ідышск. *tejl(n)* 'частка' (у адрозненне ад ням. *Teil[e])*, якое адпавядае псеўдападвойнаму ліку ўкр. *частка*, мн. *частки*, але *дві частки*. У адпаведнага бел. *частка* няма (прынамсі цяпер) спецыяльных множных формаў, што ўжываліся б з лічэбнікамі 2, 3, 4, паколькі націск у гэтай аснове нерухомы — гл. бел. *(дзве) часткі*. Такім чынам, мяркую, арыгінальныя славянскамоўныя габрэі Кіеўскага княства рассяляліся ў большасці сваёй на тэрыторыі Украіны і, магчыма, паўднёвай Беларусі (цікава, што менавіта ў паўднёва-заходніх беларускіх гаворках

арыгінальныя праславянскія канчаткі падвойнага ліку захаваліся найдаўжэй).

Апошняе звяно, якое злучае ідыш з усходнеславянскаю граматыкай — гэта тое, што славянскі кампанент у ідышы (які звычайна не перавышае 10% ад усяго слоўніку) часцей браўся з паўднёва- і заходнебеларускіх, а таксама паўночна- і заходнеўкраінскіх гаворак — а менавіта з тэрыторыі арыгінальнага кіеўска-палескага дыялекту, якая існавала да перагрупавання пачатку XV ст.

[1] Тэрміну *сорбы* (*Sorbs*), прынятаму ў заходняй лінгвістыцы, адпавядае лічыцца гарбіч *сарбы*, якія ў нямецкія колы жыцця (*Заўв. ідыша*).

Напавядае лічыцца гарбіч *сарбы*, якія ў нямецкія колы жыцця (*Заўв. ідыша*) (а разам з тым часта й меркаванне наконт таго, ці германізм быў прыняты ідышам на першай, лужыцкай, ці на другой, кіеўска-палескай, стадыі рэлексіфікацыі), і дзе габраізмы (альбо новаўтвораныя габраізмы) з’явяцца ў ідышы (разам з іншымі, менш сур’ёзнымі, паказальнікамі, што не абмяркоўваліся тут) — усё гэта ёсць сур’ёзным пацверджаннем гіпотэзы рэлексіфікацыі ідышу. Калі б ідыш і сапраўды быў нямецкім дыялектам, інтэнсіўна славянізаваным на працягу 700-гадовых кантактаў са славянскімі мовамі, чаго памылкова прытрымліваецца традыцыйная (і папулярная) тэорыя, можна было б чакаць, што славянскае ўздзеянне праявіцца на ўсіх роўнях мовы бессістэмна і непрадказальна. Але мы насамрэч не бачым гэтага. Яшчэ адна дылема, звязаная з поглядам на ідыш як на надзвычай славянізаваную форму нямецкай мовы заключаецца ў тым, што каланіяльныя нямецкія дыялекты Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы (быццам бы вельмі цесна звязаныя з самім ідышам) знаходзіліся ў кантакце са славянскімі мовамі нават яшчэ даўжэй за ідыш, і ўсё ж такі яны не дэманструюць такой вялікай ступені „славянізацыі“ (гл. *Вайнрайх* 1958). Таксама гэтага не назіраецца і ў цюркскіх мовах, як, напр., у караімскай, на якой размаўляе выміраючая група караімаў (секты габрэйскага паходжання, што адмовілася прызнаваць аўтарытэт Талмуду), якая пражывае на беларускіх этнічных землях больш за шэсць стагоддзяў (многія караімы лічаць сябе хазарскага паходжання (гл. *Заянчкоўскі* 1961)). Славянскі „адбітак“ ідышу, такім чынам, наўрад ці можна прыпісаць шматвяковым кантактам са славянамі. Больш за тое, пытанне не толькі ў фізічным суіснаванні на адной тэрыторыі дзвюх моваў, але нават і ў існаванні дзвюхмоўнага

насельніцтва, якое магло паслужыць мастком для перадачы ўплываў адной мовы на другую. На жаль, нам не стае падрабязнай інфармацыі наконт прыроды славянска-ідышскага білінгвізму ў перыяд да XIX ст.

Канечне ж, існуе шэраг лінгвістычных пытанняў, якія патрабуюць вывучэння. Напрыклад, не з'яўляецца верагодным фактам тое, што ўсе габраізмы ў ідышы былі атрыманыя шляхам рэлексіфікацыі з мэтай замяніць заблакаваныя германізмы. Існуе цэлы шэраг пост-рэлексіфікаваных пазычанняў як з іўрыту, так з нямецкай і славянскіх моваў. Далейшыя даследаванні патрабуюць дыферэнцыяцыі паміж пазычаннямі, абумоўленымі рэлексіфікацыяй, і пост-рэлексіфікаванымі пазычаннямі. Гэта досыць проста зрабіць у выпадку з нямецкім кампанентам, бо ж мы маем звесткі пра храналогію нямецкіх інавацыяў пасля XV—XVI стагоддзяў.

Той факт, што ідыш ёсць славянскаю мовай, дазваляе зрабіць важныя высновы для вызначэння этнагенезу габрэяў-ашкеназі. Этнаграфічныя сведчанні таксама паказваюць, што жыдоўская рэлігія і народная культура маюць у вялікай ступені славянскае, дахрысціянскае паходжанне; такім чынам, апошнія былі „юдаізаваныя" праз сувязь з рэлігіяй і народнаю культурай палестынскага габрэйства (пра тэхніку „юдаізацыі" гл. *Вэкслер* 1991, 1993). Далейшае даследаванне ў галіне геаграфіі захаваных паганскіх славянскіх звычаяў (напр., бел. *Дзяды*), магчыма, дапаможа рэканструяваць рэгіянальнае паходжанне жыдоў. Вывучэнне варыянтаў жыдоўскай мовы і этнаграфіі падштурхнула мяне да думкі пра падобнае негабрэйскае паходжанне й іншых „жыдоўскіх" групаў (гл. *Вэкслер* 1996). Вядома, найлепшым доказам той гіпотэзы, што абсалютная бальшыня сённяшніх жыдоў мае нежыдоўскае паходжанне, ёсць генэтыка. Шырокамаштабнае тэставанне ДНК толькі распачалося, аднак выбаркавыя эксперыментальныя вынікі пацвярджаюць маё падазрэнне наконт праўдзівасці генетычнага паходжання сучасных жыдоў ад старажытнапалестынскіх. Зразумела, што абсалютна не абавязкова, каб ідыш і яго носьбіты мелі аднолькавае паходжанне. Тэарэтычна, габрэі-ашкеназі маглі б быць семітамі, якія размаўлялі на адной са славянскіх моваў.

У сваю чаргу, даследаванне хазарскага пытання можа зрабіць вялікі ўнёсак у ідышскую праблематыку. Дагэтуль я мяркую,

што габрэі, якія з IX ст. насялялі германска-лужыцкія землі, мелі балканскае паходжанне (прынятае на працягу стагоддзяў меркаванне пра пераважна французскае і італьянскае паходжанне габрэяў-ашкеназі не мае ніякіх падставаў, што я й імкнуўся паказаць у *Вэкслер* 1992 і 1993). Пацверджаннем такой сувязі з Балканамі можна лічыць наяўнасць у ідышы ўнікальнага раманскага кампаненту (г. зн., раманізмаў, не зафіксаваных у нямецкіх дыялектах), які меў не французскае, а італьянскае і балканскае паходжанне. Пацверджанне знаходзім таксама ў археалагічных і гістарычных жыдоўскіх помніках на Балканах і асабліва ў юдэйска-цюркскіх знаходках у паўднёва-заходняй Вугоршчыне і Ваяводзіне, што ў Сербіі (гл. аварскі некропаліс у Чалараве — доказ, цалкам праігнараваны заходнімі даследнікамі еўрапейскіх габрэяў), і, урэшце, у рэлігійных абрадах габрэяў заходнеславянскіх земляў, у тым ліку і ўсходняй Германіі, якія нагадваюць рытуалы візантыйскіх жыдоў.

Меркаваная міграцыя жыдоў з Балканаў на тэрыторыю ўсходняй Нямеччыны мае паралель з перасяленнем неюдаізаваных славянаў — фармальнае падабенства паміж назовамі балканскіх „сербаў“ і нямецкіх „сорбаў“[1] невыпадковае (на гэтую тэму гл. *Кунстман* 1987). Лявіцкі і іншыя навукоўцы, карыстаючыся тапанімічнымі дадзенымі, паказваюць, што хазарскія габрэі суправаджалі іншыя этнічныя азіяцкія групы ў Цэнтральную Еўропу, а не толькі ў Вугоршчыну, дзе даўно была прызнаная хазарская прысутнасць. Такім чынам, лужыцкія габрэі маглі быць як балканскага, так і хазарскага паходжання. Спадзяюся, што даследаванні хазарскага пытання кінуць святло й на гэтую праблему.

***Літаратура***

Horvath, J. and P. Wexler, eds. (1997). *Relexification in creole and non-creole languages. (With special reference to Haitan Creole, Modern Hebrew, Romani and Rumanian.)* Wiesbaden: Otto Harrassowitz.

Kunstmann, H. (1987). *Beitrage zur Geschichte der Besiedlung Nord- und Mitteldeutschland mit Balkanslaven.* Munich: Kubon and Sagner.

Lewicki, T. (1988). Kabarowie (Kawarowie) na Rusi, na Wegrzech i w Polsce we wczesnym sredniowieczu. *Studia nad etnogeneza*

*Slowian i kultura Europy wczesno-sredniowiecznej,* eds. G. Labuda i Tabaczynski, 2:77-87. Wroclaw-Krakow-Gdansk-Lodz: Zaklad im. Ossolinskich.
Weinreich, U. (1958). Yiddish and Colonial German in Eastern Europe: The differential impact of Slavic. *American contributions to the Fourth International Congress of Slavicists,* 369-421. The Hague: Mouton.
— (1968). *Modern English-Yiddish Yiddish-English dictionary*. New York: YIVO-McGraw-Hill.
Wexler, P. (1990*). The schizoid nature of Modern Hebrew. A Slavic language in search of a Semitic past.* Wiesbaden: Otto Harrassowitz.
— (1991). Yiddish — the fifteenth Slavic language. *International journal of the sociology of language* 91:1-150, 215-25. Berlin: Mouton-de Gruyter.
— (1992). *The Balkan substratum of Yiddish. A reassessment of the unique Romance and Greek components*. Wiesbaden: Otto Harrassowitz.
— (1993). *The Ashkenazic Jews. A Slavo-Turkic people in search of a Jewish identity.* Columbus, Ohio: Slavica.
— (1995). Забыты сучасны кантэкст сучаснай гебрайскай мовы. *Беларусіка = Albaruthenica* 4:20-34. Мінск.
— (1996). *The non-Jewish origins of the Sephardic Jews*. Albany: State University of New York.
— [рукапіс] *Two-tiered relexification in Yiddish: the Jews, the Sorbs, the Khazars and the Kiev-Polessian Principality*.
Zajaczkowski, A. (1961). Khazarian culture and its inheritors. *Acta orientalia* (Budapest) 12(1-3), 299-307.

*З ангельскай мовы пераклалі Алеся Ліцвіноўская і Ўладзімер Матусевіч*
*паводле аўтарскага тэксту*

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

# Дэніс Прэгер
# Сэксуальная рэвалюцыя юдаізму

**Дэніс Прэгер** — кансэрватыўны камэнтатар і вядучы ток-шоў на радыё KABC у Лос-Анджэлесе і заснавальнік „Цэнтру Miche за этычны манатэізм“. Аўтар шматлікіх кніг (апошняя — *a human nature repair manual* „Шчасьце — гэта сур'ёзная праблема“, Regan Books, 1999) і пышнага сайту www.dennisprager.net. Свае артыкулы публікуе ў заснаваным

**П**радпісаньне юдаізму, каб уся сэксуальная актыўнасьць была засяроджаная ў рамках шлюбу, зьмяніла сьвет. Забарона Торай пазашлюбнага сэксу сталася неабходнаю перадумовай для ўтварэньня заходняй цывілізацыі. Грамадзтвы, дзе сэксуальнасьць нічым не абмяжоўвалася, ускладнялі тым самым працэс свайго развою. *Панаваньне заходняга сьвету, якое настала пазьней, у значнай ступені можа быць вытлумачана сэксуальнай рэвалюцыяй, пакліканай да жыцьця юдаізмам і пасьля падхопленай хрысьціянствам.*

Гэтая рэвалюцыя палягае на тым, што ўся моц сэксу была лякалізаваная ў межах шлюбу, у выніку чаго сэкс не панаваў болей у грамадзтве, ухвалялася каханьне паміж мужчынам і жанчынай і сацыяльны статус жанчыны пачаў павольна павышацца.

Жывучы за тысячы гадоў пасьля таго, як юдаізм усталяваў гэтае прадпісаньне, мы амаль ня можам усьвядоміць, наколькі нічым не ўтаймаваны сэкс можа падпарадкаваць сабе жыцьцё чалавека й грамадзтва. Ад старажытных часоў ажно да нядаўнай пары ў шматлікіх частках сьвету сэксуальнасьць прасякала практычна ўсё грамадзкае жыцьцё.

Сэксуальнасьць чалавека, і перадусім — мужчыны, сьведчыць практыка, паліморфная й не абмяжоўваецца нічым (у значна большай ступені, чым сэксуальнасьць жывёлы). Мужчыны займаліся сэксам з жанчынамі й мужчынамі, з малымі дзяўчаткамі й хлопцамі, з адным партнэрам і ў вялікіх групах, з абсалютна чужымі людзьмі й найбліжэйшымі

сваякамі, а таксама з размаітаю свойскай жывёлай. Яны сабою дасягалі й дасягаюць аргазму, ужываючы розныя прадметы (да прыкладу, акраўкі скуры, боты ды іншыя часткі адзежы), выпаражняючыся адзін на аднаго (зацікаўленых чытачоў адсылаем да фатаграфічных працаў Робэрта Мэпэтэрпа, якія з дакладнасьцю прадстаўляюць гэтыя працэсы), а таксама ўбіраючыся ў жаночыя строі, гледзячы на катаваньне іншых, песьцячы дзяцей абодвух полаў, слухаючы голас на бачнымі з цела (так званы сэкс па тэлефоне) і, натуральна, гледзячы на аголеныя целы й часткі целаў. Ня так шмат існуе адрасаўлёных альбо неадушаўлёных рэчаў, якія б не правакавалі пэўных мужчын на даходжаньне аргазму. Натуральна, ня ўсе гэтыя практыкі віталіся грамадзтвам — да прыкладу, кровазьмяшэньне паміж бацькам і дзіцем альбо спакушэньне чужой жонкі рэдка сустракалі падтрымку, — але многія з такіх практык ухваляліся. Да такіх практык можа весьці не ўтаймаваны ці, ужываючы тэрміналёгію Фройда, „не сублімаваны“ сэксуальны поцяг.

**Дэсэксуалізацыя Бога й рэлігіі**

Вынік не ўтаймаванага полавага поцягу — сэксуалізацыя ўсяго, улучна з рэлігіяй. Калі б полавы поцяг ня быў бы адпаведным чынам стрыманы (ход не пра здушэньне, бо гэта вядзе да разбуральных вынікаў), найвышэйшая форма рэлігіі — ня будучы часткаю першабытнай рэлігійнасьці — не магла б разьвівацца. Вось жа, першаю рэччу, якую зрабіў юдаізм, была дэсэксуалізацыя Бога: *Спачатку Бог стварыў неба й зямлю* — сваёю воляй, а ня дзякуючы якім-колечы сэксуальным паводзінам. Такая канцэпцыя стварэньня радыкальна разыходзілася з традыцыямі ўсіх іншых рэлігіяў і зьмяняла гісторыю чалавека. Багі амаль што ўсіх цывілізацыяў бралі ўдзел у сэксуальных сувязях. На Блізкім Усходзе бабілёнская багіня Іштар спакусіла чалавека, героя Гільгамэша. У эгіпэцкай рэлігіі бог Азырыс меў сэксуальныя стасункі із сваёй сястрой Ізыдай, і тая панесла бога Гора. У Ханаане галоўны бог Эль супольваўся з Ашэраю. У індуісцкіх вераваньнях бог Крышна быў сэксуальна актыўны, маючы шмат жонак і нямала пазашлюбных прыгодаў. Бог Самба, сын Крышны, спакусіў шмат сьмяротных жанчын і мужчын. У грэцкай міталёгіі Зэўс ажаніўся з Гераю, заляцаўся да шматлікіх жанчын, выкраў

гожага юнака Ганімэда й займаўся мастурбацыяй. Пасэйдон ажаніўся з Амфітрыдаю, што не перашкодзіла яму заляцацца да Дэмэтры й згвалціць Тантала. Рымскія багі таксама сэксуальна перасьледавалі як мужчын, так і жанчын.

Беручы пад увагу сэксуальную актыўнасьць багоў, ня варта дзівіцца й таму факту, што самі рэлігіі былі прасякнутыя ўсімі формамі сэксуальнай актыўнасьці. На старажытным Блізкім Усходзе, і ня толькі там, жрацы дэфлыравалі дзяўчатаў, якія мелі пачаць сэксуальнае жыцьцё із сваімі сужэнцамі, а сакральная, ці рытуальная прастытуцыя была амаль што паўсюднай. Норман Сасман, псыхіятр ды гісторык сэксу, наступным чынам апісвае гэтую сытуацыю: „Прастытуткі-жанчыны альбо прастытуткі-мужчыны, служачы часова ці стала, займаючыся гетэрасэксуальнымі й гомасэксуальнымі, аральна-генітальнымі, садаміцкімі ды іншымі формамі сэксуальнай актыўнасьці, ахвяруюць свае вабноты на карысьць храму“. На старажытным Блізкім Усходзе зь вельмі раньніх часоў анальны полавы акт быў часткаю культу тамтэйшай багавіцы. У старажытным Эгіпце, Мэсапатаміі й Ханаане мелі месца штогоднія сакральныя полавыя акты паміж каралём і жрыцамі. Прастытуткі мелі стасункі зь вернікамі ў храмах і санктуарыях старажытнай Мэсапатаміі, Фінікіі, Кіпру, Карынту, Картагену, Сыцыліі, Лібіі, Заходняй Афрыкі й Індыі старажытных ды новых часоў.

У старажытным Ізраілі раз-пораз паўтараліся спробы аднавіць прастытуцыю, зьвязаную з Храмам, што прыводзіла да габрэйскіх грамадзянскіх войнаў, у якіх змагаліся прыхільнікі й праціўнікі культавага сэксу. У Біблііі згадваецца, як кароль Юдэі Аса „выгнаў з сваёй краіны *кдэшым* (храмавых мужчын-прастытутак); ... што ягоны наступнік Ёсафат выгнаў з краіны апошніх *кдэшым*, якія засталіся з часоў караляваньня ягонага бацькі Асы, і што пазьней кароль Ёсія пад час сваёй рэлігійнай рэформы разбурыў дамы *кдэшым*“. У Індыі амаль што да нашага стагодзьдзя некаторыя культы вымагалі сэксуальнага акту паміж манахамі й манашкамі, а замужнія жанчыны мелі стасункі із жрацамі-заступнікамі бога. Да 1948 году, калі Індыя атрымала незалежнасьць, шматлікія індуісцкія храмы ў розных частках краіны мелі як жанчын-прастытутак, так і прастытутак-юнакоў. У XIV стагодзьдзі кітайцы адкрылі тыбэцкія рэлігійныя гомасэксуальныя абрады, што практыкаваліся пры двары

мангольскага імпэратара. У нашым стагодзьдзі на Шры-Ланцы ў культавых абрадах, прысьвечаных багавіцы Патыні, бралі ўдзел жрацы, пераапранутыя жанчынамі, а муж багавіцы быў сымбалічна выкастраваны.
Юдаізм узяў сэксуальную актыўнасьць пад кантроль. Яна больш не магла дамінаваць у рэлігійным ды грамадзкім жыцьці. Яна мусіла быць асьвечаная — што для габрэяў значыць „адасобленая“ ад сьвету — і зьмешчаная ў доме, на шлюбным ложку. Абмежаваньне сэксуальных паводзінаў, зьдзейсьненае юдаізмам, было адным з найпрынцыповейшых чыньнікаў будучага грамадзкага прагрэсу. Разам з этычным монатэізмам сэксуальная рэвалюцыя, якую пачала Тора, мела далекасяжныя гістарычныя наступствы.

**Вынаходка гомасэксуалізму**
Рэвалюцыйнасьць забароны юдаізмам усіх формаў пазашлюбнага сэксу ні ў чым не была настолькі радыкальнаю, як у дачыненьні да гомасэксуалізму. Уласна кажучы, *можна сьцьвярджаць, што юдаізм вынайшаў панятак гомасэксуалізму, бо ў старажытным сьвеце сэксуальнасьць не была падзеленая на гетэра- й гомасэксуалізм*. Гэты падзел зрабіла Біблія. Да Бібліі сьвет адрозьніваў адно сэксуальнасьць актыўную (партнэр актыўны) й пасыўную (партнэр пасыўны).
Марта Нісбаўм, прафэсарка філязофіі Ўнівэрсытэту Браўна, нядаўна напісала, што старажытныя зьвярталі на сэксуальныя схільнасьці іншых людзей ня болей увагі, чым мы цяпер — на прыхільнасьці кулінарныя: „Старажытныя катэгорыі сэксуальнага досьведу вельмі істотна адрозьніваліся ад нашых… Цэнтральным у сэксуальнай маралі было адрозьненьне паміж актыўнаю й пасыўнаю роляй. *Пол аб’екту… сам зь сябе ня быў маральнаю праблемай*. Юнакоў ды жанчын часьцяком успрымалі як узаемазамяняльныя аб’екты [мужчынскай] корці. Сацыяльна прэстыжней было авалодваць, чымся быць авалоданым. Сэкс у прынцыпе разумеўся не як узаемадзеяньне, а як *тое, што робіцца кімсьці камусьці.*“
Юдаізм зьмяніў усё гэтае. Ён зрабіў *пол аб’екту маральнаю праблемай*. Ён задэкляраваў: узаемазамяняльных сэксуальных аб’ектаў няма. У выніку сэкс у сутнасьці сваёй стаўся *сувязьзю*, а ня тым, што робіцца кімсьці камусьці.
Каб ацаніць маштаб зьдзейсьненай юдаізмам сэксуальнай

рэвалюцыі, якая палягае на забароне гомасэксуальных практык ды вымозе, каб сэксуальная сувязь мела месца адно паміж мужчынам і жанчынай, трэба насамперш добра ўсьвядоміць, што гомасэксуалізм вітаўся, цаніўся й практыкаваўся паўсюль, ува ўсім сьвеце. Адзіным выняткам была менавіта габрэйская цывілізацыя і — тысячагодзьдзем пазьней — цывілізацыя хрысьціянская. „Па-за габрэямі, *ніводная* з архаічных цывілізацыяў *не забараніла гомасэксуалізму як такога*“, — адзначае прафэсар Дэвід Грынбэрг. Адно юдаізм, каля трох тысяч гадоў таму, ацаніў гомасэксуалізм як зло. Ён выказаў гэта ў наймацнейшай і адназначнай формуле: „*Ня будзеш класьціся з мужчынамі так, як з жанчынамі, бо гэта — паскудзтва*“, а таксама: „*Калі мужчына лёг з мужчынаю, як з жанчынаю, абодва зрабілі паскудзтва*“. Вось сутнасьць сэксуальнай маралі юдаізму: гомасэксуалізм адрынуты і абвешчана, што гэта адхіленьне ад нормы“. /…/

**Выберы жыцьцё**

Юдаізм ня мог пагадзіцца з гомасэксуалізмам, бо апошні супярэчыць ягоным асноватворным прынцыпам. Як безнадзейна бясплодны, ён супярэчыць жыцьцесьцьвярджэньню й выказанай Богам вымозе, каб менавіта мужчыны й жанчыны жылі разам, а таксама адмаўляе тое, што юдаізм лічыць асноўнаю структурай для ўсіх людзей, то бок сям’ю.

Калі можна гаварыць пра існасьць юдаізму, дык яна залучаная ў сьцьвярджэньні Торы: „*Я паклаў перад табою жыцьцё й сьмерць, блаславеньне й праклятьце, а ты выберы жыцьцё*“. Юдаізм падтрымлівае ўсё, што ўзмацняе жыцьцё, і супрацьстаіць усяму, што рэпрэзэнтуе сьмерць. Таму габрэйскі сьвятар (*коген*) павінен быў займацца адно жыцьцём. Магчыма, юдаізм — адзіная сярод рэлігіяў сьвету, якая забараніла сваім сьвятаром уваходзіць у кантакт зь мёртвымі. Апроч таго:

— *мяса* (сьмерць) было аддзеленае ад *малака* (жыцьця);

— *мэнструацыя* (сьмерць) была аддзеленая ад *полавага акту* (жыцьця);

— *мясаедныя* зьвяры (сьмерць) былі аддзеленыя ад *траваеднай*, кашэрнай жывёлы (жыцьця).

Напэўна таму Тора ставіць у адзін шэраг прынашэньне дзіцяці ў ахвяру і мужчынскі гомасэксуалізм. Канечне, яны маральна нераўназначныя, але, хоць і ў рознай ступені, прадстаўляюць

сьмерць. Першае пазбаўляе дзіця жыцьця, другое робіць немагчымым зьяўленьне новага жыцьця (нараджэньне дзіцяці). Гэтае супастаўленьне гомасэксуалізму з прынашэньнем ахвяры ёсьць у Тальмудзе: „*Той, хто ня дбае пра памнажэньне роду, падобны да таго, хто пралівае кроў*“.
Першае сьцьвярджэньне Бога пра чалавека (пра чалавека наагул і насамперш пра мужчыну) гучыць так: „*Ня добра мужчыну быць самому адному*“. Можна дапусьціць, што Бог, вырашаючы праблему самотнасьці чалавека, мог бы стварыць іншага мужчыну альбо колькі мужчын. Але Бог вырашыў гэтую праблему, стварыўшы жанчыну — не мужчыну, ня колькі жанчын, не супольнасьць мужчын і жанчын. Самотнасьць мужчыны была зьвязаная не з адсутнасьцю іншых людзей. Яна была зьвязаная з адсутнасьцю жанчыны. Натуральна, юдаізм лічыць таксама, што й кабеты патрабуюць мужчын. Але як Тора, так і габрэйскае права былі ў большай ступені патрабавальныя ў пытаньнях жаніцьбы мужчыны, чым у выпадках замужжа жанчыны. Юдаізм хвалюе тое, што можа стацца з мужчынамі, з грамадзтвам, калі мужчыны не скіруюць сваю сэксуальнасьць у шлюб. У гэтым сэнсе юдаізм выказаў моцныя прарочыя здольнасьці: пераважная бальшыня найлюцейшых злачынстваў робіцца нежанатымі мужчынамі. Вось жа, цэлібат мужчыны, шанаваны ў шматлікіх рэлігіях стан, для юдаізму — грэх. Каб стацца людзьмі ў поўным сэнсе слова, мужчына й жанчына мусяць паяднацца. Паводле Кнігі Быцьця: „*І стварыў Бог чалавека… мужчынам і жанчынаю стварыў іх*“. Еднасьць мужчыны й жанчыны — гэта ня толькі нейкі пекны ідэал, гэта іста габрэйскага погляду на працэс паўставаньня чалавека. Нязгода з гэтым раўназначная адмаўленьню асноўнай мэты жыцьця.
Нямногім габрэям трэба тлумачыць, што сям’я займае цэнтральнае месца ў жыцьці народу. Адною з найхарактэрнейшых рысаў габрэяў была й ёсьць іх адданасьць сямейнаму жыцьцю. Для юдаізму менавіта сям’я — не народ і не асоба — асноўная грамадзкая катэгорыя. Вось жа, Бог, бласлаўляючы Абрагама, кажа яму: „*Празь цябе блаславёныя будуць усе сем’і зямлі*“. /…/

**Габрэйскі сэксуальны ідэал**
Юдаізм мае свой сэксуальны ідэал, і ідэал гэты — сямейны

сэкс. Усе іншыя формы сэксуальных паводзінаў, хаця й неаднолькава дрэнныя, але ўсё-ткі зьяўляюцца адхіленьнямі ад гэтага ідэалу. Чым большае адхіленьне, тым мацнейшая непрыхільнасьць юдаізму да гэтага тыпу паводзінаў. Ступені сэксуальных грахоў могуць быць розныя. Можна сказаць, што, паводле юдаізму, ёсьць пэўны кантынуум зла, якое пачынаецца з дашлюбнага сэксу, за якім ідзе цэлібат, потым зрада, пасьля гомасэксуалізм, кровазьмяшэньне й, нарэшце, заафілія. Мы зможам лепш зразумець, чаму юдаізм адрынае гомасэксуалізм, калі зразумеем ягонае стаўленьне да іншых практык, якія таксама ня могуць ім быць прынятыя. Да прыкладу, нарматыўны юдаізм з усёй рашучасьцю адмаўляе тое палажэньне, што нежанатасьць — нагэтулькі ж варты лад жыцьця, што й шлюб. Юдаізм сьцьвярджае, што халастое жыцьцё — менш праведнае, менш поўнае й менш габрэйскае. Таму адно жанаты мужчына мог быць першасьвятаром і адно мужчына, які меў дзяцей, мог быць судзьдзём у найвышэйшым габрэйскім судзе Сангедрыне (Сынэдрыёне). Хаця нежанаты рабін можа быць духоўным правадыром грамады, ён быў бы адрынуты амаль кожнаю грамадой, калі б публічна сьцьвярджаў, што самотнае жыцьцё настолькі ж каштоўнае для габрэяў, наколькі й жыцьцё сямейнае. Але ж ніводзін габрэй ня можа сьцьвярджаць, што самотныя мужчыны мусяць быць адсунутыя ад жыцьця габрэйскай суполкі. Самотныя габрэі мусяць быць каханыя і ўлучаныя ў габрэйскую сям'ю, у грамадзкае й рэлігійнае жыцьцё.

Гэтае стаўленьне да халастога жыцьця дапамагае зразумець і стаўленьне юдаізму да гомасэксуалізму. Гомасэксуалізм супярэчыць габрэйскім ідэалам, таму ня можа вітацца габрэйскім грамадзтвам. Тыя, што публічна аддаюць яму перавагу, ня могуць выконваць грамадзкія функцыі, ня могуць быць грамадзкімі ўзорамі. Натуральна, гомасэксуалісты могуць быць улучаныя ў грамадзкае жыцьцё габрэйскай суполкі й быць люблены мі як браты і як габрэі. Тым ня менш габрэі ня могуць адчыніць дзьвярэй пазашлюбнаму сэксу, бо, калі нехта даводзіць, што нейкая форма пазашлюбных сэксуальных паводзінаў маральна раўнапраўная зь сямейным сэксам, дык ён тым самым адчыняе дзьверы ўсім іншым праявам сэксуальнасьці. /…/

Сэксуальныя ідэалы юдаізму, перадусім яго адмоўнае

стаўленьне да гомасэксуалізму, рабілі габрэяў апрычонымі ад найдаўнейшых часоў да сёньня. Ужо ў II стагодзьдзі да нашай эры габрэйскія пісьменьнікі заўважалі, што паміж сэксуальным ды сямейным жыцьцём габрэяў і ладам жыцьця іх негабрэйскіх суседзяў існуе вялізарная розьніца. У „Прароцтвах Сыбілы“, напісаных пэўным габрэем з Эгіпту (найхутчэй паміж 163 і 45 годам да н.э.), аўтар параўнаў габрэяў зь іншымі народамі: „Габрэі надаюць вялікую вагу сьвятому шлюбу й не ўваходзяць у бязбожныя стасункі зь дзецюкамі, як гэта робяць фінікійцы, эгіпцяне, рымляне, грэкі й шмат іншых народаў — пэрсы, галы і ўся Азія“. У нашыя часы гісторык сэксуальных нораваў Арно Карлен напісаў, што, паводле іншага дасьледніка гэтай праблемы Альфрэда Кінсі, „гомасэксуалізм быў нечувана рэдкі сярод артадаксальных габрэяў“. /…/

**Мужчынам і жанчынаю зрабіў іх**

Сьвету, які падзяліў чалавечую сэксуальнасьць на актыўную (што авалодвае) ды пасыўную (якой авалодваюць), юдаізм сказаў: гэта памылка — сэксуальнасьць мусіць быць падзеленая на мужчынскую й жаночую. Сьвету, які ставіўся да жанчын як да выраблялыніцаў дзяцей, ня вартых рамантычнай і сэксуальнай увагі, юдаізм сказаў: памылка — жанчыны павінны быць адзіным аб’ектам эратычнага каханьня мужчын. Сьвету, які лічыў пачуцьцёвасьць ды фізычную красу найвышэйшымі дабротамі жыцьця, юдаізм паведаміў: гэта няслушна, бо найвышэйшыя вартасьці — этыка й сьвятасьць. За тысячу гадоў да тае эпохі, калі пры рымскіх імпэратарах служылі аголеныя хлопцы, габрэйскім царом было прадпісана перапісваньне й захоўваньне *sefer torach* — кнігі Торы.

Пад час досьледаў, што тычыліся пытаньня гомасэксуалізму, ніштo мяне ня ўзрушыла мацней за тальмудычны закон, які забараняў габрэям прадаваць рабы альбо авечкі негабрэям, каб ім не прыйшло да галавы займацца гомасэксуалізмам ды заафіліяй. Гэта быў сьвет, у якім рабіны напісалі Тальмуд, а шчэ раней быў напісаны Стары Закон. Калі ў мяне пыталіся, што ёсьць найбольшым адкрыцьцём, якое я зрабіў у сваіх досьледах, я заўсёды адказваў: зразуменьне таго, што для зьяўленьня Торы патрэбнае было Божае аб’яўленьне. Тора папросту занадта адрозьнівалася ад усёй рэшты сьвету, занадта супярэчыла тагачасным людзкім звычкам, каб быць адно

чалавечым творам.
Узьнікненьне заходняй цывілізацыі было нечувана пакутлівым і сталася рэччу выключнай. Яно вымагала існаваньня веры, згодна зь якой праведныя паводзіны ўзнагароджваліся не імгненна, а ў аддаленай пэрспэктыве, і зьмены скіраванасьці існых датуль звычак. Гэтае самаабмежаваньне не заўсёды добра прымалася. Рабіліся шматлікія спробы зьнішчыць *габрэйска-хрысьціянскую цывілізацыю* — часьцяком самімі габрэямі (радыкальнымі палітыкамі) альбо хрысьціянамі (антысэмітамі). Падмуркам гэтай цывілізацыі й габрэйскага грамадзтва было вяршэнства ды чысьціня сямейнага жыцьця. Але сям'я — гэта ня толькі й ня столькі натуральная адзінка, колькі *вартасьць*, якая павінна культывавацца й ахоўвацца. Грэкі нападалі на сям'ю ў імя прыгажосьці й Эрасу. Марксісты крытыкавалі інстытут сям'і ў імя прагрэсу. І сёньня вызвольны рух гомасэксуалістаў крытыкуе яе ў імя спагады й роўнасьці. Я разумею, чаму гомасэксуалісты гэта робяць. Жыцьцё смутнае для многіх зь іх. Аднак я ня мог сьцяміць, чаму да гэтых нападаў далучаюцца габрэі альбо хрысьціяне. Цяпер я разумею: яны ня ведаюць, што *на кон пастаўленая нашая цывілізацыя. /…/*

*Пераклала Саламея Кварт паводле*
Dennis Prager, Rewolucja seksualna judaizmu y Brulion*, 1/1999, Warszawa.*

[image]
[image]


Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

## Сакрат Яновіч
## Усе мы патроху жыды

---

Сакрат Яновіч — беларускі культурны і грамадзкі дзеяч, кіраўнік культурнага асяродку *Villa Sokrates*, адзін зь лідэраў польскіх беларусаў. Жыве ў Крынках (Беласточчына). Эсэіст, празаік, выдавец альманаху *Annus Alboruthenicus*, суаўтар *Czasopisu*. Апошняя кніга С.Яновіча..... Сярод ягоных апошніх публікацыяў „Тысяча гадоў

**Ж**ыдоў я ня ведаў. Іх зьніштожылі ў Крынках немцы яшчэ ў сорак другім або трэцім, калі я быў ува ўзросьце першаклясьніка. Адзіна, што памятаю з тае пары, гэта пагарбелага барадатага чалавека зь мяшком за плячыма, якога лупіць паліцыянт палкаю, каб хутчэй даганяў абоз мужыцкіх фурманак з жыдамі, што валокся ў Гарадзенскую вуліцу, у нейкую Кілбасіну недзе за Бераставіцаю...
Апустошаную местачковую гету рабавалі тутэйшыя хамы і, быццам сёньня, бачу заюшаную булавешку дзядзькі Сяменава, які чагосьці не падзяліў з бандытамі гарбарнай Пагулянкі. Немцы мелі забаву, гледзячы, як нечалавекі цягаюць юдэйскае ламарэндзе: ложкі з жалезнымі біламі, падраныя матрацы, вашывыя пярыны, прыламаныя столікі, растрэсеныя шафкі, посуд. Да часу, пакуль якісьці недадумак — казалі людзі — узяў і вываліў на вуліцу валізу даляраў, палічыўшы іх каляровымі абгорткамі цукерак, што выпрабляў фабрыкант Сруль... Паставілі варту з карабінамі. Тады ў рабаваньні гэты сёй-той наклаў галавою. Такі Ванька Галяк: поначы пер насьценны гадзіньнік і быў бы жывы, калі б здабыча не заелася званіць! Зусім тэатральна пакінуў гэты сьвет хваравекі Срайкішка: сканаў на скрыні ваконнага шкла, разьлегшыся на ёй бабай у гінэкалягічнай позе ды паказеліўшы вачыскі. Давалок свой шанц да ўзбуялых асатоў, пакрай Палясьцінскай. Спрабавалі хадзіць і бабы. Але ім рэдка ўдавалася. Іх загадзёў вынюхвалі патрулі ўласаўцаў, валячы ў кусты і дубасячы „по очереди“. Затое не забівалі. Не ўпалохалі тыя русакі толькі

Салодкую Фэлю, перадваенную ўдаву, якой спадабаліся
рускамоўныя акупанты. Зь немцамі з гарнізону ёй
баяліся запэцкаць сваю расу.
Мы, дзецярня, таксама шныпарылі ў пакінутых жыдамі хатах.
Дзеці як дзеці — шукалі чаго салодкага і смачнага. Цукерак
не стралялі. Лазілі за дня, бы бяздомныя сабачкі, бы кацяняты.
Але падпільноўвалі нас пасткі цывілізацыі. Жыды
адрозьніваліся ад гояў, у дамах іх багатыроў існавала
каналізацыя. У такой адной студні з гаўном мала не
захліснуўся мой сябар Віцька. Мы потым асьцярожна ступалі ў
панадворках, бы пяхота на мінным полі. Шмат гаварылі пра
ўмывальнікі і ванны, прызначэньня якіх так і ня скемілі, пакуль
не ўцяклі немцы і не прыйшлі саветы, зь імі палякі, а мы
падрасьлі дзеля навукі ў вялікім горадзе Беласток.

Як цяпер разумею, крынкаўцы густа перакідваліся ў гутарцы
жыдоўскімі словамі зь ідыш. Юрлівага кавалера, шчыпайлу
дзяўчат празывалі „маладым шванцам“. Сварлівы тып — гэта
„фэкі чалавек“. Ненадзейны тавар — „шайс“. Камбінатар —
„шанцоўнік“. Асобы зь лёгкім языком — „мэхляр“ або „фукс“
(шукаць фукса). Байкі гарадзіць наіўным — гэта „дурыць
майсамі“. Вось прыкладныя фразы: — Чаго гэты фукс ад цябе
хоча, га? Які гэта шайс ён табе прынёс? Ой, фэкі чалавек!
Майсамі дурыць галаву. Хай пільнуе лепей свайго маладога
шванца, якому Салодкая Фэля зробіць гевалт, гешэфт поткаю...
І будзе кіндрык на пацеху (кіндар кучаравы).
Сёньнячы, у татальнае зьнікненьне беларускай мовы, усё тое
ўжо археалёгія.
Бажніцаў — сынагогаў — у Крынках стаяла пяць. Уцалела
дзьве, на Чыстай і Беластоцкай. І вялізны могільнік, блізу
праваслаўнага за гумнамі, пад высокай Шыбеніцай, на якой —
казала бабуля — вешалі „мяцежнікаў“ (у 1863 годзе).
Крынкаўскія галячыхі добра ўспаміналі жыдоў, якія давалі
зарабіць ім у свае сьвятыя дні, калі нельга было жыду нават да
выключальніка электрычнага сьвятла дакрануцца. Жыдоўкі
ўяўляліся лагоднымі гаспадынямі, ня тое, што фэкія палячкі, у
якіх служанка — або ня так села, або ня так ступіла нагою...
Мая маці, Аляксандра, вучылася краўцаваць у Ханы, і ўсё
згадвае, як хацела тая Хана аддаць ёй на схоў ад немцаў двух
сынкоў... — Ах, Ханачка, а дзе я іх схаваю, каб суседзі ня

Беларусь“ (Беласток), 12 (1999) 1 (2000) 2 (2001) 3 (2002) 4 (2003) 5 (2004) 6 (2005) 7 (2006) 8 (2007) 9 (2008) 10 (2009) 11 (2010) 12 (2011) 13 (2012) 14 (2013) 15 (2014) 16 (2015) 17 (2016) 18 (2017) 19 (2018) 20

выдалі жандарам, іхнаму Шатэнбэргу!
Жыды былі ня з нашага сьвету. Выратавалася ўсяго некалькі, і тое тыя, што пайшлі ў лес, да савецкіх партызанаў. Па вайне яны выехалі ў Амэрыку. У кагосьці зь іх мой бацька купіў пляц і паставіў на тых пажарышчах новы дом, у якім я і жыву. Можна сказаць: на жыдоўскіх фундамэнтах (часам выкапаю ў агародзе абломак пасуды ці мядзяную манэту часоў Вялікага Княства Літоўскага). Мая пакручаная рэўматызмам суседка ўмее гаварыць па-жыдоўску, але ўжо забывае, бо няма ёй з кім у Крынках пагергетаць. Здарылася раз ёй аказія, у прыезд якогасьці ўнука з Ізраілю, і, як гэта з жыдам знацца, крыху прызарабіла. Ды за тыя фунты пасьля пацягнулі бабу на пастарунак: ці не завэрбаваная яна імпэрыялістычнай выведкаю?! Кабета пракляла шанц, і хоць заморскія грошы ёй адабралі, але, прыбегшы дахаты, сымбалічна спаліла ў пліце хоць газэту з партрэтам Брэжнева. — А каб я ведала тую бяду!...
Мужык-п'яніца выманьваў ад яе залатоўкі „на чарку атруты" ў бары, палохаючы, што скажа „дзе трэба", як паліла Леаніда Ільіча...
У апагей польскага сталінізму пра жыдоў наагул маўчалі. Пайшоў почут, што ў іх руках уся ўлада і сам Сталін жыд. Некаторыя ўдакладнялі: грузінскі жыд. Прымаўка „Усе жыды начальнікі" пацьвярджалася ў літаральным сэнсе: пасьля акупацыі засталіся ў жывых адзінкі, але не чуваць было, каб хто-лень стаў чарнарабочым. Маці апазнавала жыдоў на шаноўных фатаграфіях, публікаваных у тадышніх газэтах. — Во, выліты Мошка Хацкель! Бачыш, якая шышка ён у Варшаве?! Давай напішам яму пісьмо, што падаткамі нас душаць... — Пішы, дурная баба, пішы! — злаваў бацька. — Хацкеля ў Кілбасіну вывезьлі і тамака ўсе душою загавелі. — У немцаў, можа, выкупіўся і цяпер расьсеўся ў паляках, — не здавалася маці. — Ага, у немца ты выкупішся, — бразгаў дзьвярыма бацька ды йшоў малаціць авёс у маразечу.
Я ўтрэшчваўся ў надрукаваны партрэт нібы-Хацкеля і дзівіўся, па чым старая апазнае жыда. На мае роспыты, маці зноў брала газэту ў рукі, зіркацела, і канчальна казала: — Як гэта па чым я пазнаю?! Хацкель, і ўсё!

Жыдоў шкадавалі па-сялянску практычна. — Без жыдоў

камуністамі парабіліся нашыя лайдакі, — заўважыў Смаркаты Ёзік. — Жыд хоць чытаць умеў і пра сьвет знаў, а мужык з чырвонаю кукардаю на грудзёх адно ведае: сьцябаць шанцоўную самагонку, заваліцца нанач да салдаткі, і лямантаваць „Хай жыве Сталін!“ Ну, хай жыве, хай яго халера возьме...

У Крынках згадвалі жыдоў менш і менш. Тыя, што маглі, выміралі, а маладым не спатрэбіліся майсы. У Варшаве час-часом падымалі палякі гевалт на жыдоў, што крынкаўскія старажылы тлумачылі дасканала лягічна: — Нашы наеліся жыдоўскага дабра пры немцах, а палякі, во, цяпер пасыкнуліся пазабіраць ім кватэры і пасады (— 1968 г.). Удавяцца, бо чужым дабром не разжывешся.

Каторагасьці году ў той варшаўскі вэрхал адзін крынкаўскі начальнік — імя яго няхай будзе навек забытае — наняў бульдозэр і давай выкопваць мармуры на жыдоўскіх могілках, што за стадоламі Польнай вуліцы. І неяк адразу ўзарвалі тады дынамітам па-сярэдневяковаму каменныя сьцены найвялікай сынагогі ў Крынках, выпаленай усярэдзіне, але цэлай. На загад гэта партыйнага шэфа зь Беластоку, Аркадзя Лашэвіча, алекшыцка-бераставіцкага КПЗБоўца, што прыпісаўся да палякаў, хоць жонка ў яго Таня. Таго і таго першым пракляў п’яны Крывашэй з хаткі на той жа Польнай. Падтрымаў яго Мондры Дурань, даваенны штабс-капітан, якому сьвет клінам сышоўся. — Кагда грабы чапаюць, — паўтараў Мондры Дурань, — і сьвятыні ўніштажаюць да астатку, дык каюк красных чакае. Так усягда, кагда Госпад Бог каво хочат згубіць, дык розум пярвее яму адымае, а потым усё лясьне і пылам пакрыет... — сказаўшы прароцтва, тыдзень з хаты не паказваўся, але і так ніхто не арыштаваў быў Мондрага Дурня.

Узьнікла гмінная тэорыя: немцы спляжылі жыдоўства, саветы — праваслаўе, і вось чарга за палякамі, каб у касьцёлах сьвіней загадавалі ды ксяндзоў пажанілі. Палякі, аднак, хоць і чырвоныя, усё ж не сьпяшаліся са сваёй гістарычнай задачай. Нешта, відаць, пранюхалі, бо — немец прапаў, саветы з голаду пухнуць, значыць: бяда! Бог не гандляр, гешэфту зь ім ня зробіш. Бойся Бога, калі хочаш жыць! У пекле, праўда, цікавей, але каму ахвота мець полымя ў задніцы...

Гаварнеча пра жыдоў выбухнула ў заняпад камунізму. Перш хатнія філёзафы дадумаліся, што гэта жыды стварылі камунізм,

яны яго і зьвядуць зь белага сьвету. Масква дапусьціла памылку: паўсела на жыдоў: мужыкаваты Хрушчоў, затым стала пад мухаю Брэжнеў-плятун. Няўжо нямаш у рускіх разумных? Усіх у рэвалюцыю выстралялі, адных дурняў пакінулі, каб пладзілі такіх, як яны, з пустымі, як цэбар, чарапамі?... Ой, ванькі-ванькі! Немцаў пабядзілі, а самі далей галодныя і халодныя.

Неўзабаве партыя кінула кліч: „Зажывем багата!“ Сабралася кагосьці даганяць і нават пераганяць, што Крынкі ўспрынялі адназначна: усяму скарб не навука і знаёмствы, а золата! І пайшла капаніна па агародах былое геты. Як ня дзіўна, пачаў паніку з рыдлёўкаю ў далонісках, бы бохны, Пецька-Савет, валацужны нахлебнік Манькі-Ваўчыцы з маянтковых кучаў з гнілым саламяным дахам. Зараз за ім прыгопаў Сяргей-Булава з кіркаю. Зьявілася і Вольга-Патафон з матычкаю, але яе адпугнулі, сакатала зьберагу. Зьбеглася, вядома, пралетарская Пагулянка, хто з чым. Пекны Лёнік, а ён ніколі не аганьбіўся бруднаю работаю, асталяваўся са сваім гешэфтам на парозе развалюхі незабытага Лейзара-пячніка, урэзаўшы на баяне „Кацюшу“, за што паспадзяваўся на папіюху і закусь (баян той сьцібрыў быў у якогасьці шванцаватага лейтэнанта, што ў „освобождение“ дабраўся да яго сястры, закінуўшы яе ногі з туфелькамі сабе за пагоны). Порсткі Ахапак з Высранкі праявіў, як заўсёды, кемнасьць і прыбразгацеў з канём, запрэжаным у глыбокі нямецкі плуг на два лемяшы. Маючы мазгі дзеля тэхнікі, аплянаваў, што спрытней яму будзе мэтадам ворыва. Аднак плуг падкідала на камянёх у зямлі, параскіданых снарадамі ў вайну, ажно раптам каніска зьнік яму з вачэй, уваліўшыся ў нябачны склеп. Дэраш паламаў пярэднія ногі, і мусілі дарэзаць жываціну касою. Затое намацаў Ахапак пад цагляным скляпеньнем патайнік з дарагімі паперамі, зь якімі назаўтра запёрся ў беластоцкі банк, адкуль і вывелі яго ў кайданах хлопцы ў скураных плашчах ды пасадзілі. У камэндатуры тайнай паліцыі Ахапку ня верылі, хаця і прыяжджалі сьледчыя зь ім паглядзець гэты няшчасны склеп, нават адкапалі конскае падла за мястэчкам. Пасядзець ён пасядзеў, але за што, так і не даведаўся. Дзень і ноч пыталі ў яго пра нейкага Ратшыльда, што пазычыў у амэрыканцаў самалёт, каб накідаць зь неба на бульбянішчы Польшчы

калярадзкіх жукоў. Каб яны гарам гарэлі! Ахапак, не стрываўшы такой тайніцы, урэшце вярнуўшыся дамоў, столькі нараспавядаў пра яе ў Крынках, што ад яго людзі скакалі ў заплоцьце, быццам пацукі перад катом... Даволі хутка памёр у самоце. Адны казалі, што надта зьбілі Ахапка на допытах, таму і прывар'яцеў, ня цямячы, як страшэнныя рэчы вярэдзіць у вушы кожнаму. Магчыма, магчыма, бо ўлада ёсьць уладай і не сваёй сракі не шкадуе. Але ж, як аднае бяды не бывае, Ахапка, відаць, даканала бязьдзетная жонка — яна тым часам паджгала з хахалём на лёгкахлебныя заходнія землі, што аднялі Нямеччыне і аддалі Польшчы. І сьлед па ёй прастыў.
А цяперашнім часам пра жыдоў зноў загаманілі. У гэты раз тэрцыяркі ды нямоглыя ўдаўцы, якім мус ужо мець гешэфт з Госпадам. Менавіта ад ксяндза дачуліся, што Хрыстос навучаў толькі па-жыдоўску (арамэйская мова), ды першаапосталы паходзілі з жыдоў, і таму ўсе мы патроху жыды. Гэтая навіна выклікала спавядальны настрой у дзядуляў з бабулямі, абгрунтаваны зусім не па-хрысьціянску. Як і ўсенькае патомнае мужыцтва, наеліся яны барбарскага страху ад таго, што давядзецца на Страшным Судзішчы выслухаць даўжэзны пералік сваіх сьвінстваў, учыненых калісьці крынкаўскім жыдам і жыдоўкам. Гідкіх! Бог-жыд наўрад ці выбачыць ім... Хоць Ён і не нацыяналіст, поўны любові Госпад. Але самі яны разумеюць, што такіх зьдзекаў, якіх дапусьціліся былі ў геце, таксама не падаравалі б. Анікому! Ёсьць і надзея, што Ўсявышні ўсё ж не халоп і літасьць мае.
Кажуць: ксёндз пацешыў іх, каб ня грызьліся благімі думкамі, бо хрысьціяне нават лепшыя жыды, моляцца Богу, якога ж жыды не прызнаюць. У Крынках канчальна аціхлі проціжыдоўскія анэкдоты, а антысэміта Сікеля стары Піндаль нашпарыў кульбакаю. Маладым местачкоўцам бачыцца гэта дзяцінаясьцю апошніх магіканаў. Хлопцам сьняцца грошы, дзяўчатам багаты замуж.

[image]
[image]

[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

## Адам Глобус
## Тутэйшыя
## Апавяданне

---

Калі робіцца сумна, я згадваю даўніх знаёмых габрэяў. Так-так, менавіта ўспаміны пра габрэяў развейваюць маркоту і нараджаюць лірычныя настроі. А чым чалавек розніцца ад жывёлы? Лірычным настроем і больш нічым.
Згадваю Жэню Міхельсон…
У бібліятэцы будтрэсту нумар чатыры разам з маці працавала цётка Жэня — вясёлая, вяліказубая, жыццёлюбівая жанчына. Жэня Міхельсон любіла сала. Пра свою любоў да скварачкі яна расказвала наступнае: „Прыехала я ў Менск вучыцца на бібліятэкарку, паступіла на вечаровае аддзяленне. У бацькоў не было грошай, каб мяне вучыць. Працавала маляром на будоўлі. Усе сядаюць палуднаваць, дастаюць хлеб і сала, а я — селядца з цыбуляю. Яны сала, я сялёдку. Дайшло да таго, што я пачала прытомнасць страчваць. Раз згубіла, другі… Павалілася — вядро з фарбаю на сябе вывернула. Тады жанчыны сабраліся й кажуць… Ты, Жэнька, канечне, жыдоўка, і ніхто цябе за гэта не асуджае, але каб жыць і працаваць, трэба сала есці. Угаварылі мяне з’есці скварку. З таго часу я без скварачкі не магу“. Дома Жэня Міхельсон сала не ела, свякруха забараняла, а ў бібліятэцы заўсёды мела канапку з белымі скваркамі. З бібліятэкі цётка Жэня перайшла працаваць у газетны шапік, дзе, пэўна, таксама падсілкоўвалася сальцам. Апошні раз я бачыў Жэню Міхельсон у гэтым шапіку, на бульвары Тараса Шаўчэнкі. Яна сказала: „Ой, Валодзя, з’язджаю я ў Амерыку.

Якая розніца, дзе прэсу прадаваць?“ Сапраўды. Жэня Міхельсон з’ехала. Цікава, ці есць яна сала ў Брукліне? Не ведаю.
Як не ведаю, які лёс напаткаў Фіму…
У дзіцячым садку ў маю групу хадзіў Фіма. Прозвішча ягонае сцерлася з памяці, а вось учынак бачу, як сягоння… Стаяў сонечны верасень, цёплы і духмяны, як антонаўскі яблык. Двор садка засцілала шапаткая лістота. Па кляновым золаце прыйшоў Фімаў бацька, тоўсты, як шар. Фіма падбег да таты, апусціўся на калені і пачаў гладзіць рукамі бялюткія чаравікі. „Тата, у цябе самыя прыгожыя на свеце чаравікі! Можна я іх пацалую?“ Фіма расцалаваў бацькавы чаравікі. Учынак быў настолькі нечаканы, што нават суворая выхавацелька Клаўдзія нічога не змагла сказаць.
А яшчэ ў маю групу хадзіў Жэнік…
З Жэнікам Цыканоўскім я чытаў вершы. Ён адно чатырохрадкоўе, я другое, ён наступнае, потым зноў я. Такі дзетсадаўскі мантаж. У тагачасных садках была мода чытаць вершыкі на пару. І каб адзін хлопчык быў белы-белы з блакітнымі вачыма, а другі чорны-чорны. Цыканоўскі быў чарнавокі, усмешлівы, з трапяткім гукам „грр-р“ замест „р“. І вось праз дваццаць гадоў я сустрэў Жэніка на таксовачным прыпынку. У свае дваццаць пяць ён аблысеў цалкам, як калена. А ў мяне былі даўжэзныя валасы. „Мы зноў можам чытаць вершы. Уяўляеш: адзін лысы-лысы, а другі валасаты-валасаты!“ — пасмяяўся Цыканоўскі. Я заўсёды паважаў мужчын, якія не саромеюцца ўласнай лысіны і не заграбаюць яе касмылямі.

Валік Эльпер, як і Цыканоўскі, ніколі не ўстыдаўся лысіны, акуратнай плешы на цемені. Валік карыстаўся вялікай папулярнасцю сярод менскіх габрэек. Такой папулярнасцю, што журналістка Іра Халіп з гонарам казала: „Валічак зрабіў з мяне жанчыну!“ Я зайздросціў Валіку. Ці бывае зайздрасць чорнай або белай? Канечне, не бывае. Або ты зайздросціш, або не. Напэўна, з-за той зайздрасці я добра напіўся на Валікавых провадах у Ізраіль. Там і прыдумаў новае беларускае свята — праводзіны тутэйшага габрэя ў Ерусалім. А што за свята без рытуальных дзеянняў? Цяпер цяжка растлумачыць, якім чынам мне ўдалося ўгаварыць Ірку Халіпку з сяброўкаю ўчыніць эратычна-ўралагічны акт. Я абвясціў, што свята не свята, калі Валік не палюбуецца, як ягоныя каханкі мочацца на лёд

Менскага мора. Снег сышоў. Гулянка ладзілася на грудку вакол вялікага вогнішча. З гэтага грудка ўсе жадаючыя, на чале з Эльперам, маглі назіраць, як Іра з сяброўкаю пасікалі на блакітны лёд. Упэўнены, у гарачыя дні ізраільцянін Валік з прыемнасцю згадвае залацістыя лужыны на прахалодным блакіце Менскага мора.

А я згадваю і іншае… Час, калі мяне мучыла пытанне: „Як адрозніць яўрэя ад жыда?“ Вось было пытанне з пытанняў. У савецкай імперыі слова „жыд“ было забароненае і выкарыстоўвалася выключна як абраза, а слова „яўрэй“, хоць і не насіла абразлівай афарбоўкі, з-за антысеміцкіх настрояў прамаўлялася на паўтону ніжэй за астатнія словы ў сказе. З-за гэтага я схіляюся да выкарыстання ў беларускай мове формы „габрэй“. Але гэта цяпер. А тады… Хто жыд? Хто яўрэй? І вось пачуў я апавяданне пра братоў-блізнюкоў. Аднаго з якіх можна залічваць у жыды, а другога — у яўрэі. Розніліся яны перш-наперш паводзінамі, бо выгляд мелі амаль аднолькавы. Калі братам хацелася цукерку, яны прыходзілі да маці. Тая, у залежнасці ад настрою, або адчыняла ключыкам буфет, або не. І калі буфет не адмыкаўся, паводзіны братоў рэзка мяняліся. Яўрэй выбягаў на вуліцу і з крыкам: „Яна не дала мне цукеркі!“ кідаўся ў вялізную брудную лужыну. Кідаўся ён спінаю ў ваду, высока па-рэвалюцыйнаму ўскінуўшы рукі. Жыд тым часам заставаўся на беразе, прысядаў на кукішкі, біў ваду даланёю так, каб не запрыскаць вопраткі, і мармытаў: „Не дала, не дала, не дала…“

Я тут згадваю менскіх габрэяў, а свет ведае віцебскіх. На жаль, я толькі адзін раз у жыцці наведаў Віцебск — горад легендарных мадэрністаў Казіміра Малевіча і Марка Шагала. Каля дамка, дзе жыў Шагал, я зрабіў фотаздымак — „шагаю“ каля дому Шагала. Здымак атрымаўся кепскай якасці, маленькі, крыва абрэзаны і мутны. Але я вырашыў паказаць яго мастаку Хаіму Ліўшыцу. Я пераняў Ліўшыца ў інстытуцкім калідоры і сказаў: „Хаім Маісеевіч, вось здымак“. „Так, здымак“, — паўтарыў Ліўшыц. „Я вось тут “шагаю”!“ „Кепска відаць, але я бачу, што нехта “шагае”“. „Гэта я “шагаю” каля дома Марка Шагала“. „Знайшлі, Валодзя, чым здзівіць. Я па гэтай вуліцы яшчэ смаркатым хлопчыкам бегаў. І Вы думаеце, я не пазнаю дому Шагала?“ Адрас шагалаўскага дому я даведаўся ў краязнаўчым музеі, але хацелася спраўдзіць яго і ў

Ліўшыца. Спраўдзіў. Не ведаю, наколькі дакладна я буду трактаваць адзін з законаў юдаізму, але мне яго пераказалі так: „На правільнае пытанне ты атрымаеш дакладны адказ“. Выдатны закон. І ўсе нармальныя людзі мусяць яму падпарадкоўвацца. І не трэба баяцца. Людзей, якія могуць задаць правільнае пытанне, у Менску вельмі мала, як і людзей, што любяць спяваць.

Бора Сіманоўскі не любіў спяваць. Сапраўды, не любіць чалавек спяваць, і хай сабе не спявае. Правільна? Толькі Бора маўчаў на ўроку спеваў у сёмым класе. Сівы настаўнік мучыў акардэон, а Сіманоўскі сядзеў з закрытым ротам і глядзеў у столь. Каб Борка адкрываў рот, бойкі не адбылося б. А так настаўнік грымнуў інструментам аб стол, падышоў да Сіманоўскага і закрычаў на ўсю сярэднюю школу, каб той вымятаўся з класу. „Не пайду!“ Настаўнік паспрабаваў выцягнуць Сіманоўскага, але той учапіўся за парту, раскірэчыўся, угнуў галаву. Тады настаўнік спеваў… Ну, каб настаўнік працы, фізкультуры ці гісторыі пачаў біць вучня кулакамі па мордзе і галаве, усе б маўчалі. А так — настаўнік спеваў! У класе выбухнула істэрыка. „Жыды б’юцца! Жыды б’юцца!“ — крычала на сорак галасоў мікрараёнскае школьніцтва. Дзядзька-настаўнік перамог, выкінуў Барыса Сіманоўскага на калідор, вярнуўся і зайграў „Марсельезу“. Самае дзіўнае, што настаўнік не паскардзіўся на вучня, а той пачаў старанна раскрываць рот — нібыта спявае.

Калі табе маркотна, дапамагаюць і згадкі пра жанчын. Я згадваю і габрэйскіх жанчын — такіх, як Голда Роберман. Успамінаю, як я ляжаў у ложку з голай Голдаю. На вуліцы панавала пекла. Мы ўжо не любілі адно аднаго. Так, выпадкова сустрэўшыся ў Маскве, схадзілі ў кавярню і злюбіліся пасярод дня. Дзіўна, калі мы закахаліся, дык гулялі ночы навылёт, гаварылі, цалаваліся, а цяпер будзённа спатолілі полавыя памкненні і адпачывалі на скамечаных прасцінах. „Дай слова, што нікому не раскажаш“, — прашаптала Голда. „Пра тое, што мы любіліся?“ „Не“. „Даю!“ „Я цяпер не Голда Лейбаўна, а Галіна Львоўна. І прозвішча ў мяне Страчанкова, а не Роберман“. „Замуж выйшла?“ „Не. Проста Масква — не Менск, тут лепш назвацца Страчанковай“. Наступная сустрэча з Голдаю адбылася праз некалькі гадоў, яна выйшла замуж, нарадзіла дачку і ўзяла мужава прозвішча, а якое, не скажу.

Адно, што зноў расійскае.
Пра беларускіх габрэяў у Маскве можна ўспамінаць бясконца, але раскажу яшчэ і пра Лаўфманаў. Сям'я Лаўфманаў кантралявала гандаль у гарадку Мсціслаў. „Кантралявала“ — гэта з сучаснай лексікі, але дакладна. Лаўфману-старэйшаму падпарадкоўваліся розныя базы і склады. Мы сутыкнуліся з ім па досыць складанай па савецкім часе праблеме. У сутарэннях кармеліцкага касцёла падначаленая Лаўфману гароднінная база саліла і захоўвала агуркі. Соль ела касцёльныя сцены. Лаўфман выслухаў нас — рэстаўратараў — і бочкі з агуркамі прыбраў. Сярод нас знайшліся ўдзячныя людзі, аматары ідышу і старажытнагабрэйскіх песень. Яны напрасіліся да гандляра ў госці. Самае цікавае, што я пачуў пасля тых гасцей, былі не песні, хоць і яны мелі неаспрэчную каштоўнасць. Уразіла апісанне Лаўфмана-наймалодшага. Калі прыйшлі госці, ён ужо сядзеў за сталом. Маленькі Лаўфман-Вельзэвул узвышаўся над пачастункамі на адмысловым крэсле. Гадоў ён меў восем-дзевяць. Рот быў шырокі, з рэдзенькімі зубкамі. У правай руцэ сціскалася свежая, тлустая, сакаўная катлета, а ў левай трымалася мухабойка. „Наш меншанькі, самы разумны, — з захапленнем распавяла жонка Лаўфмана-найстарэйшага. — Наш унучак вучыцца ў Маскве. Уяўляеце?! У самой Маскве. І дзякуючы яму, нашаму разумніку-прыгажуну, сын атрымаў кватэру, і не на ўскрайку, а ў цэнтры. У цэнтры Масквы, во! Гэта ўсё выгляд і розум. На выгляд ён выдае на поўнага ідыёта. Вось мы яго й завялі ў школу для разумовых інвалідаў і навучылі, як сябе паводзіць. Ён паўгода іграў ролю крэтына. Сыну далі спачатку даведку, пра хваробу майго ўнука, а пазней і кватэру. А цяпер ён ходзіць у элітную маскоўскую школу, што спецыялізуецца на ангельскай мове. Пакажы, пакажы ім, як выглядае маскоўскі дурань!“ Маленькі Лаўфман сціснуў катлету так, што тлушч пацёк па пальцах вундэркінда, і ляснуў мухабойкаю па стале. Каб пераканаць гледачоў канчаткова, ён пусціў з носа соплі, а з рота сліну… Нават аповед пра катлету з мухабойкаю мяне ўразіў, а каб глянуць на малалетняга Вельзэвула — Уладара мухаў?

Але вернемся з Масквы ў Менск, да тутэйшых габрэяў…
У двары дому нумар сем па вуліцы Чарнышэўскага гулялі два Гены: Генка-Тонкі Мальцінскі — сын перакладчыка Хаіма, які

пераўвасабляў беларускую літаратуру на ідыш для часопіса „Зорка Бірабіджану“, і Генка-Тоўсты Паркін. Два Генкі — дзве супрацьлегласці. Тонкі — суцэльны рух, актыўнасць дваццаць чатыры гадзіны ў суткі, падманы, інтрыгі, смех. Гэта Генка-Тонкі абмяняў пустыя стрыжні да шарыкавай, яшчэ нікім не бачанай, ручкі на процьму цацак, за што атрымаў па мардасах. А Гена-Тоўсты сядзеў і чытаў Стывэнсана, Дойла, Купэра, Рыда… Зладзейнічаць ён пачне пазней. Украдзе машыну і сядзе ў турму, дзе пачне сачыняць раманы. Гена-Тонкі, пэўна ж, сеў бы ў турму, каб не эміграцыя. Тонкі з’ехаў у Ізраіль і стаў афіцэрам паветраных сілаў. А Тоўсты стаў аўтарам турэмных раманаў. Вось такія Генкі жылі на Чарнышэўскага-сем, што паміж вуліцамі Якуба Коласа і Кузьмы Чорнага.

А ў доме нумар тры на Чарнышэўскага жыў Славік Эпштэйн. Ён выдатна вучыўся ў пачатковай школе. Меў ганарысты характар і гарбаносы профіль. Славік два разы ўзапар пабіў мае акуляры. О, гэтыя акуляры! Я з мамай ездзіў на край Менску, дзе падбіралі лінзы. І нарэшце я з’явіўся ў класе ў новенькіх, бліскучых акулярах. А ў кішэні сіняга форменнага пінжака ляжаў зялёна-малахітавы футарал. Толькі адзін урок я прасядзеў у акулярах. На перапынку паспрачаўся з Эпштэйнам: хто намалюе больш роўны круг крэйдаю на дошцы. Абодва кругі атрымаліся крывыя. І гарачая спрэчка перарасла ў бойку. Аправу без шкла я паказаў маці. Мы зноўку ездзілі на ўскраіну. А калі я з’явіўся ў абноўленых акулярах, дык першае, што зрабіў: падышоў да Славіка і папярэдзіў, што калі ён зломіць акуляры, раздзяру ягоны дзённік выдатніка на шматкі. „Не раздзярэш“. Дарма ён так сказаў. Я схапіў дзённік. З маіх рук паляцела пакамечаная пашкуматаная папера. Зразумела, Эпштэйн не вытрымаў крыўды. Другія акуляры загінулі. Бацька сказаў, што мне не варта насіць акуляры, бо можна застацца зусім без вачэй. Біліся мы з Эпштэйнам толькі два разы, а так сябравалі, і калі мае бацькі атрымалі новую кватэру і мы пераязджалі, Славік падарыў мне на памяць манету Вялікага Княства Літоўскага з выбітай на ёй Пагоняю.

Манета згубілася. Шмат што згубілася. Але згадкі пра манету мяне супакойваюць, як і згадкі пра Магаліфаў…

Ведаў я трох Магаліфаў, двух асабіста, а аднаго Магаліфа-дзеда — завочна. Магаліф-дзед камісарыў ва Ўкраіне пад час грамадзянскай вайны і зрабіў вялікую ласку расійскай

літаратуры. Ён выратаваў выбітнага пісьменніка — Міхаіла Прышвіна. Байцы Чырвонай арміі збіраліся „замачыць“ сівабародага дзядка з падазронымі паперкамі ў рэчмяху. А камісар Магаліф загадаў дзядка адпусціць. Хапіла адукацыі. Можа тому, калі я вёў журналісцкае расследаванне пра лёс каштоўнасцяў, якія Сталін вывозіў з СССР і прадаваў у Германіі і праз Германію, напароўшыся на камісара Магаліфа, які быў намеснікам савецкага амбасадара ў Нямеччыне і, відавочна, прымаў удзел у распродажы збораў Эрмітажу, я не стаў акцэнтаваць на ім увагу. І калі Магаліф пашкадаваў і абараніў Прышвіна, дык Сталін не пашкадаваў Магаліфа, і ягоныя цёплыя ўзаемаадносіны з Ліляю Брык не дапамаглі.
Фотаздымак, дзе каханка Маякоўскага Ліля стаіць з камісарам Магаліфам на фоне маскоўскага Крамля, мне паказваў Магаліф-бацька. Ён прыехаў у Менск з Горак. Прыехаў не адзін, а з найлепшым сябрам — жабкаю ў зялёным тэрмасе. Мы сядзелі ў скверыку на пляцы Перамогі. Магаліф-бацька скардзіўся жабцы на лёс і паказваў мне здымкі з ЗША, куды перабраўся жыць Магаліф-сын. Здымкі былі мярзотныя. Распаўнелы Магаліф-сын адзняў свой выходны дзень са смажаннем мяса, піццём віна і сном на траве. Сытае марнатраўства — вось і ўсё пра здымкі. А ў Менску Магаліф-сын пісаў песні, досыць меладычныя, і выконваў тыя песні Лявон Барткевіч з ансамблю „Песняры“. А ў Амерыцы Магаліф-сын працуе ў фірме „Шанэль“, грузчыкам у краме. Магаліф-бацька на развітанне паказаў здымак з Ліляю Брык і папрасіў адкласці напісанне артыкулу пра дэпартацыю каштоўнасцяў, бо час не той. Цяпер той час, дзесяць год мінула, і даўно няма той жабкі з тэрмасу. Адны згадкі пра яе.
Я згадваю яшчэ шмат тых, хто не хоча прызнавацца ў сваім габрэйстве. Згадваю, каб адагнаць маркоту й безнадзейнасць, якія акупавалі наш Менск.
Успамінаю Ігара Лібермана, які ніколі не саромеўся, што ён габрэй. Удакладню: націск на першы склад — Лі́берман. Ён за гэта перажываў. А я забываўся й казаў Либерм*а*н. І на Адэсу я казаў Адзеса. А ён нерваваўся. Ігар Ліберман перажываў толькі за гэтыя два словы, за ўсё астатняе — не. Войска, а ён у войску ахоўваў турму, прывучыла не перажываць з-за драбязы. І з-за жанчын ён не перажываў, у яго іх было процьма, толькі за жонку ён узяў Рэгіну-музыказнаўцу. Непрыгожую. Вядома, на

мой густ. І я ніяк не мог зразумець, чаму Ігар выбраў Рэгіну. Дайшло пазней. Толькі ў Рэні быў вялізны габрэйскі чамадан. Такі бязмежны, сплецены з лазовых дубцоў, жоўта-сіянісцкі чамадан. З такім і толькі з такім чамаданам можна было спакойна выправіцца на Зямлю Запаветную. Ігар з Рэняю спакавалі валізы і з'ехалі. З Ерусаліму Ліберман даслаў мне бутэльку віна, чырвонага і смачнага, як кроў.
*Менск, снежань 1999 году*

[image]
[image]

---
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

[image]

**A R C H E**

[image]

**H a b r e j s k i n u m a r** **№ 3 (8) – 2000**

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

[image]

» да Зьместу «

[image]

# Ісак Башэвіс Зынгер
# Карона зь пер’я

---

**Р**эб Нафталі Халішыцэр, старшыня кагалу ў Краснабрудзе, дажыў да старасьці і застаўся безь дзяцей. Адна ягоная дачка памерла пры народзінах, другая — ад халеры пад час паморкі. Сын патануў, плывучы на кані цераз Сан. Засталася ў рэба Нафталі толькі ўнучка — сірата Ахса. Паводле кагальнага звычаю дзяўчынкі не наведваюць ешывы, бо „дачка царова ў сваім доме слаўная“, а ў гэбрайскіх сем’ях усе дочкі — прынцэсы. Ахса, аднак, вучылася — у хаце. І ўсіх, хто яе бачыў, яна ўражвала сваёй прыгажосьцю, розумам ды стараннасьцю. Скура ў яе была белая, валасы — чорныя, а вочы — сінія.
Рэб Нафталі працаваў аканомам у маёнтку пана Чартарыйскага. А паколькі пан завінаваціўся рэбу Нафталі дваццаць тысяч злотых, дык у заклад была аддадзеная зямля, на якой рэб Нафталі збудаваў млын, бровар і засадзіў некалькі соцень моргаў тае зямлі хмелем. Жонка рэба Нафталі, Неша, паходзіла з багатай сям’і, з чэскай Прагі. А таму яны маглі дазволіць сабе запрашаць для Ахсы самых спрактыкаваных хатніх настаўнікаў. Адзін вывучаў зь ёю Біблію, другі навучаў францускай мове, трэці займаўся на фартэпіяна, а чацьверты — танцамі. Ахса разумела ўсё на ляту. У восем год яна ўжо гуляла зь дзедам у шахматы. Рэбу Нафталі ня трэ было турбавацца пра пасаг для ўнучкі. Ахса засталася адзінай спадкаемцай усяе яго маёмасьці.
Добрую пару ёй пачалі шукаць загадзя, аднак ня так проста было дагадзіць Ахсінай бабулі. Яна магла толькі глянуць на чарговага хлопца, запрапанаванага сватамі, і сказаць

„плячысты, як той ёлупень“ альбо „такі вузкі лоб, што адно прыдуркі й маюць“.
Памерла Ахсіна бабуля неяк зусім нечакана. Рэбу Нафталі было ўжо далёка за семдзесят, і цяжка было сабе ўявіць, каб ён ажаніўся другі раз. Першую палову дня ён прысьвячаў чытаньню сьвятых кніг, а другую — гаспадарчым справам. Уставаў ён на досьвітку, сядаў за Тальмуд і камэнтары, а таксама адпісваў лісты старшыням кагалу. Калі хто быў хворы, дык ішоў у адведкі. Два разы на тыдзень разам з Ахсай ён заходзіў у прытулак для старых і адносіў туды супу і кашы. Нярэдка бывала так, што сьпеставаная і прызвычаеная толькі да вучобы Ахса закасвала рукавы і пачынала перасьцілаць шпітальныя ложкі.

Улетку пасьля паўдзённага сну рэб Нафталі загадваў запрэгчы ў брычку каня і разам з Ахсай выпраўляўся аглядзець палі ды праехацца па мястэчку. Едучы, яны размаўлялі пра справы, і ўсе добра ведалі, што вельмішаноўны рэб Нафталі гэтак жа ўважліва прыслухоўваўся да парадаў унучкі, як некалі — да парадаў ейнай бабкі.
Бракавала толькі аднаго — у Ахсы не было сябровак. Спрабавала неяк знайсьці іх для Ахсы бабуля, і празь нейкі час нават пагадзілася запрашаць у дом простых дзяўчат з Краснабруду. Аднак Ахсе вельмі хутка надакучылі іхнія размовы пра ўборы ды хатнія справы. А паколькі настаўнікі ў яе былі ўсё мужчыны, дык Ахсу, калі толькі гаворка ня йшла пра заняткі, трымалі ад іх на адлегласьці. Цяпер жа адзіным кампаньёнам Ахсы быў дзед. У сваім жыцьці рэбу Нафталі давялося сустракацца са шмат якімі знакамітымі асобамі шляхетнага паходжаньня. Бываў ён на кірмашох у Варшаве, Кракаве, Гданьску і Каралеўцы, а таму гадзінамі мог распавядаць Ахсе пра рабінаў, фокусьнікаў і чарадзеяў, пра вучняў ілжэмэсіі Сабатая Цьві, пра сваркі ў сойме, пра выбрыкі Замойскіх, Радзівілаў і Чартарыйскіх, пра іхніх жонак, каханак і прыдворных. Часам Ахса магла ўсклікнуць: „Мой родненькі дзядулька, каб жа ты быў не маім дзедам, а маім жаніхом!“ — і пацалаваць яго ў вочы, у ягоную белую бараду.
Рэб Нафталі звычайна адказваў: „Ну, то ж я не адзін мужчына ў Польшчы. Ёсьць шмат такіх, як я, да таго ж яны шчэ й маладыя“.

„Дзе, дзеду? Ну, дзе?“
Што да выбару мужа, дык пасьля сьмерці бабкі Ахса вырашыла ня слухацца нічыіх парадаў — у тым ліку й дзедавых. Калі ейная бабка ў запрапанаваных жаніхах бачыла адно што дрэннае, дык рэб Нафталі, наадварот, толькі добрае і заўважаў. Ахса папрасіла, каб свацьця зладзіла ёй сустрэчы зь яе кавалерамі, на што рэб Нафталі й даў дазвол. Пару прыводзілі ў пакой, дзьверы мелі заставацца адчыненымі, а пры дзьвярах мусіла стаяць старая і глухая прыслужніца і сачыць за тым, каб сустрэча не зацягнулася і каб паміж маладымі не было аніякіх фрывольнасьцяў. Зазвычай Ахса заставалася з маладым чалавекам ня болей за пару хвілінаў. Большасьць кавалераў падаваліся ёй нецікавымі і дурнаватымі. Некаторыя спрабавалі выглядаць на разумных і не зусім прыстойна жартавалі. Ахса асаджвала іх імгненна. Як гэта ні дзіўна, але бабуля са сваімі меркаваньнямі як бы ўвесь час прысутнічала пры гэтых сустрэчах. Аднойчы Ахса нават вельмі ясна пачула яе голас: „Якое рыла!“ Другі раз яна сказала: „Гэты нібы па канцылярскай кнізе чытае“.
Ахса добра ведала, што гэта прамаўляе не яе бабка. Нябожчыкі не вяртаюцца з таго сьвету, каб абмяркоўваць жаніхоў. Праўда, гэта быў бабулін голас і ейныя словы. Ахса хацела паразмаўляць пра гэта зь дзедам, але баялася, каб дзед не падумаў, ці ня страціла яна розум. Да таго ж дзед сумаваў па сваёй жонцы, і Ахса не хацела вярэдзіць ягоную душу.
Калі рэб Нафталі Халішыцэр зразумеў, што ўнучка паказвае на дзьверы ўсім, ён моцна затурбаваўся. Ахсе на той час ужо споўнілася васямнаццаць год. Людзі ў мястэчку пачалі пляткарыць, што ёй патрэбны прынц на белым кані, што яна хоча дастаць месяц зь неба, а таму й застанецца ў дзеўках. І тады рэб Нафталі вырашыў узяць справу ў свае рукі і выдаць яе замуж. Ён пайшоў у ешыву і прывёў з сабой маладога чалавека, якога звалі Зэмах, сірату і пабожнага вучня. Зэмах быў чорны, як цыган, і каржакаваты. Пэйсы ў яго былі густыя. Ён быў блізарукі, але праседжваў над кнігамі па васямнаццаць гадзінаў у дзень. Як толькі ён зьявіўся ў краснабрудзкай ешыве, дык адразу ж скіраваўся ў чытальную залю, падышоў да Тальмуду і пачаў чытаць яго на разгорнутай старонцы, пагойдваючыся ўперад і назад усім сваім целам. У такт малітве матляліся і ягоныя пэйсы. Некаторыя вучні падыходзілі да яго,

каб пазнаёміцца, але адказваў ён на іхнія пытаньні, не ўздымаючы вачэй ад кнігі. Выглядала на тое, што ён ведаў на памяць увесь Тальмуд, бо зьвяртаў увагу на кожнае няправільнае цытаваньне.
Ахса запатрабавала сустрэчы, аднак рэб Нафталі адказаў, што такія паводзіны вартыя толькі дачок краўцоў і шаўцоў, а не яе, дзяўчыны з добрым выхаваньнем. Ён нават папярэдзіў Ахсу, што калі яна выправіць і гэтага хлопца, дык ён перапіша тастамэнт зь яе на каго іншага. Да самага моманту падпісаньня шлюбнага кантракту Ахса нават і ня бачыла Зэмаха, бо пад час заручынаў мужчыны і жанчыны знаходзяцца ў розных пакоях. А калі ўпершыню ўбачыла яго, дык пачула бабулін голас: „Вось і падсунулі табе гнілы тавар“.
Словы гэтыя прагучалі так ясна, што прысутныя, як падалося Ахсе, мусілі абавязкова пачуць іх. Аднак ніхто, акрамя яе, гэтых словаў ня чуў. Дзяўчаты і жанчыны сталі вакол яе гуртом. Яны віншавалі яе, казалі, якая яна прыгожая, і хвалілі яе ўборы і кляйноты. Дзед перадаў ей шлюбную грамату і гусінае пяро, але ў гэты момант пачуўся бабулін голас: „Не падпісвай!“. І калі Ахса ўзяла ў рукі пяро, тая штурхнула Ахсу пад руку, і на паперы ўтварылася клякса.
Рэб Нафталі закрычаў: „Што ты нарабіла!?“
Ахса паспрабавала паставіць подпіс, аднак пяро ў яе высьлізнула з рук. Яна расплакалася: „Дзеду, я не магу“.
„Ахса, ты ганьбіш мяне“.
„Даруй мне, дзеду“. Асха закрыла далонямі твар. Госьці пачалі абурацца. Пачулася шыканьне, сьмех і плач. Усхліпвала і Ахса. Ня ведаючы як, яна дабрыла да свайго пакою і ўпала на ложак.
Зэмах прамовіў: „Я не хачу жаніцца з гэтай вядзьмаркай“.
Ён праціснуўся праз натоўп і пабег на вакзал вяртацца ў ешыву.
Рэб Нафталі выбег за ім. Словамі і грашыма ён спрабаваў супакоіць хлапца, але Зэмах шпурнуў грошы рэба Нафталі на зямлю. Хтосьці вынес з гасьцініцы, дзе спыніўся Зэмах, ягоны пляцёны куфэрак. І перад тым як вагон крануўся, Зэмах пракрычаў: „Я ніколі не дарую ёй, і Бог — таксама“.

Колькі дзён пасьля гэтага Ахса ляжала хворая. Рэб Нафталі Халішыцэр, якому ўсё жыцьцё спадарожнічаў посьпех, ніяк ня быў падрыхтаваны да такой няўдачы. Ён захварэў, твар ягоны змарнеў і пажоўк. Жанчыны і дзяўчаты спрабавалі супакоіць

Ахсу. Рабіны і старшыні кагалу хадзілі ў адведкі да рэба Нафталі, аднак ён слабеў з кожным днём. Празь нейкі час Ахса акрыяла і ўстала з ложку. Яна накіравалася ў пакой да свайго дзеда і зашчапіла за сабой дзьверы. Прыслужніца, якая падслухоўвала і назірала праз замочную шчыліну, сьцьвярджала, што яна нібыта чула, як рэб Нафталі сказаў сваёй унучцы: „Ты звар'яцела!“

Ахса ўвіхалася вакол дзеда, прыносіла яму лекі, мыла яго. У старога, аднак, пачалося запаленьне лёгкіх. З носу цякла кроў. Ён ужо ня мог памачыцца. І неўзабаве памёр. Тастамэнт рэб Нафталі склаў колькі год таму. Згодна зь ягонай воляй адна траціна маёмасьці перадавалася на справы дабрачыннасьці, а рэшта пераходзіла да Ахсы.

Калі памірае дзед, унукі, паводле закону, ня мусяць захоўваць жалобы. Ахса, аднак, не зьвярнула на тое ўвагі. Загадаўшы нікому не ўваходзіць у свой пакой, яна сядзела на ўслончыку і чытала кнігу Ёва. Яна зьняславіла сірату, вучня ешывы, і зьвяла дзеда ў труну. Стан яе зьмяніўся, яна ўся ператварылася ў сум. Паколькі Ахса ўжо некалі чытала гісторыю Ёва, яна пачала шукаць у дзедавай бібліятэцы якой іншай кнігі. На сваё дзіва яна знайшла Біблію ў перакладзе на польскую мову — Новы і Стары Запаветы пад адною вокладкаю. Ахса ведала, што кніга гэтая забароненая, аднак яна ўсё ж такі разгарнула яе. „Цікава, ці чытаў яе дзед?“ — падумала Ахса. „Не, пэўна, не“. Яна ўзгадала, як у фэсты, калі гоі хрэсным ходам ішлі з абразамі, ёй забаранялі нават падыходзіць да вакна. Дзед казаў ёй, што гэта ідуць ідалапаклоньнікі. „А ці чытала гэтую кнігу бабка?“ — сама сабе падумала Ахса. Паміж старонкамі яна знайшла колькі засушаных валошкаў — менавіта гэтыя кветкі любіла зьбіраць бабка. Ахсіна бабуля паходзіла з Багеміі, і казалі, што ёйны бацька належаў да сэкты Сабатая Цьві. Ахса ўзгадала й пра тое, што князь Чартарыйскі, наяжджаючы ў маёнтак, любіў паразмаўляць з бабкай і заўсёды хваліў яе польскую мову. А аднойчы, і гэта быў камплімэнт, ён сказаў, што, калі б ён быў раней сустрэў яе і каб яна не была гэбрайкаю, дык ажаніўся б зь ёю.

За тую ноч Ахса прачытала Новы Запавет ад першай да апошняй старонкі. Цяжка было ёй пагадзіцца, што Ісус ёсьць адзінародным сынам Божым і што Ён уваскрос зь мёртвых. Што да самой кнігі, дык Ахса падумала, што яна ўсё ж лепей

адпавядае ейнаму бязрадаснаму стану, чымся суворыя словы Прарокаў, якія ніколі ня кажуць пра Валадарства Нябеснае і ўваскрасеньне. Усё, што яны абяцаюць, гэта ўзнагароду за добрыя ўчынкі і галодную сьмерць ды хваробу — за дрэнныя. На сёмую ноч Шываху Ахса вырашыла ўсё ж паспаць. У пакоі было цёмна, і яе ўжо агарнула дрымота, калі яна раптам пачула крокі. Ахса адразу ж пазнала, што гэтыя крокі — дзедавы. У цемры зьявілася постаць рэба Нафталі. Ахса выразна бачыла ягоны асьветлены твар, белую бараду, мяккія рысы твару і нават ярмолку на высокім ілбе. Ціхенечка ён прамовіў: „Ахса, ты зрабіла страшэнную памылку“.
Ахса заплакала. „Дзядуленька, што ж мне рабіць?“
„Усё можна выправіць“.
„Як!?“
„Папрасі прабачэньня ў Зэмаха. Станься яго жонкай“.
„Дзядуню, ён мне агідны“.
„Ён твой нарачоны“.
Голас змоўк, і Ахса адчула пах нюхальнага тытуню, які дзед звычайна зьмешваў з гвазьдзікамі і морскай сольлю. А потым постаць зьнікла, і толькі пустка зазеўрала ў цемры. Зьдзіўленьне Ахсы было настолькі вялікае, што яна нават не пасьпела спужацца. Урэшце яна прыхінулася да парэнчы ложку і празь нейкі час заснула.

Прачнулася Ахса ад штуршка і пачула бабулін голас. Гэта быў ня той ціхі і слабы голас, якім зь ёю звычайна размаўляў дзед. Быў гэта моцны голас жывога чалавека.
„Ахса, унучка мая“.
Ахса расплакалася.
„Бабуля, ты дзе?“
„Я тут“.
„Што мне рабіць?“
„Тое, што падказвае табе тваё сэрца“.
„Але што?“
„Ідзі да сьвятара. Ён скажа“.
Ахса зьнямела. Ад жаху ёй заняло мову. Адно што й пасьпела яна сказаць: „Ты не мая бабка, ты сатана“.
„Не, я твая бабуля. Ці ж ня памятаеш, як улетку мы плюхаліся ў копанцы каля пагорку, і ты знайшла на дне злоты?“
„Памятаю, бабуля“.

„Магу падаць табе і іншы знак. Дык ведай жа, гоі не памыляюцца. Ісус з Назарэту — Сын Божы. Як і казалі прарокі, Ён нарадзіўся ад Духа Сьвятога. Мяцежныя гэбраі адкінулі ісьціну, а таму і доля іхняя ліхая. Мэсія ня прыйдзе да іх, бо Ён ужо прыйшоў".
„Бабуля, мне страшна".
„Ахса, ня слухай!" — раптам пракрычэў ёй у правае вуха дзед. „Гэта не твая бабка, гэта злы дух, які ўводзіць цябе у зман. Не паддавайся на гэтыя блюзьнерствы. Ён хоча зацягнуць цябе ў пекла".
„Ахса, гэта ня твой дзед, гэта проста прывід, які атабарыўся за нашай лазьняй", — перабіла бабка. — „Зэмах — няўдалік, і да таго ж помсьлівы. Ён будзе мучыць цябе, і дзеці, што народзяцца ад яго, будуць злыя і шкадлівыя. Ратуйся, пакуль ёсьць калі. Бог не з гэбраямі".
„Вядзьмарка! Выradак!" — роў дзед.
„Хлус!"
Дзед змоўк, аднак бабка, хоць ейны голас і гучаў ня так выразна, працягвала гаварыць: „Напраўдзе твой дзед на небе, ён спазнаў ісьціну і прыняў новую веру. Яго ахрысьцілі вадой нябеснай, і цяпер ён — у раі. Сьвятыя ўсе там біскупамі і кардыналамі. А той, хто ўпарціцца і адкідвае праўдзівую веру, будзе гарэць у гэгене вогненнай. Калі ты ня верыш мне, падам табе знак".
„Які знак?"
„Расшпілі навалку, успары падушку, і ты знойдзеш там карону зь пер'я. Ніхто зь людзей ня змог бы зрабіць такую карону". Бабка зьнікла, і Ахса заснула цяжкім сном. На досьвітку яна прачнулася і запаліла сьвечку. Яна ўспомніла бабуліны словы і разьдзерла насыпку па шве. Уражаньне ад таго, што яна ўбачыла, было настолькі моцным, што Ахса не дала веры сваім вачам: пух і пер'е перапляліся, і з гэтага ўтварылася карона, упрыгожаная неверагоднымі ўзорамі і тонкім арнамэнтам. Ніводны зямны майстар ня здолеў бы зрабіць нечага падобнага. Вянчаў карону маленькі крыжык. Карона была такой лёгкай, што ажно трымцела ад Ахсінага дыханьня. Ад вялікага хваляваньня Ахса нават замерла. Хто б ні зрабіў гэта, анёл ці д'ябал, аднак дзіва дзіўнае, зроблена было тое ў поўнай цемры ды яшчэ ў падушцы. Зачаравана глядзела Ахса на гэты цуд. Яна загасіла сьвечку, лягла і выпрасталася. Спустошаная, яна яшчэ

доўга ляжала, а потым зноў заснула.
На раніцу Ахса падумала, што яна ўсё гэта прысніла. На ночным століку, аднак, стаяла карона зь пер'я. Пад промнямі сонца яна зіхацела і пералівалася ўсімі колерамі вясёлкі. Нават падавалася, што яна была абсыпаная маленькімі дыямэнтамі. Ахса села на ложку, падзівілася на гэты цуд, потым паднялася, выбрала чорную сукенку, такога ж колеру хустку і апранулася. Загадала, каб падалі ёй брычку, і накіравалася да хаты ксяндза Косьціка.
На ейны стук спачатку выйшла прыслужніца. Сьвятару было пад семдзесят, і ён ведаў Ахсу. Ксёндз часта бываў у маёнтку: то асьвяціць хлеб на Вялікдзень, то прычасьціць каго перад сьмерцю, то блаславіць маладых, то адпець нябожчыка. Адзін з Ахсіных настаўнікаў браў у яго лацінска-польскі слоўнік. А калі сьвятар наведваўся ў маёнтак, дык Ахсіна бабуля запрашала яго да сябе, і яны доўга размаўлялі за пірагом і вішнёўкай. Сьвятар запрапанаваў Ахсе сесьці. Яна села і распавяла пра ўсё, што адбывалася зь ёю, ад пачатку і да канца. Ксёндз выслухаў і сказаў: „Не вяртайся да гэбраяў. Прыходзь да нас. Мы паклапоцімся пра тваю маёмасьць".
„Я забыла забраць карону. Я хачу, каб яна была са мною".
„Добра, сястра мая, едзь і забяры яе".
Ахса паехала дахаты, але прыслужніца ўжо пасьпела прыбраць у пакоі, выцерці пыл з начнога століка, і кароны нідзе не было. Ахса шукала яе на сьметніку, выглядала ў яме памыйнай, аднак нідзе не было нават і пярынкі.
У хуткім часе жахлівая навіна скаланула ўвесь Краснабруд: Ахса выхрысьцілася.

Прайшло шэсьць год. Ахса выйшла замуж і сталася шляхцянкай Мар'яй Малкоўскай. Стары шляхціц Уладзіслаў Малкоўскі памёр. Ня маючы прамога спадкаемцы, ён адпісаў сваю маёмасьць пляменьніку Людвіку. Да сарака пяці год Людвік быў у дзецюках, і мала хто спадзяваўся, што ён калі ажэніцца. Разам са сваёй сястрой Глёрыяй, дзеўкай-векавухай, Людвік жыў у дзядзькавым замку. Вадзіў ён амуры з парабчанкамі і нарабіў цэлую кучу байструкоў. Гэта быў рухавы малога росту чалавек са сьветлай казьлінай бародкаю. Быў ён сам сабе наўме і бавіў час, чытаючы старыя кнігі па гісторыі, рэлігіі і

генэалёгіі. Курыў ён парцалянавую люльку. Каб выпіць, яму ня трэ было кампаніі; на паляваньне ён хадзіў адзін і пазьбягаў шляхецкіх баляў з танцамі. Справы ў маёнтку Людвік вёў жалезнай рукой, а таму аканом, калі б і хацеў што скрасьці, дык ня здолеў бы. Суседзі лічылі Людвіка пэдантам, а некаторыя нават думалі, што ён не зусім здаровы на галаву. Калі Ахса выхрысьцілася, Людвік запрапанаваў ёй — цяпер яе ўжо звалі Мар'яй — стацца ягонай жонкай. Пляткарылі, што сквапны Людвік закахаўся ў спадчыну, што засталася Ахсе ад дзеда. Урэшце ксёндз ды іншыя пераканалі Ахсу прыняць прапанову. Людвік быў нашчадкам польскага караля Ляшчынскага. Глёрыя, на дзесяць год старэйшая за свайго брата, выказалася супраць шлюбу, аднак Людвік, як ужо ня раз бывала, яе не паслухаўся.
Краснабрудзкія гэбраі ўзьнялі вэрхал, баючыся, што Ахса цяпер паставіцца да іх варожа ды падаб'е супраць іх Людвіка (такое зь пярэхрыстаміі ўжо здаралася). Людвік, аднак, гандлю з гэбраямі не спыніў і па-ранейшаму прадаваў ім рыбу, збожжа і быдла. А Зэлік Фрамполер, як і раней, прывозіў на продаж у маёнтак розныя тавары. У лёсе Глёрыі таксама нічога не зьмянілася: яна засталася жыць у замку.
У першыя тыдні пасьля шлюбу Ахса і Людвік разам хадзілі гуляць, Людвік нават пачаў завітваць да сваіх суседзяў, казаў, што зладзіць баль. Ён шчыра прызнаўся Мар'і ўва ўсіх сваіх мужчынскіх прыгодах і паабяцаў надалей паводзіцца так, як належыць багабойнаму хрысьціяніну. Прайшло, аднак, няшмат часу, і Людвік узгадаў усе свае ранейшыя звычкі: спыніў візыты да суседзяў, зноў пачаў заляцацца да вясковых дзевак і запіў. Муж і жонка перасталі размаўляць адзін з адным, і ў сям'і ўсталявалася злавеснае маўчаньне. Людвік болей не заходзіў да Мар'і ў спальню, а яна так і не пасьпела зацяжарыць. Празь нейкі час яны ўжо ня елі за адным сталом, і, калі Людвіку трэ было нешта сказаць Мар'і, дык ён праз слугу пасылаў ёй цыдулку. Глёрыя, якая распараджалася грашыма, выдавала залвіцы адзін злоты на тыдзень. Уся маёмасьць Мар'і належала цяпер ейнаму мужу. Урэшце Ахса вырашыла для сябе, што ўсё гэта — кара Божая і што ёй застаецца адно што чакаць сьмерці. Але што будзе зь ёй пасьля сьмерці? Ці ня будуць яе смажыць на жалезным ложку зь цьвікамі і ці ня кінуць яе потым у сьмярдзючае пекла? І што будзе зь яе душой? Пераселіцца яна

ў сабаку, мыш альбо ў прыдарожны камень?
А паколькі Ахсе не было куды падзець свой час, дык днямі, а напару і ўночы, сядзела яна ў мужавай бібліятэцы. Людвік ужо даўно не купляў для бібліятэкі новых кніг, і ўсе кнігі былі старыя, у скураных пераплётах, драўляных альбо паточаных мольлю аксамітных і шаўковых вокладках. Старонкі кніг пажоўклі і пакрыліся бурымі плямамі. Ахса чытала аповеды пра жыццё старажытных князёў, далёкія краіны, пра розныя бітвы і інтрыгі, што ладзілі князі, кардыналы і герцагі. Яна праглынала гісторыі пра крыжакоў і страшную эпідэмію чумы. Распуста і зло апанавалі людзкі сьвет, аднак поўніўся ён і дзівосамі. Зоркі ў небе вялі паміж сабой войны і паглыналі адна адну. Камэты прадказвалі катастрофы. Недзе нарадзілася хвастатае дзіцяня; у нейкай жанчыны скура пакрылася луской і вырасьлі плаўнікі. У Індыі факіры басанож хадзілі па гарачым вугольлі і не абпякалі сабе ног. Жыўцом іх закопвалі ў зямлю, а яны потым уставалі з магілаў.
Між тым здарылася неверагоднае. Аднойчы ўранку, хоць перад тым і не было аніякіх знакоў ад сілаў нябесных, Ахса знайшла ў сваёй падушцы карону зь пер'я. Не зьяўляліся да яе таксама ў гэты час ні яе дзед, ні бабка. Папраўдзе кажучы, Ахсе часам хацелася зьвярнуцца да дзеда, аднак яна не насьмельвалася сваімі нячыстымі вуснамі вымавіць ягонае імя. Яна выраклася юдэйскага Бога і ня верыла больш у Бога гояў, а таму й кінула маліцца. Часта праз вакно Ахса бачыла, як у маёнтак прыяжджаў Зэлік Фрамполер, і ёй карцела распытаць яго пра справы ў кагале, аднак яна баялася, што той палічыць за грэх размаўляць зь ёй і што Глёрыя раскажа ўсім, што яна зноў зблыталася з гэбраямі.

Міналі гады. Валасы Глёрыі пасівелі, а галава яе пачала нэрвова трэсьціся. Зьбялела і казьліная бародка Людвіка. Слугі пастарэлі, паглухлі дый на вочы ўжо сталі нізкія. Ахсе, ці Мар'і, было за трыццаць, але яна ўяўляла сябе старой жанчынай. З гадамі яна яшчэ больш упэўнілася, што гэта д'ябал пераканаў яе ахрысьціцца і што карона зь пер'я — справа ягоных рук. Дарогі назад, аднак, не было. Закон Расейскай імпэрыі забараняў пярэхрыстам вяртацца ў сваю веру. З кагалу даходзілі кепскія весткі: у Краснабрудзе згарэла сынагога, пагарэлі таксама й лаўкі на рынкавай плошчы. Некалі

заможныя гаспадары і старшыні кагалу панадзявалі цяпер торбы і выправіліся жабраваць. Праз кожныя колькі месяцаў надаралася якая-небудзь пошасьць. Гэткім чынам, не было куды й вяртацца. Ахса часта думала пра самагубства. Але як зрабіць сабе сьмерць? Цяжка ёй было рашыцца павесіцца ці парэзаць сабе вены, а ніякай атруты ў доме не было.
Паступова Ахса прыйшла да думкі, што гэтым сьветам кіруюць злыя сілы. Ня Бог, а нячысьцік вядзе рэй. Знайшла яна й тоўстую кнігу, у якой распавядалася пра вядзьмарства і дзе падрабязна апісваліся розныя чары, талісманы. Падаваліся ў кнізе заклінаньні да дэманаў і дамавікоў, апісваліся чорная імша і ахвяраваньні Асмадэвусу, Люцыпару і Бэльзэбулу. Распавядалася й пра тое, як вядзьмаркі намашчалі свае целы, зьбіраліся ў лесе, прычашчаліся чалавечынай і лёталі на мётлах, жалезьніках і абручах, а за імі ганяліся зграі нячысьцікаў і іншых рагатых і хвастатых ночных пачвараў з крыламі кажаноў і сьвінячымі лычамі. Часта гэтыя пачвары кахаліся зь вядзьмаркамі, а тыя потым нараджалі яшчэ большых страшыдлаў.
Ахса ўзгадала гэбрайскую прыказку: „Калі ня можаш рушыць угору, ідзі ўніз“. Яна ўжо не спадзявалася на новы сьвет, які мусіў яшчэ паўстаць, а таму вырашыла скарыстаць з таго адзінага жыцьця, якое мела. Уночы яна пачала прыклікаць д’ябла і падрыхтавалася ўступіць зь ім у змову, як тое ўжо рабілі шмат якія адкінутыя і пагарджаныя жанчыны.
Аднойчы апоўначы, пакаштаваўшы мяшанкі зь мёду, сьліны, чалавечае крыві і вароніных яек, прысмачанай гальбанам і мандрагорай, адчула яна раптам халодны пацалунак на сваіх вуснах. У бляклым месяцовым сьвятле Ахса ўбачыла аголеную мужчынскую постаць, высокую і чорную. На галаве — скудлачаныя валасы і аленія рогі. З рота мужчыны вытыркаліся два вепручыныя іклы. Постаць нахілілася да Ахсы і прашаптала: „Які будзе загад, мая гаспадыня? Можаш прасіць у мяне палову майго валадарства“.
Цела аголенага мужчыны было лёгкім і празрыстым, як павуціньне, і тым ня менш неверагодная энэргія і моц сыходзілі ад яго. Ахса ўжо была амаль гатовая прамовіць: „Хачу цябе, мой раб. Вазьмі мяне“. Замест гэтага яна няўцямна прамармытала: „Дзеда й бабу“.
Д’ябал зарагатаў: „Яны — пыл!“

„Гэта ты зрабіў карону зь пер'я?“ — запыталася Ахса.
„А хто ж яшчэ?“
„І ты падмануў мяне?“
„Я ўводжу ў зман“, — гігікнуў д'ябал.
„А праўда, дзе ж праўда?“ — запыталася Ахса.
„Праўда ў тым, што праўды няма!“
Крыху павагаўшыся, д'ябал зьнік. Хоць да раніцы Ахса так і не заплюшчыла вачэй, але ўсё, што адбывалася, нагадвала ёй сон. Да яе зьвярталіся галасы, і яна размаўляла зь імі. Грудзі яе набрынялі, смочкі напяліся, а чэрава набракла і павялічылася да неверагодных памераў. Галаву разрываў нясьцерпны боль. Зубы дробна ляскаталі, язык так набрыняў, што Ахса нават спужалася, ці ня вытыркнецца ён праз падняб еньне. Вочы былі гатовыя выскачыць з вачніц. Увушшу стаяў страшэнны гром, нібы нехта гухаў молатам па кавадле. І тады яна адчула, як сутаргава сьціснулася яе чэрава. „Зараз я нараджу дэмана“, — закрычала Ахса. Яна пачала хапатліва маліцца Богу, таму самаму Богу, Якога яна раней адкінула. Паволі сон яе змарыў, і, калі пад раніцу яна прачнулася, боль у целе зусім зьлёг. У нагах ложку стаяў дзед у белым халаце з капюшонам, які ён звычайна насіў напярэдадні Ём Кіпур і ў якім ён заўсёды бласлаўляў Ахсу, перад тым як пайсьці на малітву Кол Нідрэ. Сьвятло дзедавых вачэй лілася на падшываную коўдру Ахсы, і яна ціха прамовіла: „Дзеду!“
„Так Ахса, я тут“.
„Што мне рабіць, дзеду?“
„Уцякай адсюль і пакайся“.
„Позна. Я ўжо запродала сваю душу“.
„Ніколі ня позна. Знайдзі таго мужчыну, што ты зганьбіла. І станься дачкой свайго народу“.
Пазьней Ахса ўжо ня памятала, ці то дзед сапраўды зь ёю гаварыў, ці то яна проста зразумела яго бяз словаў. Ноч скончылася. Першыя промні сонца чырваньню залілі пакой. За вакном шчабяталі птушкі. Ахса агледзела сваю кашулю. Крыві на ёй не было. Ніякага дэмана яна не нарадзіла. Упершыню за колькі год яна пачала чытаць падзячную гэбрайскую малітву. Пасьля Ахса ўстала з ложку, памылася ў тазіку і пакрыла валасы хусьцінкай. Людвік і Глёрыя забралі ў яе ўсё, што яна мела ў пасаг. Перахавала Ахса толькі бабуліны кляйноты: загарнула іх у насоўку і паклала ў кошык з кашуляй і ніжняй

бялізнай. Людвік зазвычай бавіў ночы са сваімі каханкамі альбо на досьвітку ад'яжджаў на паляваньне. Глёрыя, хворая, ляжала ў сябе ў спальні. Прыслужніца прынесла сьняданак, але Ахса ледзьве дакранулася да ежы. Пасьля сьняданку яна выйшла з дому. Быццам на чужаніцу, на яе забрахалі сабакі. Са зьдзіўленьнем старыя слугі глядзелі, як яна з кошычкам у руках, у хустцы, павязанай па-сялянску, выходзіць з брамы. Хоць маёнтак Малкоўскіх знаходзіўся недалёка ад Краснабруду, аднак Ахса йшла амаль цэлы дзень. Стаміўшыся, яна села адпачыць над ручаём. Памыла ў ім рукі, прачытала малітву і зьела прыхоплены кавалак хлеба.
Па-за краснабрудзкіх могілак стаяла хата Эбэра, далакопа. Ягоная жонка мыла ў ночвах бялізну на двары. Ахса спынілася і запыталася ў яе: „Гэта дарога на Краснабруд?"
„Так, ідзі проста".
„А што новага чуваць у мястэчку?"
„А ты хто?" — запыталася ў Ахсы жанчына.
„Я сваячка рэба Нафталі Халішыцэра".
Жанчына выцерла рукі аб падол. „Нікога ўжо не засталося з гэтай сям"і".
„А дзе ж Ахса?".
Жанчына здрыганулася. „О, Божа, яе ўжо, пэўна, пахавалі". І жанчына распавяла пра Ахсіны пярэхрысьціны.
„Яна ўжо пры жыцьці была пакараная".
„А што сталася з тым хлопцам зь ешывы, зь якім яна заручылася?"
„Хто ж яго ведае? Ён нетутэйшы".
Ахса запыталася пра магілы свайго дзеда і бабы, і старая жанчына паказала на два камяні, якія схіліліся адзін да аднаго і парасьлі мохам і травой. Ахса падышла да камянёў, упала на зямлю перад імі і праляжала там да познага вечара.

Ужо тры месяцы вандравала Ахса зь ешывы да ешывы, аднак Зэмаха нідзе не было. Яна шукала зьвесткі пра яго ў кагальных кнігах, распытвала старшыняў і рабінаў: Зэмах нібы зьнік. Ня ў кожным горадзе было дзе спыніцца, а таму Ахса часта начавала ў начулішчах, дзе давядзецца. Яна клалася на сяньнік, накрывалася дзяружынай і пачынала ціха маліцца, просячы, каб дзед зьявіўся ёй і сказаў, дзе шукаць Зэмаха. Аніякага знаку

ад дзеда, аднак, не было. Па начох хворыя і старыя кашлялі і мармыталі ў сьне. Плакалі й румзалі малыя дзеці. Іхнія маткі сварыліся. Хоць Ахса і вырашыла для сябе, што гэта частка ейнай пакуты, аднак яна так і не змагла пазбыцца пачуцьця прыніжэньня. Кагальныя старшыні на яе буркалі, змушалі па колькі дзён чакаць сустрэчы. Жанчыны падазрона зіркалі — навошта яна шукае нейкага мужчыну, які, пэўна ж, мае жонку і дзяцей, а мо й наагул памёр. „Дзядуленька, навошта ты сарваў мяне на гэты шлях?“ І ў сьлязох Ахса прасіла: „Альбо скажы, куды мне ісьці, альбо пашлі мне сьмерць“.
Аднойчы ўзімку ў Любліне Ахса, схаваўшыся ад холаду ў карчме, запыталася ў карчмара, ці ня чуў ён што пра невысочанькага тальмудыста і былога вучня ешывы, якога зваць Зэмах. „Ты маеш на ўвазе Зэмаха, настаўніка зь Ізьбіцы?“ — запытаўся адзін з наведнікаў.
Ён яшчэ нешта дадаў да партрэту Зэмаха, і Ахса зразумела, што знайшла таго, каго шукала. „Ці ня быў ён заручаны з адной дзяўчынай з Краснабруду?“ — запыталася Ахса.
„Так. Было такое. А хто ты?“
„Сваячка“.
„Што ты хочаш ад яго?“ — працягваў чалавек. „Ён бедны, да таго ж упарты, як баран. Ад яго ўсе вучні паразьбягаліся. Дзікаваты ён нейкі і незразумелы“.
„Ці жанаты ён?“
„Меў ужо дзьвюх жанок. Адну замучыў да сьмерці, а другая кінула яго“.
„Ці ёсьць у яго дзеці?“
„Не, ён няплодны“.
Наведнік хацеў сказаць яшчэ нешта, але ў гэты момант зайшоў слуга і паклікаў яго.
У вачах Ахсы зьявіліся сьлёзы. Ейны дзед не пакінуў яе. Ён вядзе яе туды, куды трэба. Яна выйшла, каб неяк дамовіцца пра сваё падарожжа ў Ізьбіцу. Перад карчмой стаяла фурманка, гатовая выправіцца ў дарогу. „Не, я не адна“, — падумала Ахса. — „Неба скіроўвае кожны мой крок“.
Напачатку ехалі брукаванкаю, але потым дарога ператварылася ў суцэльную гразь, нейкія яміны і канавы. Ноч надарылася цёмная і сырая. Раз-пораз падарожнікі мусілі злазіць і дапамагаць фурману выцягваць вазок з балота. Пасажыры раздражняліся і бурчалі на вазака, але Ахса з радасьцю і

падзякай успрымала гэтыя нязручнасьці. Усю ноч ішоў мокры сьнег, дзьмуў халодны вецер, і кожны раз, калі Ахса вылазіла з павозкі, яе ногі па лыткі загразалі ў халодным брудзе. Толькі позна ўвечары яны прыехалі ў Ізьбіцу. Мястэчка ператварылася ў суцэльнае балота, на якім, як на купінах, масьціліся старыя хаткі. Нехта паказаў Ахсе дарогу да дому настаўніка Зэмаха, што туліўся на пагорку недалёка ад яткі. І хоць ужо была зіма, у паветры лунаў задушлівы гніласны смурод. Вакол яткі бадзяліся сабакі.

Ахса зазірнула ў вакно Зэмахавай хаты і ўбачыла абшарпаныя сьцены, брудную падлогу і зашмальцаваныя кнігі на паліцах. У місе з алеем мігцеў на кноце слабы агеньчык. За сталом сядзеў чарнабароды вастраносенькі чалавечак з густымі бровамі на жоўтым твары. Ён нізкавока ўглядаўся ў старонку тоўстай кнігі. На ім была ярмолка і падшываная камізэлька, зь якой вытыркаўся брудны вацін. Калі Ахса аглядала ўсю гэтую сцэну, зь дзюркі ў сьцяне вылезла мышка; мітусьліва ўскараскалася на ложак і пабегла па матрацы, набітым гнілой саломай, праз паедзеную яе сяброўкамі аўчыну, што ляжала замест коўдры, да падушкі бяз навалкі. Хоць Зэмах і пастарэў крыху, Ахса пазнала яго. Зэмах пачаў чухацца, потым сплюнуў сабе на пальцы і расьцёр лоб. Так, гэта быў Зэмах. Ахсу адначасова цягнула і на плач, і на сьмех. На хвіліну яна адарвала свой позірк ад вакна і паглядзела ў ночную цемру. Упершыню за колькі год яна пачула голас сваёй бабкі: „Ахса, уцякай адсюль“.

„Куды?“

„Назад, да Ісава“.

І тады яна пачула голас дзеда: „Ахса, Зэмах уратуе цябе ад пекла“. Прычым ніколі дзед не прамаўляў яшчэ да яе гэтак гарачліва. Ахсе стала млосна, і, каб ня ўпасьці, яна прыхілілася да дзьвярэй. Дзьверы адчыніліся, і яна ўвалілася ў хату.

Зэмах павярнуў галаву, і адно зь ягоных калматых броваў узьляцела ўгору. Ён злосна вылупіўся на Ахсу: „Што табе тут трэба?“

„Вы рэб Зэмах?“

„Так. А ты хто?“

„Ахса з Краснабруду. Некалі Вашая нарачоная...“

Зэмах разявіў рот, у якім быў відзён толькі адзін крывы і чорны зуб.

„Пярэхрыстка?“

„Я вярнулася ў юдаізм“.
Зэмах ускочыў зь месца і жудасна закрычэў: „Прэч з майго дому! Хай зьнікне імя тваё!“
„Рэб Зэмах, калі ласка, выслухайце мяне“.
Ён кінуўся на яе з кулакамі. Міса з алеем упала на падлогу, і цемра ахутала пакой.
„Поскудзь!“

Малітоўны дом у Халішыцы быў перапоўнены. Набліжаўся час поўні, і людзі сабраліся, каб узьнесьці Госпаду свае просьбы. У жаноцкай палове нехта голасна і пабожна чытаў адну малітву за другой. Раптам расчыніліся дзьверы, і, шырока пераступіўшы цераз парог, у дом уваліўся чарнабароды чалавек у падзертай вопратцы. Цераз плячо ў яго вісела торба. На вяроўцы, нібы быдла, ён вёў жанчыну. На жанчыне была чорная хустка, зрэбная сукенка, на нагах валачылася нейкае рызьзё, а на шыі боўталася нізка часныку. У малітоўным доме запанавала ціша. Незнаёмец падаў жанчыне знак, і яна распласталася на парозе.
„Суродзічы, — закрычэла яна, — тапчыцеся па мне і плюйце на мяне!“
У малітоўным доме ўсчаўся гвалт. Незнаёмец падышоў да чытальнага стала, пастукаў па ім, каб стала цішыня, і прамовіў:
„Сям’я гэтае жанчыны паходзіць з вашых месцаў. Рэб Нафталі Халішыцэр быў яе дзедам. Гэта тая самая Ахса, якая выхрысьцілася і выйшла замуж за шляхціца. Ёй адкрылася праўда, і цяпер яна хоча выкупіць сваю віну і адрабіць усе гнюснасьці“.
Хоць Халішыц і знаходзіўся ў той частцы Польшчы, што адышла да Аўстрыі, аднак гісторыю Ахсы чулі і тут. Некаторыя з людзей у малітоўным доме пачалі абурана казаць, што гэта не пакаяньне; нельга чалавека, як быдла, цягаць на вяроўцы. Іншыя гразілі незнаёмцу кулакамі. Паводле аўстрыйскага закону, пярэхрысты маглі бесьперашкодна вяртацца ў юдэйства. Але каб жа гоі ўведалі, што таго, хто перайшоў у іхнюю веру, так прыніжаюць, дык маглі б увесьці іншы, суворы закон, і на гэбраяў магла звалiцца кара. Стары рабін, рэб Бэзалел, хапатліва прытупацеў да Ахсы.
„Уставай, дачка мая. Ты ўжо пакаялася, і ты з намі“.
Ахса паднялася.

„Рабі, я зганьбіла свой народ“.
„Ты раскайваешся, і таму Гасподзь даруе табе“.
Калі жанчыны, якія маліліся на сваёй палове, пачулі, што адбываецца, яны прыбеглі на мужчынскую палову малітоўнага дому; сярод іх была і рабінава жонка. Рэб Бэзалел зьвярнуўся да яе: „Забяры яе да нас і пераапрані ў людзкую вопратку. Чалавек створаны на ўзор і падабенства Божае“.
„Рабі, — зьвярнулася да яго Ахса,— я хачу выкупіць усе свае злачынствы“.
„Я сам прызначу табе пакараньне за твае грахі. Ня муч сябе“.
Некаторыя жанчыны расплакаліся. Рабінава жонка накінула Ахсе на плечы сваю шаліноўку. Другая жанчына запрапанавала ёй накідку з капюшонам. Ахсу адвялі ў пакой, дзе ў старыя часы трымалі тых, хто зграшыў супроць кагалу — у ім па-ранейшаму ляжалі бервяно і ланцугі — там Ахсу й перапранулі. Нехта прынёс кашулю і боцікі. Пакуль яе пераапраналі, Ахса біла сябе кулаком у грудзі і пералічала свае грахі; яна ўгнявіла Госпада, яна служыла ідалам і клалася ў адзін ложак з гоем. Абліваючыся сьлязьмі, яна казала: „Я займалася вядзьмарствам, прыклікала д’ябла, і ён у аддзячыны змайстраваў для мяне карону зь пер’я“. Калі Ахсу пераапранулі, рабінава жонка павяла яе да сябе.
Пасьля малітвы мужчыны пачалі распытваць незнаёмца, хто ён такі і якое дачыненьне мае да ўнучкі рэба Нафталі.
„Мяне завуць Зэмах“, — адказаў ён. — „Я мусіў стаць яе мужам, аднак яна адкінула мяне. А вось цяпер прыйшла да мяне прасіць прабачэньня“.
„Гэбраі мусяць дараваць“.
„Я дараваў ёй, аднак Бог помсьлівы“.
„Ён таксама і міласэрны“.
Зэмах пачаў дыскутаваць са старшынямі і адразу ж сталася відавочная ягоная абазнанасьць у сьвятых кнігах. Ён цытаваў Тальмуд, Камэнтары і Адказы. Ён нават падправіў рабіна, які цытаваў адно зь месцаў.
Рэб Бэзалел запытаўся: „Ці маеш ты сям’ю?“
„Я разьведзены“.
„У такім разе ўсё можна палагодзіць“.
І рабін запрасіў Зэмаха да сябе. Жанчыны сядзелі з Ахсай на кухні і сілком кармілі яе хлебам з цукорай — яна перад тым была тры дні нічога ня ела. У пакоі рабіна мужчыны заняліся

Зэмахам. Яны прынесьлі яму нагавіцы, боты, палітон і капялюш. А паколькі Зэмах завашывеў, дык яго павялі й мыцца. Увечары сабраліся сем найбольш паважаных жыхароў мястэчка і ўсе старшыні кагалу. Жанчыны прывялі Ахсу. Рабін абвесьціў, што, паводле закону, Ахса ўжо па-за шлюбам і што ейны шлюб з шляхціцам — ня што іншае як распуста. Рабін зьвярнуўся да Зэмаха: „Зэмаху, ці хочаш ты ўзяць Ахсу за жонку?“.
„Так“, — адказаў Зэмах.
„Ахса, ці хочаш ты, каб Зэмах быў тваім мужам?“
„Так, рабі, але я ня вартая яго“.
Потым рабін паведаміў, якім мусіць быць пакараньне для Ахсы. Яна мусіць пасьціць кожны панядзелак і чацьвер, ня есьці мяса і рыбы на будні, чытаць псальмы і ўставаць на досьвітку дзеля малітваў. Рабін пры гэтым зазначыў: „Галоўнае ня кара, а каята. І, як казалі прарокі, „Ён вернецца і пазбавіць нямогласьці“.
„Рабі, даруйце мне, — перапыніў яго Зэмах, — але гэтае пакараньне для тых, хто проста зграшыў, а не для тых, хто здрадзіў сваёй веры“.
„Што ты хочаш, каб яна зрабіла яшчэ?“
„На гэты выпадак ёсьць больш суворае пакараньне“.
„Напрыклад?“
„У абутак грэшніку насыпаюць каменьчыкаў. Узімку ён мусіць голы качацца ў сьнезе, а ўлетку — у крапіве, пасьціць ад суботы да суботы“.
„Сёньня людзі ня здатныя на такія суворыя выпрабаваньні“, — крыху павагаўшыся, адказаў рабін.
„Калі яны здатныя грашыць, дык мусяць быць здатныя і на адпаведную пакуту“.
„Сьвяты рабі, — зьвярнулася да яго Ахса, — ня трэба мне палёгкі. Прызначце мне суворае пакараньне“.
„Я ўжо сказаў, і тое правільна“.
Усе сьцішыліся. „Зэмаху, — падала голас Ахса, — дай мне мой пакунак“.
Зэмах пайшоў па свой мех, які ён пакінуў у куце. Ён паставіў яго на стол і выцягнуў адтуль невялічкі пакунак. Вокліч зьдзіўленьня разьнёсься па хаце, калі Ахса пачала высыпаць зь яго ўсё, што там было: пэрліны, дыямэнты і рубіны.
„Рабі, гэта мае ўпрыгожваньні і каштоўнасьці“, — сказала Ахса. — „Я ня вартая таго, каб іх мець. Хай рабі распараджаецца імі,

як захоча“.
„Яны твае альбо належаць шляхціцу?“
„Мае, рабі. Яны перайшлі на мяне ад майго сьвятога справядлівага дзеда“.
„Напісана, што нават самыя дабрадзейныя ня мусяць ахвяраваць больш за пятую частку“.
Зэмах хітануў галавой: „Зноў жа, не магу пагадзіцца. Яна зганьбіла свайго дзеда, што спачывае ў раі. Немагчыма, каб гэтыя каштоўнасьці належалі ёй“.
Рабін сьціснуў сваю бараду ў кулак.
„Калі ты ведаеш лепш, дык станься рабінам“. Рэб Бэзалел устаў, а потым зноў сеў.
„З чаго вы будзеце жыць?“
„Я буду насіць ваду“, — адказаў Зэмах.
„Рабі, а я магу рабіць цеста і мыць бялізну“, — сказала Ахса.
„Добра, рабіце, як лічыце. Я аднак веру не ў суворасьць закону, а ў ягоную літасьць“.

Пасярод ночы Ахса прачнулася. Муж і жонка жылі ў хаціне з бруднай падлогай непадалёк могілак. Зэмах днямі цягаў ваду, а Ахса мыла бялізну. Яны пасьцілі і елі толькі ўвечары ўсе дні, акрамя суботы і сьвятаў. Ахса насыпала сабе ў абутак пяску і дробных каменьчыкаў і насіла кашулю з грубай воўны на голае цела. Спалі яны паасобку, на падлозе. Зэмах — на дзяружыне каля вакна, а Ахса — на сяньніку каля печкі. На вяроўчыне, нацягненай ад сьцяны да сьцяны, віселі іхныя апранахі, якія пашыла Ахса.
Былі яны жанатыя ўжо тры гады, аднак Зэмах так і не наблізіўся да Ахсы. Ён прызнаўся ёй, што і ён вялікі грэшнік і, хоць меў жанок, аднак юрлівыя думкі былі толькі пра Ахсу. А таму ўвесь час, падобна Анану, праліваў сваё насеньне на зямлю. З гэтага наклікаў на сябе кару, аддаліў сябе ад Найвышшага. Гняўлівасьць сваю скіроўваў на жанок, і адна зь іх памёрла. Як можна было больш сябе апаганіць?
Хоць іхняя хата стаяла пад лесам, і яны маглі прынесьці колькі заўгодна дроваў, Зэмах аднак не дазваляў паліць печку на ноч. Спаць яны клаліся апранутыя і накрываліся мяхамі і рызьзём. Людзі з Халішыцу лічылі, што Зэмах не зусім здаровы на галаву. Рабін урэшце запрасіў да сябе мужа і жонку і

патлумачыў ім, што мучыць і зьдзекваццa зь сябе, як і зь іншых, жорстка. Зэмах, аднак, прывёў месца з „Пачаткаў мудрасьці“ пра тое, што без утаймаваньня цела каята ні да чаго не вядзе. Кожны раз, перад тым як пакласьціся ў ложак, Ахса спавядалася, і ўсё ж яе сны не былі чыстыя. Д’ябал зьяўляўся ёй у вобразе яе бабулі і красамоўна распавядаў пра залітыя агнямі гарады, пышныя балі, увішных шляхцюкоў і юрлівых жанчын. Дзед жа зноў чамусьці не прыходзіў.
Сваю бабулю Ахса сьніла маладой і прыгожай. Яна сьпявала гарэзьлівыя песьні, піла віно і танчыла з нейкімі прайдзісьветамі. Іншым разам бабуля вяла Ахсу ў касьцёл, дзе сьвятары сьпявалі, а вернікі, укленчыўшы, пакланяліся залатым ідалам. Голыя жанчыны лёгкіх паводзінаў пілі віно з рога і распусьнічалі.
Аднойчы Ахса сасьніла, як, голая, яна стаіць каля вялізнай круглай адтуліны. Вакол яе карлікі водзяць карагоды і сьпяваюць брыдкія пахавальныя песьні.
З усіх канцоў трубяць трубы, бубняць бубны. Ахса прачнулася, але мярзотны сьпеў усё стаяў увушшу. „Не, мяне ўжо нішто не ўратуе“, — падумала яна.
Зэмах таксама прачнуўся. Ён падняўся і падышоў да вакна. Нейкі час ён глядзеў праз адзіную не забітую дошкамі шыбіну. Потым запытаўся: „Ахса, ты ня сьпіш? Сьнегу нападала“.
Ахса вельмі добра ведала, што ён мае на ўвазе, а таму адказала: „Не, у мяне проста няма сілы“.
„А як распусьнічаць, дык сіла ёсьць“.
„Усе косткі мае ныюць“.
„Скажы гэта анёлу, якога ты абразіла“.
Зыркае месяцовае сьвятло, адбіваючыся ад чысьцюткага сьнегу, запоўніла ўвесь пакой. Зэмах, як той пячорнік-адлюднік, адпусьціў доўгія патлы. Барада ягоная скудлачылася. У начной цемры ягоныя вочы блішчэлі халодным месяцовым сьвятлом. Ахса ніколі не магла зразумець, як Зэмаху ставала сілаў увесь дзень цягаць ваду, а потым яшчэ па начах чытаць кнігі. Ён пасьціў увесь дзень і ўвечары амаль нічога ня еў. Каб ня мець аніякага задавальненьня ад ежы, ён проста глытаў хлеб, не жуючы. Суп, які варыла для яго Ахса, ён заўсёды моцна перасольваў і пераперчваў. Ахса таксама моцна схуднела. Углядаючыся ў сваё адлюстраваньне ў вадзе, яна бачыла тонкія рысы твару, запалыя шчокі і хваравітыя вочы. Яна часта

кашляла і цыркала крывёю. На гэты раз Ахса сказала: „Даруй мне, Зэмаху. Я не магу падняцца“.
„Уставай, распусьніца. Гэта, можа, апошняя твая ноч“.
„Было б добра, калі так“.
„Спавядайся і кажы праўду!“
„Я сказала табе ўжо ўсё“.
„Ці ж не была распуста для цябе задавальненьнем?“
„Не, Зэмаху, не“.
„Мінулы раз ты казала, што гэта прыносіла табе задавальненьне“.
Ахса доўга не адгукалася.
„Вельмі і вельмі рэдка. Можа, на якую хвілю“.
„І ты забывалася на Бога?“
„Не зусім“.
„Ты ведала пра закон Божы і сьвядома адкідвала Госпада“.
„Я думала, што праўда ў гояў“.
„І ўсё таму, што д’ябал змайстраваў табе карону зь пер’я?“
„Я прыняла гэта за цуд“.
„Не апраўдвайся, распусьніца!“
„Я не апраўдваюся. Ён гаварыў голасам маёй бабулі“.
„Чаму ты слухалася бабы, а ня дзеда?“
„Проста дурная была“.
„Дурная? І столькі гадоў усё апаганьвала“.
Празь нейкі час муж і жонка выйшлі басанож з хаты. Зэмах першы кінуўся ў сьнег і пачаў хутка качацца ў ім. Ягонае цела, нібы футра, густа пакрывалі чорныя валасы. Ахса крыху счакала і таксама кінулася ў сьнег. Яна качалася ў сьнезе паволі і моўчкі, а Зэмах галасіў: „Мы зграшылі, мы прадаліся, скралі, сылгалі, кпілі і паўсталі супроць Цябе“. А потым дадаў: „Хай будзе воля Твая, каб мая сьмерць сталася выкупленьнем усіх маіх бясчынстваў“.
Ахса часта чула гэтыя словы, але кожны раз яны прымушалі яе скаланацца. Гэтаксама галасілі і сяляне, калі яе муж, шляхціц Малкоўскі, біў іх бізуном. І Ахса баялася гэтага Зэмахава галашэньня больш, чым зімовага холаду і крапівы. Часам, калі Зэмах быў у больш шляхетным настроі, ён абяцаўся прыйсьці да Ахсы ў ложак і нават казаў, што хацеў бы стаць бацькам ейных дзяцей. Аднак замест таго ён увесь час вышукваў нейкія новыя прыграшэньні, якія яны зрабілі. Ахса з кожным днём усё больш слабела. Ёй падавалася, што надмагільныя камяні і

саваны, разьвешаныя на вяроўках над кладамі, клічуць яе. І яна нават прымусіла Зэмаха даць ёй зарок, што над яе магілай ён будзе чытаць Кадыш.

Аднойчы сьпякотным днём у месяцы Тамуз Ахса пайшла на луг нарваць шчаў'я. Яна пасьціла ўвесь дзень і хацела зварыць на вячэру баршчу сабе і Зэмаху. Рвучы, яна адчула, як сілы пакідаюць яе. Яна лягла на траву, каб крыху адпачыць. Аднак ногі яе здранцьвелі, і ўваччу ўсё зьнікла. Глыбокі сон агарнуў яе. Калі яна расплюшчыла вочы, ужо стаяла ноч. На небе не было ні зорачкі, і дужа парыла. Набліжалася навальніца. Ад зямлі ішоў моцны пах травы і зёлак, ад якога ў Ахсы круцілася галава. Вобмацкам яна знайшла кошык, аднак ён быў пусты. Карова ці каза высаўгала шчаў'е. Нечакана яна ўзгадала сваё дзяцінства, калі яе з усіх бакоў песьцілі, апраналі ў аксаміт і шоўк, а прыслуга выконвала кожную яе прыхамаць. Ахсу пачаў душыць кашаль, на ілбе выступіў пот, а па сьпіне прабег дрыготкі холад. Неба засьцялілі хмары, стаяла цемра, і Ахса ня ведала, у які бок ісьці дахаты. Босымі нагамі яна наступала на калючкі і каравякі. „У якую пастку я патрапіла?!", — пачула яна голас унутры сябе. Яна выйшла да нейкага дрэва і спынілася, каб перавесьці дух. І ў гэты момант убачыла дзеда. Ягоная белая барада сьвяцілася ў цемры. Яна пазнала ягоны высокі лоб, зычлівую ўсьмешку і позірк, поўны любові і дабрыні. Ахса крыкнула: „Дзядуню!". І з вачэй у яе пырснулі сьлёзы.

„Я ведаю ўсё", — сказаў дзед. — „І твае пакуты і твой жаль".

„Што мне рабіць, дзеду?"

„Дачка мая, твае пакуты скончыліся. Мы чакаем цябе — я, твая бабуля і ўсе, хто любіць цябе. Сустрэнуць цябе сьвятыя анёлы".

„Калі, дзядуню?"

У гэты момант дзедава постаць зьнікла, і цемра агарнула ўсё. Ахса рушыла ў ноч, але цяпер яна інтуіцыяй сьляпога адчувала, што сапраўды ідзе дахаты. Нарэшце яна выйшла на свой двор, адчыніла дзьверы і адразу ж адчула, што Зэмах чакае яе. Ён сядзеў на падлозе, і ягоныя вочы сьвяціліся, як два вуглі. Ён аж крыкнуў: „Гэта ты?".

„Так, Зэмаху".

„Дзе ты швэндалася? З-за цябе я ня змог спакойна памаліцца.

Ты зблытала ўсе мае думкі“.
„Даруй, Зэмаху. Я стамілася і заснула на лузе“.
„Брахуха! Выradак! Нягодніца“, — заходзіўся Зэмах. — „Я шукаў цябе на лузе. Ты недзе спала з пастухом“.
„Госпадзе праведны, што ты кажаш!?“
„Кажы мне праўду!“
Зэмах ускочыў і пачаў яе трэсьці.
„Распусьніца! Ведзьма!“
Ніколі Зэмах ня быў такі разьятраны.
„Зэмаху, мужа мой, я верная табе. Я спала на траве. Вяртаючыся дахаты, я ўбачыла свайго дзеда. Час мой надышоў“. Ахсе стала млосна, і яна ўпала на падлогу. Зэмахаў гнеў адразу растаў, ён заенчыў: „Сьвятая душа твая, дзе ж я буду безь цябе? Ты сьвятая. Даруй мне, што я быў несправядлівы да цябе. Гэта таму, што я люблю і кахаю цябе. Я хацеў, каб душа твая сталася чыстая і ты сядзела ў раі поруч са сьвятымі Дзевамі“.
„Буду сядзець там, дзе заслугоўваю“.
„Чаму? Няўжо няма на небе справядлівасьці?“ — выгукнуў Зэмах страшным голасам. Ахса моцна спужалася, а Зэмах пачаў біцца галавой аб сьценку.
На наступную раніцу Ахса ня ўстала з ложку. Зэмах прынёс ёй кашы, якую зварыў на вогнішчы. Ён паспрабаваў накарміць яе. Ахса выплёўвала кашу з роту. Зэмах пабег па местачковага лекара, але той, агледзеўшы Ахсу, нічога не сказаў. Прыйшлі жанчыны, што звычайна прыходзяць да тых, хто памірае. Ахса была ў вельмі кепскім стане. Жыцьцё паволі пакідала яе. Апоўдні Зэмах пешкі выправіўся ў Яраслаў па доктара. Зьвечарэла, але Зэмаха ўсё не было. Прачуўшы пра тое, што здарылася з Ахсай, жонка рабіна прыслала ёй падушку, і Ахса ўпершыню за колькі год ляжала на падушцы. Увечары жанчыны-сядзелкі пайшлі дахаты, і Ахса засталася адна. У місе з кнотам пахліпваў слабы агеньчык. Праз адчыненае вакно у пакой задзімаў цёплы ветрык. Хоць на небе і не было відно месяца, але высыпалі яркія зоры. Шалелі цвыркуны. Чалавечымі галасамі заходзіліся ў балоце жабы. Раптам перад ложкам Ахсы па сьцяне прамільгнуў цень. Ахса ведала, што канец яе блізкі, але страху сьмерці не было. Душа яе супакоілася. Яна нарадзілася прыгожай, у багатай сям’і. Бог быў шчодры да яе і надарыў яе талентамі, якіх не было ў

іншых. Проста такая ў яе няшчасная доля, і ўсё павярнулася супроць яе. Што гэта? Пакараньне за яе ўласныя грахі альбо за грахі яе продкаў? Ахса ведала, што апошнія гадзіны яе жыцьця пройдуць у пакаяньні і што ў малітвах яна разьвітаецца са сваім жыцьцём. Аднак менавіта такі быў у яе лёс, што сумневы не пакідалі яе нават цяпер. Дзед казаў ёй адно, а бабка — зусім іншае. У адной старой кнізе Ахса чытала пра адшчапенцаў, якія лічаць, што гэты сьвет — усяго толькі выпадковае спалучэньне атамаў. А таму толькі адно жаданьне мела Ахса: каб падалі ёй знак і каб адкрылася ёй уся праўда. Яна ляжала і малілася, каб здарыўся гэты цуд. Лёгкі сон ахінуў Ахсу, і ёй прымроілася, што ляціць яна ў нейкую глыбокую і густую цемру. Кожны раз, калі ёй падавалася, што яна ўжо дасягнула дна, усё правальвалася пад ёй, і яна зноў, яшчэ больш імкліва, падала некуды ўніз. Цемра ўсё згушчалася вакол яе, і Ахса адчувала, што яна знаходзіцца па-над нейкім прадоньнем.

Яна расплюшчыла вочы, яна ведала, што ёй рабіць. Вялікімі намаганьнямі ёй удалося ўстаць з ложку і знайсьці нож. Яна зьняла з падушкі навалаку і, трымаючы зьнямелымі пальцамі нож, успарола падушку. Засунула ў яе руку і выцягнула адтуль карону зь пер'я. Нябачная рука прымацавала да вяршыні кароны чатыры літары, якія складалі імя Бога.

Ахса паставіла карону каля свайго ложку. У дрыготкім сьвятле яна ясна разрозьнівала кожную літару: „Я", „ха", „вэ" і „э". Зь зьдзіўленьнем Ахса, аднак, падумала: „А чаму менавіта карона мусіць быць знакам праўды? Ці няма на небе якой іншай праўдзівай веры?" І яна пачала зноў маліцца, каб ёй зьявіўся якісь новы цуд. Раптам, разгубіўшыся, Ахса перапыніла малітву. У яе памяці ясна паўсталі словы д'ябла: „Праўда ў тым, што праўды няма".

Позна ўначы адна з жанчын-сядзелак прыйшла зноў. Ахса хацела яе папярэдзіць, каб яна не наступіла на карону, але была такая слабая, што не змагла вымавіць і слова. Жанчына наступіла на карону, і тая рассыпалася. Ахса заплюшчыла вочы, каб больш ужо не расплюшчыць іх ніколі. На досьвітку яна глыбока ўздыхнула, і душа адышла ад яе.

Жанчына-сядзелка падняла з падлогі пушынку і паднесла да твару — аніякага знаку жыцьця.

Удзень жанчыны памылі Ахсу і апранулі яе ў саван, які яна сшыла для сябе сама. Зэмах так і не вярнуўся зь Ярославу, і

ніхто пасьля нічога пра яго ня чуў. У Халішыцы казалі, што яго нібыта забілі па дарозе. Некаторыя нават казалі, што быў ён не чалавек, а дэман. Пахавалі Ахсу непадалёк ад капліцы нейкаму сьвятому чалавеку, а рабін памянуў яе добрым словам.
Засталася адна загадка. За колькі гадзінаў перад сьмерцю Ахса распарола падушку, якую пераказала ёй жонка рабіна. Сядзелкі, якія мылі Ахсу, знайшлі ў яе паміж пальцаў пярынкі. Як магла зрабіць гэта аслабелая жанчына? І што яна шукала ў падушцы? Як толькі местачкоўцы не імкнуліся зразумець гэта і якіх толькі тлумачэньняў не вынаходзілі, аднак праўды так і не дазналіся.
Бо калі і ёсьць такая рэч, як праўда, дык яна ўся блытаная дый не заўсёды ўсім бачная, як тая карона зь пер'я.

*Пераклаў з ангельскай Алесь Анціпенка паводле*
Isaak Bashevis Singer. A Crown of Feathers and Other Stories, 1970.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

[image]

**A R C H E**

[image]

**H a b r e j s k i n u m a r** **№ 3 (8) – 2000**

[image]

Пачатак Навіны Форум Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

[image]

» да Зьместу «

[image]

# Ілья Куркоў
# Яўрэі ў БССР: ілюзіі і надзеі

---

**С**а школьных падручнікаў вядома, што 1929 год стаў для СССР годам „вялікага пералому“ — з пачаткам татальнай калектывізацыі былі скасаваны апошнія рэшткі НЭПу, запушчаны механізм масавых судовых працэсаў, савецкая дзяржаўнасць дасягнула таталітарнай сталасці, сфармавала свае рысы, якія пранесла праз дзесяцігоддзі. І, магчыма, невыпадкова, што менавіта ў 1929-м справіў сваё 50-годдзе былы нарком па справах нацыянальнасцяў І.В.Сталін.
У разгляданы час савецкія ідэолагі не адмаўлялі наяўнасці ў краіне нацыянальнага, і, у прыватнасці, яўрэйскага пытання, але ўжо небяспечна станавілася сумнявацца ў тым, што яно „паспяхова вырашаецца, дзякуючы мудрай палітыцы камуністычнай партыі і савецкага ўраду“. Беларусь, у якой яўрэі складалі большасць гарадскога насельніцтва, на думку партыйнага кіраўніцтва, павінна была стаць своеасаблівым „узорным палігонам“, дзе б памянёная паспяховасць выявілася найбольш яскрава. Дзеля гэтага рабілася нямала: ідыш стаўся адной з дзяржаўных моваў БССР, паслядоўна праводзілася кампанія па землеўладкаванні яўрэяў, некаторы час словы „антысеміт“ і „антыкамуніст“ лічыліся амаль сінонімамі. 24 ліпеня 1925 году Бюро ЦК КП(б)Б была прынята пастанова, у якой прызнана: „... считать необходимым — изживать из употребления в белорусском языке слова „жыд“, заменив его словом „яўрэй“. Для этого в дальнейшем дать соответствующие

директивы коммунистам — иметь в виду настоящее постановление в своей работе, в частности по Инбелкульту и Госиздату“[1].

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, фонд 4, воп.3, справа 5, ліст 348.

Але нярэдка афіцыйныя дырэктывы значна разыходзіліся з рэальным станам спраўаў. Вось толькі адзін прыклад.

На пачатку 1929 году ў Менску праходзіў XII з’езд кампартыі Беларусі. Увечары 9 лютага тут выступіў сакратар Яўрэйскага бюро ЦК КП(б)Б Бейлін. Ён выйшаў на трыбуну з экземплярам нядаўна выдадзенага расійска-беларускага слоўніка і, паказваючы яго дэлегатам, паведаміў, што: „... маюцца досыць сур’ёзныя палітычныя моманты, на якія неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу. На расійскай мове „блудніца“, а па-беларускі — „распутніца“, „бахурка“ і, выбачайце, „курва“ (сьмех у зале, голас: „Чытаць ня трэба“). Тут гавораць, што ня трэба чытаць. Я лічу, што гэта можна ў стэнаграму не заносіць[2].

[2] Але, як бачым, занесли. Далей напісана так: „девушка — дзяўчына, дзявочніца, цэлка“ (сьмех у зале). Далей, таварышы, „рускі — расейскі, рускі, маскальскі, маскоўскі, маскаль;

Бядняк — бедны, бядак, галыш, худак, хадак, злыдзей;
Мужык — мужычына, халоп, хам;
Яўрэй — яўрэй, жыд, яўрэйка, жыдоўка;
Яўрэйскі — жыдоўскі;
Яўрэйства — яўрэйства, жыдоўства;
Яўрэйчык — яўрэйчык, жыдочак“.

Гэта выдавецтва — Дзяржвыдавецтва, якое прайшло праз Глаўліт і вышла ў 7000 экз. ... Акрамя грубасьці тут маецца і надзвычайна важны палітычны момант. Таварышы, мы зараз маем антысэмітызм, мы зараз маем яўны шавінізм, і мы змагаемся з гэтым. Таму ЦК партыі яшчэ ў 1925 г. вынес пастанову ізьяць з упатрабленьня і зь літаратуры слова „жыд“... Я лічу недапушчальным, калі на фабрыках, або на заводах, у прыватнасьці на заводзе „Бальшавік“, мы ўжываем словы „жыд“ і „хам“. Такім чынам узаконіваюць гэтыя словы. Я пытаюсь, ці можам мы змагацца з шавінізмам, з антысэмітызмам, калі ў падручніках узаконіваюць гэтыя словы. І другі момант. Калі кулак на сходах заве бедняка лодырам, або злыднем, мы даем кулаку магчымасьць, апіраючысь на гэтыя словы, лаяць так бедняка на вёсцы“[3].

[3] НА РБ, ф.4, воп.2, спр.60, л.512-513.

Тэма сялянства была ўзнята сакратаром Яўрэйскага бюро ЦК зусім не выпадкова. Адметнай рысай эпохі была беспасярэдняя сувязь паміж становішчам на вёсцы і вырашэннем нацыянальнага пытання. Найлепш, напэўна, гэта было відаць на Ўсебеларускім з’ездзе яўрэяў-сялян, які адбыўся ў студзені 1928 году. Аб значнасці дадзенага мерапрыемства сведчыць факт выступлення на яго ўрачыстым адкрыцці старшыні Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР А.Р.Чарвякова. Яго прамова была вельмі насычанай, але калі зноў пачаць цытаваць тут афіцыйную стэнаграму з’езду, мяркуем, не кожны чытач здолее гэта вытрымаць, таму звернемся да іншай, больш папулярнай крыніцы.

Сярод матэрыялаў ЦК КП(б)Б захаваўся дакумент, які мае загаловак: „Съезд еврейских колонистов в Белоруссии. Статья в „Форвертсе“ (Нью-Ёрк) от 1 марта 1928 г.“. Нягледзячы на некаторыя недакладнасці ў гэтым артыкуле (напрыклад, „амерыканізацыя“ назваў пасад кіраўнікоў БССР), тут даецца даволі поўны агляд з’езду і становішча з землеўладкаваннем яўрэяў наагул.

Чытачу ў Нью-Ёрку, напэўна, цікава было даведацца, што: „...За час до открытия съезда городской театр Минска[4] был переполнен. Человек тысяча стоит снаружи с тщетной надеждой ворваться внутрь — „Театр не резиновый“, дает знать старший милиционер у дверей. Милиционеры не

довольствуются философией, когда публика начинает сильно напирать, „аргументируют“ милиционеры локтями не хуже, чем языком.
— Отступите, граждане, напрасен ваш труд, вы не войдете, мест нет.

[4] Зараз будынак Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я.Купалы.
Милиционеры — евреи, и они обращаются к публике простым минским материнским языком „Маме-лошн“. Десятки людей из публики называют их по имени: „Впусти, Шлеймке, будь братом, Иёшке, пусти“. Но Шлеймке и Иёшке не знают никакого панибратства при исполнении своих обязанностей, и они напирают на публику с еще большей энергией... Съезд открыл Секретарь еврейских секций Белоруссии и заведующий Еврейским отделом Центральной национальной комиссии при белорусском ЦИК — Бейлин, стопроцентный коммунист, который душой и телом предан интересу еврейских трудящихся... Публика сильно подогрета речью т. Бейлина и не жалеет ему аплодисментов во всю. Но главный энтузиазм воспламеняется только тогда, когда выступает с речью „Президент“ — Председатель белорусского ЦИКа Червяков. Червяков очень популярен среди населения, особенно у евреев. Среди евреев его зовут „золотой гой“, „друг евреев“, который „делает евреям много добра“, и поэтому достаточно было его появления на трибуне, как все в театре, как один, встали и устроили ему бурную овацию. Встает вот этот „Президент“ на съезде еврейских крестьян и говорит приблизительно следующее:
— Вы извините меня, дорогие товарищи, что я свой доклад на съезде еврейских крестьян делаю на белорусском языке. У нас в Белоруссии еврейский язык признали как один из трех государственных языков, знать которые должны все ответственные государственные работники. Сложилось так, что я до сих пор не успел выучиться еврейскому языку, но я обещаю, что к вашему следующему съезду свой доклад произнесу на еврейском языке.
Аплодисментам и удовольствию не было конца.
— Ну что скажешь, Берке, — ударяет локтем в бок, обращается крестьянин средних лет к своему соседу. Ну что? Слышал ты

подобное в жизни? Председатель ЦИКа, можно ведь сказать, государь страны, и извиняется перед евреями за то, что не знает еврейского языка. Воистину, времена Мессии.
Двухчасовый доклад вызвал восторг у публики, не меньше, чем от вступительной речи, и не столько от первой части доклада, где Червяков рассказал о трудностях и состоянии советской власти в Белоруссии, — это слыхали и от предыдущего оратора, — как вторая часть доклада, которая была полностью посвящена еврейским делам, еврейскому вопросу. „Золотой гой“ показал себя всеведущим в еврейских партиях и их программах и с еврейскими вопросами вообще, и каждой страны в отдельности, лучше другого еврея. Слушая его: об ассимиляции, о национальной автономии, о сионизме, территориализме, о левых Поалей-Цион, о правых Поалей-Цион, о кризисе в Палестине и о еврейских школах в Польше, могло показаться, что это говорит „Евсек“, прибывший в большевистскую партию через БУНД, через „Ферейнигте“, или совсем — через сионизм. Он, понятно, не забыл „натереть морду“ еврейской буржуазии и сказать несколько теплых слов еврейским трудящимся, главное — крестьянам. Когда бы эту речь произносил бы еврей, он не получил бы и половины тех аплодисментов, полученных „золотым гоем“ Червяковым.
...Особенно трогателен был момент, когда в полной амуниции на сцену вышло отделение красноармейцев, и один молодой бравый красноармеец вышел вперед и начал свое приветствие на настоящем минском наречии. Не на еврейском языке, что пишут в книгах, газетах, но на простом материнском языке, которым говорят в доме, на улице, на базаре.
— Любо слушать! — посмаковали евреи, — вот рот, вот свет настал: солдаты (иовоним) говорят по-еврейски“[5].

[5] НА РБ, ф.4, воп.10, спр.39, л.103-107.
...Але неўзабаве пасля „часоў Месіі“ ў краіне пачаўся рашучы наступ на рэлігію, у якім, дарэчы, „лепшы сябар працоўных яўрэяў“ адыгрываў не апошнюю ролю. Мэта была зразумелая — скасаваць рэлігію ўвогуле, але, з улікам спецыфікі часу, рабіць гэта было трэба як мага больш „натуральна“, і, вядома ж, „па шматлікіх просьбах працоўных“.
9 красавіка 1929 года пад старшынствам А.Р.Чарвякова адбылося пасяджэнне фракцыі КП(б)Б Прэзідыуму ЦВК БССР.

Сярод іншых пытанняў тут разглядалася „хадайнічаньне Віцебскай гарадской Рады аб дазволе выняцьця 14 малітоўных дамоў пад культурныя ўстановы, майстэрні і г.д.“. З пастановы, прынятай па гэтым пытанні, бачна, як ажыццяўлялася на практыцы дзяржаўная палітыка: „Лічыць нямэтазгодным правядзеньне выняцьця маліцьвеных дамоў масавым, кампанейскім парадкам... у першую чаргу, па мажлівасьці, патрэбна падрыхтаваць згоду веруючых на выняцьце, а таксама выкарыстоўваць парушэньні веруючымі правіл аб адлучэньні царквы ад дзяржавы (парушэньне дагавору і г.д.). Лічыць магчымым папярэдня дазволіць Віцебскаму гарсавету правесьці кампанію па падрыхтоўцы выняцьця харальнай сынагогі, адной сынагогі пад школу і адной сынагогі пад клюб для тэкстыльшчыкаў, адной з гарадзкіх цэркваў і адну царкву, якая знаходзіцца на Маркаўшчыне, пры ўмове, калі вакол выняцьця царквы на Маркаўшчыне ўжо мабілізавана думка і пажаданьне рабочых мас фабрыкі „Дзьвіна“. Выняцьце сабору і касьцёлу лічыць у сучасны момант нямэтазгодным“[6].

[6] НА РБ, ф.4, воп. 10, спр.107, л.26.

Галоўнае — абраць надзейную тактыку. І ўжо масам здаецца, што яны сапраўды маюць уплыў на вырашэнне свайго лёсу, дастаткова своечасова „прасігналіць, куды трэба“. Вось, напрыклад, які „сігнал“ прыйшоў з Гомеля: „…2 апреля сего года госучреждения по своим соображениям прекратили убивать скот по еврейскому способу, а начали убивать обыкновенными быкобойцами. Явившихся резников администрация скотобойни устранила, не допустив их к убою частного скота по еврейскому способу. Таким образом составилось положение, что все еврейское верующее население осталось без мяса и впредь вынуждено отказаться от употребления мяса, так как мясо от убиваемого скота обыкновенными быкобойцами употреблять не могут и не будут. Полагая, что Советская Законность не чинит насилия над религией, мы обращаемся к Прокурору Республики, сделать надлежащее и зависящее распоряжение о разрешении еврейской общине необходимое количество мяса для верующих изготовить на Гомельской Госскотобойне по способу еврейской веры без всякого давления со стороны. Апреля 4 дня 1929 г.“[7]

[7] НА РБ, ф.4, воп.10, спр.107, л.31.
Трэба адзначыць, што, нягледзячы нават на „пралетарскае паходжанне“, хадайнікі па справах рэлігіі разглядаліся афіцыйнымі коламі як элементы нядобранадзейныя.
На XII з’ездзе КП(б)Б 10 лютага 1929 году дэлегат Эстрын з Бабруйску казаў: „…Таварышы, быў у нас выпадак такі. У друкарні зьнялі аднаго рабочага — Вэйнера. Яго абвінавачвалі ў паломцы машыны. Ён у нядзелю не працуе, у суботу не працуе ў друкарні (сьмех у зале, голас: „І старастай у сынагоге“). Калі закрылі „микву“, ён прышоў ад імя веруючых прасіць адчыніць. Вы можаце сабе прадставіць, што гэта за рабочы“[8].

[8] НА РБ, ф.4, воп.2, спр.60, л.619.
А сапраўды, што гэта быў за чалавек, які свядома ішоў на рызыку страціць працоўнае месца? Відаць, пытанне было досыць прынцыповым, з тых, калі „адступаць ужо няма куды“. Каб неяк высветліць гэта, звернемся да яшчэ аднаго „сігналу“ — тэлеграмы, дасланай у ЦВК БССР 10 сакавіка 1929 году: „Местная. Председателю Центрального Исполнительного Комитета Белоруссии Червякову. Раввинов города Минска. Заявление. Артель сапожников „Рекорд“ насильственно заняла сегодня, десятого марта, синагогу по Немиге, 21. Обращаем Ваше внимание на то, что эта синагога всегда, даже в будни, полна молящихся. При этой же синагоге имеется единственный в городе религиозный бассейн, которым пользуется большое число религиозных евреев. Занятие этой синагоги равносильно совершенному запрещению еврейской религии, поставив ее вне закона, что противоречит духу советского законодательства. Просим Вас распорядиться о немедленном очищении артелью „Рекорд“ означенной синагоги. Раввины: Глускин, Цимбалист, Мазель, Блох, Рабинович, Керштейн, Копелиович, Пайкин, Шаковицкий, Габриелов, Ярхо, Либерман“[9].

[9] НА РБ, ф.4, воп.3, спр.36, л.33-34.
Цікавы далейшы лёс гэтай тэлеграмы. Цяжка сказаць, ці зразумеў яе адрасат, „дасведчаны ў яўрэйскіх пытаннях“, пра які басейн ідзе размова, але да справы ён паставіўся вельмі сур’ёзна: на другі ж дзень пераслаў тэлеграму рабінаў першаму сакратару ЦК КП(б)Б Я.Б.Гамарніку. Ад сябе А.Р.Чарвякоў

дадаў пісьмо на асабістым бланку, якое напісаў, дарэчы, уласнай рукою (напэўна, не ўсё было магчыма даручыць машыністцы). Дакумент гэты дае ўяўленне аб „механізме“ прыняцця адказных рашэнняў тагачасным беларускім кіраўніцтвам.

„*Службовая запіска. Менск, 11 сакавіка 1929 г.*

*ЗУСІМ ПАТАЙНА.*

В ЦК КП(б)Б т. Гамарнику

Посылаю Вам телеграмму раввинов г.Минска на мое имя. Эта телеграмма есть один из многих за последнее время документов подобного рода, получаемых мною от представителей разных религиозных культов. Из этих документов видно: 1) Волна атеизма в массах растет, и это служит основой наступления масс на религиозные организации, главным образом в виде требований о занятии церквей, синагог и др. зданий под общественно-полезные учреждения. Бывает, что наши органы плетутся в хвосте. 2) Наши „безбожники“ часто, чтобы доказать свою деятельность, стремятся провести резолюции на общих собраниях о занятии зданий рел. культов, и вследствие этого иногда бывает трудно отличить, когда подобная резолюция является результатом настроения масс, и когда она принимается потому, что против подобной резолюции не голосуют. 3) В последнее время усилилась „церковная“ деятельность наших „церковных“ комиссий при соответствующих органах, причем эта работа, я боюсь, носит слишком административный характер.

Вот по всем этим причинам я предлагаю на одном из заседаний Бюро ЦК, или в ином составе, заслушать сообщение на тему о церковных (всех культов) делах в Белоруссии.

С ком. приветом А.Червяков“[10]

[10] НА РБ, ф.4, воп3, спр.36, л.32. Аўтограф А.Р.Чарвякова. Якія меры былі прыняты па самім змесце тэлеграмы, мы пакуль не высветлілі, але галоўнае ў іншым. Афіцыйна абвешчанае ў СССР „адзінства партыі і народу“ не спраўджвалася ў рэальным жыцці. Тое, што для звычайных грамадзян было „надзённым“, „патаемным“, „асвечаным духам продкаў“, улады ўспрымалі прынцыпова інакш. Па вялікім рахунку яны былі не „за“ і не „супраць“ святыняў, але ў бягучы момант сацыялістычнага

будаўніцтва мелі заданне знішчаць іх і, па мажлівасці, „без эксцэсаў“.
...Але што гэта за „рэлігійны басейн“, з-за якога ўзнікла перапіска двух вядомых дзяржаўных дзеячаў? Калі некаму карціць даведацца, дык вельмі прыгожа пра мікву гаворыць урывак з тэксту В.Розанава „Уединенное“. Зрэшты, гэта ўжо не мае дачынення да яўрэяў БССР.



Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

[image] [image] [image] [

лёсу і ўвогуле яўрэйскага жыцця знаходзяць апасродкаванае сапраўды пластычнае выражэнне ў прымаце злавесных, згушчаных, настояных на болю й жаху цёмна-фіялетавых, глыбокіх смарагдова-зялёных , густа-сініх колераў, у цяжкім беспаветраным халодным каларыце („Лета“. 1979). Насуперак, праз жах, які, са словаў Басава, пераследаваў яго ўсё жыццё, цалкам паводле класічнага яўрэйскага *насуперак*! На каляровых кантрастах прарываецца ён у мастацкую прастору свайго часу. Пры гэтым ягоны мяцеж — унутраны, пластычны, кампазіцыйны, парадаксальна спалучаецца з вонкавай быццёвай закамплексаванасцю і непраціўленнем злу гвалтам і нічым іншым у жыцці („Горад“. 1978). Супярэчлівасць як адна з нацыянальных рысаў крыецца ў ім самім і навакол яго. Маленькі ціхі правінцыйны інтраверт — стваральнік моцных планетарных расчыненых прасцораў мастацтва.

Знак, сімвал, лінія (апошняя як літара пластычнай мовы — у Басава яна контур) набываюць культавае значэнне. Пляма, прадмет даводзяцца стылізацыяй да выгляду элементу піктаграмы, арнаменту. Усё гэта часам выклікае асацыяцыі з кабалістычнымі матывамі („У дарозе“, „Дзяўчына ў чырвоным“).
Містычны і эзатэрычны элементы яўрэйскай свядомасці, на мой погляд, прысутнічаюць на палотнах гэтага майстра („У дарозе“, „На прыродзе“, „Суперніцы“). Тут і „прымітыў“, і нейкая экспрэсіўная дэфармацыя — свайго роду пластычная маніфестацыя, якая ў наступным акрэсліць эстэтычны калідор будучага беларускага андэграўнду.

[image]

Зрэшты, у жыцці Басаў не быў ні змагаром, ні бунтаўніком, не задумваў нічога спецыяльна „супраць“, не супрацьстаяў і не супрацьстаўляў, не заклікаў і не дэкляраваў — увогуле не стасаваўся ні з рэаліямі жыцця, ні з супольнымі ілюзіямі соцыуму.
Будучы вестуном беларускага андэграўнду канца 70-х — пачатку 80-х, І.Басаў не быў і яго часткай, не ўяўляў ніякай небяспекі для існуючага ладу, не хаваўся па гарышчах і сутарэннях, а наадварот шчодра і наіўна нёс сваё мастацтва на суд гледача. Але да гэтага суду збольшага не даходзіла, бо яму

папярэднічаў самы няправедны і страшны суд... Не, не ідэалагічных цэнзараў ЦК КПБ, а калег па пэндзлі, якіх палохалі яго жывапісная моц і напор.

У апошнія гады колер набывае асаблівую чысціню і выразнасць, абрыс — магічную сілу, усё разам дасягае нейкай асаблівай знакавасці („Дзве жанчыны“. 1991; „Чырвоны пейзаж“, „Барацьба“, „Гутарка“ — 1993) і тут жа — нечаканае памякчэнне сілуэту, раптам узніклая акругласць, плыннасць ліній („Зара“; „Да зары“ — 1993). Апошнія два гады яго творчасці (1992 і 1993) былі зорнымі. Ён стварыў свае найлепшыя творы, быў поўны планаў.

[image]

У 1994 годзе ён пайшоў з жыцця, не дачакаўшыся ніводнай сваёй персанальнай выстаўкі. Калі не лічыць, праўда, адной экстравагантнай прапановы ад Саюзу Мастакоў: да 50-годдзя мастака зрабіць яго персанальную выстаўку закрытай ад прэсы і гледачоў.
Усім яго жывапісным палотнам папярэднічалі малюнкі. Як заўсёды — завершаныя і самакаштоўныя кампазіцыі з амаль скульптурнай лепкай аб’ёмаў, упэўненай шырокай контур-*лініяй*-мазком, з асаблівай выразнасцю вялікіх паўзаў на аркушы. Графіка І.Басава — яшчэ наагул не адкрытая таямніца. Моцны контур у Басава не толькі графічны, маляўнічы і рэльефны, але часам, здаецца, зусім зрываецца з плоскасці аркуша альбо палатна і адасоблена існуе ў Прасторы. Накшталт таго, як акрэсліваецца контур ягонага лёсу ў прасторы творчасці мастака.

[image]
[image]

**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**

Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

# Уладзімер Мальцаў Праграмны спэктакль яўрэйскага тэатру

Расфармаваны 18 чэрвеня 1949 году на пачатку палітычнай кампаніі па барацьбе зь „бязродным касмапалітызмам“, ён надоўга быў выкрасьлены з гісторыі культуры Беларусі. На працягу наступных дзесяцігодзьдзяў гаварыць аб тэатры было не прынята. Гісторыкам давядзецца ладна папрацаваць, каб узнавіць сапраўдную, вольную ад мітаў ды перадузятасьці гісторыю беларускага Яўрэйскага тэатру.

Яўрэйскі тэатр адкрыўся ў Менску 21 кастрычніка 1926 году спэктаклем „У пакаянных кайданох“. Пастаноўцы драматычнай паэмы І.-Л.Пераца адводзілася роля праграмнага спэктаклю. „Мы ў Перацу ўпершыню пераходзім да чыста тэатральных прыёмаў, якія павінны вызначыць наш шлях на найбліжэйшы час“, — казаў ягоны пастаноўшчык М.Рафальскі.

Над праектам пастаноўкі ён думаў яшчэ ў 1923 годзе, зь перасьцярогай рыхтуючы беларускія ўлады да ўключэньня ў рэпэртуар „спрэчнага“, „містычнага“ твору. У тыя часы М.Рафальскі кіраваў у Маскве яўрэйскім аддзяленьнем беларускай драматычнай студыі, што была адкрытая беларускім савецкім „урадам“ дзеля падрыхтоўкі актораў новых тэатраў. На базе яе яўрэйскага аддзяленьня і быў створаны беларускі Яўрэйскі тэатр. Спэктакль „У пакаянных кайданох“ у ягоным рэпэртуары стаўся гістарычны: ён і падводзіў вынікі студыйнага пэрыяду існаваньня трупы, і дэкляраваў мастацкую праграму на будучыню.

Уладзімер Мальцаў — тэатразнаўца. Сярод апошніх ягоных публікацыяў — „Росальский и еврейская драматическая студия („История еврейского народа“, часть 3, Институт славяноведения РАН), „Анализ некоторых тенденций и концепций развития современного театрального источниковедения“

(„Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва“, Выпуск 3, Нацыянальная бібліятэка Беларусі). Аўтар дысэртацыі пра Другі Беларускі дзяржаўны тэатр у 20-я гады.

Пасьля прэм’еры газэты доўга і насьцярожана маўчалі. Потым яўрэйскі часопіс „Октябрь“ абвесьціў „У пакаянных кайданох“ вяршыняй дасягненьняў студыі, у беларускай ды расейскай прэсе меркаваньні адносна спэктаклю разышліся, але ў іншым дыяпазоне — ад далікатна-насьцярожаных да катэгарычна-рэзкіх. У далейшых крытыках жыцьця тэатру нэгатыў пераважаў, і да пачатку 1930-х гадоў спэктакль, абвешчаны „нацыяналістычным“ ды „фармалістычным“, быў канчаткова прызнаны „контрарэвалюцыйным зрывам“. У 1937 годзе рэжысэр быў абвінавачаны ў шматгадовай антысавецкай дзейнасьці, і даўняя пастаноўка ўсплыла ў дакумэнтах НКВД як адзін з важкіх пацьвярджальных аргумэнтаў.
З-за частай падмены эстэтычнага аналізу ідэалягічнымі прапрацоўкамі, чым характарызуецца крытыка 1920—30-х гадоў, уласна творчая дэклярацыя тэатру, як і яе ўвасабленьне, нам да канца ня ясныя.
Паводле водгукаў крытыкі, І.Дабрушын, прыстасоўваючы твор І.-Л. Пераца да сцэны, „перамантаваў паэму так, што Перац наўрад ці назваў бы яе сваёю“. У канчатковым варыянце фабула спэктаклю выглядала наступным чынам.
Бедны ешыботнік (сэмінарыст) закахаўся ў дачку багатыра рэба Брах’е і ў дзень ейных заручынаў з багатым жаніхом абвесьціў яе сваёй нарачонай. Ён ня толькі наклікаў на дзяўчыну падозраньне ў нявернасьці і паставіў пад пагрозу выгодныя

заручыны, але і кінуў выклік яўрэйскай рэлігійнай традыцыі. Суд на чале з рабінам і рэбам Брах'е „апраўдаў" дзяўчыну, а грэшніку вынес вырак: ён мусіў быць закуты ў кайданы, каб выкупіць свой грэх праз малітву і каяту. Усе, акрамя аднаго вар'ята, адвярнуліся ад юнака, кпілі зь яго, рабілі адказным за ўсе магчымыя бядоты. Натоўп жабракоў і калекіх праклінаў грэшніка за тое, што ён ледзь не пазбавіў іх падачкі і сьвяточнае бяседы.
Змарнелы, зьнясілены мроямі герой засынае. У сьне да яго зьяўлялася „каханая" і маліла не адрынаць яе. Але надта трывалымі і непахіснымі былі звычаі, якім намагаўся супрацьстаяць герой. У снох душылі ледзь жывога Зынгебара бацькі нявесты — рэб Брах'е ды ягоная грубая жонка. А тым часам госьці, шамэс і бадхен, што вярталіся зь вясельля, ухвалялі ласку рэба Брах'е.
Герой у спэктаклі падаваўся няздольны да актыўнага сацыяльнага дзеяньня. Не ставала яму моцы парваць пакаянныя кайданы, ня мог ён вырвацца з асяродзьдзя, што яго паглынала. Вызваленьне прыходзіла толькі ў сьне. Але спробу бунту тэатр цаніў, і вобраз Зынгебара актор Г.Цорфас рамантызаваў. Мяжа паміж рэчаіснасьцю і матэрыялізаванымі суб'ектыўнымі мроямі героя сьціралася, сон і ява напаўзалі адно на адно, ствараючы агульную атмасфэру ірэальнасьці.

Спэктаклем „У пакаянных кайданох" калектыў, калі казаць словамі тых часоў, разьвітваўся зь сярэднявечным сьветам неадукаванасьці і цемры. Паміж змрочным мінулым, паказаным тэатрам, і сёньняшнім днём усталяваўся эстэтычны бар'ер. На чорнай аксамітнай заслоне, што адкрывала дэкарацыі, былі вышытыя яўрэйскія літары „П" і „К", што значылі „тут пахаваны". Зь іх звычайна пачыналіся надмагільныя надпісы на старых яўрэйскіх могілках. Магільны камень адкідаўся, і ў вычварных сцэнічных фантазіях тэатру мёртвы, струхнелы сьвет мінулага жыцьця ажываў. „Паказаць на сцэне (...) вузенькія вулкі гета, (...) цьвінтар сынагогі, даць пры дапамозе цынку (...) зьбялеласьць трупа, аздабляючы колерамі трупярні ўсё старое жыцьцё яўрэйскага грамадзтва, — гэта бліскучая ідэя", — дзяліўся ўражаньнямі ад спэктаклю М.Юзафовіч.
Беларуская крытыка ўказвала, што спэктакль „У пакаянных

кайданох“ быў пастаўлены М.Рафальскім пад уплывам маскоўскіх тэатраў ГОСЕТ і „Габіма“. Параўнаньне з „Габімай“ падаецца дзіўным. „Габіма“ была вястункай сыянізму. Гэты грамадзка-палітычны рух, што набіраў моцы ў Расеі ад канца XIX стагодзьдзя, стаў у апазыцыю да афіцыйнай палітыкі савецкага ўраду, заклікаў яўрэяў вярнуцца на гістарычную прарадзіму — у Палестыну, каб заснаваць незалежную дзяржаву Ізраіль і адрадзіць старажытную яўрэйскую мову, якой асноўная маса расейскага яўрэйства ня ведала. Служэньне мастацтву габімаўцы лічылі сьвятой справай, якая вымагала рэлігійнай самаадданай ахвярнасьці (сэмантыка слова „біма“ ў перакладзе з стараяўрэйскай спалучае два паняцьці — аўтар і сцэна), і стваралі манумэнтальна-экстатычны біблійны тэатр. Часопіс „Красная Нива“ праанансаваў пробны паказ спэктаклю, пастаўленага Рафальскім, для маскоўскай публікі. „У чаканай пастаноўцы рэзка адмяжоўваюцца два сусьветы яўрэйства — той, што памірае, і той, што нараджаецца. Гэта сьвет клерыкальных ды прымхлівых яўрэяў і сьвет рамесьнікаў, чаляднікаў, будучага яўрэйскага пралетарыяту. Паміж абодвума сусьветамі мітусіцца яўрэйскі юнак-ешыботнік, закаханы ў дачку багатага яўрэя, ужо прасватаную за другога. Барацьба самотнага ешыботніка і барацьба клясаў абодвух сусьветаў даюць калізіі драматызму. Ешыботнік ненавідзіць стары лад і ня ўмее прыстаць да новага. Ён асуджаны на пагібель і сьмерць — сузіральнік, паэт нірваны ды пасіўны філёзаф“. Дзеля ўзмацненьня сацыяльнага патасу трэці акт спэктаклю М.Рафальскі сканчаў сцэнай бунту, які стыхійна прабудзіў у працоўных нізах пакараны ешыботнік. „Фабульны працяг“ паэмы І.-Л.Пераца, як і зьмяшчэньне акцэнту з індывідуальнай драмы героя на сацыяльны рух масаў, што абуджаюцца да актыўнасьці, аказаўся неарганічным; пазьней, ужо ў Беларусі, сцэну бунту зьнялі, і спэктакль ішоў у двух актах.

Ужо ў тэксьце дэклярацыі задумы спэктаклю адчуваюцца „вахтангаўскія“ адгалоскі са спэктаклю „Гадыбук“, пастаўленага ў маскоўскім тэатры „Габіма“. Тэма двух сусьветаў, паміж якімі мітусіцца заціснуты чалавек, у савецкім мастацтвазнаўстве традыцыйна лічылася „вахтангаўскай“. Гэтая модная тэма „гучыць“ і ў творчай дэклярацыі беларускай яўрэйскай студыі. Насамрэч ні ў спэктаклі „Габімы“, ні ў

спэктаклі яўрэйскай студыі двух сусьветаў не было. І калекі, і багатыры ў спэктаклі Я.Вахтангава выступалі „як увасабленьне агіднага, брыдкага сьвету, які губіць усё жывое“. Не мітусіўся ў спэктаклі „Ў пакаянных кайданох“ паміж двума сусьветамі і Зынгебар: і багатыя, і бедныя былі гатовыя разарваць іншадумца, яўрэйскае асяродзьдзе мела пачварнае аблічча. Герой-індывідуаліст супрацьстаяў усеагульнай коснасьці яўрэйскага жыцьця, замяшанай на ханжастве і крывадушным выкананьні аджылых рэлігійных умоўнасьцяў. Тэатр пераймаў ад „Габімы“ трактоўку адзінанацыянальнага асяродзьдзя з брыдкай, скалечанай псыхікай, хоць і выкарыстоўваў для яе ўвасабленьня адрозныя ад „габімаўскіх“ пастановачныя сродкі. Натан Альтман любіў чыстыя, буйныя плоскасьці, лякальныя колеры, і таму апрануў натоўп жабракоў у „Гадыбуку“ аднастайна: мужчынаў — у аднолькава доўгія, да зямлі, лапсардакі, жанчын — у такія ж доўгія аднатонныя сукенкі. Скручаныя сьпіны, надламаныя, сутаргавыя рухі жабракоў-хасыдаў — паводле задумы майстра — можна было параўнаць са зьмярцьвелым, каравым дрэвам, што самотна тырчыць з сухой ды неўрадлівай глебы.

І.-Б.Рыбак у спэктаклі беларускага калектыву знайшоў індывідуальны падыход да тэмы паміраючага яўрэйскага сьвету. М.Рафальскі адкрываў для тэатру самабытнага яўрэйскага мастака Ўкраіны. Цяпер унёсак Ісара-Бэр Рыбака ў разьвіцьцё яўрэйскага мастацтва ўвекапомнены адкрыцьцём у Бат-Яме мастацкага мэмарыяльнага музэю (1962 г.), а творы мастака захоўваюцца ў дзяржаўных ды прыватных калекцыях розных краін. Зьехаўшы ў 1921 г. з Украіны ў Нямеччыну, ён актыўна ўключыўся ў выстаўную дзейнасьць бэрлінскага Сэцэсыёну і так званай „лістападаўскай групы“ мастакоў, арганізаваў у Нямеччыне першую пэрсанальную выставу. Непрацяглы візыт І.-Б.Рыбака ў СССР у 1925 годзе (у тым самым годзе ён ужо назаўжды эміграваў у Францыю) быў адзначаны ягоным дэбютам у якасьці тэатральнага мастака. Прыцягненьне для працы над І.-Л.Перацам прэстыжнага мастака, які атрымаў эўрапейскае прызнаньне, не было выпадковым. У 1916 годзе І.-Б.Рыбак удзельнічаў у гістарычна-этнаграфічнай экспэдыцыі па хасыдзкіх мястэчках Украіны. Уражаньні ад вандроўкі доўга былі пажыўнай крыніцай для станкавых работаў, ілюстрацыяў ды тэорыяў мастака. (У 1923 г.

ім былі выдадзеныя літаграфіі „Шэтл“, у 1924 г. — „Яўрэйскія тыпы Ўкраіны“).
Жанрава-характэрнымі фарбамі І.-Б.Рыбак даражыў і ў эскізах да спэктаклю таксама даў „этнаграфічныя тыпы“. Ён адлюстраваў сьвет першабытных пачуцьцяў, дрымучую цнатлівую наіўнасьць яўрэйскай глушы, паказаўшы танцуючыя фігуркі герояў у выглядзе лялек і надаўшы ім пэўную дэкаратыўнасьць.

За тыпажом у І.-Б.Рыбака праглядвае маска. У падскокваньнях скрыпача ды бахена лёгка пазнаюцца вандроўныя пэрсанажы „яўрэйскага мястэчка“, якім яго пісалі тады яўрэйскія мастакі, што стваралі адметны мастацкі сусьвет з аднымі і тымі дзеючымі асобамі. Такіх пэрсанажавых паўтораў багата ў работах Марка Шагала. Іхнае падабенства з пэрсанажамі, напісанымі І.-Б.Рыбаком, выяўляецца ў паваротах целаў, вопратцы, атрыбутыцы ці ў дэталях строяў. Пэрсанажы тыя, аднак жа, не былі перанятыя ў Шагала, а прыйшлі на сцэну са сьвету ягоных, І.-Б.Рыбака, карцін. Як і М.Шагал, ён на працягу ўсяго жыцьця вар’яваў улюбёныя тыпы ды сюжэты, стварыўшы для „Парыскай выставы“ „Хасыдзкі танец“, „Скрыпача“, па малюнках якіх на мануфактуры Сэўру ўжо пасьля ягонай сьмерці былі адлітыя парцалянавыя статуэткі. Парцалянавая статуэтка „Сьляпы скрыпач“, што цяпер перахоўваецца ў прыватнай калекцыі Ў.Маргуліеса (Лёндан), зьяўляецца варыяцыяй варыяцыяў вобразу местачковага скрыпача са спэктаклю „Ў пакаянных кайданох“ Беларускага яўрэйскага тэатру.
У палотнах мастака першых пасьлярэвалюцыйных гадоў адчуваецца ўплыў кубізму. І.-Б.Рыбак часьцяком парушаў маштабныя суадносіны аб’ектаў, любіў спалучэньні буйных плоскасьцяў, таму вобразы ягоных твораў набывалі вуглаватасьць ды цяжкаважнасьць, „ціснулі“ вагой сваёй фігуры. Адна з карцін мастака, „Старая сынагога“ (1919), магчыма, была ўзятая за аснову сцэнаграфічнага вобразу спэктаклю.
Выгнуты хваляй на ўсю сцэну змрочны сталёвы мур служыў фонам-заднікам для архітэктурнага макету сынагогі. Пафарбаваны ў сталёвы колер і падсьвечаны зьнізу, ён дазволіў ужыць так званае „клявіятурнае асьвятленьне“. На фоне сталі,

што мігціць халоднымі адценьнямі, контуры сцэнічнай архітэктуры і пэрсанажаў рабіліся графічна выразнымі і пластычна выдзеленымі. Будынак жа самое сынагогі быў трансфармаваны. Мастак захоўваў прадметныя вонкавыя абрысы сынагогі — пахілены дах, двухпятравы інжынэрны каркас канструкцыі, але „выразаў“ сьцены, агаліўшы шматлікія сходні, цёмныя пераходы, галерэйкі ды верхнія пляцоўкі „нутраной архітэктуры“. Вузкія лесьвічныя пляцоўкі „туліліся“ адна да адное, прыціснутыя масіўнымі плоскасьцямі скляпеньняў. Калі шматступенчатая архітэктурная канструкцыя з мноствам маленькіх гульнявых пляцовак запаўнялася людзьмі, узьнікаў вобраз перанаселенага яўрэйскага гета — цёмнага, скучанага, мітусьлівага.

Яшчэ раней, у 1919 годзе, падобны вобраз гета быў адбіты ў карціне кіеўскага мастака Абрагама Маневіча „Разбурэньне гета“. Празь лініі пакручастых вулак і нагрувашчаных дамоў яўрэйскага кварталу прабіваўся масіўны будынак сынагогі. У спэктаклі яўрэйскі квартал таксама „разгортваўся“, прарастаў з сынагогі. І на карціне Маневіча, і ў сцэнаграфічным вырашэньні І.-Б.Рыбака яна ўяўлялася магутным цэнтрам, што рэглямэнтаваў усе сфэры жыцьця кагалу.

Сцэнаграфічны вобраз разгортваўся ў спэктаклі ў часе, паралельным драматычнай дзеі, напаўняючыся новым зьместам. Першапачаткова дэкарацыі абыгрываліся рэжысурай у якасьці вызначэньня канкрэтнага месца дзеяньня — двара сынагогі. Але па ходзе спэктаклю дэкарацыя эвалюцыянавала ад архітэктурнага макету да канструктывісцкага станка. Захаваныя фотаздымкі сьведчаць, што схілы даху і сьцены сынагогі ў адной са сцэнаў спэктаклю былі цалкам зьнятыя, максымальна агаліўшы інжынэрны каркас устаноўкі. Гэтак у сцэнаграфіі матэрыялізавалася важная для спэктаклю тэма разбурэньня сынагогі. З архітэктурных масіўных сходняў, парэнчаў ды пляцовак узьнікаў канструктывісцкі станок, пазбаўлены якіх-кольвек выяўленчых функцыяў. Нібыта каробку незаселенага недабудаванага будынку з дахам і сьценамі, апорнымі слупамі ўзьнялі ўгору, пакінуўшы воку пабочнага назіральніка толькі пабудову зь пераходаў ды пляцовак.

У вычварных рытмах цяжкаважнай архітэктуры — паўкруглых праёмах, што выгінаюцца хваляй, ці лесьвіцах, што робяць

нечакана круты заварот, — гучыць нейкая мэдытацыйная музыка, старажытная, рытуальна велічная, зь незвычайнай, мудрагелістай мэлёдыкай.
У яўрэйскім выяўленчым мастацтве 1920-х гадоў назіраецца тэндэнцыя да тэатралізацыі станкавага жывапісу, што прапаноўваў сцэне новы набор тэатральных масак. Паўторнасьць жэстыкуляцыі і ролевых функцыяў быццам пазбаўляла безыменных пэрсанажаў аўтарскага кляйма; яны рабіліся самастойным знакам яўрэйскага нацыянальнага сьвету.
Натуралістычных спосабаў паказу чалавека на сцэне беларуская яўрэйская студыя не прымала, таму прапанаванае І.-Б.Рыбаком пералажэньне нацыянальна-пабытовага тыпу на мову маскі падсілкоўвала ейныя пошукі.

Яшчэ ў „Гадыбуку“ Я.Вахтангаў — як трапна прыкмеціў Х.Херсонскі — раскрыў „прыроду местачковага яўрэйскага жэсту“, „фізычную праяву страху ды пакутаў“. Надламаныя канвульсійна-сутаргавыя рухі жабракоў-хасыдаў былі хутка ўспрынятыя тэатрамі як плястычнае ўвасабленьне „яўрэйскага стылю“, што выяўляў псыхіку людзей, гістарычна скалечаных замкнёнай прасторай гета і мяжы аселасьці. „У падкрэсьлена рытмізаванай жэстыкуляцыі, вонкавай тэмпэрамэнтнасьці рухаў, узьнёсласьці ды напеўнасьці артыкуляцыі ён (*Я.Вахтангаў. — У.М.*), — пісаў Л.Тамашын, — сыходзіў з нацыянальных асаблівасьцяў жэсту ды мовы, сцэнічна іх трансфармаваўшы“. Выяўляючы і эстэтызуючы асаблівасьці нацыі праз рытм, мэлёдыку мовы і рух, армянін Я.Вахтангаў прапанаваў тэатру той шлях разуменьня спэцыфікі нацыянальнае творчасьці, што ўжо складвалася ў яўрэйскай мастацкай культуры пачатку XX стагодзьдзя.
Ад клюбнага скрыўленьня інтанацыяў, наўмысна жаргоннага „аб’яўрэйваньня“ слова, што было ўласьціва практыцы вандроўных трупаў, калектывы адмовіліся і сканцэнтравалі сваю ўвагу на гуку, рытміцы фразоўкі, інтанацыйным мэлясе. Сьледам за „Габімай“ ды Маскоўскім ГОСЕТам у тым самым напрамку рушыла і беларуская яўрэйская студыя ў Маскве. М.Рафальскі будаваў партытуру спэктаклю на спалучэньні разнастайных рытмічных узораў. Вялікага эфэкту ён дасягаў у масавых сцэнах. Іх зафіксавалі фотаздымкі. Асобныя твары ці

групы людзей існуюць у адасобленых пластычных рытмах, не ва ўнісон — у разброд, аднак яны ўсе аб'ядноўваюцца рэжысэрам у адно; дзіўная ды вытанчаная карціна з вострых кутоў ды зыгзагаў целаў.
Найменшы рух актора, які цьвёрда фіксаваў позу ды ракурс цела, мадуляцыі голасу, вышыню ды сілу гуку, былі выверанаыя і замацаваныя ў партытуры спэктаклю; ён разыгрываўся як па нотах. Рухі, даведзеныя да мэханічнае адточанасьці, і міміка, блізкая да масачнай, фармавалі цацачна-марыянэткавую манеру выкананьня. Ідэал Г.Кляйста, які абвяшчаў, што „дасканаласьць актора — альбо ў тым целе, якое ніяк не кантралюецца, альбо ў тым, якое кантралюецца поўнасьцю, то бок у марыянэтцы ці ў напаўбогу" — выявіўся ў нацыянальным яўрэйскім варыянце. Аб акторах, занятых у спэктаклі, беларуская крытыка не пісала, адзначыўшы толькі, што яны мацнейшыя ў масавых сцэнах, чымся ў сольных.
Напісаная кампазытарам А.Крэйнам аркестровая музыка ды сольныя нумары ў спэктаклі былі разьлічаныя на самастойнае канцэртавае выкананьне. А.Крэйн разьвіваў культавую спадчыну мінулага праз сродкі сучаснага сымфанічнага мысьленьня. (Вялікі ўплыў на фармаваньне індывідуальнай манэры кампазытара зрабілі сымфоніі французскіх імпрэсіяністаў ды творы А.Скрабіна.) Выбар М.Рафальскага не выпадкова спыніўся на кампазытару, які шукаў прататыпаў „нацыянальнага стылю" ў „сынагагальных старажытных матывах зь ixнай мудрагелістай мэлядычнай арнамэнтацыяй і рэчытатыўнай рытмікай".
Музыказнаўчы тэрмін „акордавы тып будовы" вызначае сутнасьць рэжысэрскага мысьленьня М.Рафальскага, прадэманстраванага ў гэтым спэктаклі. Ад накладаньня сцэнаў, што адбываюцца ў рэчаіснасьці ды ўва ўяўленьні галоўнага героя, але дадзеных аднамамэнтна — паўнагучным акордам, да майстэрства ў пабудове масавых мізансцэн, калі агульны пластычны ўзор натоўпу, што танцуе на розных узроўнях канструкцыі, ствараецца са спалучэньняў — накладаньняў ліній маленькіх мікрасусьветаў.
Антыклерыкальная сьветапоглядная пазыцыя М.Рафальскага не падлягае сумневу. Твор І.-Л.Пераца ён паспрабаваў рэвалюцыянізаваць, выправіўшы сьветапоглядныя „хібы" аўтара і прыпісаўшы яму антырэлігійную накіраванасьць.

У многіх творах Пераца праступае бесчалавечная сутнасьць рэлігійнага аскетызму. Але вось атэізм ды заклікі да сацыяльнага пераўладкаваньня былі арганічна чужымі для пісьменьніка. А якраз дзеля гэтых мэтаў рэжысэр выкарыстаў ня толькі дэклярацыйнае паўстаньне рамесьнікаў (у фінале), але і абвострана-схематычны гратэск.
Быўшы чалавекам, узгадаваным у межах „рысы аселасьці“, М.Рафальскі разумеў, што ўва ўмовах шматвекавога панаваньня рэлігійнага мысьленьня многія формы яўрэйскага сьвецкага жыцьця былі рэглямэнтаваныя рэлігіяй, зрасьліся зь ёю. Дзякуючы юдаізму яўрэйскі народ, што асыміляваўся ды інтэграваўся, захаваў адметнасьць уласнай культуры. Рэлігійнай традыцыяй працятая культура — этыкет, вусныя ды літаратурныя формы творчасьці, творы сакральна-абрадавага мастацтва. Жадаючы абнавіць яўрэйскі тэатр, рэжысэр зьвярнуўся да рытуальных формаў сынагагальнага жыцьця як да вытокаў народнага побыту. Ён тэатралізуе ў спэктаклі шлюбны цырыманіял, вясельную пагулянку, фальклёрныя вітаньні жаніха ды нявесты, народны дыялёг як рытуальныя формы рэлігійна-сьвецкага жыцьця. Пры гэтым яны ўзнаўляюцца без этнаграфічнага рэстаўраваньня.
Пагружэньне рэжысэра ў пабытовую рытуальнасьць хасыдзкага жыцьця беларускай крытыкай успрымалася неадэкватна. „У спэктаклі „Ў пакаянных кайданох“ Беларускі Яўрэйскі тэатр зрабіў спробу выступіць супраць нацыяналістычных ды клерыкальных традыцыяў яўрэйскага тэатру пры дапамозе той самай зброі. Дзякуючы гэтаму ўвесь спэктакль працяты містыкай ды сымболікай“, — пісалі В.Вольскі і М.Модэль. (Доля праўды ў гэткай ацэнцы спэктаклю была: скараціўшы трэці акт з паўстаньнем местачковай беднаты, сацыяльны патас спэктаклю М.Рафальскі, безумоўна, зрабіў значна сьціплейшым.) Рэжысэр — рабілі высновы аўтары — „ня толькі ня змог крытычна паставіцца да разуменьня твору, але і сам цалкам патрапіў пад уплыў гэтак характэрных для творчасьці Пераца сынагагальна-магільных настрояў“.
Беларуская драматычная студыя, якая тым самым часам абвесьціла спэцыфіку свайго калектыву як тэатру нацыянальнай плястыкі і жэсту, апынулася ў складанай сытуацыі, бо ня мела ў беларускім мастацтве ані сур’ёзнага

апірышча для сучасных пошукаў, ані цэльнай праграмы для ажыццяўленьня сваіх ідэяў. Нясьмелыя дэклярацыі дзеячаў маладога беларускага тэатру ня дужа падмацоўваліся практыкай. У яўрэйскай студыі глеба пад нагамі была цьвярдзейшай, а посьпехі — значнейшымі.
Аднак у савецкай прэсе 1930-х гадоў у ідэалягічных дыскусіях сама канцэпцыя „нацыянальнага тэатру плястыкі і жэсту“ была бязьлітасна скрытыкаваная як „біёляга-этнаграфічная“, „нацыяналістычная“ і „пазаклясавая“. Спэктакль „У пакаянных кайданох“ быў выключаны з рэпэртуару Яўрэйскага тэатру і асуджаны.
„У кайданох...“ быў цалкам лягічным этапам разьвіцьця і росту беларускага Яўрэйскага тэатру. Аднак гэтая тэма далёка не актуальная на дадзеным перавале савецкага тэатру, які цяпер меў патрэбу ў сынтэтычна-рэалістычным выяўленьні як барацьбы пралетара ў мінулым, гэтак і, галоўным чынам, перамог ды цяжкасьцяў нашага сацыялістычнага будаўніцтва, новага жыцьця і новага чалавека“, — пісала „Полесская правда“.
Тым ня менш, спэктакль „У пакаянных кайданох“ праклаў мосьцік да этапных пастановак М.Рафальскага ў Беларускім Яўрэйскім тэатры — „Глухі“ Д.Бэргельсона (1928) ды „Рэкрут“ Аксэльрода (1934).

*Праца падтрыманая*
*Інстытутам падтрымкі дасьледаваньняў у Празе,*
*грант 1187/1997.*



Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

## Ня толькі шахматысты

**У**сім нам вядомая роля габрэйскага народу ў мэдыцыне, літаратуры, філязофіі, навуцы ды тэхніцы. Многа меней мы ведаем аб іхных дасягненьнях у спорце: беларускі абываталь зьвязвае ўладальнікаў прозьвішчаў на -штэйн ці -ман хіба што зь беларускімі шашкамі ды шахматамі. Аднак гэта паскудны стэрэатып.
У свой час габрэі годна рэпрэзэнтавалі Савецкую Беларусь на міжнароднай арэне. Мы тут пералічваем шэраг найвыбітнейшых спартоўцаў. Цікавыя нам і лёсы гэтых людзей.

**Акрабатыка**
**Вадзім Біндлер** (нар. 1958), Заслужаны майстар спорту, чэмпіён сьвету (1980), першы чэмпіён Эўропы (1978). Упершыню ў гісторыі акрабатыкі ў 1974 г. яшчэ школьнікам выканаў трайное сальта ўзад на дарожцы, прычым гэты трук быў зроблены без аніякіх прыстасаваньняў, а за дарожку былі маты. Гэты скок быў прадэманстраваны ў 1974 г. на чэмпіянаце Ўзброеных сілаў СССР у Кіеве, аднак яго выкананьне на чэмпіянаце сьвету трэнэрская рада забараніла дзеля перасьцярогі. Часавы інтэрвал паміж выкананьнем двайнога і трайнога сальта склаў амаль 80 гадоў. Біндлер стаўся адным з найлепшых акрабатаў сусьвету. Цяпер жыве ў ЗША.
**Леанід Ліўшыц** (нар. 1938), Заслужаны майстар спорту, Заслужаны трэнэр СССР. Падрыхтаваў першага чэмпіёна сьвету па акрабатычных скоках Зікунова, першую чэмпіёнку СССР па скоках на батуце Зданюк. Працуе трэнэрам у Менску. Старшыня Фэдэрацыі акрабатыкі Беларусі.

**Міхаіл Цэйцін** (нар. 1920), Заслужаны трэнэр СССР (першы зь беларускіх акрабатаў). Судзьдзя міжнароднае катэгорыі. 5-разовы чэмпіён Беларусі (1949—1953), трэнэр зборнай СССР (1963—1965). Ініцыятар увядзеньня спартовае гімнастыкі ў праграму агульнафізычнага выхаваньня. Галоўны рэжысэр спартова-масавых тэатралізаваных відовішчаў у СССР і за мяжой. Апублікаваў 60 навуковых працаў па мэтодыцы падрыхтоўкі акрабатаў і прыкладным выкарыстаньні акрабатыкі ў футболе. Вэтэран другой сусьветнай вайны, удзельнічаў у падрыхтоўцы дэсантнікаў.
**Аляксандар Гінсбург** (1923—1988) па сканчэньні вайны арганізаваў у Віцебску навучальныя групы акрабатыкі. З-за адсутнасьці памяшканьня заняткі праводзіліся проста на двары. Ён выхаваў чэмпіёна сьвету Радзянку, 30 майстраў спорту. Сёньня ў Беларусі праводзяцца спаборніцтвы акрабатаў, прысьвечаныя памяці Гінсбурга. Дзякуючы яму, Віцебск стаўся адным з асноўных цэнтраў акрабатыкі ў сьвеце. У гэтым месьце працавалі Заслужаныя трэнэры Беларусі **Швальба** — найлепшы трэнэр па скоках на батуце, **Бляхман**, **Гендлін**, **Робэрман**. Сярод іншых спартоўцаў вызначым **Нэлі Шэрман**, прызэрку чэмпіянату Саюзу.

**Бадмінтон**
**Уладзімер Ліўшыц** (нар. 1938), майстар спорту міжнароднага клясу, Заслужаны трэнэр Беларусі.
**Марк Альбінскі** (нар. 1935), Заслужаны трэнэр Беларусі. Трэнэр зборнай СССР (1974—1991).

**Бокс**
Боксам у Беларусі займаліся многія габрэі. За першыя 25 гадоў правядзеньня спаборніцтваў (1934—1963) сярод 228 чэмпіёнаў рэспублікі па ўсіх вагавых катэгорыях было 50 габрэяў: **М.Цырлін**, браты **М.і В.Коганы**, **І.Рубін**, **Л.Аксэльрод**, **Б.Новікаў**, **Л.Бідэл** ды іншыя. У Заходняй Беларусі былі баксэры — пераможцы альбо прызэры чэмпіянатаў Польшчы (**Рунштэйн**, **Разэнблюм**, **Фэмэрман**). Вялізны ўнёсак у разьвіцьцё боксу зрабіў **Ісак Рубін**, Заслужаны трэнэр Беларусі, доктар-анэстэзіёляг па прафэсіі. У 80 год ён усё шчэ пасьпяхова спалучаў трэнэрскую дзейнасьць з працай у мэдычнай установе Горадні. Сярод ягоных гадаванцаў 9 майстроў спорту, 6

прызэраў чэмпіянату СССР, 10 чэмпіёнаў Беларусі.
Сярод найвыбітнейшых баксэраў варта адзначыць наступных:
**Уладзімер Бацьвіньнік** (нар. 1938), Заслужаны майстар спорту, Заслужаны трэнэр Беларусі, чэмпіён СССР (1959). Правёў на рынгу 170 сустрэчаў, у 160 перамог. Працуе трэнэрам-выхаваўцам у спартшколе №7 Менску.
**Уладзімер (Вульф) Коган** (1920—1995), майстар спорту (1948), Заслужаны трэнэр СССР (1957). Першым з баксэраў Беларусі стаўся чэмпіёнам СССР у 1949 г. 5-разовы чэмпіён Беларусі (1937, 1938, 1947, 1949, 1950). Бронзавы прызэр Сусьветных студэнцкіх гульняў (Будапэшт, 1948). На рынгу правёў 140 баёў, зь іх у траціне перамог датэрмінова. Удзельнік другой сусьветнай вайны. Пасьля выхаду на пэнсію вучыў сакрэтам боксу курсантаў Рэспубліканскае школы МУС, напісаў кнігу „Рынг кліча“, першае выданьне па гісторыі боксу ў Беларусі. Ад 1995 г. у Беларусі праводзіцца адкрыты розыгрыш Кубку Беларусі памяці Ўладзімера Когана.
Вядомымі спартоўцамі былі і ягоныя браты:
**Мацьвей Коган** (1918—1942). Чэмпіён Беларусі па боксе ў 1936—38 гадах. Срэбны прызэр чэмпіянату СССР, дзе саступіў Іванову. Прапаў бязь вестак на фронце.
**Арон Коган** — у 1930-х чэмпіён Беларусі па цяжкай атлетыцы.
**Аляксандар Коган** — у тыя самыя гады чэмпіён рэспублікі па клясычным дужаньні.

**Дужаньне**
**Леанід Лібэрман** (нар. 1952), клясычны стыль, Заслужаны майстар спорту, Заслужаны трэнэр Беларусі. Чэмпіён сьвету (1975).
**Лазар Шапіра** (нар. 1938), вольны стыль. Заслужаны трэнэр СССР і Беларусі. Прызэр чэмпіянату СССР у камандных спаборніцтвах, у пэрыяд 1957—1964 гадоў быў 7-разовым чэмпіёнам Беларусі. Дачка **Натальля Шапіра-Асмолава**, майстар спорту па мастацкай гімнастыцы, зьехала ў Ізраіль, дзе працуе трэнэрам зборнае краіны.
Трагічны лёс напаткаў **Марка Славіна**, рэпатрыянта зь Беларусі, які загінуў разам з ізраільскай алімпійскай камандай у Мюнхене ў 1972 г.
**Моша Мірскі** стаўся першым барацьбітом зь Беларусі, які атрымаў тытул Ганаровага трэнэра СССР.

Сярод іншых выбіваюцца імёны **І.Геймана**, **М.Файбышава**, **М.Сіндара**, **І.Ясіловіча**, неаднаразовага чэмпіёна Беларусі ды прызэра першынства СССР (1961) **А.Кацовіча**.

**Лёгкая атлетыка**
**Марыя Іткіна** (нар. 1932), Заслужаная майстарка спорту, Заслужаная трэнэрка Беларусі, 4-разовая чэмпіёнка Эўропы. Прэзыдэнт Саюзу спартоўцаў Беларусі.

**Цяжкая атлетыка**
**Рафаіл Белянкоў** (нар. 1945), майстар спорту міжнароднага клясу. Чэмпіён Эўропы (1972). Рэкардсмэн сьвету (двойчы) ды СССР (6 разоў).
**Навум Лапідус** (1908—1976), Заслужаны майстар спорту, Заслужаны трэнэр Беларусі, першы беларускі судзьдзя міжнароднае катэгорыі па цяжкой атлетыцы. Чэмпіён СССР (1932—1935) у найлёгшай вазе (да 53 кг), 25-разовы рэкардсмэн краіны. Апошні рэкорд усталяваў у 40-гадовым веку, калі ў штуршку ўзьняў штангу вагою 116,5 кг, то бок у два з гакам разы перасягнуўшы собскую вагу. Рэкорды Лапідуса ня сталіся ў свой час сусьветнымі толькі з таго, што да 1946 г. СССР не зьяўляўся членам Міжнароднае Фэдэрацыі цяжкое атлетыкі і культурызму.
**Барыс Левін** (нар. 1937), Заслужаны майстар спорту, Заслужаны трэнэр Беларусі, чэмпіён Беларусі (1966—1967) у вазе да 60 кг. Узгадаваў 28 майстроў спорту, сярод выхаванцаў — Шары, чэмпіён сьвету, Алімпійскіх гульняў, пераможца першынства Эўропы.
**Зроіль Мэханік** (1909—1984), Заслужаны майстар спорту, Заслужаны трэнэр СССР, судзьдзя міжнароднае катэгорыі. Першы савецкі цяжкаатлет, які стаўся чэмпіёнам Эўропы (1947) у вазе да 67,5 кг. На яго рахунку адзін сусьветны і 15 рэкордаў СССР. Спортам пачаў займацца ад сярэдзіны 1920-х у Менску. Выхаванец дзіцячага дому. Працаваў шаўцом. Пасьля працы разам з Лапідусам, таксама шаўцом, наведваў клюб „КІМ“ на Багадзельнай вуліцы, дзе спартоўцы займаліся барацьбой, цяжкой атлетыкай, удзельнічалі ў мастацкай самадзейнасьці. Пасьля зьехаў у Маскву, дзе выступаў за „Лякаматыў“.
У ганаровую кнігу беларускага спорту занесеныя імёны менчукоў **Яўгена Кантаровіча** (1933, 1934), **Рыгора**

**Гальдштэйна** (1957), рэкардсмэна сьвету, Эўропы і СССР **Рамана Фэльдмана**, чэмпіёнаў рэспублікі **Фэлікса Тамарына**, **Марата Мільмана**, каваля **Міхала Шапіры**, які арганізаваў спартовае таварыства „Будаўнік“.
Першымі прапагандыстамі, трэнэрамі і арганізатарамі цяжкой атлетыкі ў Беларусі ў 1930-х былі браты **Адольф** і **Рыгор Гольдсбэргі.** Адольф загінуў у вайну, а Рыгор стаўся арганізатарам ды галоўным судзьдзём найбуйнейшых спаборніцтваў, узначальваючы на працягу 20 год (1940—1960) галоўную судзьдзёўскую калегію па цяжкой атлетыцы.

**Футбол**
**Міхаіл Андружэйчык** (нар. 1936), Заслужаны трэнэр Беларусі (тытул быў нададзены за падрыхтоўку маладых футбалістаў у 1982 г., калі менскае „Дынама“ сталася чэмпіёнам СССР). Цяпер трэнэр ізраільскага “Макабі” па міні-футболе: каманда пад яго кіраўніцтвам выйшла ў першую лігу.
У 1936—1937 гадах у складзе менскага „Дынама“ гуляў **Ісак Зальцбург**; пазьней за каманду выступаў **А.Ворцінг**. У „Дынама“ (Менск) і зборнай Беларусі ігралі майстры спорту **Генадзь Хасін**, **Міхаіл Радунскі**.

**Шахматы**
**Барыс Гельфанд** (нар. 1968), міжнародны грасмайстар.
У 17 гадоў стаў чэмпіёнам СССР сярод юнакоў, а праз 2 гады заваёўвае тытул чэмпіёна Эўропы сярод юнакоў. Па сваім спартовым рэйтынгу стабільна ўваходзіць у дзясятак наймацнейшых шахматыстаў сьвету. Цяпер жыве ў Ізраілі.

**Шашкі**
**Алена Альтшуль-Ратковіч** (нар. 1964), міжнародная грасмайстарка, 5-разовая чэмпіёнка сьвету па стаклеткавых шашках (1980—1986). Разам з другім мужам, міжнародным грасмайстрам В.Вірным, зьехала ў Нямеччыну.
**Анатоль Гантварг** (нар. 1948), міжнародны грасмайстар, Заслужаны майстар спорту, 4-разовы чэмпіён сьвету (1979—1985). Па адукацыі — матэматык, працаваў прапаршчыкам Савецкай Арміі.
**Бэніямін Гарадзецкі** (нар. 1919), грасмайстар СССР, судзьдзя ўсесаюзнае катэгорыі. Аўтар дасьледаваньняў у галіне

эфэктыўнага выкарыстаньня шашкавых мадэляў у разьвіцьці штучнага інтэлекту. Юнаком рэдагаваў шашкавыя рубрыкі ў беларускіх газэтах „Акцябр“ (на ідыш) ды „Штандар вальносьці“.
**Міхаіл Кац** (нар. 1947), міжнародны грасмайстар, Заслужаны трэнэр СССР. Падрыхтаваў чэмпіёнак сьвету Л.Сахненку, А.Альтшуль, З.Голубеву-Садоўскую. Ад 1994 г. жыве ў ЗША.
**Аркадзь Плакхін** (н. 1940), міжнародны грасмайстар, чэмпіён сьвету па расейскіх шашках (1994). Працуе сьлесарам у Менску.

*Падрыхтаваў Анатоль Прасаловіч*

[image]
[image]

**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

# Макс Горкгаймэр, Тэадор В.Адорна
# Дыялектыка Асьветніцтва.
# Элемэнты антысэмітызму

---

*Кніга найбуйнейшых нямецкіх філёзафаў XX стагодзьдзя* ***Макса Горкгаймэра*** *(1895-1973) і* ***Тэадора Адорна*** *(1903-1969) „Дыялектыка Асьветніцтва. Філязафічныя фрагмэнты“ адразу пасьля свайго выхаду сталася клясычным для эўрапейскага мысьленьня творам. На аснове філязафічнай крытыкі, разгляду фашызму і вынікаў шматгадовых эмпірычных дасьледаваньняў аўтараў у ЗША была разробленая тэорыя сучаснай масавай культуры. Увазе беларускіх чытачоў прапануецца апошні, пяты разьдзел кнігі. У Інтэрнэце цікаўныя знойдуць прадметны паказьнік да „Дыялектыкі...“ (Index zur »Dialektik der Aufklärung«), складзены нямецкім энтузіястам Карстэнам Алефэльдам.*

**Межы Асьветніцтва**

**I**

Сёньня антысэмітызм адным уяўляецца як лёсавызначальнае для чалавецтва пытаньне, іншым — як пустое месца. Для фашыстаў жыды — ня меншасьць, а антыраса, нэгатыўны прынцып як такі; ад іх выгубленьня беспасярэдне залежыць шчасьце сьвету. Абсалютна процілежнаю ёсьць тэза аб тым, што жыды безадносна да нацыянальных ці расавых прыкметаў утвараюць пэўную групу на падставе рэлігійных вераньняў ды традыцыі і нічога іншага. Адметныя жыдоўскія прыкметы, маўляў, датычаць усходніх жыдоў, прынамсі, тых, хто папросту яшчэ да канца не асымільваўся. Абедзьве дактрыны адначасна і праўдзівыя, і памылковыя.

Першая адпавядае праўдзе ў тым сэнсе, што фашызм зрабіў яе праўдзівай. Жыды сёньня ёсьць групай, якая як практычна, так і тэарэтычна прыцягвае да сябе волю да зьнішчэньня, што спараджаецца ілжывым грамадзкім ладам з свайго нутра. Абсалютнае ліха ставіць на іх таўро абсалютнага ліха. Такім чынам, яны насамрэч ёсьць абраным народам. Тым часам як панаваньне больш ня можа быць абумоўлена эканамічна, жыдом як такім надаецца статус абсалютнага аб'екту, зь якім трэба абыходзіцца адпаведным чынам. Рабочым, якія яшчэ нядаўна самі перабывалі ў падобным стане, ніхто гэтага зь відавочных прычынаў ня скажа проста ў твар; нэграў, маўляў, трэба трымаць там, дзе ім і належыць быць, але ад жыдоў Зямлю трэба ачысьціць, і заклік вынішчыць іх як шкодных паразытаў знаходзіць водгук у сэрцах усіх патэнцыйных фашыстаў усіх краінаў. У вобразе жыдоў, які шавіністы навязваюць сьвету, выражаецца іх собскае іство. Яны прагнуць усеахопнага валоданьня, прысабечаньня, улады бязь межаў — за любую цану. Пераклаўшы на жыдоў гэтую сваю віну, яны зь зьдзеклівасьцю пераможцаў укрыжоўваюць іх, бясконца паўтараючы ахвяраваньне, у дзейснасьць якога яны ня могуць да канца паверыць.

Іншая, лібэральная тэза праўдзівая як ідэя. Яна ўтрымлівае ў сабе вобраз таго грамадзтва, у якім жорсткасьць некаторы час не ўзнаўляе сама сябе і не шукае якасьцяў, у якіх яна магла б праявіцца. Адылі разглядаючы адзінства людзей як прынцыпова ўжо зьдзейсьненае, лібэральная тэза спрыяе апалёгіі існуючага стану. Спроба прадухіліць найвялікшую пагрозу пры дапамозе палітыкі, якая б улічвала інтарэсы меншасьцяў, і дэмакратычнай стратэгіі, такая ж двузначная, як і абарончыя дзеяньні апошніх лібэральна настроеных грамадзянаў наагул. Бясьсільнасьць гэтых палітыкі і стратэгіі вабіць варагоў бясьсільнасьці. Самім існаваньнем і выглядам жыдоў існуючы ўнівэрсалізм кампрамэтуецца ў сілу недастатковай прыспасабляльнасьці іх.

Тое, што яны нязьменна датрымліваюцца свайго собскага ладу жыцьця, робіць іх дачыненьне да пануючага ладу няпэўным. Яны спадзяваліся атрымаць ад яго падтрымку, ня маючы пры гэтым сілы і магутнасьці. Іхным стаўленьнем да пануючых народаў была сумесь прагавітасьці і боязі.

Але нават калі яны выракаліся сваёй адметнасьці дзеля захадаў

пануючай сыстэмы, тыя, хто ішоў у авангардзе гэтага вырачэньня, рабіліся халоднымі стоікамі — такі характар грамадзтва да сёньня навязвае людзям.
Дыялектычнае перапляценьне асьветы і ўлады, дваякая сувязь прагрэсу з жорсткасьцю і выбаўленьнем, якую жыды адчувалі і ў вялікіх асьветніках, а таксама ў дэмакратычных народных рухах, выяўляецца таксама і ў сутнасьці саміх асымільваных. Асьвечанае валоданьне сабой, з дапамогай якога тыя жыды, якія прыстасаваліся да новых абставінаў, пераадольвалі ў сабе балючыя сьляды чужога панаваньня, супастаўнага з другім абразаньнем, беззасьцярожна вывела іх з собскай напаўжывой грамады ў буржуазію новага часу, якая ўжо несупынна крочыла наперад, да вяртаньня ў чысты прыгнёт, да сваёй рэарганізацыі ў стопрацэнтовую расу. Раса ня ёсьць асаблівасьцю, дадзенай беспасярэдне ад прыроды, як гэтага б хацелася шавіністам. Яна ёсьць хутчэй рэдукцыяй да прыроднага, да непрыхаванай сілы, закасьнелай партыкулярнасьці, якая ў рэальнасьці якраз і ёсьць унівэрсаліяй. Раса сёньня — гэта самасьцьверджаньне буржуазнага індывіда, інтэграванага ў барбарскі калектыў. Гармонію грамадзтва, за якую выказваліся лібэральныя жыды, ім давялося ўрэшце зазнаць на сабе саміх як гармонію *Volksgemeinschaft**.

* „Народнай супольнасьці“ — афіцыйнай ідэалягемы „клясавага міру“ ў фашысцкай Нямеччыне. — *Зацем рэдактара*.
Яны думалі, што гэта антысэмітызм зьнявечвае лад, але той лад насамрэч ня можа існаваць, не нявечачы чалавека. Перасьлед жыдоў, як і перасьлед увогуле, неад'емны ад такога ладу. Ягонай сутнасьцю, як бы яна часам ні хавалася, ёсьць гвалт, які адкрываецца нам сёньня.

**II**

Антысэмітызм як нацыяналістычны рух заўжды быў тым, што ягоныя завадатары любілі ўпікаць сацыял-дэмакратам: ураўнілаўкай. Тым, хто ня мае паўнаты ўлады, мусіць быць гэтак сама кепска, як народу. Прагныя пасьлядоўнікі, ад нямецкага чыноўніка да нэграў у Гарлеме, у прынцыпе заўсёды ведалі, што ўрэшце яны не атрымаюць нічога ад гэтага, апроч радасьці ад таго, што і іншыя таксама больш ня маюць. Арызацыя жыдоўскай уласнасьці, якая і без таго збольшага

давала прыбытак вярхам, наўрад ці прынесла масам Трэцяга Райху большае шчасьце, чымся казакам — мізэрная кантрыбуцыя, якую яны пад пагрозаю спаленьня вымагалі ад жыхарства жыдоўскіх кварталаў. Рэальным здабыткам была толькі напаўпразрыстая ідэалёгія. Тое, што дэманстрацыя эканамічнай неэфэктыўнасьці нацысцкага лекавага сродку хутчэй узмацняе ягоную прыцягальную сілу, чымся паслабляе яе, паказвае на ягоную сапраўдную прыроду: ён дапамагае ня людзям, а іхнай празе да зьнішчэньня. Сапраўдны пажытак, на які разьлічвае фашыст, — санкцыяваньне ягонай жорсткасьці праз калектыў. Чым менш выходзіць карысьці, тым больш зацята людзі трымаюцца руху, заміж таго каб лепей зразумець яго. Антысэмітызм выявіў імунітэт супраць аргумэнту недастатковай рэнтабэльнасьці. Народ ад яго ў захапленьні. Ягоная мэтазгоднасьць для ўлады відавочная. Ён выкарыстоўваецца для адцягненьня ўвагі, як танны сродак карупцыі, узор тэрарызму. Рэспэктабэльныя рэкеціры падтрымліваюць яго, а нерэспэктабэльныя — яго зьдзяйсьняюць. Але кшталт духу, як грамадзкага, так і індывідуальнага, што выяўляецца ў антысэмітызьме, дагістарычна-гістарычны зьбег абставінаў, адчайнай і няўдалай спробай уцёкаў зь якога ён ёсьць, цалкам спавіты змрокам. Калі пазнаньне не надае належнай увагі пакуце, што так глыбака ўласьцівая цывілізацыі, то і індывідуум ня здольны суняць пакуту праз пазнаньне, нават калі б ён хацеў гэтага гэтаксама моцна, як і сама ахвяра.

Глыбака рацыянальныя эканамічныя і палітычныя тлумачэньні і контраргумэнты — наколькі б слушнымі яны ні былі — ня здольныя да гэтага, бо зьвязаная з уладай рацыянальнасьць сама грунтуецца на пакуце. Як той, хто сьлепа нападае, і тая, хто сьлепа абараняецца, перасьледаваньнік і яго ахвяра належаць да аднаго кола зла. Антысэміцкі спосаб паводзінаў узьнікае ў тых сытуацыях, калі асьлепленым, пазбаўленым суб'ектыўнасьці людзям даюць волю як суб'ектам. Тое, што яны робяць, ёсьць — для тых, хто гэта робіць — сьмяротнымі і пры гэтым бессэнсоўнымі рэакцыямі, як іх клясыфікуюць бігевіярысты, не даючы ім тлумачэньня. Антысэмітызм — гэта даведзеная да аўтаматызму схема, нават рытуал цывілізацыі, а пагромы ёсьць сапраўднымі рытуальнымі забойствамі. Яны дэманструюць бясьсільнасьць таго, што магло б спыніць іх —

асэнсаваньня, азначэньня, урэшце, праўды. У бязглуздым баёданьні часу за забойствам сьцьвярджаецца тупое жыцьцё, якому людзі аддаюць сябе.
<…>

**III**

Сёньняшняе грамадзтва, у якім як першабытныя рэлігійныя пачуцьці і іх выбухі, гэтак і спадчына ў выглядзе рэвалюцыяў выстаўляюцца на продаж на рынку, у якім фашысцкія фюрэры за зачыненымі дзьвярыма заключаюць дамовы пра землі і жыцьцё нацыяў, тым часам як дасьведчаная публіка ля радыёпрыймачоў вылічвае іхны кошт, грамадзтва, у якім нават слова, што выкрывае яго, акурат і зьяўляецца прапусткай для прыёму ў шэрагі палітычнага рэкету: гэтае грамадзтва, у якім ужо ня проста палітыка ёсьць бізнэсам, але бізнэс і ёсьць усёй палітыкай — яно абураецца адсталымі дробнагандлярскімі паводзінамі жыда і вызначае яго як матэрыяліста, спэкулянта, які павінен саступіць палымянаму духу тых, хто ўзьвёў бізнэс у ранг абсалюту.

Буржуазны антысэмітызм мае адну спэцыфічную эканамічную падставу: маскаваньне ўлады пад вытворчасьць. Калі ў даўнейшыя эпохі беспасярэдне ўладары ажыцьцяўлялі рэпрэсіі, ня толькі пакідаючы працу вылучна нізам, але і абвяшчаючы працу ганебнай, якою яна заўсёды і была пры прыгнёце, дык пры мэркантылізьме абсалютны манарх адмяняецца ў найбуйнейшага мануфактурыста. Вытворчасьць атрымлівае сьвецкі статус. Паны ў якасьці буржуа ўрэшце цалкам адмовіліся ад вайсковай уніформы і апрануліся ў цывільнае. Праца не зьнеслаўляе чалавека, сказалі яны, каб авалоданьне вынікамі працы іншых зрабіць больш рацыянальным. Яны самі залічвалі сябе да тых, хто стварае прадукт, дарма што як і даўней заставаліся тымі, хто гэты прадукт заграбае і прысабечвае. Фабрыкант рызыкаваў і заграбаў грошы гэтак сама, як гандляр і банкір. Ён разьлічваў, плянаваў, купляў, прадаваў. На рынку ён канкураваў зь імі за прыбытак, які адпавядаў ягонаму капіталу. Толькі ён квапіўся ня проста на рынак, а на першакрыніцу: як функцыянэр клясы ён клапаціўся пра тое, каб не цярпець страты ад працы сваіх людзей. Работнікі павінны былі даваць як мага больш. Як сапраўдны Шэйлак*, ён настойваў на даўгавых абавязках. Валодаючы

машынамі і матар'яламі, ён прымушаў іншых ажыццяўляць вытворчасьць. Ён называў сябе вытворцам, але ён, як і ўсе іншыя, употайкі ведаў праўду. Прадуктыўнай працаю капіталіста, незалежна ад таго, ці ён апраўдваў свае прыбыткі заробкам прадпрымальніка, як за лібэралізмам, ці дырэктарскім акладам, як сёньня, была ідэалёгія, якая хавала сутнасьць працоўнай дамовы і драпежніцкую прыроду эканамічнай сыстэмы ўвогуле.

* Шэйлак — жыд-ліхвяр у п'есе Шэкспіра „Вэнэцыянскі купец". — *Зацем рэдактара*.

Таму і крычаць: трымай злодзея! — і паказваюць на жыда. Насамрэч ён — ахвярны казёл, што выкупляе ня проста за асобныя манэўры і махінацыі, а ў тым шырокім сэнсе, што яго выстаўляюць віноўнікам эканамічнай несправядлівасьці цэлай клясы. Фабрыкант на фабрыцы трымае ў полі зроку сваіх вінаваўцаў, работнікаў і, яшчэ перш як даць ім грошы, кантралюе выкананьне імі іхных абавязкаў. Што насамрэч адбылося, яны адчуваюць толькі тады, калі бачаць, што можна купіць за гэтыя грошы: найдрабнейшы магнат можа распараджацца такой колькасьцю паслугаў і дабротаў, як ніводны ўладар дагэтуль; работнікі, аднак, атрымліваюць гэтак званы культурны мінімум. Мала таго, што яны на рынку пазнаюць, як мала дабротаў ім прыпадае, прадавец яшчэ і расхвальвае тое, што яны ня могуць сабе дазволіць. Толькі ў суадносінах заробку да цэнаў выяўляецца, чаго пазбаўленыя работнікі. Прыняўшы свой заробак, яны прынялі заразом прынцып аплаты. Гандляр прэзэнтуе ім вэксаль, які яны падпісалі фабрыканту. Ён ёсьць судовым выканаўцам суцэльнай сыстэмы і выклікае на сябе нянавісьць, што мусіла б скіроўвацца на іншых. Адказнасьць сфэры абарачэньня за эксплюатацыю ёсьць грамадзка неабходнай уявай.

Жыды былі не адзіныя, хто быў заняты ў сфэры абарачэньня. Але яны былі занадта доўга ізаляваныя ў ёй, каб нянавісьць, якую яны здаўна цярпелі, не закранула іх сутнасьці. Для іх, у адрозьненьне ад арыйскіх калег, доступ да крыніцы даданай вартасьці быў і надалей закрыты. Права валодаць сродкамі вытворчасьці яны дабіліся зь цяжкасьцяй і позна. Праўда, хрышчоныя жыды ў гісторыі Эўропы і нават у нямецкай кайзэраўскай імпэрыі здолелі дасягчы высокіх пасадаў у

адміністрацыі і індустрыі. Аднак заўсёды ім даводзілася апраўдваць гэта падвойнай адданасьцю, натужнай руплівасьцю, упартым самаадмаўленьнем. Іх дапускалі туды толькі ў тым выпадку, калі яны сваімі паводзінамі маўкліва прымалі і яшчэ раз пацьвярджалі вэрдыкт пра іншых жыдоў: у гэтым быў сэнс хрышчэньня. Усе вялікія справы дзяржаўных мужоў так і не прывялі да прыняцьця жыда ў народы Эўропы, яму не далі пусьціць каранёў і за гэтую адсутнасьць каранёў на яго абрыналіся цкаваньні. Ён заўсёды заставаўся безаабаронным жыдам, залежным ад кайзэраў, князёў ці абсалютысцкай дзяржавы. Усе яны калісьці былі эканамічна больш магутнымі ў параўнаньні да адсталага насельніцтва. Пакуль яны маглі выкарыстоўваць жыда як пасярэдніка, яны баранілі яго ад масаў, якім даводзілася аплочваць рахункі прагрэсу. Жыды былі калянізатарамі прагрэсу. Пачынаючы з таго часу, калі яны ў якасьці купцоў дапамагалі пашыраць рымскую цывілізацыю ў родапляменнай Эўропе, яны былі, у адпаведнасьці са сваёй патрыярхальнай рэлігіяй, прадстаўнікамі гарадзкіх, буржуазных, урэшце, індустрыйных дачыненьняў. Яны прыносілі формы капіталістычнага ладу ў краіну і ўбіралі ў сябе нянавісьць тых, каму даводзілася пакутаваць ад іх. Дзеля эканамічнага прагрэсу, ад якога яны сёньня гінуць, жыды ад самага пачатку былі для дэклясаваных капіталізмам рамесьнікаў і сялянаў бяльмом на воку. Выбарачны, адмысловы характар прагрэсу яны цяпер зазнаюць на самых сабе. Тыя, хто заўсёды хацеў быць першым, застаюцца далёка ззаду. Нават жыдоўскі ўладальнік амэрыканскай індустрыі забаваў, нягледзячы на ўвесь свой бліск, жыве ў безнадзейнай абароне. Каптан быў уяўным перажыткам спрадвечнай буржуазнай формы адзеньня. Сёньня ён сьведчыць, што ягоныя носьбіты былі выкінутыя на ўзбочыну грамадзтва, якое, само дасягнуўшы поўнай асьвечанасьці, выганяе прывідаў сваёй папярэдняй гісторыі. Тыя, хто прапагандаваў індывідуалізм, абстрактнае права, панятак асобы, цяпер дэградавалі да ўзроўню біялягічнага віду. Тых, хто ніколі ня меў магчымасьці цалкам бесклапотна карыстацца грамадзянскімі правамі, якія б надалі яму якасьць „людзей“, цяпер без разбору зноў клічуць „жыд“. Ад стасункаў з цэнтральнай уладай жыд залежаў таксама і ў XIX стагодзьдзі. Універсальнае, ахоўванае дзяржавай права было зарукай ягонай бясьпекі, надзвычайны

закон — ягоным кашмарам. Ён заставаўся аб'ектам, залежным ад літасьці іншых, таксама і тады, калі настойваў на праве. Гандаль ня быў ягонай прафэсіяй, гандаль быў ягоным лёсам. Жыд быў траўмаю рыцара індустрыі, якому даводзіцца разыгрываць зь сябе творцу. У жыдоўскім жаргоне ён чуе тое, за што ўпотайкі пагарджае сабой: ягоны антысэмітызм — гэта саманянавісьць, бруднае сумленьне паразыта.

**IV**

Укарэнены ў масах антысэмітызм ня мае сувязі з рэлігіяй. Сьцьвярджаецца, што размова тутака ідзе пра чысьціню расы і нацыі. Паўсюль уважаюць, што людзі даўна адмовіліся ад клопату пра ратунак душы. Сёньня ўжо нават сярэдні вернік нагэтулькі ж хітры, наколькі раней быў хіба што які кардынал. Простым дакорам жыдом, што яны закаранелыя нявернікі, сёньня масы ў рух не прывядзеш. Адылі наўрад ці рэлігійная варожасьць, якая была стымулам для перасьледу жыдоў на працягу двух тысячагодзьдзяў, цалкам згасла. Стараннасьць, зь якою антысэміты адпрэчваюць рэлігійныя карані сваіх пераканаьняў, хутчэй сьведчыць аб тым, што падыспадна гэтая традыцыя ня меней глыбака ўласьцівая ім, чымся колішнім рэлігійным фанатыкам — прафанная ідыясынкразія. Рэлігія не скасаваная, а запатрабаваная ў якасьці культурнага здабытку. Хаўрус асьветы і ўлады выключыў уплыў моманту ейнай праўды да сьвядомасьці і закансэрваваў яе аб'ектывізаваныя формы. І тое, і другое ў канчальным выніку ідзе на карысьць фашызму: нястрымная корць каналізуецца ў паўстаньні масаў, нашчадкі палымяных эвангелістаў ператвараюцца, на ўзор Вагнэравых рыцараў сьвятога Граалю, у змоўнікаў, зьвязаных кругавой парукай, і элітную гвардыю, рэлігія як інстытуцыя часткова зрастаецца беспасярэдне з сыстэмай, часткова пераходзіць у аздобу масавай культуры і масавых мерапрыемстваў. Фанатычная вера, якою выхваляюцца фюрэр і ягонае акружэньне, нічым ня розьніцца ад той зацятай веры, якая даўней не давала спатыкнуцца тым, хто страціў надзею, толькі ейны зьмест згубіўся. Ад яго засталася адно нянавісьць да тых, хто не падзяляе веры. У нямецкіх хрысьціянаў ад рэлігіі любові не засталося нічога, апроч антысэмітызму.

Хрысьціянства — гэта ня проста рэцыдыў папярэдняга юдаізму.

Ягоны хрысьціянскі Бог пры пераходзе з генатэістычнай ува ўнівэрсальную форму яшчэ ня цалкам пазбыўся рысаў прыроднага дэмана. Жах, што паходзіць з часоў, калі яшчэ не аформіўся анімізм, з прыроды пераходзіць да панятку абсалютнага „Я“, якое поўніцай падпарадкоўвае сабе прыроду як ейны творца і ўладар. Ува ўсёй сваёй невымоўнай магутнасьці і велічнасьці, якія надае яму такое адчужэньне, гэты панятак усё ж дасягальны для думкі, якая менавіта праз сувязь з найвышэйшым, трансцэндэнтным становіцца ўнівэрсальнай. Бог як дух супрацьстаіць прыродзе як іншы прынцып, які ня проста адказвае за ейны сьляпы кругабег як усе мітычныя боствы, а можа вызваліцца зь яго кругабегу. Але адначасна ад ягонай абстрактнасьці і аддаленасьці ўзмацніўся жах перад несувымерным, і жалезныя словы „я ёсьць“, якія ня церпяць нічога побач сябе, сваёй непазьбежнай моцай перасягаюць сьляпейшы, але таму і больш мнагазначны вырак ананімнага лёсу. Бог юдаізму патрабуе таго, што яму належыцца, і зводзіць рахункі з тым, хто не аддае яму належнага. Ён аблытвае свой твор павучыньнем віны і заслугі. Хрысьціянства, наадварот, увыпукліла момант літасьці, які, аднак, утрымліваецца ў самім юдаізьме ў хаўрусе Бога зь людзьмі і ў прадказаньні мэсіі. Яно аслабіла жах перад абсалютам дзякуючы таму, што боскае стварэньне ў бостве здабыла сябе само: боскага пасярэдніка клічуць людзкім імем і ён памірае людзкой сьмерцю. Ягоная вестка: ня бойцеся; закон растане перад верай; большай за якія-любя мірскія даброты стане любоў, адзіны запавет.
<…>

**V**

<…>

Псыхічная энэргія, якую актывізоўвае палітычны антысэмітызм, ёсьць гэткаю рацыяналізаванаю ідыясынкразіяй. Усе тыя прыклёпы, адносна якіх існуе поўнае паразуменьне фюрэраў і іхных пасьлядоўнікаў, добра прыдаюцца для таго, каб можна было безь відавочнага парушэньня прынцыпу рэальнасьці, быццам бы з гонарам, паддацца мімэтычнай спакусе. Яны цярпець ня могуць жыда і ўвесь час імітуюць яго. Ня будзе антысэмітам чалавек, які ня мае ў крыві схільнасьці да перайманьня таго, што для яго значыць жыд. Гэта заўжды самі

мімэтычныя шыфры: пераконлівы рух рукі, сьпеўная інтанацыя, зь якою, незалежна ад сэнсу выказваньня, малюецца рухомая карціна прадмета і пачуцьця, нос, фізіягнамічны *principium individuationis*, быццам пісьмёны, якімі запісаны на твары індывіда адметны характар. У шматзначных праявах цягі да пахаў працягваецца жыцьцё старой цягі да нізкага, да беспасярэднай лучнасьці з навакольнай прыродай, зь зямлёй і брудам. З усіх пачуцьцяў акт нюханьня, які прыцягвае, а не апрадмечвае, найбольш пачуцьцёва сьведчыць пра жаданьне згубіцца ў іншым і расчыніцца ў ім. Таму пах як адчуваньне і адчуванае — і тое, і другое ў працэсе злучаецца ў адно цэлае — зьмяшчае больш экспрэсіі, чымся іншыя пачуцьці. У зроку чалавек застаецца тым, кім ён ёсьць, у паху чалавек растае. Таму цывілізацыя ўважае пах за ганьбу, за знак нізкіх сацыяльных слаёў, нізкіх расаў і невысакародных жывёлаў. Цывілізаванаму чалавеку дазваляецца аддавацца гэтай цязе толькі тады, калі забарона прыпыняецца праз рацыяналізацыю, скіраваную на сапраўды ці нібыта практычныя мэты. Аддавацца заганнаму поцягу дазваляецца толькі тады, калі няма сумневу, што гэта служыць ягонаму выгубленьню. Тады гэта набывае рысы пацехі ці жарту, стаецца мізэрнай пародыяй на выкананьне жаданьня. Людзі падступна цешацца мімэтычнай функцыяй, якою пагарджаюць, якая пагарджае сама сабою. Той, хто вынюхвае пахі, каб іх зьнішчаць, „кепскія“ пахі, той можа ўволю імітаваць вынюхваньне, атрымліваючы нерацыяналізаваную асалоду ад паху. Дэзынфэктуючы забаронены поцяг безумоўнай ідэнтыфікацыяй сябе з забараняючай інстанцыяй, цывілізаваны чалавек прапускае яго скрозь сябе. Калі ён перасягае пэўны парог, распачынаецца сьмех. Гэта ёсьць схемаю антысэміцкага спосабу рэакцыі. Антысэміты зьбіраюцца разам, каб адсьвяткаваць момант аўтарытарнага дазволу забароненага, адзін толькі ён робіць іх калектывам, ён фармуе супольнасьць саўдзельнікаў. Іхныя завыванні ёсьць арганізаваным сьмехам. Чым жахлівейшыя абвінавачваньні і пагрозы, чым большая жорсткасьць, тым больш немінучы зьдзек. Жорсткасьць, зьдзек і атручанае імі перайманьне — гэта, у сутнасьці, адно і тое ж. Сэнс фашыстоўскіх бюракратычных фармальнасьцяў, рытуальнай дысцыпліны, уніформаў і ўсяго нібыта ірацыянальнага апарату палягае ўва ўмагчымленьні мімэтычных паводзінаў.

Мудрагелістыя сымбалі, уласьцівыя любому контрарэвалюцыйнаму руху, чарапы і акантоўкі, барбарскае біцьцё ў бубны, манатоннае паўтарэньне словаў і жэстаў — гэта таксама арганізаванае перайманьне магічных практык, мімэзыс мімэзысу. Фюрэр з тварам актора з балагану і харызмай пастаянна гатовай успыхнуць гістэрыі вядзе рэй. Ягонае прадстаўленьне ідзе ад чужога імя і перадае тое, што ўсім астатнім у сапраўднасьці забаронена. Гітлер можа жэстыкуляваць як клоўн, Мусаліні — адважвацца на фальшывыя ноты, як правінцыйны тэнар, Гёбэльс — гаварыць побегам, як жыдоўскі агент, якога ён раіць забіць, Кафлін — прапаведаваць любоў, як сам збавіцель, укрыжаваньне якога ён узносіць угору, каб зноў і зноў лілася кроў. Фашызм таталітарны таксама і ў тым, што ён імкнецца павярнуць бунт прыгнечанай прыроды супраць улады беспасярэдне на карысьць улады.

Гэты мэханізм вымагае жыдоў. Іхная штучна ўзмоцненая заўважнасьць дзейнічае на законнанароджанага сына родапляменнай цывілізацыі, нібы магнітнае поле. Калі ён, звыклы да сваёй адрознасьці ад жыда, заўважае таксама сваё падабенства да яго, агульначалавечыя рысы, супольныя ім, у ім уздымаецца пачуцьцё адпрэчваньня, адчужваньня. Гэтак табуяваныя, супярэчныя пануючаму парадку працы поцягі ператвараюцца ўва ўніфікуючыя ідыясынкразіі. Эканамічная пазыцыя жыдоў, апошніх падманутых падманшчыкаў лібэралісцкай ідэалёгіі, не забясьпечвае надзейнай абароны ад гэтага. Дзеля таго што яны так прыдатныя да стварэньня такіх псыхічных індукцыйных плыняў, яны мімаволі прыдаюцца для такіх функцыяў. Яны падзяляюць лёс бунтуючай прыроды, наўзамен якой іх ужывае фашызм: яны сьлепа і дальнабачна выкарыстоўваюцца. Ня мае вялікага значэньня, ці жыды як індывіды насамрэч яшчэ маюць тыя мімэтычныя рысы, якія спараджаюць бацылы зла, ці гэтыя рысы ім толькі прыпісваюцца. Калі эканамічныя магнаты ўрэшце пераадольваюць боязь падлучыць фашыстаў да абароны сваіх інтарэсаў, дык аўтаматычна ўсталёўваецца гармонія „нацыянальнай супольнасьці“ ў стасунку да жыдоў. Улада пакідае іх без апекі, калі з прычыны свайго ўсё большага адчужэньня ад прыроды вяртаецца да голай прыроды. Жыдоў агулам абвінавачваюць у забароненай магіі, у крывавых

рытуалах. Толькі пераапранутая ў абвінавачваньне, пракаветная паганская прага аўтахтонаў вярнуцца да мімэтычнай практыкі ахвяраваньня адраджаецца ў іхнай собскай сьвядомасьці. Калі ўвесь жах зьнішчаных цывілізацыяй дагістарычных часоў праз праекцыю на жыдоў рэабілітуецца як рацыянальны інтарэс, яго ўжо не спыніць. Ён можа быць сапраўды зьдзейсьнены, і зьдзяйсьненьне ліха нават перасягае ліхі зьмест праекцыі. Народныя фантазіі пра жыдоўскія злачынствы, забіўствы дзяцей і садысцкія эксцэсы, пра атручваньне народу і міжнародную змову дакладна вызначаюць запаветную антысэміцкую мару і не пасьпяваюць за сваёй рэалізацыяй.

У пэўны момант само слова „жыд“ падаецца крывавай грымасай, выява якой разгортваецца на сьцягу са свастыкай — чэрап і адначасна зьнявечаны крыж; тое, што кагосьці клічуць жыдам, дзейнічае як заклік зьбіць яго на горкі яблык, каб ён быў падобны да гэтай выявы.

Цывілізацыя ёсьць перамогаю грамадзтва над прыродай, якая ўсё ператварае ў прыроду. Жыды самі на працягу тысячагодзьдзяў удзельнічалі ў гэтым дзякуючы асьветніцтву ня ў меншай меры, чымся цынізму.

Прадстаўнікі найстарэйшага і ўсё яшчэ вельмі жывучага патрыярхату, інкарнацыі монатэізму, яны ператварылі табу ў цывілізатарскія максымы, калі іншыя яшчэ трымаліся магіі. Здаецца, жыдом удалося тое, да чаго марна імкнулася хрысьціянства: зьнясіленьне магіі празь ейную собскую сілу, што ў якасьці набажэнства абяртаецца супраць сябе самой. Яны ня зьнішчылі прыпадабненьне да прыроды, а хутчэй захавалі яго ў чыстых вымогах рытуалу. Такім чынам яны замірыліся зь ім у сваёй памяці, не вяртаючыся сымбалічна назад да міталёгіі. Дзеля гэтага яны падаюцца прагрэсіўнай цывілізацыі адсталымі і надта разьвітымі, падобнымі і непадобнымі, кемлівымі і дурнымі. Яны прызнаюцца вінаватымі ў тым, што яны ў якасьці першых буржуа зламалі ў сабе перш за ўсіх: у тым, што іх спакушае нізкае, у празе да жывёльнага і зямнога, у ідалапаклонстве. За тое, што яны вынайшлі панятак кашэрнай ежы, іх перасьлядуюць як сьвіней. Антысэміты робяцца выканаўцамі Старога Закону: рупяцца аб тым, каб жыды абярнуліся ў парахню, бо яны елі з дрэва пазнаньня.

**VI**

Антысэмітызм грунтуецца на ілжывай праекцыі. Яна ёсьць антыподам сапраўднаму мімэзысу, надзвычай роднаснай яго выціснутаму складніку, магчыма, яна нават ёсьць паталягічнай адметнай рысай, у якой ён адбіваецца. Калі мімэзыс палягае ў прыпадабненьні да навакольнага асяродзьдзя, дык ілжывая праекцыя прыпадабняе навакольнае асяродзьдзе да сябе. Калі для першага вонкавае робіцца мадэляй, да якой дастасоўваецца нутраное, чужое робіцца знаёмым, дык у другім выпадку гатовае да скачку нутраное пераносіцца вонкі і пазначае нават самае знаёмае як ворага. Поцягі, якія не прызнаюцца суб'ектам сваімі собскімі і тым ня менш уласьцівыя яму, прыпісваюцца аб'екту: будучай ахвяры. Звычайны параноік ня вольны ў сваім выбары, ягоны выбар падпарадкаваны законам ягонай хваробы. У фашызьме гэты спосаб паводзін падхопліваецца палітыкай, аб'ект хваробы вызначаецца адпаведна з рэальнасьцяй, сыстэма вар'яцтва робіцца разумнаю нормай сьвету, адхіленьне ад яе — нэўрозам. Мэханізм, якім паслугуецца таталітарны лад, стары, як цывілізацыя. Тыя самыя полавыя поцягі, якія людзкі род душыў, умелі захоўвацца і перамагаць — як у індывідаў, так і ў народаў — пры дапамозе ператварэньня навакольнага асяродзьдзя сілаю ўяўленьня ў д'ябальскую сыстэму. Заўсёды чалавек, апантаны сьляпою прагай забіўства, бачыў у ахвяры перасьледніка, які змушаў яго, роспачнага, да неабходнай самаабароны, а наймагутнейшыя дзяржавы ўспрымалі найслабейшага суседа як невыносную пагрозу і нападалі на яго. Рацыяналізацыя была крутнёй і ўвадначас непазьбежнасьцю. Абраны ў якасьці ворага ўжо ўспрымаецца як вораг. Расстройства палягае ў тым, што суб'ект у недастатковай ступені адрозьнівае сваю і чужую ступень удзелу ў праектаваным матар'яле.

<...>

Паталягічнымі ў антысэмітызьме ёсьць не праектыўныя паводзіны як такія, а адсутнасьць у іх рэфлексіі. Суб'ект, пазбаўляючыся магчымасьці вярнуць аб'екту тое, што ён ад яго ўзяў, сам стае не багацейшы, а бяднейшы. Ён губляе рэфлексію ў абодвух кірунках: у выніку таго, што ён ужо не рэфлектуе прадмет, ён ужо не рэфлектуе сябе і такім чынам губляе здольнасьць да адрозьненьня. Заміж голасу сумленьня яму чуюцца галасы; заміж таго каб заглыбіцца ў сябе, склаўшы

пратакол сваёй собскай прагі да ўлады, ён прыпісвае пратаколы сыёнскіх мудрацоў іншым. Ён перапаўняецца і адначасна гібее. Ён безаглядна надзяляе вонкавы сьвет тым, што ёсьць у яго; але тое, чым ён яго надзяляе, ёсьць абсалютна нікчэмным, бязьмерна разьдзьмутым, сувязямі, махінацыямі, цёмнай практыкай безь відалі на думку. Сама ўлада, якая, нават калі яна абсалютная, паводле сэнсу заўсёды ёсьць толькі сродкам, у нястрымнай праекцыі робіцца і собскай, і чужой мэтай, можна нават сказаць, мэтай увогуле. Пры захворваньні індывіда абвостраны інтэлектуальны апарат чалавека зноў абяртаецца супраць чалавека як сьляпы інструмэнт варожасьці ў жывёльнай прадгісторыі, у якасьці якога ён заўсёды функцыяваў у гэтага роду супраць усёй астатняй прыроды. Нібы чалавек, што як біялягічны від ад свайго ўзьнікненьня выстаўляе сябе іншым вяршыняй стварэньня ў гісторыі эвалюцыі і таму найжахлівейшай зьнішчальнай сілай, і ўнутры чалавечага роду больш прагрэсіўныя расы выстаўляюць сябе больш прымітыўным, тэхнічна лепей узброеныя народы — больш адсталым, так і хворы індывід супрацьстаўляе сябе іншым індывідам як у маніі велічы, так і ў маніі перасьледу. У абодвух выпадках у цэнтры суб'ект, а сьвет — ня больш як нагода для ягонай маніі; ён стаецца бясьсільным ці ўсясільным увасабленьнем таго, што на яго праектуецца. Супраціў, на які параноік бесьперапынна наракае пры кожным сваім кроку, ёсьць вынікам адсутнасьці супраціву, пустэчы, якую стварае наўкола сябе гэты асьлеплены самім сабой. Ён ня можа спыніцца. Ідэя, якая ня мае цьвёрдага апірышча ў рэальнасьці, настойліва сьцьвярджае сябе і робіцца навязьлівай.
Паколькі параноік успрымае вонкавы сьвет толькі так, як гэта адпавядае ягоным сьляпым мэтам, ён заўсёды здольны толькі да паўтарэньня абстрактных прыхамацяў адмоўленага „Я“. Голая схема ўлады як такой, што роўным чынам прыгнятае і іншых, і собскае расколатае ўсярэдзіне Я, падхоплівае тое, што ёй прапануецца, і ўлучае яго, зусім не зважаючы на ягоную самабытнасьць, у сваё мітычнае павучыньне. Суцэльнасьць вечна аднолькавага стаецца сурагатам усёмагутнасьці. Выглядае на тое, быццам зьмей, які сказаў першым людзём: вы будзеце падобныя да Бога, выканаў сваю абяцанку ў параноіку. Ён стварае ўсіх паводле свайго вобразу. Здаецца, яму ня трэба нікога жывога, і ўсё-ткі ён патрабуе, каб яму ўсе служылі.

Ягоная воля працінае сусьвет, нішто ня можа абыходзіцца бяз сувязі зь ім. У ягоных сыстэмах няма прабелаў. Як астроляг ён надае зорам сілы, якія прыносяць бесклапотным згібеньне, ці то ў даклінічнай стадыі чужога „Я“, ці то ў клінічнай стадыі собскага „Я“. Як філёзаф ён робіць гісторыю выканаўцай непазьбежных катастрофаў і заняпадаў. Як поўны вар’ят ці абсалютны рацыяналіст ён зьнішчае непажаданых праз індывідуальны акт тэрору ці праз добра прадуманую стратэгію вынішчэньня. Так ён дасягае посьпеху. Як жанчыны абагаўляюць абыякавага паранаідальнага мужчыну, так народы апускаюцца на калені перад таталітарным фашызмам. У саміх адданых паранаідальнае апэлюе да параноіка як да пачвары, страх перад сумленьнем апэлюе да таго, хто пазбаўлены сумленьня, якому яны ўдзячныя. Яны ідуць за тым, хто на іх не зважае, хто не ўспрымае іх як суб’ектаў, а прызначае іх для выкарыстаньня ў шматлікіх мэтах. Па ўсім сьвеце такія жанчыны зрабілі сваёй рэлігіяй заняцьцё вялікіх і малых уладных пасадаў, а самі зрабіліся зласьлівымі бабамі, як мянуе іх грамадзтва. Дзеля гэтага пагляд, які заклікае іх да свабоды, мусіць, дзеіць на іх як пагляд занадта наіўнага спакушальніка. Іхны сьвет перакручаны. Але ўвадначас яны, як даўнія багі, якія лякаліся пагляду сваіх вернікаў, ведаюць, што за заслонай перабывае сьмерць. Акурат у не паранаідальным, даверлівым паглядзе яны сутыкаюцца з тым духам, які згас у іх таму, што ўва ўсім, што звонку, яны бачаць толькі халодныя сродкі свайго самазахаваньня. Такі дотык абуджае ў іх сорам і лютасьць. Вар’ят жа ня здольны на яго, нават калі ён, як фюрэр, глядзіць ім у твар. Ён проста запальвае яго. Агульнавядомы пагляд у вочы не захоўвае так індывідуальнасьці, як свабодны пагляд. Ён фіксуе. Ён змушае іншых да аднабаковай вернасьці, замыкаючы іх за ня маючымі вокнаў мурамі манады собскай асобы. Ён не абуджае сумленьня, а адразу прыцягвае да адказнасьці. Пагляды, што працінаюць і абмінаюць, гіпнатызуюць і не зважаюць, — гэтыя пагляды маюць аднолькавую прыроду, у абодвух выпадках суб’ект сьціраецца. З прычыны таго, што ў такіх паглядах няма рэфлексіі, тыя, хто ня мае рэфлексіі, імі электрызуюцца. Іх зраджваюць: жанчын выкідаюць, нацыю выпальваюць. Так замкнёны ў сабе чалавек стаецца карыкатурай на боскую ўладу. Падобна да таго, як у яго сувэрэнных выбрыках насамрэч абсалютна адсутнічае

стваральная патэнцыя, гэтак і яму, маўляў чорту, не стае атрыбутаў прынцыпу, які ён узурпуе: незабыўнай любові і ўгрунтаванай на сабе самой свабоды. Ён ліхі, ім кіруе прымус, і ён гэтак сама слабы, як ягоная сіла. Калі пра боскую ўсёмагутнасьць кажуць, што яна прыцягвае істоту да сябе, дык сатанінская, уяўная, усё зацягвае ў сваю бясьсільнасьць. У гэтым сакрэт яе ўлады. Пад прымусам праектаванае „Я“ ня можа праектаваць нічога, апроч уласнага няшчасьця, але ад прысутнага ў ім самім грунту яно, тым ня менш, адцятае дзеля сваёй безрэфлексійнасьці. Таму прадукты ілжывай праекцыі, стэрэатыпныя схемы мысьленьня і рэальнасьці, ёсьць прадуктамі і схемамі ліха. Для „Я“, што патанае ў бессэнсоўнай бездані сябе самога, прадметы стаюцца алегорыямі згібеньня, у якіх палягае сэнс ягонага собскага перакрышу.

<…>

Гатовасьць да фальшывай праекцыі настолькі фатальна ўласьцівая духу, што яна, ізаляваная схема самазахаваньня, пагражае апанаваць усё, што выходзіць вонкі яе: культуру. Фальшывая праекцыя ёсьць узурпатарам сфэры свабоды і асьветы; параноя — гэта сымптом напаўадукаванага. Для апошняга ўсе словы стаюцца сыстэмай вар’яцтва, спробаю абняць духам тое, што не абдымаецца ягоным досьведам, гвалтоўным чынам надаць сэнс сьвету, які робіць бессэнсоўным яго самога, але адначасна спробаю зганьбіць дух і досьвед, якіх ён пазбыты, і навязаць ім віну, якую нясе грамадзтва, што вымыкае яго з гэнага духу і досьведу. Павярхоўная адукацыя, якая, у адрозьненьне ад простай неадукаванасьці, гіпастазуе абмежаваныя веды як праўду, ня можа вытрымаць павялічаны да невыноснасьці разлом паміж нутраным і вонкавым, паміж індывідуальным лёсам і грамадзкім законам, паміж бачнасьцю і сутнасьцяй. Ведама, у гэтым пакутаваньні зьмяшчаецца элемэнт праўды, адсутны ў простым прыняцьці дадзенага, якому склала прысягу высакамерная разважнасьць. Адылі ў сваёй боязі павярхоўная адукацыя стэрэатыпна хапаецца за ўласьцівую ёй у адпаведным выпадку формулу, ці то каб абгрунтаваць зьдзеянае ліха, ці то каб прадказаць катастрофу, часам пераапранутую ў рэгенэрацыю. Тлумачэньне, у якім собскаму жаданьню надаецца якасьць аб’ектыўнай сілы, заўсёды ёсьць такім жа павярхоўным і бессэнсоўным, як сама ізаляваная падзея, недарэчная і заразом злавесная.

Цемрашальскія сыстэмы сёньня робяць тое, што сярэднявечнаму чалавеку ўмагчымляў міт пра чорта ў афіцыйнай рэлігіі: адвольнае напаўненьне сэнсам вонкавага сьвету, якое асобны параноік зьдзяйсьняе паводле прыватнай, нікім не прыманай схемы, якая акурат таму і падаецца ўласна вар'яцкай. Ад гэтага ратуюць фатальныя сыходы ў эзатэрыку і пошукі панацэі, якія разыгрываюць навуковасьць і адначасна адключаюць думку: тэазофія, нумэралёгія, знахарства, эўрытмія, аскетызм, ёга ды безьліч іншых, канкуруючых і ўзаемазамяняльных сэктаў, усе з акадэміямі, гіерархіямі, прафэсійнымі жаргонамі, фэтышызаванымі формуламі навукі і рэлігіі. Калісь яны былі з гледзішча асьветы апакрыфічнымі і нерэспэктабэльнымі. Сёньня ж, калі асьвета з эканамічных прычынаў увогуле адмірае, у нечуваным маштабе зьявіліся новыя ўмовы для параноі масаў. Рэлігійныя сыстэмы мінуўшчыны, якімі народы захоплівaліся як замкнёна паранаідальнымі формамі, мелі шырэйшы інструмэнтар узьдзеяньня. Акурат у выніку іхнай рацыянальнай арганізаванасьці і вызначанасьці яны пакідалі прастору, прынамсі ўверсе, для асьветы і духу, панятак якіх быў іх собскім мэдыюмам. Яны нават у пэўным сэнсе процідзейнічалі параноі. Фройд называе нэўрозы, у гэтым выпадку нават з поўным правам, „асацыяльнымі ўтварэньнямі"; „яны імкнуцца прыватнымі сродкамі дасягчы таго, што ў грамадзтве ўзьнікла шляхам калектыўнай працы"*.

* Freud, Totem und Tabu. Gesammelte Werke. Band IX.S.91.

Рэлігійныя сыстэмы ўтрымліваюць нешта з той калектыўнасьці, якая ахоўвае індывідаў ад захворваньня. Апошняе сацыялізуецца: у запале супольнага экстазу, ды ўвогуле ў грамадзе, сьлепата стаецца вузамі, а паранаідальны мэханізм — усёабсяжным, так і не ўхіляючы ад магчымых страхаў. Магчыма, апошняе было адным зь вялікіх унёскаў рэлігіі ў самазахаваньне віду. Паранаідальныя формы сьвядомасьці імкнуцца да стварэньня саюзаў, фрондаў і рэкетаў. Іхныя ўдзельнікі баяцца верыць у сваё вар'яцтва адзінцом. Праектуючы, яны паўсюль бачаць змову і празэліцкія махлярствы. Пасьля свайго ўтварэньня група заўсёды ставілася паранаідальна да іншых; вялікія дзяржавы, нават арганізаванае чалавецтва як цэлае ў гэтым сэнсе зусім ня лепшыя за

галаварэзаў. Тыя, хто быў вымкнуты з чалавецтва не па сваёй волі, таксама як і тыя, хто з тугі за чалавецтвам сам вымыкаў сябе зь яго, ведалі: дзякуючы іх перасьледу мацавалася хваравітая салідарнасьць. Але нармальны чалец здымае сваю параною праз удзел у калектыўнай параноі і палка чапляецца да аб'ектываваных, калектыўных, зацьверджаных формаў маніі. *Horror vacui*, якім яны замацоўваюць свае саюзы, гуртуе іх і надае ім амаль неадольную сілу.

Разам з буржуазнай уласнасьцю пашырылася таксама і адукацыя. Яна адцясьніла параною ў цёмныя куткі грамадзтва і душы. Але ў выніку таго, што адначасна з асьветай духу не адбылося рэальнай эманцыпацыі чалавека, адукацыя сама захварэла. Чым менш адукаваная сьвядомасьць стасавалася з грамадзкай сапраўднасьцю, тым больш яна сама падлягала працэсу арэчаўленьня. Культура конча ператварылася ў тавар, распаўсюджваны на правах інфармацыі, і ўжо не прасякала тых, хто вучыўся яе. Мысьленьне робіцца адрывістым, абмяжоўваецца фіксацыяй ізаляваных фактаў. Стройнасьць мысьленьня адмаўляецца як нязручнае і марнае намаганьне. Момант разьвіцьця ў думцы, усё генэтычнае і інтэнсыўнае ў ёй забываецца і нівэлюецца да беспасярэдне цяперашняга, да экстэнсыўнага. Сёньняшні лад жыцьця не пакідае „Я" прасторы для духоўнага ўдасканаленьня. Думка, пераплаўленая ў веды, нэўтралізуецца і зводзіцца адно да кваліфікацыі на спэцыфічных працоўных рынках і да павышэньня таварнага кошту асобы. Так гіне тая кандыцыя духу, якая працуе супраць параноі. Урэшце, ува ўмовах позьняга капіталізму напаўадукацыя стала аб'ектыўным духам. У сваёй таталітарнай фазе ўлада зноў зьвяртаецца да правінцыйных шарлятанаў ад палітыкі і разам зь імі да сыстэмы вар'яцтва як *ultima ratio* і навязвае яе і так ужо добра апрацаванай буйной і культурнай індустрыяй бальшыні. Абсурднасьць улады сёньня для здаровай сьвядомасьці настолькі відавочная, што ёй трэба хворая сьвядомасьць, каб захаваць сабе жыцьцё. Зь перасьледам, у які мусова пераходзіць улада, пагаджаюцца толькі апантаныя маніяй перасьледу, калі ім дазваляюць перасьледаваць іншых.

У фашызьме, дзе старанна выгадаваная буржуазнай цывілізацыяй адказнасьць за жанчын і дзяцей зноў губляецца за бесьперапынным самавыраўноўваньнем кожнага індывіда

паводле рэглямэнту, сумленьне і без таго зьліквідаванае. Яно палягала — іначай, чымся ўяўлялі сабе Дастаеўскі і нямецкія апосталы нутранога сьвету (*deutsche Innerlichkeitsapostel*) — у адданасьці „Я“ вонкавым сутнасьцям, у здольнасьці рабіць сапраўднае пачынаньне іншых сваім собскім. Гэтая здольнасьць ёсьць здольнасьцяй да рэфлексіі як узаемапранікненьня рэцэптыўнасьці і сілы ўяўленьня. Калі буйная індустрыя, скасоўваючы незалежнага эканамічнага суб'екта — часткова праз паглынаньне самастойных прадпрымальнікаў, часткова праз трансфармацыю работнікаў у прафсаюзныя аб'екты, безупынна выбівае эканамічную глебу з-пад маральнай пазыцыі, марнее таксама і рэфлексія. Душа як магчымасьць адкрытага самому сабе пачуцьця віны, сыходзіць на нішто. Сумленьне стаецца беспрадметным, бо месца адказнасьці індывіда за сябе і за сваіх блізкіх заступае, хай нават пад старым назовам маралі, папросту ягоная праца дзеля апарату. Больш не адбываецца канфлікту собскіх матывацыяў, у якім утвараецца інстанцыя сумленьня. Замест засваеньня грамадзкага наказу, якое робіцца ня толькі больш абавязковым і ўвадначас больш адкрытым, але і вызваляе ад грамадзтва, нават паварочвае супраць яго, адбываецца хуткая, беспасярэдняя ідэнтыфікацыя з стэрэатыпнымі шкаламі вартасьцяў. Узорная нямецкая жанчына, якая быццам мае вылучнае права на жаноцкасьць, і сапраўдны нямецкі мужчына, які быццам мае вылучнае права на мужчынскасьць, як і іхныя замежныя вэрсіі, ёсьць тыпамі асацыяльных канфармістаў. Нягледзячы на тое, што ўлада відавочна кепская, і дзякуючы таму, што яна відавочна кепская, яна стала нагэтулькі магутнай, што кожны ў сваёй бясьсільнасьці са сьляпой пакорнасьцю можа толькі заклінаць свой лёс.

<…>

**VII**

Але антысэмітаў больш няма. Апошняга разу імі былі лібэралы, якія хацелі выказаць свае антылібэральныя меркаваньні. Старая кансэрватыўная дыстанцыя, што аддзяляла шляхту і афіцэрскі корпус ад жыдоў, пры канцы XIX стагодзьдзя была проста рэакцыйнай. Духу часу адпавядалі Альварты і Кнюпэлькунцы*.

* Маюцца на ўвазе нямецкія палітыкі-юдафобы, якія датрымваліся крайне правых поглядаў і ўваходзілі ў

парлямэнцкую фракцыю „Deutsch-sozialen Reformpartei“ (Нямецка-сацыяльнай партыі рэформаў) у Райхстагу. Гэрман Альварт да таго ж быў аўтарам сумна вядомага твору „Verzweiflungskampf der arischen Volker mit dem Judentum“ („Адчайная барацьба арыйскіх народаў з жыдоўствам“(1890). — *Зацем рэдактара.*

Яны гуртавалі вакол сябе ўжо людзкі матар’ял для фюрэра, але іхным апірышчам былі зласьлівыя характары і ўпорыстыя галовы па ўсёй краіне. Калі антысэміцкія пераканаьні сталі выказвацца голасна, яны напоўнілся буржуазнасьцю і адначасна бунтарствам. Брутальная нацысцкая рыторыка была яшчэ і парушэньнем грамадзянскай свабоды. У палітыцы антысэмітаў, якая выйшла зь піўнога шынка ў Мюнхене, выявілася мана нямецкага лібэралізму, якім гэтая палітыка сілкавалася і да канца якога яна ўрэшце прывяла. Калі ў дачыненьні жыдоў яны і паслугоўваліся сваёй собскай пасярэднасьцяй як адпускной граматай для іх зьбіцьця — зьбіцьцё такое ўжо тады мела ў сабе рысы ўнівэрсальнага забойства — дык з эканамічнага гледзішча яны ўсё ж былі яшчэ досыць абачлівымі, каб тым часам прамацваць рызыкі Трэцяга Райху перад абліччам перавагаў варожага атачэньня. Антысэмітызм яшчэ быў адным з канкуруючых матываў пры суб’ектыўным выбары. Рашэньне спэцыфічным чынам залежала ад яго. З прыняцьцём нацысцкай праграмы, ведама, быў заразом прыняты ўвесь шавіністычны слоўнік. Антысэміцкі настрой здаўна сьведчыў пра стэрэатыпнасьць мысьленьня. Сёньня толькі яна і засталася. Выбар усё яшчэ зьдзяйсьняецца, але адно паміж татальнымі сутнасьцямі. Месца антысэміцкай псыхалёгіі заступіла простае „так“ фашысцкай праграме, інвэнтару лёзунгаў ваяўнічай буйной індустрыі. Як і ў выбарчым сьпісе масавых партыяў, дзе партыйная машына навязвае выбарцу прозьвішчы, якія ня маюць нічога супольнага зь ягоным досьведам і якія ён можа выбіраць толькі *en bloc***, так і ключавыя ідэалягічныя моманты кадыфікуюцца ў нешматлікіх тэзах. Адну зь іх трэба абраць *en bloc*, інакш собскія пераканаьні самому чалавеку пададуцца такімі ж мізэрнымі, як і асобныя галасы ў дзень выбараў у параўнаньні з гіганцкімі статыстычнымі лічбамі. Антысэмітызм — гэта наўрад ці самастойнае парываньне, а хутчэй пункт пляцформы: той, хто дае фашызму хоць які шанец, разам з разьбіцьцём

прафсаюзаў і крыжовым паходам на бальшавізм аўтаматычна падпісваецца пад зьнішчэньнем жыдоў. Перакананьне антысэміта, якім бы ілжывым яно ні было, перайшло ў прадвызначаныя рэфлексы бессуб'ектных месцазаступнікаў ягонай дыспазыцыі. Калі масы акцэптуюць рэакцыйную праграму, якая ўтрымлівае пункт, накіраваны супраць жыдоў, яны падпарадкоўваюцца сацыяльным мэханізмам, у якіх досьвед індывідаў што да жыдоў ня грае жаднай ролі. Жыцьцё паказвае, што ў мясцовасьцях, дзе няма жыдоў, антысэмітызм мае ня менш шанцаў, чым нават у Галівудзе. Месца досьведу заступае клішэ, месца актыўнай фантазіі — мэтанакіраваная рэцэпцыя. Пад страхам хуткай гібелі прадстаўнікі кожнай праслойкі павінны засвоіць прызначаны ім урок арыентацыі. Яны мусяць арыентавацца як у сэнсе веданьня, як уладкаваны найнавейшы самалёт, так і ў сэнсе далучэньня да адной з зададзеных інстанцыяў улады.

** сьпісам (фр.)
<...>
Такім чынам, разам з індывідам ня зьніклі таксама і ягоныя псыхалягічныя дэтэрмінанты, што спрадвеку былі агентамі ілжывага грамадзтва сярод людзей. Але характэрныя тыпы знаходзяць цяпер у схеме зьдзяйсьненьня ўлады сваё дакладнае месца. Іхны каэфіцыент дзеяньня, як і каэфіцыент церця, улучаны ў разьлікі. Сама палітычная праграма становіць сабой зубчатае кола. Тое, што ў псыхалягічным мэханізьме спрадвеку было вымушаным, паднявольным і ірацыянальным, дасканала дапасавана да яго. Рэакцыйная праграма, якая зьмяшчае ў сабе антысэмітызм, адпавядае дэструкцыйна-канвэнцыйнаму сындрому. Разам яны сьпярша ня столькі рэагавалі супраць жыдоў, колькі вымалёўвалі кірунак для інстынкту, які адно дзеля праграмы атрымлівае адэкватны аб'ект перасьледу. Абумоўленыя досьведам „элемэнты антысэмітызму", згубіўшы сілу праз страту досьведу, сьведчаньнем якой ёсьць мысьленьне катэгорыямі праграмы, зноў мабілізуюцца праграмай. Будучы ўжо падарванымі, яны спараджаюць у нэа-антысэміту згрызоты сумленьня і тым самым — ненажэрнасьць ліха. Акурат таму, што саму псыхалёгію індывідуумаў і ейныя зьместы цяпер можна ствараць ужо толькі пры дапамозе напрацаваных грамадзтвам сынтэтычных схемаў, сучасны

антысэмітызм набывае сваю нікчэмную, непранікальную сутнасьць. Жыд-пасярэднік стаецца поўным увасабленьнем д'ябла толькі пасьля таго, як з эканамічнага гледзішча яго, уласна кажучы, ужо не існуе; гэта робіць трыюмф лёгкім, а антысэміцкага бацьку сямейства — пазбытым адказнасьці назіральнікам безупыннай гістарычнай тэндэнцыі, які бярэ чынны ўдзел толькі ў тым, што патрабуе ад яго ягоная роля партыйнага службоўца ці работніка фабрыкі па вытворчасьці цыклёнаў. Кіраўніцтва таталітарных дзяржаваў, якое выракае на вынішчэньне часткі народу, неадпаведныя духу часу, ёсьць толькі выканаўцам даўна прынятых эканамічных вэрдыктаў. Людзі, што належаць да іншых сфэраў падзелу працы, могуць сачыць падзеі з абыякавасьцю, якая не пакідае чалавека, што чытае газэтнае паведамленьне пра ўпарадкаваньне месца ўчорашняй катастрофы. Дый сама адметнасьць, дзеля якой забіваюць ахвяраў, ужо даўна сьцерлася. Людзей, што падпадаюць пад дэкрэт як жыды, даводзіцца да таго ж выяўляць з дапамогай мудрагелістых анкетаў, пасьля таго як пад нівэлюючым ціскам індустрыйна разьвітага грамадзтва варожыя рэлігіі, якія калісьці і ўтваралі адметнасьць, шляхам пасьпяховай асыміляцыі былі папросту перароблены ў набыткі культуры. Самі жыдоўскія масы ў такой жа малой меры здатныя вырвацца за межы мысьленьня, навязаныя праграмай, як і варожыя ім моладзевыя зьвязы. Фашыстоўскі антысэмітызм сьпярша мусіць нейкім чынам вынайсьці свой аб'ект. Параноя перасьлядуе свае мэты ўжо не на падставе індывідуальнай гісторыі хваробы перасьледніка; стаўшы грамадзкай рэаліяй, яна спачатку сама мусіць вызначыць яго ў заблытаным кантэксьце войнаў ды кан'юнктураў, перш як псыхалягічна схільныя да гэтага фольксгеносэн*** як пацыенты змогуць накінуцца на гэты аб'ект звонку і знутра.

*** Назоў чальцоў НСДАП у фашыстоўскай Нямеччыне. — *Зацем рэд*.

Тое, што паводле тэндэнцыяў антысэмітызм цяпер ёсьць толькі адным з пунктаў узаемазамяняльнай праграмы, бясспрэчна, дае надзею на ягоны канец. Жыдоў забіваюць у той час, калі кіраўнікі маглі б замяніць антысэміцкі пункт настолькі лёгка, наколькі лёгка перавесьці функцыянэраў з аднаго месца наскрозь рацыяналізаванай вытворчасьці ў другое. Базыс

разьвіцьця, якое прыводзіць да мысьленьня ў катэгорыях падобнай праграмы, і так ёсьць унівэрсальнай рэдукцыяй усякай спэцыфічнай энэргіі ў адну, аднолькавую, абстрактную форму працы паўсюль, ад поля бітвы да мастацкай студыі. Але пераход ад такіх варункаў да людзкага стану ня можа зьдзеяцца, таму што з дабром здараецца тое самае, што і зь ліхам. Свабода ў прагрэсіўнай палітычнай праграме ў такой жа ступені ўяўная для сілавых палітычных структураў, безь якіх ня могуць абысьціся прагрэсіўныя рашэньні, як і варажнеча да жыдоў — для хімічнага трэсту. Нягледзячы на тое, што першае прыцягвае людзей, псыхалягічна больш гуманных, усё большая страта досьведу ўрэшце ператварае таксама і прыхільнікаў прагрэсіўнай праграмы ў ворагаў усякай адметнасьці. Ня столькі антысэміцкая праграма ёсьць антысэміцкай, колькі ўвогуле мэнтальнасьць, прывязаная да праграмаў. Тая нянавісьць да адметнасьці, што тэлеалягічна свомая ёй, як сукрытая варожасьць апанаваных суб'ектаў апанаваньня прыроды да натуральнай меншыні заўсёды гатовая праявіцца таксама і там, дзе яны, выконваючы гэтую праграму, уяўляюць пагрозу для сацыяльнай меншыні. Сацыяльна адказную эліту і так нашмат цяжэй зафіксаваць, чымся іншыя мяншыні. У тумане дачыненьняў уласнасьці, маёмасьці, паўнамоцтваў і мэнэджмэнту яна пасьпяхова ўнікае тэарэтычнага вызначэньня. У ідэалёгіі расы і ў рэчаіснасьці клясы выяўляецца ня што іншае, як абстрактная адметнасьць ад бальшыні. Але калі нават прагрэсіўная праграма сягае па такія сродкі, якія разыходзяцца зь ейным зьместам, дык зьмест фашысцкай праграмы настолькі мізэрны, што ў якасьці субстытуту лепшага ён можа захоўвацца адно праз адчайнае намаганьне падманутых. Ягоная жахлівасьць — гэта жахлівасьць відавочнай і тым ня менш усё яшчэ трываючай маны. Тым часам як яна не дапускае праўды, зь якой можна было б яе параўнаць, ува ўсёй нязьмернасьці свайго абсурду перад намі ўзьнікае нэгатыўная праўда, разьвітацца зь якой тыя, хто пазбаўлены здольнасьці да меркаваньня, змогуць толькі дзякуючы поўнай страце мысьленьня. Сьведамае сваёй магутнасьці, Асьветніцтва, што стала ўладай, само робіць магчымым выхад за межы Асьветніцтва.

*Зь нямецкай мовы пераклаў Алесь Пяткевіч паводле*
Max Horkheimer, Theodor W.Adorno.

Dialektik der Aufklärung. Philisophische Fragmente.
Fischer Taschenbuch Verlag GmbH, Frankfurt am Main, 1996.

[image]
[image]

**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

---

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

## Аляксандар Фрыдман
## Лёс мірскай ешывы

---

**З** 1939 году ў мястэчку Мір няма ешывы[1].

[1] Ешыва (іўр. „сядзеньне“, „паседжаньне“) — вышэйшая рэлігійная навучальная ўстанова, прызначаная для вывучэньня Торы, Тальмуду, рабінскай літаратуры і астатніх складнікаў юдаізму.
У 1989 годзе рабін Тэадор Льюіс з Дубліну, адзін з апошніх студэнтаў гэтай ешывы (у 1935–1939 гадох), апублікаваў кнігу ўспамінаў „Bar Mitzvah Sermons at Touro Synagogue“.
Амэрыканская дасьледчыца Рыва Кімбл стварыла сайт (http://darkwing.uoregon.edu/~rkimble/Mirweb/Mir1.html), прысьвечаны гісторыі габрэяў Міра. Тут зьмешчаныя ўрыўкі з кнігі рабі Льюіса, а таксама ўспаміны іншага мірскага ешыботніка 30-х гадоў родам з Ірляндыі — рабі Егуды Бройда.
У жніўні 1939 году рабі Льюіс, ратуючыся ад блізкай вайны, вымушаны быў пакінуць Мір. Зваротны шлях быў доўгі і пакутны: праз Латвію, Эстонію, Фінляндыю, Швэцыю і Нарвэгію. Паўсюль сустракаліся былыя студэнты зь Міра. Адзін зь іх дапамог рабі Льюісу ў Рызе, а другі — у Стакгольме.
„У Міры я правёў найлепшыя гады свайго жыцьця“, — піша Льюіс.
Пры канцы XIX і ў першых дзесяцігодзьдзях XX стагодзьдзяў позіркі традыцыйнага габрэйства былі скіраваныя ў бок „літоўскіх“[2] ешываў.

[2] „Літоўскімі“ прынята называць ешывы, у якіх быў пакладзены

ў аснову выкладаньня мэтад найвялікшага тальмудыста рабі Эліяху Залмана бэн Шлома (Віленскага Гаона) (1720—97). Калі ў Заходняй Эўропе габрэйства ахапіла хваля асыміляцыі, на Ўсходзе кантынэнту працягвала панаваць традыцыя. Слынныя ешывы знаходзіліся ў Валожыне, Міры, Радуні, Слоніме, Клецку, Цельшах (сучасная Літва) і набылі вядомасьць у розных кутках габрэйскага сьвету. Эўрапейскія рабіны раілі сваім самым здольным вучням ехаць на вучобу ў літоўскія ешывы. Тэадору Льюісу шанцавала з настаўнікамі. Спачатку гэта быў галоўны рабін Ірляндыі рабі Герцаг, а потым рабі Абрамскі, у якога Льюіс навучаўся ў лёнданскай ешыве *Etz Chaim*. Рабіны палічылі, што Льюіс варты навучаньня ў літоўскай ешыве, а рабі Абрамскі параіў накіравацца ў Мір.

Мястэчка Мір не было на мапе Польшчы. Рабі Льюіс вырашыў навесьці даведкі ў польскага консула ў Дубліне. Консул упершыню чуў пра існаваньне такога населенага пункту. „Навошта вам ехаць у такую глухмень? — дзіваваўся ён. — Едзьце лепей у культурныя цэнтры — Варшаву, Кракаў, Львоў, там і жыць, і навучацца значна больш камфортна, там няма недахопу ў забавах і выгодах“. Пераконваць консула рабі Льюіс ня стаў, вырашыўшы, што зразумець усю прывабнасьць Міра прадстаўніку Польскай дзяржавы папросту недаступна. Вонкавы выгляд мястэчка Мір шакаваў замежных студэнтаў. Бездарожжа, каровы, што мірна гуляюць па ходніках, адсутнасьць электрычнасьці і выгодаў у дамох, праблемы з тэлефоннай сувязьзю, а побач — славуты замак Радзівілаў, які належаў тады Сьвятаполк-Мірскім.
Мястэчка мела багатую габрэйскую гісторыю. Магнаты Радзівілы запрасілі габрэяў у свой маёнтак Мір яшчэ на пачатку XVII ст. Ужо ў 1678 г. Бэрнгард Танэр у сваім „Апісаньні падарожжа польскага пасольства ў Маскву“ адзначаў, што ў мястэчку даволі шмат габрэяў. Габрэі Рэчы Паспалітай удзельнічалі ў славутых мірскіх кірмашох, што адбываліся двойчы на год. Тут яны разгарнулі актыўны гандаль футрам, коньмі, зернем, прысмакамі, тытунём, віном і г.д. Кірмаш абслугоўвалі фурманы-габрэі. У XVIII ст. габрэйскія купцы зь Міра вялі гандаль зь Ляйпцыгам, балтыйскімі портамі — Кёнігсбэргам, Мэмэлем, Лібавай.

У 1765 г. у Міры і навакольлі жыло 607 габрэяў-падаткаплатнікаў, у 1806 г. мястэчка налічвала 807 габрэйскіх жыхароў, сярод якіх было 30 купцоў і 106 краўцоў. У 1847 г. габрэйская грамада Міра складалася з 2273 асобаў. Расейскі перапіс 1897 г. засьведчыў: 5401 жыхар, сярод якіх 3319 — габрэі.
Рэзьнікі, рамізьнікі, краўцы, цесьляры — вось далёка ня поўны пералік прафэсіяў мірскага габрэйства. Найбагацейшыя вялі буйны гандаль лесам, зернем, коньмі.
Заступніцтва Радзівілаў дазволіла літоўскаму габрэйству ўжо ў XVIII ст. ператварыць Мір у адзін з сваіх духоўных цэнтраў.
У 1697, 1702 і 1751 гг. тут правёў свае сэсіі Літоўскі ваад („габрэйскі сойм“). У Міры жылі выбітныя габрэйскія духоўныя лідэры: галахіст[3] і прапаведнік рабі Мэір бэн Ісак Эйзэнштадт (каля 1670—1744), тальмудыст рабі Саламон Залман бэн Егуда Лейб Міркес (Міркіш) (XVIII ст.), які адзін час быў рабінам у Франкфурце-на-Одэры, рабі Іосіф Давід Айзэнштадт (1766—1826).

[3] Галаха — нарматыўная частка юдаізму, якая рэглямэнтуе рэлігійнае, сямейнае і грамадзянскае жыцьцё габрэяў; сукупнасьць законаў, што ўтрымліваюцца ў Торы і Тальмудзе, а таксама ў больш позьняй рабінскай літаратуры.
У 1815 годзе буйны купец і тальмудыст Самуіл Цікцінскі заснаваў ешыву, якой было наканавана ўславіцца ўва ўсім габрэйскім сьвеце.
Сапраўдная слава прыйшла да ешывы „Мір“ напачатку XX ст., калі яе ўзначаліў знакаміты тальмудыст рабі Эліэзэр Егуда Фінкель, які здолеў сабраць пад адным дахам найбуйнейшых габрэйскіх рэлігійных аўтарытэтаў свайго часу.

Канец XIX — пачатак XX стст. быў ня лепшым пэрыядам у гісторыі габрэяў Міра. Беспрасьветнае эканамічнае становішча, юдафобская палітыка ўладаў, боязь пагромаў вымушалі габрэяў пакідаць Радзіму і накіроўвацца ў пошуках лепшай долі ў ЗША, Эўропу альбо Эрэц-Ісраэль. Тыя, што заставаліся, арганізоўвалі аддзелы самаабароны, многія ўступалі ў шэрагі габрэйскіх сацыялістычных партыяў — Бунду альбо Паалей-Цыёну.
Пад час першай сусьветнай вайны мірская ешыва пераехала ў

Палтаву, адкуль вярнулася толькі ў 1921 годзе. Да гэтага часу габрэйскае насельніцтва мястэчка зьменшылася да 2074 чалавек. Эканамічнае становішча габрэяў заставалася вельмі цяжкім, але польскія ўлады не рабілі замахаў на асновы габрэйскага ладу жыцьця. Калі ў Савецкай Беларусі зачыняліся сынагогі ды ешывы, на Захадзе па-ранейшаму квітнела габрэйскае законавучэньне.

Рабі Льюіс адзначае, што габрэі жылі галоўным чынам у цэнтры Міра, а хрысьціянскае насельніцтва сялілася на ўскраінах. Большую частку габрэйскай грамады складалі беднякі. Бульба ды хлеб утваралі іх звычайны рацыён.

Цяжка пераацаніць ролю ешывы для эканомікі Міра. Ешыботнікі ўтваралі сабой асноўную кліентуру маленькіх крамак ды рамесьніцкіх лавак. Яны ўносілі разнастайнасьць ў млявае жыцьцё мястэчка.

Ешыва ня мела інтэрнату, таму студэнты жылі ў прыватных хатах, наймалі „баалабостэ“ (жонку ці ўдаву домаўладальніка), якая клапацілася пра іх. Рабі Льюіс жыў у перапісчыка Торы, а харчаваўся ў хаце ўдавы Эткі Міранкі, якая варыла есьці для сямёх маладых габрэяў з ЗША, Польшчы, Ірляндыі. Штотыдзень прыходзіла сялянка, забірала ў ешыботнікаў бруднае адзеньне, а празь некалькі дзён вяртала яго памытым.

Адсутнасьць выгодаў у доме бянтэжыла „аўсляндэраў“ — замежных студэнтаў. Так, ваду даводзілася набіраць з калодзежу ў цэнтры мястэчка. Некаторыя габрэі-беднякі зараблялі на жыцьцё тым, што насілі ваду пад дамы багатых супляменьнікаў.

Ешыва месьцілася ў вялізнай мураванцы ў цэнтры мястэчка. Будынак налічваў па шэсьць вокнаў з кожнага боку (студэнты вывучалі кнігі, напісаныя дробным шрыфтам, а таму патрабавалася добрае асьвятленьне). Ешыва была адзінай установай Міра, дзе выгоды знаходзіліся ў доме.

Рабі Тэадор Льюіс зьявіўся ў ешыве ўночы. Ешыботнікі ня спалі, чатыры сотні студэнтаў апантана вывучалі трактаты па габрэйскай этыцы.

Польскія ды літоўскія габрэі складалі большасьць ешыботнікаў. Каля чвэрці студэнтаў былі замежнікі: каля 40 амэрыканцаў, 30 выхадцаў зь Нямеччыны, 8 — з Англіі, 6 — з Аўстрыі, 4 — з Бэльгіі, па тры чалавекі з Францыі, Ірляндыі і Канады, 2 — з

Паўднёвай Афрыкі, па адным — з Швэцыі, Данііі. Меліся таксама выхадцы з Эрэц-Ісраэль, Галяндыі і Чэхаславаччыны. Узрост студэнтаў розьніўся: у сярэднім, ад 20 да 40 гадоў. Некаторыя замежнікі да прыезду ў Мір пасьпелі ўжо атрымаць ступені дактароў мэдыцыны альбо юрыспрудэнцыі ў эўрапейскіх унівэрсытэтах. Навучаючыся ў ешыве, яны ставілі перад сабой мэту атрымаць глыбейшае ўяўленьне пра габрэйскую рэлігію, мараль, тут ішло канчатковае фармаваньне іх як асобаў.
Навучальны дзень пачынаўся а палове на восьмую раніцы і працягваўся да паловы на дзясятую вечара. Ён уключаў у сябе: ранішнюю малітву, сьняданак, заняткі з выкладчыкам, дзённую малітву, адпачынак, калі студэнты звычайна выходзілі на паўгадзінны шпацыр, абед, працяг заняткаў і вечаровую малітву. За кнігамі студэнты праседжвалі цалюсенькія ночы. Электрычнасьць у мястэчку адключалі а першай ночы, а таму ахвотныя працягваць свае заняткі мусілі запальваць газьнічкі. Слава ешывы „Мір“ была плёнам дзейнасьці рэктара (рош-ешывы) рабі Эліэзэра Егуды Фінкеля і ягонага зяця рабі Хаіма Шмулевіца. Тальмудычныя пытаньні асьвятляў у сваіх штотыднёвых лекцыях рабін Міра рабі Аўраам Камаі. Духоўным лідэрам ешывы быў машгіах[4] рабі Ерухом Левовіц. Асабліва цанілася меркаваньне машгіаха ў пытаньні выбару нявесты.

[4] Машгіах — асоба, якая абавязана была сачыць за выкананьнем кашруту, правілаў харчаваньня, вызначаных традыцыяй.
Габрэйскія сьвяты ў мястэчку Мір мелі асаблівы калярыт: у месяц, які папярэднічаў Рош-ха-Шана (габрэйскаму Новаму году), у Мір зьяжджаліся былыя студэнты ешывы і слынныя рабіны Польшчы. У сьвята Сімхат-Тора ў ешыве зьбіраліся ўсе мясцовыя габрэі, каб паглядзець на студэнцкае сьвяткаваньне. Ешыботнікі ўтваралі два колы, у цэнтры якіх ставалі кіраўнікі ешывы, і танчылі ды сьпявалі на працягу некалькіх гадзінаў, да поўнай зьнямогі.

Тым часам Эўропа шпаркімі крокамі ішла да новай сусьветнай вайны. У 1938 годзе брытанскія студэнты атрымалі ліст з варшаўскага кансуляту, у якім ім раілі як мага хутчэй выехаць

з Польшчы. Ешыботнікі папярэджаньне праігнаравалі. Сапраўдны шквал тэлеграмаў абрынуўся на ешыву ў жніўні 1939 году. Бацькі патрабавалі ад дзяцей, каб тыя неадкладна вярталіся дадому. Брытанскі консул зноў накіраваў ліст з прапановай выехаць з краіны, якая стаяла на парозе гітлераўскага ўварваньня.
1 верасьня 1939 году пачалася другая сусьветная вайна.
17 верасьня Чырвоная Армія ўступіла на тэрыторыю Заходняй Беларусі. Кіраўніцтва ешывы выдатна разумела, чаго чакаць ад савецкіх уладаў. Часу на роздум не заставалася. Рабі Фінкель прыняў рашэньне — ешыва „Мір“ сарвалася зь месца і ўцякла ў пакуль незалежную Літву.
Габрэйскія ўцекачы з Польшчы асаджалі прадстаўніцтвы заходніх дзяржаваў у Коўні. Паўсюль яны чулі адмовы.
У Эўропе знайшлася толькі адна краіна, што працягнула руку дапамогі польскім габрэям — Галяндыя. Улады гэтай краіны дазволілі ўцекачам атабарыцца ў сваіх каляніяльных уладаньнях — Кюрасао і Галяндзкай Гвіяне (Сурынаме). Але да запаветных калёніяў яшчэ трэ было дапяць, а шлях пралягаў цераз тэрыторыі СССР і Японіі.
Савецкія ўлады далі згоду прапусьціць уцекачоў. Цяпер усё залежала ад японцаў. Натоўпы ўцекачоў штурмавалі японскі кансулят у Коўне. Консул Хіунэ Сугіхара, парушыўшы рашэньне свайго ўраду, вырашыў выдаваць візы.
Ад 31 ліпеня да 28 жніўня 1940 г. Сугіхара выдаваў да 300 візаў у дзень. Студэнт ешывы „Мір“ рабі Мошэ Зупнік, сабраўшы ўсе неабходныя дакумэнты, прыйшоў у кансулят. Прыйшоў, каб атрымаць візу для сябе, але здолеў дамагчыся яшчэ 300 візаў для ўсёй ешывы. Консул фізычна не пасьпяваў аформіць візы, і тады яму пачалі дапамагаць сам Зупнік і некалькі ягоных сяброў, якія скапіявалі запаветныя дакумэнты ўласнымі рукамі. Яны ня ведалі японскай мовы, і таму прозьвішча ўсіх ешыботнікаў аказалася аднолькавае — „Рабіновіч“.
Студэнты ешывы разам зь іншымі ўцекачамі дабраліся на цягніку да Масквы, а потым па Транссыбірскай магістралі да Ўладзівастоку. Японскія памежнікі прапусьцілі тры сотні Рабіновічаў у Кобэ, дзе ешыва жыла на працягу некалькіх месяцаў.
Потым студэнтаў пераправілі ў Шанхай, дзе яны перабывалі на

працягу ўсёй вайны. Іх перасьледавалі эпідэміі, бракавала прадуктаў, нямецкія нацысты патрабавалі ад японцаў зьнішчыць габрэяў (меркавалася пад маркай амэрыканскіх бамбардзіровак абвясьціць габрэям, што іх перавозяць на бясьпечную выспу, а па дарозе ўсіх патапіць). Габрэі даведаліся пра гэта і здолелі адкупіцца. Ешыботнікі наагул не паддаваліся роспачы. Іхнымі намаганьнямі ў Шанхаі ўпершыню была надрукаваная габрэйская літаратура.

9 лістапада 1941 году нацысты расстралялі 1500 габрэяў Міра, а 850 заключылі ў гета, пераведзенае ў траўні 1942 году на тэрыторыю Мірскага замку. 80 габрэяў там утварылі падпольле мірскага гета. 13 жніўня 1942 году гета было зьнішчана. Сярод тых, хто загінуў, былі былыя ешыботнікі і рабін Міра Аўраам Камаі. За некалькі дзён да гэтага некалькі соцень габрэйскіх юнакоў і дзяўчат здолелі ўцячы, але да ліпеня 1944 году, калі ў Мір увайшлі савецкія войскі, зь іх жывымі засталіся толькі каля сарака чалавек.

У 1985 годзе Хіунэ Сугіхара быў прызнаны „праведнікам сярод народаў сьвету“. Нашчадкі ўратаваных дзякуючы візам Сугіхары налічваюць сёньня больш як 40000 чалавек.

Мірская ешыва ў 1947 годзе разлучылася. Адна частка студэнтаў на чале з рабі Фінкелем накіравалася ў Эрэц-Ісраэль, а другая — у Нью-Ёрк. Цяпер сотні студэнтаў вывучаюць Тору і Тальмуд у ешывах „Мір“ у Ерусаліме і Брукліне. У беларускім мястэчку Міры габрэяў больш няма.



Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**

**Анатоль Вялікі**

# Разгром габрэйскай намэнклятуры

**„Габрэйскае пытаньне“ ў Беларусі ў 40—50-я гады**

---

Праблема нацыянальных дачыненьняў у савецкі пэрыяд зводзілася кіраўнічым рэжымам да двух ідэалягічных клішэ — „росквіт ды збліжэньне нацыяў“, а таксама „нацыянальная формаю і сацыялістычная зьместам“. Аднак гэтыя прапагандысцкія клішэ не адлюстроўвалі сутнасьці этнакультурных працэсаў і па вялікім рахунку не выконвалі нават прапагандысцкіх функцыяў. У прыватнасьці гэта датычыцца так званага „габрэйскага пытаньня“ ў былой Савецкай Беларусі.

Вырашэньне „габрэйскага пытаньня“ ў БССР пачалося адразу ж пасьля 1944 году з асновы асноваў таталітарнай сыстэмы — партыйна-савецкай намэнклятуры, „новай клясы“, паводле вядомага вызначэньня Мілавана Джыласа. У першае пасьляваеннае дзесяцігодзьдзе адбылася „ціхая намэнклятурная зачыстка“ сфармаванай за перадваенны пэрыяд беларускай габрэйскай „новай клясы“. Тое, што гэта была ўжо сфармаваная „новая кляса“, не выклікае сумневу, дастаткова прааналізаваць склад партыйных органаў, пачынаючы з гаркамаў і райкамаў партыі і заканчваючы ЦК КП(б)Б.

Склад першых-трэціх сакратароў РК і ГК КП(б)Б на пачатак 1939 г. па нацыянальным складзе выглядаў наступным чынам: з 96 першых сакратароў 59 былі беларусамі, 15 — габрэямі, 20

— расейцамі; з 96 другіх сакратароў 69 былі беларусамі, 19 — габрэямі, 7 — расейцамі; з 92 трэціх сакратароў 68 былі беларусамі, 13 — габрэямі, 9 — расейцамі. У цэлым, з усяго сакратарскага корпусу 196 сакратароў былі беларусамі, 47 — габрэямі, 36 — расейцамі. Як бачна, габрэі сярод сакратароў райкамаў і гаркамаў партыі займалі другое месца, выперадзіўшы нават расейцаў. У працэнтных паказчыках гэтыя лічбы выглядалі наступным чынам: чальцамі ГК і РК КП(б)Б было абрана 284 сакратары, зь іх беларусаў — 196, або 69%, расейцаў — 36, або 12%, габрэяў — 47, або 16,5%, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасьцяў — 5, або 1,7%. Даволі значным было прадстаўніцтва габрэяў і ў апараце ЦК КП(б)Б (зьвесткі на чэрвень 1941 г.). Памочнікам першага сакратара ЦК КП(б)Б быў габрэй, сакратаром прыёмнай першага сакратара таксама быў габрэй. У „асобым сэктары“ ЦК партыі з 26 супрацоўнікаў 14 былі габрэямі, 8 беларусамі. У адным зь вядучых аддзелаў ЦК — аддзеле кіраўнічых партыйных органаў — з 27 супрацоўнікаў 11 былі габрэямі, 12 — беларусамі, у прамыслова-транспартным аддзеле з 6 супрацоўнікаў 4 былі габрэямі, 2 — беларусамі і г.д.

У Віцебскім гаркаме партыі на пэрсанальным уліку ЦК КП(б)Б налічвалася 68 адказных работнікаў, зь іх 32 габрэі, 16 беларусаў, 9 расейцаў, астатнія — прадстаўнікі іншых нацыянальнасьцяў. З 32 габрэяў 6 працавалі дырэктарамі заводаў, 5 — адказнымі работнікамі гаркаму партыі (сакратары, інструктары, загадчыкі аддзелаў), адзін — дырэктарам Віцебскага мэдычнага інстытуту, адзін — дырэктарам мэдычнага тэхнікуму, адзін — дырэктарам каапэратыўнага тэхнікуму.
Ня менш пераканаўчая „габрэйская прысутнасьць“ адчувалася і ў Магілёве. На ўжо прыгаданым пэрсанальным уліку ЦК налічвалася 56 адказных работнікаў. Зь іх 25 габрэяў, 16 беларусаў, 4 расейцы, астатнія — прадстаўнікі іншых нацыянальнасьцяў. З 25 габрэяў, прадстаўнікоў „новай клясы“, сакратарамі партыйных камітэтаў найбуйнейшых прадпрыемстваў Магілёва працавалі 4 чалавекі, дырэктарамі заводаў — 7, сярод іх былі таксама загадчык гарадзкога аддзелу аховы здароўя, начальнік РА НКУС і г.д.
Не адставаў па гэтых паказчыках і Гомель. З 75 прадстаўнікоў

„новай клясы“ 33 былі габрэямі, 16 — беларусамі, 15 — расейцамі. Габрэйскую „новую клясу“ рэпрэзэнтавалі 4 сакратары партыйных арганізацыяў прадпрыемстваў (з 12 ува ўсім Гомелі), дырэктары аўтамэханічнага тэхнікуму і музычнай вучэльні, рэдактар абласной газэты „Палеская праўда“, загадчык гарадзкога аддзелу аховы здароўя, 8 дырэктараў найбуйнейшых прамысловых прадпрыемстваў — такіх, як фабрыка „Камінтэрн“, шклозавод імя Сталіна, хлебакамбінат, мясакамбінат і г.д.
Пра тое, што гэта была не эпізадычная, а сталая прысутнасьць, сьведчыць таксама выказваньне першага сакратара ЦК КП(б)Б В.Шаранговіча на Менскай гарадзкой партканфэрэнцыі ў 1937 г. Ведучы гаворку пра кадры партыйных работнікаў, ён сказаў наступнае. „Мне далі даведку аб складзе сакратароў ГК і РК КП(б)Б. Усяго першых сакратароў 88, другіх — 40. Зь іх беларусаў — 38 першых сакратароў, другіх сакратароў — 19. Габрэяў — 30 першых сакратароў, другіх сакратароў — 12. Расейцаў — 10 першых сакратароў, другіх — 6. Па Менску ўсяго сакратароў парткамаў — паводле стану на 1 студзеня 1937 г. — 341 чалавек. Зь іх беларусаў — 125, габрэяў — 153, расейцаў — 37, палякаў — 5, іншых нацыянальнасьцяў — 22. Якая тут насоўваецца выснова — і па Беларусі ў цэлым, і, асабліва, тав. Рыскін (А.Рыскін у 1937 г. быў першым сакратаром Менскага ГК КП(б) Б. — *Заўвага аўт.*) і тав. Хадасевіч, па Менску — цалкам нездавальняючае выхаваньне і вылучэньне мясцовых нацыянальных кадраў, у першую чаргу — беларускіх камуністаў, і гэта сур’ёзная загана“.
Улічваючы пададзеныя вышэй факты, можна сьцьвярджаць, што перад вайной габрэйская „новая кляса“ складала неад’емную частку палітычнай, гаспадарчай, навуковай, культурнай эліты камуністычнай Беларусі. У вайне габрэі-намэнклятурнікі пацярпелі, як і ўвесь народ Беларусі. Дастаткова сказаць, што сярод 140 партыйных работнікаў раённага ўзроўню, што загінулі ў гады вайны, ёсьць імёны 15 габрэяў.

Пачатак 1945 году не абяцаў ім нічога кепскага. Рэспубліка пераходзіла да мірнага жыцьця. Габрэі, што ўваходзілі ў „новую клясу“, занялі ў аднаўлянай сыстэме тое ж месца, якое яны займалі да вайны.
У Менскай вобласьці з 97 адказных партыйных работнікаў у

першым паўгодзьдзі 1945 г. 19 габрэяў працавалі першымі-трэцімі сакратарамі райкамаў і гаркамаў партыі. У Віцебскай вобласьці з 108 работнікаў самага высокага рангу 19 былі габрэямі. У Гомельскай вобласьці з 70 адказных партработнікаў 13 былі габрэямі, у Магілёўскай з 97 — 19.
Даволі значным было прадстаўніцтва габрэяў-партыйцаў і сярод работнікаў абласнога ўзроўню. Напрыклад, у Палескай вобласьці Шэрман Н.З. узначальваў прамысловы аддзел абкаму, Рубінчык К.М. быў намесьнікам загадчыка сельскагаспадарчага аддзелу, Качароўскі А.Е. — загадчыкам ваеннага аддзелу гэтага ж абкаму партыі. У Віцебскай вобласьці Гінзбург Я.Б. працаваў сакратаром АК па прапагандзе, Шапіра Х.З. — загадчыкам прамысловага аддзелу абкаму. У Гомельскім АК КП(б)Б Рыўкіна Х.Л. была намесьнікам загадчыка аддзелу прапаганды, Клябанаў С.І. — загадчыкам ваеннага аддзелу АК КП(б)Б.
Сытуацыя карэнным чынам зьмянілася ў канцы 1946 — пачатку 1947 г., калі прайшлі выбары партыйных органаў усіх узроўняў. Так, па іх выніках у 1946—1947 гг. сярод першых сакратароў ГК і РК апынуліся ўсяго два габрэі-намэнклятурнікі, альбо 1,1%, сярод другіх сакратароў — 8, альбо 4,2%. Далей — балей. Па выніках выбараў у раённыя і гарадзкія партыйныя арганізацыі 1955 г. сярод сакратароў не было ніводнага габрэя. Больш габрэяў на вышэйшыя кіраўнічыя пасады не дапускалі. У сутнасьці, выбары партыйных органаў 1955 г. паставілі канчатковую кропку ў дачыненьні габрэйскай „новай клясы“. Шматгадовая, пачынаючы ад 1917 г., актыўная габрэйская прысутнасьць у грамадзка-палітычным жыцьці рэспублікі была зьліквідаваная.
Як жа гэта адбылося? Па-першае, пасьля вайны з ініцыятывы І.Сталіна распачалася барацьба з так званымі „бязроднымі касмапалітамі“, а прасьцей — з габрэямі. Джала гэтай барацьбы было скіравана ня толькі супраць творчай інтэлігенцыі, але і супраць габрэяў-намэнклятурнікаў.
Па-другое, у Беларусі пасьля 1944 г. вылучылася група работнікаў-беларусаў, якія пад час вайны бралі актыўны ўдзел у баёвых дзеяньнях у складзе савецкай партызанкі. Гэтыя былыя камандзіры ды камісары партызанскіх аддзелаў лічылі, што, атрымаўшы вядомасьць і папулярнасьць у рэспубліцы, яны могуць і павінны вызначаць пасьляваенны лёс БССР. І кампанія

барацьбы зь „бязроднымі касмапалітамі“, якая разгарнулася так дарэчы, толькі дапамагла ім умацавацца ўва ўладных структурах усіх узроўняў. „Партызанскі клан“ адчуў смак улады пад час вайны і не жадаў разьвітвацца з гэтаю ўладай па вайне. Дастаткова нагадаць імёны тых, хто прыйшоў. В.Лабанок: ад жніўня 1941 г. да чэрвеня 1944 г. — першы сакратар Лепельскага падпольнага райкаму партыі, з чэрвеня 1944 г. — камандзір Лепельскай партызанскай брыгады, з 1944 г. — у апараце ЦК КП(б)Б, старшыня Полацкага, Гомельскага аблвыканкамаў, першы сакратар Віцебскага, Палескага абкамаў партыі, з 1962 г. — першы намесьнік старшыні, а з 1974 г. — намесьнік старшыні прэзыдыюму ВС БССР; І.Клімаў: ад траўня 1943 г. да чэрвеня 1944 г. — першы сакратар Вялейскага падпольнага абкаму партыі, у 1944—53 гг. — першы сакратар Вялейскага, Маладэчанскага, Баранавіцкага абкамаў, з 1953 г. першы намесьнік, а з 1962 г. — намесьнік старшыні СМ БССР; В.Казлоў: зь ліпеня 1941 г. — сакратар Менскага падпольнага абкаму, з сакавіка 1943 г. — камандзір Менскага партызанскага злучэньня, у 1948—67 гг. — першы сакратар Менскага абкаму і гаркаму. Калі дадаць сюды ж і П.Машэрава, відаць, што „партызаны“ займалі ўсе вышэйшыя пасады ў рэспубліцы аж да канца 70-х гадоў.
Па-трэцяе, пасьля вайны ўва ўладныя структуры ўсіх узроўняў, у адрозьненьне ад даваеннага пэрыяду, улілася значная частка расейцаў, якія занялі досыць высокія пасады ў партыйным і дзяржаўным апараце. У 1946 г. сярод сакратароў гаркамаў і райкамаў партыі расейцаў было 26,4%. Узгадаем, што ў 1940 г. габрэі ў гэтай катэгорыі намэнклятурных работнікаў складалі 16,5%, у той час як расейцы толькі 12%.
Гэтыя тры прычыны і вызначылі палітычны лёс ня толькі габрэйскай „новай клясы“, фактычна зьнішчыўшы яе, але і сфармавалі стратэгію і тактыку беларуска-расейскай „новай клясы“ ўзглядам габрэяў.

Канец 40-х і пачатак 50-х характарызуюцца ўзмацненьнем ціску на габрэяў ува ўсіх сфэрах. 1947 г. характэрны тым, што ў сярэдзіне гэтага году ўпершыню за пасьляваенны пэрыяд была „выкрытая і зьліквідаваная „антысавецкая група габрэяў-нацыяналістаў“ у сыстэме Галоўнага аптэкаўпраўленьня БССР. Аднак асноўны ўдар па беларускіх габрэях прыйшоўся на

пачатак 50-х гадоў. Перадусім ён выявіўся ў шэрагу сфальшаваных справаў аб так званых „габрэйскіх буржуазных нацыяналістах“. Ініцыятарам гэтых справаў выступіў ЦК КПБ, які ў пачатку 1951 г. накіраваў усім сакратаром абкамаў партыі Беларусі пад грыфам „абсалютна сакрэтна“ тэлефанаграму пра ўзмацненьне барацьбы з праявамі буржуазнага нацыяналізму, маючы на ўвазе перш за ўсё габрэйскі буржуазны нацыяналізм. Цікавая езуіцкая фармулёўка: „Цэнтральны камітэт КП(б)Б даў усім сакратаром абкамаў вуснае распараджэньне аб неабходнасьці ўзмацніць увагу партыйных арганізацыяў да пытаньняў барацьбы супраць буржуазнага нацыяналізму, *супраць парушэньняў бальшавіцкіх прынцыпаў работы з кадрамі* (курсіў наш. — *Заўвага аўт.*)“.

Вынік зьявіўся імгненна ў выглядзе шэрагу сфальшаваных справаў аб „праявах габрэйскага буржуазнага нацыяналізму“. Адной з найважнейшых была справа работнікаў прамысловай каапэрацыі, якая ўзьнікла яшчэ ў жніўні 1950 г. Сутнасьць справы была ў тым, што старшыня Белкаапсаюзу Марголін нібыта „згуртаваў вакол сябе групу буржуазных габрэйскіх нацыяналістаў“. У студзені 1952 г. Марголін і зьвязаныя зь ім 7 „буржуазна-габрэйскіх нацыяналістаў“ былі асуджаныя ваенным трыбуналам войскаў МДБ Беларускай ваеннай акругі за „актыўную буржуазна-нацыяналістычную дзейнасьць і раскраданьне сацыялістычнай уласнасьці“ на розныя тэрміны турэмнага зьняволеньня.

У студзені таго ж 1952 г. Бюро ЦК канстатавала, што ў Барысаве „ўзьнікла і пралезла на кіраўнічыя пасады ў партыйным, савецкім кіраўніцтве група габрэйскіх буржуазных нацыяналістаў, якія займаліся нацыяналістычнай дзейнасьцю, раскраданьнем сацыялістычнай уласнасьці“.

Апошні штрых у „барацьбе зь бязроднымі касмапалітамі“ — гэта, безумоўна, вядомая на ўвесь сьвет „справа дактароў“. У Маскве гукнулі, у Менску адгукнулася. Ды так адгукнулася, што прымусіла ўсіх беларускіх габрэяў ад студзеня да пачатку сакавіка 1953 году замерці ў трывожным чаканьні. Паведамленьне ТАСС пра арышт групы дактароў прагучала 13 студзеня 1953 г., а ўжо 14 студзеня 1953 г. у Гомелі (г.зн. на другі дзень пасьля паведамленьня ТАСС) было праведзена 350 мітынгаў, сходаў, на якіх прысутнічала больш як 40 тыс. чалавек, выступіла звыш 800 рабочых, якія „гнеўна кляймілі

дактароў-забойцаў“. У сталіцы наогул дзейнічалі на апярэджаньне. Абмеркаваньне паведамленьня ТАСС на мотавелазаводзе, іншых найбуйнейшых прадпрыемствах Менску праходзіла ўночы з 13 на 14 студзеня, інакш кажучы, папросту трэцяй зьменай рабочых пагналі на мітынгі ды сходы. Неабходна аддаць належнае ўменьню ды прафэсіяналізму партыйных рэжысэраў гэтага палітычнага драматычнага спэктаклю, якія ўмела перавялі палітычныя жарсьці ад далёкіх маскоўскіх дактароў да іх беларускіх калегаў па спэцыяльнасьці ды нацыянальнасьці. Заявы тыпу „я не пайду лячыцца ў паліклініку, бо там працуюць адныя габрэі“ былі яшчэ найменш зьняважлівымі ў тым патоку абразаў ды лаянкі, што была скіраваная зусім ня толькі супраць носьбітаў пэўнай прафэсіі. Часьцей сустракаліся такія вызначэньні, як „габрэі — гэта гады, гэта подлыя здраднікі, ім ня можа быць месца на нашай зямлі, частку іх трэба зьнішчыць, а астатніх — выслаць на Поўнач“; „уся габрэйская нацыя ня вартая аднаго сьветлага жыцьця таварыша Жданава“ і г.д.

Неабходна адзначыць яшчэ адну асаблівасьць гэтай драматычнай дзеі, што расьцягнулася на доўгія два месяцы. Партыйныя чыноўнікі ўсіх узроўняў арганізоўвалі мітынгі ды сходы, галоўным чынам, сярод найменш адукаванай часткі насельніцтва, апэлюючы пераважна не да розуму, а да пачуцьцяў натоўпу. Менавіта сярод найменш адукаванай часткі насельніцтва гучалі найбольш радыкальныя заклікі да вырашэньня габрэйскага пытаньня.
Калі падсумаваць патрабаваньні, якія высоўвала на мітынгах старанна маніпуляваная рабочая кляса, вылучаюцца наступныя: выселіць габрэяў у раёны Сібіру і Далёкага Ўсходу; забараніць габрэям атрымліваць вышэйшую адукацыю; забараніць габрэям камандаваць славянамі; прымусіць габрэяў займацца цяжкай фізычнай працай на заводах, фабрыках, у калгасах; стварыць для іх асобную рэспубліку; усіх габрэяў адлучыць ад кіраўнічай работы, асабліва ў харчовай прамысловасьці, мэдычных установах. Верагодна, менавіта такія пляны і будаваліся вышэйшым савецкім кіраўніцтвам.
У „Інфармацыі аб водгуках працоўных на паведамленьне ТАСС пра арышт групы „дактароў-шкоднікаў“, накіраванай аддзелам кіраўнічых партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх органаў

ЦК на ймя першага сакратара ЦК КПБ М.Патолічава на першай старонцы паведамляецца: „Ёсьць маса заяваў у форме **просьбаў і патрабаваньняў** аб высылцы габрэяў у якое-небудзь адно месца, як гэта было зроблена ў свой час з крымскімі татарамі і немцамі Паволжа“.
А што ж габрэі? Безь перабольшаньня, іх настрой і паводзіны вылучаліся прыгнечанасьцю, перапудам, чаканьнем. Пра тое, якім быў настрой габрэйскага насельніцтва, красамоўна сьведчыць прызнаньне піянэрважатай адной са школаў Магілёва, якая, прыйшоўшы ў школу, паскардзілася дырэктару, што яна баіцца хадзіць на працу, бо мае адчуваньне, што яе вось-вось паб'юць. Сакратар Гомельскага АК КПБ Паўлаў паведамляў у ЦК КПБ, што ў выніку распачатай кампаніі ў Жлобіне мелі месца хуліганскія выпады ў дачыненьні да „асобаў габрэйскай нацыянальнасьці“.
Так, 14 студзеня 1953 г. рабочы вагоннага дэпо зь сябрамі прыйшлі на кватэру рабочага-габрэя, абражалі яго, а потым жорстка зьбілі. На вакзале г.Жлобіна двое мясцовых жыхароў бяз дай прычыны зьбілі двух габрэяў і зьніклі.
Але, хутка пачаўшыся, прапагандысцкая кампанія гэтак жа хутка і скончылася. І.Сталін памёр, а новыя лідэры камуністаў разьлічвалі аслабіць „клясавую барацьбу“. Тым ня менш, беларуска-расейская „новая кляса“, што прыйшла да ўлады ў рэспубліцы пасьля вайны, не хацела й не зьбіралася зьмяняць тую стратэгію паводзінаў узглядам габрэяў Беларусі, якая была выпрацавана за пасьляваеннае дзесяцігодзьдзе. Такой, дыскрымінацыйнай ды імпліцытна-ксэнафобскай, яна і заставалася аж да забароны структураў КПСС-КПБ у жніўні 1991 году.



Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine

**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

[image]
[image]
[image]
**ХХ стагоддзе**
[image]

**Анеля Катковіч**

# Разьвітаньне з Будславам

Успамінамі **Анелі Катковіч** мы аднаўляем мэмуарную рубрыку нашага часопіса. Анеля Катковіч (1915, Браслаў — 1982, Уроцлаў) — адна з тысячаў „шараговых жаўнераў беларушчыны“. Паводле некаторых зьвестак, працавала сакратаром Беларускае Цэнтральнае Рады, пра што, аднак, ва ўспамінах згадкі няма.

[**Будслаў**
*„Пайду ў беларускую гімназію“. — Мае бацькі. — Мы засталіся сіротамі*]*

**Ч**аста задавала нам пытаньне настаўніца ў польскай пачатковай школе: што вы будзеце рабіць пасьля заканчэньня школы? Розныя былі адказы. Адна толькі я казала, што пайду вучыцца далей у беларускую гімназію. Чаму я так адказвала, сама ня ведаю. Бацькі былі незаможныя, і не па сіле было ім паслаць мяне ў гімназію. Ніколі на гэтую тэму не было дома гутаркі. Я толькі чула, што дзесь у Вільні ёсьць такая гімназія. У адказ на мае словы настаўніца ня раіла ісьці ў беларускую гімназію, казала, што пасьля заканчэньня такой гімназіі не дастану нідзе работы, што гэта будзе змарнаваны час. А я ўпарта паўтарала:
— Аднак, міма ўсяго, пайду я ў *гэтую* гімназію.
Мама (яна гадавалася разам з Паўлінай Мядзёлкаю — дачкой мамінага старэйшага брата[1]) часта расказвала нам пра Паўлінку як пра вялікую беларускую патрыётку. Жылі мы на Зосінскай (?) вуліцы ў мястэчку Будславе. Мястэчка гэтае выдала шмат сьведамых беларусоў. Пасьля першай сусьветнай вайны была ў нашым мястэчку нават беларуская гімназія, заложаная кс. Фр. Будзькам — нашым сваяком. Існавала яна толькі тры гады. У ёй вучыўся й сп. Вінцук Грышкевіч[2]. Я была тады малая й тае гімназіі амаль ня помню.

[1] Стрыечная сястра аўтаркі (*тут і далей заўвагі публікатараў*).

Пасьля савецкіх турмаў і тысячы пакутаў у беларусаў, бацькаўшчыну й ажаніўшыся, нядоўга затрымаўся ў Вялейскай пасьля пераж ыў рэвалюцыю. Палон і вайна зруйнавалі сэрца. У 1929 годзе, у страшных муках, адышоў ад нас назаўсёды, пакідаючы пяцёра малых дзяцей і 37-гадовую жонку. Тата памёр на першы дзень Вялікадня, калі ўзнаўляюцца будслаўскія касьцельныя званы на рэзурэкцыю[3]. Чатыры тыдні, тры месяцы пасьля сьмерці таты, памёрла й наша любая, добрая, як ангел, мама, якая дагэтуль ніколі не хварэла. Цэлы месяц мучылася ў Вялейскім шпіталі на Пагорыні, выйшаўшы босая ў гарод, зьбіла нагу й дастала ўражаньня крыві. Цэлы месяц мучылася ў Вялейскім шпіталі на Пагорыні, і нарэшце ў 1977 г. цягам 3 тыдняў ад сэпсісу ў крыві. Ня будзе апісваць, якім вялікім ударам для нас усіх была сьмерць нашай мамы.

[3] Рэзурэкцыя (лац. *ressurectio* уваскрэшаньне) — назва царкоўнай службы.

У часе хваробы мамы я была гаспадыняй дома: даіла карову, варыла стравы, усіх абмывала й наводзіла парадак у хаце. Засталося нас пяцёра малых сіротаў. Я мела тады 14 гадоў, а наймалодшы брат Франак — 3. Заапекаваліся намі дзядзькі й цёткі. Рассыпалася наша сямейка. Амаль штодня ў нас трапіў у іншае месца. У Будславе застаўся толькі Франак. Ім заапекаваўся татаў брат — дзядзька Адольф. Да яго перайшла нашая зямля й хата. Вэра <Вэраніка>** паехала да цёткі ў Глыбокае, а Гэльця да дзядзькі ў Шаркаўшчыну.

* Назвы разьдзелаў, апроч ня ўзятых у прастакутныя дужкі, уведзеныя публікатарамі.

** У ламаных дужках падаецца значэньне „цяжкіх“ словаў.

Пачаў друкавацца ў часопісах „Беларуская думка“ (Сан-Рыверс, 1994. №3В), „Полацак“ (Мюнхэн, 1994. №№2—4). Рукапіс захоўваецца ў Беларускай Бібліятэцы й Музэі імя Ф.Скарыны ў Лёндане. Гэтая публікацыя сталася магчымай

дзякуючы
а.А.Надсону і
Л.Юрэвічу.

[**У Вільні**
*Гімназія. — Унівэрсытэт. — Студэнцкі Саюз*]
Наш далёкі крэўны сп. Эдвард Будзька[4] забраў мяне з братам Пётрусем у Вільню й улякаваў <зьмясьціў, уладкаваў> у беларускай гімназіі. Паступілі мы ў чацьвертую клясу. Пётрусь пасьля году [навучаньня] пакінуў гімназію й вярнуўся ў Будслаў. Я асталася і ў 1934 годзе закончыла гімназію. Паўстала пытаньне, што рабіць далей. Аб працы зь беларускай матурай <дыплёмам> ня можна было й марыць. Сп. Будзька раіў паступіць на ўнівэрсытэт. Будучы студэнткай, магла я зарабляць лекцыямі[5], дастаць у акадэміцкай <інтэрнацкай> сталоўцы ільготныя абеды, а маючы посьпех у навуцы, атрымаць і стыпэндыю. І так я адважылася паступіць на ўнівэрсытэт.

[4] Эдвард Будзька — знаны заходнебеларускі, а пазьней эміграцыйны дзеяч.
[5] Зарабляць лекцыямі — дарэктарстваваць, зарабляць рэпэтытарствам.
Прыехала ў Вільню пасьля летніх канікулаў з двума злотымі ў кішэні, дый тыя згубіла. Затрымалася на кватэры ў далёкага крэўнага нашага — Уладзі Катковіча. Запісалася на ўнівэрсытэт, на гуманістычны факультэт. Пачала хадзіць на выклады й разглядацца за лекцыямі. Абедала пераважна ў сваіх сябровак па гімназіі, якія, ведаючы пра маё цяжкое матэрыяльнае становішча, па чарзе запрашалі да сябе (найбольш дапамагала мне ў тым часе Рая Падабед). А тут у дэканаце вывесілі сьпісок студэнтаў, якія не заплацілі за вучобу, і [калі] ў тэрміне не ўнясуць аплаты, іх зь ліку студэнтаў выкрасьляць. Як убачыла я гэты сьпісок, агарнула мяне роспач. Што рабіць з сабою, як жыць далей, куды дзецца? І тады, як зь неба, прыйшлі да мяне грошы. Прыслаў іх сп. Язэп Гапановіч — прыяцель нашых бацькоў, які жыў і працаваў у Варшаве. Атрымала я 300 зл. — столькі, колькі трэба заплаціць за год вучобы на ўнівэрсытэце. Аджыла я. Хутка пасьля гэтага атрымала лекцыі й, хоць не ў дастатку, пачала весьці

студэнцкае жыцьцё.
Запісалася адразу ў Беларускі Студэнцкі Саюз — кожны вечар хадзіла туды, на Завальную[6]. Найлепшымі маімі прыяцелькамі на ўнівэрсытэце сталіся Іра й Люня — дочкі сп.Будзькі. Тварылі мы неразлучную тройку. Амаль кожную нядзелю праводзілі разам, штодня бачыліся ў памешканьні Беларускага Студэнцкага Саюзу, дзе спатыкаліся зь Ленай Аніськай, Валяй і Раяй Жукоўскімі[7] ды іншымі сябрамі — Пануцэвічам[8], Тумашам[9], Стаповічам[10], Войтанкам[11], Шчорсам[12], Смаршчком[13], Грышкевічам. Пачала сьпяваць у хары Шырмы й танцаваць у студэнцкім ансамблі. Памятныя былі нашыя канцэрты ўва ўнівэрсытэцкай залі, на іх ня раз выступаў і Забэйда-Суміцкі. У [Студэнцкім] Саюзе не прапусьціла я аніводнага дакладу, безь мяне не адбылася аніводная імпрэза.

[6] Цяпер вуліца *Pylimo*.
[7] Раіса Жук-Грышкевіч — будучая жонка Вінцэнта Жук-Грышкевіча.
[8] Вацлаў Пануцэвіч — на той час — навучэнец Віленскае Духоўнае Сэмінарыі, пазьней, на эміграцыі, гісторык, каталіцкі дзяяч, выдавец розных пэрыядычных выданьняў, у т.л. часопіса „Беларуская Царква“ (Чыкага).
[9] Вітаўт Тумаш — на той час — студэнт-мэдык, адзін з заснавальнікаў Беларускага Студэнцкага Саюзу, за нямецкай акупацыяй — кіраўнік цывільнай адміністрацыі Менску, на эміграцыі — адзін зь лідэраў БНРаўскай плыні, шматгадовы дырэктар Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва (Нью-Ёрк).
[10] Верагодна, тут вядзецца пра аднаго з братоў кс. Кастуся Стаповіча (паэтычны псэўданім — Казімір Сваяк) — Альбіна ці Бэрнарда.
[11] Віктар Войтанка — на той час — студэнт мэдыцыны, у часе ІІ сусьветнай вайны — бурмістр Баранавічаў, адзін з ініцыятараў аднаўленьня Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў 1942 і 1948 гг., на эміграцыі высьвяціўся на сьвятара.
[12] Відаць, Мікалай Шчорс — на той час — студэнт мэдыцыны, перад нямецка-савецкай вайной — старшыня Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Варшаве, у часе вайны — адзін з кіраўнікоў Беларускай Цэнтральнай Рады, на эміграцыі — „другая асоба“ пасьля Радаслава Астроўскага ў БЦРаўскай плыні; у „Мэмуарнай кнізе“ (Нью-Ёрк, 1999) дэшыфруецца як

*В[асіль] Шчорс* (с. 97), што выглядае сумнеўным, бо В.Шчорс — дзеяч старэйшага пакаленьня (с.18).
[13] Магчыма, Мітрафан Смаршчок — на той час — студэнт-мэдык, пазьней — ведамы беларускі актывіст, жыве ў штаце Мінэсота (ЗША).
Пасьпявала я ўсюды: і ў [Студэнцкі] Саюз, і на ўнівэрсытэт, і на лекцыі-рэпэтыцыі. Будучы на другім годзе ўнівэрсытэту, дастала стыпэндыю й кватэру за лекцыі, а таксама абеды ў сымпатычных бацькоў маёй вучаніцы. Аджыла я зусім. У 1939 годзе мела зложаныя <здадзеныя> ўсе экзамэны й рыхтавалася да пісаньня магістарскай працы.

**Выбухла вайна**

[*Беларуская школа ў Будславе. — Вывазы. — Прыход немцаў. — Польскія інтрыгі. — У Менску. — Савецкі й нямецкі тэрор*]
Калі прыйшлі бальшавікі, унівэрсытэт закрылі. Я затрымалася ў родным Будславе й пачала працаваць настаўніцай беларускай і нямецкай моваў у беларускай няпоўнай сярэдняй школе.
Са мною разам працавала Люня Будзька. Тады я пазнала яе яшчэ бліжэй і даведалася, які зь яе вартасны й добры чалавек. Кожную вольную хвіліну былі мы разам. Жылі толькі школай і для школы, бо была яна беларуская. Работы было многа, і ўсе свае маладыя сілы мы прысьвячалі вучням і школе, стараліся даць ім як найбольш. Мяне прызначылі дырэктарам. Зарганізавала я танцавальны гурток, і мае вучні займалі першыя месцы на абласных алімпіядах.
Забрала я да сябе [брата] Франка й [сястру] Гэльцю. Зажылі мы ізноў у сваёй роднай бацькоўскай хаце.
Страцілі супакой, калі бальшавікі пачалі вывозіць на Сібір ды арыштоўваць, запаўняць турмы ні ў чым не павіннымі людзьмі: нашага дзядзьку Адольфа зь сям'ёй вывезьлі ў Казахстан, павезьлі Васілевічаў — нашых крэўных, усіх лесьнікоў, солтысаў ды іншых, якія дзе-небудзь пры Польшчы працавалі. Усе кругом пачалі баяцца, што й іх могуць таксама павезьці на ўсход у нязнанае.
Трэ было пабачыць, як выглядаў кожны вываз! Дазвалялі забраць з сабою нямнога. Зямлю, хату, гаспадарку, жывёлу пакідалі й, акружаныя энкавэдыстамі, адпраўляліся ў дарогу. Плакалі тыя, якіх вывозілі, і плакалі тыя, што заставаліся. Ніводнае пахаваньне не выглядала так сумна, як тыя вывазы.

Мы зь [сястрой] Вэрай, ідучы за возам нашага дзядзькі [Адольфа], крычалі на ўсё мястэчка, а Вэра да крыві падзёрла свой твар. Пасадзілі іх у цяплушкі й павезьлі. А мы засталіся й дрыжэлі ад страху, узрываючыся ноччу на кожны шэлест за вакном.

У 1941 годзе пачалася нямецка-савецкая вайна. Адышлі ад нас бальшавікі, а прыйшлі немцы. Глядзелі мы на немцаў, як на вызваліцеляў ад бальшавізму, Сібіру й турмы. У нашым Будславе паднялі галаву палякі, і калі я восеньню прыйшла ў школу, каб у ёй, як і раней, працаваць, мне сказалі, што ў гэтай школе няма мне месца як савецкай актывістцы. На гвалт пачалі рабіць мяне савецкай актывісткай і даносіць на мяне немцам. А добра ведалі, якая я актывістка. Так палякі хацелі зьнішчыць усіх сьведамых беларусаў. Ня ведаю, што было бы са мною, каб я не ўцякла з Будслава ў Менск.

Тут яй сустрэлася з др. Тумашам, праф. Іваноўскім, кс. Гадлеўскім, сп. Казлоўшчыкам[14] ды іншымі. Пачала працаваць перакладчыцай у Генэральным Камісарыяце. Сьцягнула ў Менск Вэру й Франка. Жылі мы нейкі час пры Самапомачы. Вера пачала вучыцца ў мэдыцынскай школе, а Франак стаў вартаўніком на чыгунцы. Празь нейкі час паклікалі Вэру да працы ў Саюзе Беларускай Моладзі. Назначылі яе заступніцай др. Абрамавай[15] — галоўнай кіраўнічкі моладзі.

[14] Ніжэй ён згадваецца як Уладзіслаў Казлоўскі.

[15] Надзея Абрамава-Тэадаровіч — стваральніца СБМ.

Пачалося жыцьцё актыўнае й цікавае, але небясьпечнае. Толькі й чуваць было, што нехта ад бальшавіцкіх партызанаў загінуў. Усьцяж некага мы харанілі. Баяліся вечарам выйсьці з дому. Аднаго дня выйшлі мы з Вэрай з хаты й затрымаліся перад дзьвярыма. Акружылі нас дзеці з нашага падворку ды іншых. Сабралася іх грамадка даволі вялікая. Любілі дзеці Вэру. Яна пачала зь імі сьпяваць беларускія песьні. Не заўважылі мы, як падышоў да нас нейкі незнаёмы мужчына. Памаленьку пачаў выцягваць з кішані рэвальвэр, што заўважыў адзін з малых і крыкнуў да нас, каб уцякалі. Мы хутка адчынілі дзьверы нашай хаты й скрыліся за імі. Мужчына з рэвальвэрам у руках кінуўся да вакна, але нас ня ўбачыў, бо мы пасьпелі схавацца за печчу. Тым часам дзеці пабеглі ў паліцыю й расказалі пра тое, што

бачылі. Калі прыбеглі паліцыянты, мужчыны ўжо не было. Так мы цудам ацалелі.
Загінулі ў тым часе рэдактар „Беларускай газэты“ Ўладзіслаў Казлоўскі, праф. Іваноўскі, Акінчыц, Саковіч, Маракоў, сын Арсеньневай ды шмат іншых. Гінулі ад партызанаў і немцы. Служанка генэральнага камісара Беларусі Кубэ падклала [яму] ў ложак міну, і яго разарвала на кусочкі. Шмат працаўнікоў Генэральнага Камісарыяту й рэдакцыі „Беларускай газэты“, а таксама прадстаўнікі Цэнтральнай Рады мелі сувязь з партызанамі, пра што я даведалася, будучы пасьля вайны ў турме й лягеры.
Немцаў мы яшчэ добра ня зналі. Даходзілі весткі, што яны паляць вёскі зь людзьмі разам, але ня бачачы гэтага на свае вочы, не хацелі верыць, што гэта можа быць праўда. Непрыемнае ўражаньне зрабілі павешаныя ў горадзе партызаны. Сумна было глядзець на пастраляных на вуліцы ваеннапалонных, якіх я бачыла, ідучы рана да працы. Уся вуліца была запоўнена забітымі, якія, пераходзячы ноччу праз горад, хацелі ўцякаць. І так гінулі людзі ад партызанаў і ад немцаў. Прапаў бязь весткі кс. Гадлеўскі. Загінуў у Вільні Францішак Аляхновіч. А мы працавалі й дрыжэлі ад страху. Часта былі налёты на горад, пасьля якіх заставаліся руіны разьбітых дамоў і маса забітых людзей.

[**Эвакуацыя**
*У цягніку. — Альпы. — Чэхаславаччына. — Бэрлін. — Школа ў Dessau*]
У 1944 г. зьехалася шмат беларусоў з усяе Беларусі ў Менск на Кангрэс. Не пасьпелі дэлегаты выехаць з гораду, як пачулі мы, што савецкае войска прыбліжаецца да Менску. Немцы пачалі хутка пакавацца й выяжджаць з гораду. Выяжджалі зь імі й беларусы — працаўнікі Генэральнага Камісарыяту, Самапомачы, Цэнтральнай Рады й [Саюзу Беларускай] Моладзі. І мы з Вэрай, спакаваўшы частку сваіх рэчаў, адправіліся на станцыю. Селі ў доўгі цягнік, у якім памясьціліся працаўнікі вышэйназваных установаў. Цэлую ноч стаялі на месцы, а нас бальшавікі бамбардавалі, аднак нікому ніякай шкоды не зрабілі. Сыпаліся кругом бомбы, калі цягнік крануўся. Партызаны ўзарвалі мост, празь які мы мусілі пераяжджаць. Доўга стаялі ў полі, чакаючы, пакуль направяць

мост. Праяжджаючы праз Баранавічы, бачылі, як гарэў горад. За Лідай наехалі мы на міну. Шмат вагонаў было ўзарваных, шмат людзей згінула й шмат было раненых. На адной станцыі ня змог ускочыць у цягнік юнак, які выйшаў на некалькі мінут з вагону, і яму адрэзала ногі.
Ішоў цягнік уперад, а мы й самі ня ведалі, куды едзем. Нарэшце нас разьдзялілі. Частку перавялі ў Кёнігсбэрг (цяпер *Калінінград*), а частку праз Аўстрыю ў Альпы. Там апынулася моладзь і між ёй мы з Вэраю. Пасьля двух тыдняў разаслалі нас у розныя бакі Нямеччыны й Чэхаславаччыны. Мяне з Вэрай разлучылі: Вэра трапіла ў *Dessau*, дзе быў вялікі лягер *Junkerswerke*, у якім побач з рознымі чужаземцамі працавалі беларускія дзеці ў веку 10—14 гадоў, вывезеныя на прымусовыя работы. Вэры ды іншым кіраўнічкам і кіраўніком беларускай моладзі была даручаная апека над гэтымі дзецьмі. Апекавалася Вэра імі шчыра, у лістох да мяне толькі й пісала пра іх.
Тымчасам др. Абрамава, Міхася Татарыновіч, Зося Аляхновіч, Ганько[16], Нарушэвіч і я трапілі ў *Tropau* (цяпер *Opava*) у Чэхаславаччыне. У канцы 1944 году мы змушаныя былі пакінуць *Tropau* і зноў разысьціся ў розныя бакі.

[16] Відаць, Міхась Ганько — адзін з кіраўнікоў СБМ.
Я трапіла ў Бэрлін, скуль накіравалі мяне да мора ў *Мьritz*, а адтуль у *Dessau* да Вэры. Тут пачала я працаваць у школе й чулася вельмі шчасьлівай, вучачы беларускія дзеткі. Аднак ня доўга цешылася школай. Аднаго дня мяне паклікаў да сябе начальнік лягера й загадаў зараз жа адсюль выехаць. Куды я магла ехаць, калі з усіх бакоў сьціскалі немцаў бальшавікі й аліянты <саюзьнікі>. Пачала я жыць у лягеры скрываючыся. Даведаўся пра гэта начальнік і зноў загадаў пакінуць лягер. Ня ведала я, чаму ён так да мяне чапаецца, і толькі пасьля вайны зразумела, што гэта магло быць за перапіску з Аляксандрам Калодкам, які знаходзіўся ў нямецкім канцлягеры й да якога я ня толькі пісала, а таксама слала пасылкі. Можа, спрычыніўся да гэтага й Сыракваса, які з дочкай і сынам працаваў у той жа школе[, што і я]? Гэтую думку насунуў мне др. Малецкі сваймі ўспамінамі[17].

[17] Ян Малецкі. Пад знакам Пагоні. Таронта: Пагоня, 1976.

[**Канец вайны**
*Пад перастрэлкай. — Пераправа цераз Эльбу. — Амэрыканцы. — У савецкім палоне. — Уцёкі. — Польская місія. — Крадзеж. — У Варшаву*]
Так і не пасьпела я пакінуць лягер: аднаго дня ў нядзелю загадалі нам немцы з рэчамі сабрацца перад баракамі ды ўсіх нас разам зь дзяцьмі пагналі перад сабой на ўсход. Мы, прайшоўшы 15 км, знайшліся ў лесе каля *Zerbot*'у, немцы недзе зьніклі, а мы засталіся самі. Перад намі гарэў *Zerbot*. Было гэта 15 красавіка 1945 году. Змучаныя, пачалі мы шукаць месца на адпачынак. Праспаўшы ноч на зямлі, сталі разглядацца, дзе знайсьці што-небудзь на заспакаеньне голаду. Хлопцы ўбачылі капцы з бульбай і пайшлі іх раскапаць. Напяклі мы бульбы й падмацаваліся.
Пачалася над намі перастрэлка паміж немцамі й бальшавікамі; скрываліся мы ў выкапаных намі акопах. У той час пазабівалі многа коней, — мы пачалі пячы каніну й есьці яе, і так прабылі ў лесе два тыдні. Калі супакоілася страляніна, мы адважыліся выйсьці зь лесу і — убачылі перад сабою амэрыканцаў. Пастанавілі ісьці ў *Dessau*, адкуль нас немцы выгналі. Па дарозе адзін з малых разьбіў нагу. Вэра й я пры ім засталіся, а Лена Воўк-Левановіч, зь якой мы ўвесь час трымаліся разам, гэтага не заўважыла й пайшла наперад. Мы былі пастанавілі зь Ленай, якую вельмі любілі, трымацца разам і ніколі не разлучацца. Вось бачачы, што яе няма каля нас, прасілі мы Янку Жамойціна дагнаць яе й сказаць, што сталася. Дагнаў яе Янка за мастом на Эльбе, які, як толькі яны перайшлі, немцы ўзарвалі. Мы апынуліся з аднаго боку ракі, а яны з другога. Зь Ленай мы больш не спаткаліся й да сёньняшняга дня ня ведаем, што зь ёй сталася.
Пачуўшы, што да Эльбы будуць бальшавікі, а з другога боку астануцца амэрыканцы, мы пастанавілі перабрацца на другі бок ракі па ўзарваным мосьце. Мы не маглі наражаць дзяцей на небясьпечную пераправу, таму пастанавілі зь імі расстацца. Пакідалі іх не адных, а з савецкімі грамадзянамі, якія разьмясьціліся на правым беразе Эльбы. Дзеці з намі расставацца не хацелі й так плакалі, што зьбегліся людзі зь вёскі паглядзець, што сталася. Плакалі дзеці, мы плакалі. Усё ж пайшлі наперад і па вісячых над ракой бэльках пераправіліся

на другі бераг.
З намі ішоў Юзік Косьцевіч і Сыракваса зь сям'ёю. Цешыліся, думаючы, што найгоршае за плячыма. Нядоўгая была нашая радасьць. Дайшоўшы да ракі Мульдэ, прытоку Эльбы, мы мусілі затрымацца. На масьце стаяў амэрыканскі жаўнер і нікому не дазваляў ісьці далей. На беразе ракі сабралася маса людзей розных нацыяў — усе хацелі ўцячы на захад. Сядзелі мы там два тыдні, чакаючы, калі амэрыканцы дазволяць нам ісьці далей.
Аднаго дня, прачнуўшыся (спалі мы ў разваленых дамох, а елі тое, што далі немцы), убачылі мы кругом сябе савецкіх жаўнераў з чырвонымі *звёздачкамі*. Усіх нас яны пагналі перад сабою на ўсход. Савецкіх грамадзянаў аддзялілі ад іншых і памясьцілі ў лягеры *Ludwigsfeld* недалёка ад Бэрліну. Сабралася там людзей больш за 30 тысяч. Лягер знаходзіўся пры шашы, па якой дзень і ноч ехалі грузавікі, поўныя людзей з захаду. Гналі людзей і пехатою. Некаторыя гаварылі, што амэрыканцы й ангельцы выдаюць [бальшавіком] савецкіх грамадзянаў. Мы былі пераканаыя, што ўсе нашыя блізкія таксама паехалі ўжо на ўсход.
З нашага лягеру цэлымі партыямі пачалі вывозіць людзей на ўсход. Мяне й Вэру з грамадою іншых пехатой пагналі ў Бэрлін. Па дарозе людзі млелі ад перамучаньня. Трапілі мы на тэкстыльную фабрыку ў Ліхтэнбэргу, якую пачалі дэмантаваць і вывозіць разам зь людзьмі ўглыб Савецкага Саюзу. Апошнюю партыю мелі вывезьці ў панядзелак. У нядзелю мы з Вэраю ўцяклі з прыфабрычнага лягеру. Паехалі ў *Zelendorf*, да знаёмых немцаў. Ад іх даведаліся, што ў амэрыканскім сэктары Бэрліна, недалёка ад іх, знаходзіцца польская рэпатрыяцыйная місія. [З тае прычыны, што] гэтая місія знаходзіцца ў амэрыканскім сэктары Бэрліна, мы былі ўпэўненыя, што яна адпраўляе палякаў на захад. Вось падаліся мы за полек і прасілі, каб нас адправілі на захад. Трапілі на добрага чалавека, які нам сказаў:
— Мы не адпраўляем на захад, але на ўсход. Калі хочаце, можам адправіць вас у Польшчу, аднак мусіце пачакаць, покуль пачнуць ісьці транспарты.
Мы ня ведалі тады, якой будзе Польшча, і сказалі, што ня маем дзе затрымацца; прытым прызналіся, што ўцяклі з савецкага лягеру. Чуючы гэта, гэты чалавек запрапанаваў нам працу ў місіі на кухні да часу, покуль пойдуць транспарты. Абяцаў нам

даць месца на жыльлё. Зразумела, мы ахвотна згадзіліся й засталіся пры місіі. З радасьцю пачалі працаваць на кухні, бо былі вельмі галодныя.
Большасьць працаўнікоў місіі ня зналі нямецкай мовы, таму калі трэба было паразумецца зь немцамі, клікалі мяне, каб пераглумачыла. Вось так аднойчы паклікаў мяне да сябе начальнік місіі ды запрапанаваў працу ў бюро. Я згадзілася. Празь месяц пайшла працаваць у бюро й Вэра. Далі нам загранічныя пашпарты, і ўсе да нас былі вельмі добрыя. Будучы там, навязалі мы лучнасьць са сваякамі ў Польшчы й зь сябрамі, якія знаходзіліся ў Нямеччыне. Увесь час думалі й імкнуліся да таго, каб перабрацца на захад. Аднак што мы ні рабілі, усё нам не ўдавалася. Памагчы перабрацца на захад абяцалі нам знаёмыя немцы. Аднэй нядзелі яны запрасілі нас да сябе на каву, і калі мы ў іх сядзелі, іхны сын — былы афіцэр нямецкай арміі — нібыта паехаў да амэрыканцаў па дакумэнты для нас. Вярнуўшыся вельмі знэрваваны, ён сказаў, што яго затрымалі савецкія жаўнеры, адабралі паперы й ён ледзь выкупіўся ад іх, аддаючы свой гадзіньнік і пярсьцёнак.
Калі мы вярнуліся ад знаёмых дахаты, знайшлі сваё памешканьне адкрытае й пустое. Усе лепшыя рэчы былі вынесеныя. Як пазьней аказалася, сын знаёмых немцаў выкрадзеным з кішані нашага паліта ключом адамкнуў нашае памешканьне ды ўсё зь яго вынес. Засталіся мы так, як стаялі й страцілі ахвоту да выезду на захад. Каму верыць, калі знаёмыя з намі так учынілі?
Бэрлін быў акружаны савецкім войскам. Здаліся мы на ласку Божую й чакалі. Аднаго дня Вэру звольнілі з працы й загадалі ёй ехаць у Польшчу. Паехала. Спаткала там свайго даўнейшага ўхажора й выйшла замуж. Я далей працавала, але душой і сэрцам была зь сябрамі, якія знаходзіліся на захадзе.
Неяк сьніцца мне дзіўны сон. Бягу я дарогай, якая ў адным месцы разыходзіцца на захад і на ўсход. Затрымаўшыся, глянула я на захад і ўбачыла сваіх старых знаёмых і сваякоў, аднак не пабегла ў іх бок, а павярнула на ўсход. Убегла ў жыта. І тут, як з-пад зямлі, выскачылі савецкія чырвонаармейцы й, загарадзіўшы дарогу, крыкнулі: „Стой!“ Затрымалася я й падумала: „Арыштаваная“.
Абудзілася вельмі знэрваваная. Гэтага самага дня сказалі мне ў бюро, што мушу ехаць па службовых справах у Варшаву. Ведала

я, што мяне там чакае, а паехала. Уцякаць куды-небудзь было позна, бо за мною сачылі. Не паехаць ці нават, калі б удалося, уцячы? Але як буду жыць шчасьліва на волі, калі арыштуюць Вэру! Ведала я тады, што мае браты церпяць у савецкіх лягерох. Заўсёды па іх плакала. Цярпела найбольш, калі мне было добра. На думку, што яны галадаюць, а я тут сытая, не магла пралыкнуць узятага ў рот куска яды. І гэтак цяпер, як стаяла, аставіўшы ўвесь свой дабытак у Бэрліне, паехала ў Варшаву. Тут тры дні за мной хадзілі ды ўрэшце арыштавалі.

[**За кратамі**
*Арышт. — Падвал Міністэрства Бясьпекі. — Савецкая турма на Празе. — Вартаўнікі. — Легніца. — Лубянка. — Галюцынацыі. — Амэрыканка. — Кутузаў. — Гарадзкая турма. — Вэра й Славік. — Суд над Жамойціным*]
*Арыштаваная* — якое гэта страшнае слова. Аж мне здавалася, што пад зямлю западаюся. Затрымалася я была ў Варшаве ў дачкі аднэй працаўніцы місіі. На яе кватэры мяне арыштавалі. Гэтага дня падаў улеўны дождж, а я міма гэтага адзелася была й хацела пайсьці ў Лазенкі. Мяне нешта цягнула з хаты, не магла ў ёй уседзець. Дачка маёй знаёмай пачала зь мяне сьмяяцца, што ў такую нягоду іду прагуляцца. І я затрымалася, а яна выйшла. Празь некалькі мінут мяне забралі й павезьлі ў турму, якая знаходзілася ў падвале будынку Міністэрства Бясьпекі — рог Алеяў Уяздоўскіх і Катыковай.
Сядзела я там тры месяцы. Спачатку было нас дзьве, а пасьля прывялі больш. Раз толькі паклікалі наверх напісаць біяграфію. Не выводзілі нас на прагулкі й не выклікалі на сьледзтва. А толькі выводзілі мыцца й апаражніць парашу. Спалі на нарах, лежачы цесна адна пры другой. Аконца, празь якое падала крыху сьвету, было высака. Сонца мы ня бачылі. Кніг не давалі. Большасьць заключаных сядзела за АК[18]. Арыштоўвалі іх на вуліцы й прывозілі ў турму ў вопратцы, якую мелі на сабе. Адна жанчына вельмі плакала, бо забралі яе ад дзіцяці, зь якім выйшла прагуляцца, і ня ведала, што зь ім сталася. Дома ў яе нікога больш не было. Некалькі дзён перад тым, як мяне забралі, пачалі некаторых выклікаць на сьледзтва. Іх вельмі мучылі. Між намі была адна *стукачка* (гэта такая, якая даносіць уладам, аб чым гутараць арыштаваныя). Усе яе вельмі не любілі. Яна сама сябе прызначыла старшынёй камэры й

распараджалася, як хацела: дзяліла хлеб, суп, выбірала сабе лепшае месца для спаньня, будзіла ноччу таго, хто каля яе спаў, каб павярнуўся на другі бок і ня дыхаў ёй у твар. Найбольш яна мяне разгневала, калі, перайшоўшы ў другую камэру, у якой былі ўсе сьцены сьпісаныя вязьнямі, не дала нам нічога прачытаць, а, схапіўшы анучу, усё замазала. Вязьні пісалі на сьценах, і можна было шмат чаго даведацца, а яна не дапусьціла да гэтага.

[18] *Armia Krajowa* (*польск.* нацыянальная армія) — польскі антынямецкі й антысавецкі супраціў.

Аднойчы вывелі нас усіх з камэры й пасадзілі кожную асобна. Рабілі ў нас рэвізію. Мне выпала 15 мінут сядзець у камэры без акна; на падлозе ляжаў сяньнік, а ў куце стаяла параша, у якую праз маленькае круглае ваконца ў дзьвярах падала сьвятло ад электрычнай лямпачкі ў калідоры. Сядзела я й думала: „Няўжо ў такой камэры можна людзей трымаць? Гэта немагчыма!“ Мне было цяжка выседзець там 15 мінут. І што я пазьней пачула! У такой камэры — ледзь не паўгоду — сядзела мая сястра Вэра, будучы цяжарнай. Забралі яе месяц пасьля шлюбу, у той самы дзень, як і мяне. Прывезьлі з Уроцлава ў Варшаву й пасадзілі ў такую ж, як я вышэй апісала, адзіночку. Сядзела яна ў ёй, як і мы, без прагулак, бязь сьледзтва, і да таго ж у цемры. Перавялі ў іншую тады, як яна, выйшаўшы з камэры, упала на калідоры й страціла прытомнасьць. Яна ведала пра тое, што я знаходжуся блізка, бо аднаго дня, калі нас вялі мыцца, пачула мой голас.

Пасьля трох месяцаў паклікалі мяне наверх і перадалі савецкім уладам. Павезьлі мяне цяпер у савецкую турму, якая знаходзілася на Празе[19] на вул.Ягелёньскай. Тут пасадзілі ў падвал, у якім быў склад на каменны вугаль. Сьцены, падлога і ўсё кругом было пакрытае чорнай сажай. Са мною прывезьлі яшчэ адну жанчыну са Львова. Спалі мы на голых дошках. І тут таксама не выводзілі на прагулкі й ня клікалі на сьледзтва. Сядзелі два тыдні. Пасьля павезьлі нас у Легніцу таваровым цягніком. У гэтай самай турме Вэра сядзела пазьней, зімою, і вельмі мерзла, бо не палілі ў печы, таму што печ дыміла. Прабыла там Вэра 40 сутак.

[19] Прага — правабярэжная частка Варшавы.

Нас, 3 асобы, везьлі ў Легніцу. Перад вагонам стаяў вартаўнік і пільнаваў нас. Якія розныя між імі спатыкаліся людзі! Адзін зь іх крычаў на нас, калі мы, выйшаўшы з кутка вагону, выставілі твары на сонца, прамяні якога прабіваліся праз шчыліны вагону. Ён загадаў ісьці назад у куток і не глядзець на сонца. Зноў жа іншы прамовіў да нас такімі словамі:
— Вы, напэўна, думаеце, што я хачу пільнаваць вас. А ў мяне, гледзячы на вас, так сэрца баліць, мне так шкада вас. Мой лёс мала лепшы ад вашага. Пяць гадоў я ў Польшчы. Даўно ня быў дома й сваіх ня бачыў. Нам тут не дазваляюць зь нікім з палякаў гутарыць.
Яшчэ іншы вартаўнік, убачыўшы, што, пераяжджаючы праз Уроцлаў, я пачала плакаць, запытаўся, чаму плачу. Я сказала, што так нядаўна была тут на вясельлі сваёй сястры. На гэта ён сказаў, каб я дала адрас сястры, а ён пойдзе й раскажа, што са мною сталася. Дала я яму адрас, і ён прыходзіў да сестрынога мужа, але той спалохаўся й не пусьціў яго ў хату.
У Легніцы былі мы два тыдні. Спалі на голай падлозе. Некалькі разоў завязвалі нам вочы й вазілі на аэрадром. Варочаліся назад, бо не было пагоды. Нарэшце самалёт падняўся й мы паляцелі — цэлы дзень з завязанымі вачыма й ня еўшы. Убачыла я тады з-пад завязкі, што побач мяне сядзіць мужчына з кайданкамі на руках.
Прывезьлі нас у Маскву. Пасадзілі мяне ў турме на Лубянцы. Прабыла там два тыдні. Тут давалі чытаць кнігі й выводзілі на прагулкі. Запамятаўся мне адзін вартаўнік, які, бачачы, што позьняя халодная восень, а вядуць мяне на прагулку ў летнім паліце, зьняў зь сябе целагрэйку й накрыў мяне. Ён часта адкрываў у дзьвярах маёй камеры ваконца й пытаўся, ці хачу *чайку́*. Не падабалася мне ў гэтай турме тое, што загадвалі спаць з рукамі, паложанымі паверх коца. Як толькі я забылася й рукі пад коц схавала, адразу мяне будзілі. Камэры былі без вакон.
З Лубянкі павязьлі мяне чорным воранам на станцыю. Калі адчынілі дзьверы ад ворана, каб я выйшла, то ўбачыла ня менш за пяць чырвонаармейцаў з настаўленымі ў мяне штыхамі. Акружылі *прэступніцу* й павялі на пэрон. Людзі адварочваліся й глядзелі на мяне. А мяне сьмех і плач браў. Успомніла сваіх сябровак і сяброў, якія жывуць у Вольным сьвеце, і падумала: от каб яны мяне цяпер пабачылі. Мела я на сабе белы плашч, а

на ім брудную целагрэйку, якую мне ў Маскве далі. У руках несла элегантны чамадан. Села ў вагон у купэ, прыназначанае для вязьняў. У дзьвярах паставілі вартаўніка. Сядзела я й глядзела на яго, аж ён мяне запытаў, чаго так гляджу. А я яму кажу:
— Гляджу, бо вы мне вельмі прыпамінаеце майго брата. А можа вы мой брат, бо тут, у Савецкім Саюзе, маю дзядзьку, і ў яго ёсьць дзеці, якіх я ніколі ня бачыла. Яны жывуць дзесь у Магілёўшчыне.
Вартаўнік, чуючы гэта, запытаўся мяне, ці хачу я есьці, калі так, то прынясе мне што-небудзь. Едучы гэтым цягніком далей, мне выдалася, што за сьцяной нехта да мяне стукае. Пачала й я выбіваць альфабэт Морза. Мне здавалася, што гутару са сваім малодшым братам Франкам. Цэлую дарогу я зь ім гутарыла, хоць яго там не было. Была гэта галюцынацыя. Чула я тое, чаго не было. Блізка, відаць, была душэўнай хваробы.
У Менску пасадзілі мяне ў турму, т.зв. „Амэрыканку“. Тут падалі мне ордэр на арышт. Было гэта 3 сьнежня. Сядзела я ад 12 жніўня***.

*** Калі скласьці час сядзеньня ў чатырох турмах, выходзіць чатыры з паловай месяцы. Тутака храналягічная няяснасьць. Той час не залічыўся, бо ўважалі, што дагэтуль была я затрыманая тымчасова. Цэлы месяц сядзела адна ў камэры. Мяне выводзілі на прагулкі й давалі чытаць кнігі. Адна правяла першыя Каляды ў заключэньні.

**Верш, уложаны на Каляды 1949 году**
Сёньня Каляды — Хрыстос нарадзіўся.
Цешацца людзі, што ім аб’явіўся.
Елкі ўбралі, песьні сьпяваюць,
Госьці прыходзяць — жаданьні складаюць.
Кожны імкнецца быць са сваімі.
Сьвята праводзіць не із чужымі,
А ў роднай хатцы, дзе хто радзіўся,
Да грудзей маткі дзе ён туліўся.
І я хацела б быць дома сяньня,
Дзяліць з другімі радасьць каханьня,
На спацыр выйсьці — суседаў адведаць,
Музыкі паслухаць і пабяседваць.

Мела і я калісь родную хатку,
Братоў, сясьцёр, бацьку і матку.
Куцьцю ўрачыстую і мы прыгатаўлялі,
Сьвечкі і цацкі на елку чаплялі.
Пачалося сьледзтва. Маім сьледчым быў Кутузаў, які паходзіў дзесь з-пад Карэліч. Ён быў як артысты. Адзін раз сьмяяўся й жартаваў са мною, а другі кіпеў без прычыны са злосьці й кідаўся да мяне. Мучыў мяне бяссоньніцай. Ноччу выклікаў некалькі разоў на сьледзтва, а днём не дазвалялі спаць нават седзячы. Як толькі я, седзячы пры стале, засынала, адразу вартаўнік загадваў разбудзіць мяне. Прыпісвалі мне тое, аб чым я й ня сьніла. Калі на пытаньне, што я рабіла ў Беларускім Студэнцкім Саюзе, я адказала, што сьпявала ў хоры Шырмы й належала да танцавальнага гуртка, ён далей пытаў, ці сьпявалі мы ў хоры савецкія песьні. Адказвала я яму, што мы сьпявалі беларускія народныя песьні. А ён напісаў у пратакол, што я сьпявала антысавецкія песьні ў хоры, сказаўшы:
— Калі вы не сьпявалі савецкіх песень, значыць, сьпявалі антысавецкія.
І так у пратаколе засталося: „Належала да хору, які сьпяваў антысавецкія песьні“.
Дапытвалі ў маёй справе больш за 100 чалавек. Ніхто нічога кепскага пра мяне не сказаў. Ад недасыпаньня разбалелася мне галава. Балела так моцна, што вытрымаць не магла й прасіла кожны дзень даць мне парашок на супакаеньне. Сядзела я зь людзьмі рознымі, але ні з кім з Заходняй Беларусі. Пасылак не атрымлівала й ніхто з блізкіх нічога пра нас[, мяне й Вэру,] ня ведаў. Паведаміць няможна было.
Вэру прывязьлі ў Менск таксама. Была яна і ў Варшаве і ў Легніцы, потым у Берасьці. У Берасьці пасадзілі яе ў восьмым месяцы цяжарнасьці**** ў падвал, у якім поўна было велізарных пацукоў. Яна цэлую ноч сядзела й туфлем іх ад сябе адганяла. Да таго з усёй сілы скакала. Яшчэ калі яе везьлі з Варшавы ў Легніцу, паплыла зь яе вада[20]. Прывезьлі яе ў Менск такую страшную, што аж сьледчы за галаву схапіўся. Меў ён ейныя здымкі з часоў працы з моладзьдзю. Была цяпер зусім да сябе непадобная. Адразу палажылі яе ў шпіталь, і там радзіла яна сына. Тры дні мучылася, рабілі цэсарскі разрэз, і лекары ня мелі надзеі на яе выздараўленьне. Хлопчык радзіўся паморшчаны, як старычок. Дзякуючы таму, што Вэра мела

многа малака, адышоў, і калі я яго бачыла ў дарозе на этап, быў вясёлым спакойным хлопчыкам.

**** Таксама храналагічная няяснасьць.
[20] Відаць, ад плода часткова адышлі воды.
Як і ў Польшчы, так і ў Менску сядзела з намі наседка-стукачка й пра ўсё даносіла начальству. Некаторыя атрымлівалі добрыя перадачы й са мной дзяліліся. Сядзела са мной балерына Марыя Сьцепанец, лекарка-фольксдойчка[21] ды іншыя. Аднойчы прывялі ў маю камэру простую няграматную бабку. Яна так да мяне прывязался, а я яе палюбіла, што калі яе ад мяне забралі, я цэлы дзень плакала.

[21] Фольксдойчы — этнічныя немцы; людзі нямецкай нацыянальнасьці, якія паходзяць з-па-за Нямеччыны.
Дайшло да маіх вушэй, што Вэра ў Менску, што яна мае сына. У нашу камэру перавялі адну жанчыну, якая сядзела разам з Вэрай, яна й расказала мне [пра сястру]. Пасьля й сьледчы сказаў мне пра гэта. Расказваў, які прыгожы ейны сыночак. Кнігі давалі чытаць на расейскай мове. Аднойчы, прыйшоўшы [з допыту], знайшла я ў сваёй камэры кнігу Якуба Коласа. Як жа я да яе кінулася. Нарэшце беларуская кніга. Якое было маё расчараваньне, калі, разгарнуўшы кнігу, убачыла, што яна таксама на расейскай мове! І чытаць мне яе не хацелася. Пасьля большгодняга сьледзтва даў мне сьледчы прачытаць грубы сшытак маіх пратаколаў. Чытаючы іх, даведалася я, што й др. Усевалад Кароль[22], др. Грынкевіч[23], Езавітаў[24] знаходзіліся ў заключэньні, бо да маёй справы былі падшытыя іх пратаколы. Вэра, падпісваючы свае пратаколы, была хворая й мела высокую тэмпэратуру, да таго ж і сына на руках. Так што падпісала на сябе прысуд, не чытаючы пратаколаў.

[22] Усевалад Кароль — лекар, заходнебеларускі дзеяч, у часе другой сусьветнай вайны — сябра Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні.
[23] Станіслаў Грынкевіч — доктар псыхіятрыі, ведамы заходнебеларускі й эміграцыйны дзеяч; у 1941 г. быў у савецкім арышце.
[24] Канстанцін Езавітаў — генэрал-маёр, адзін з найвыдатнейшых беларускіх палітычных і вайсковых дзеячоў;

па зьвестках КГБ, быў арыштаваны ў красавіку 1945 г., памёр у траўні 1946 г.
Справу нашую пераслалі ў Маскву ў *Особое Совещание*. Мяне тымчасам перавязьлі ў гарадзкую турму[25] й пасадзілі ў збудаваны на дварэ барак для палітычных вязьняў. Пры ім была адна камэра бяз столі. Вось у ёй адбывалі мы свае 20-мінутовыя прагулкі: вартаўнік уводзіў нас і пакідаў адных, пасьля забіраў, [потым] прыводзіў і замыкаў іншых. У гэтай турме сядзела я й чакала на прысуд. Часамі клікаў мяне сьледчы, каб запытацца ў нейкай няяснай для яго справе. Аднойчы, ідучы так да сьледчага, убачыла я на дварэ Вэру зь дзіцём на руках. Я крыкнула: „Вэра!“ — і кінулася да яе бегчы. Вартаўнік, які яе вёў на прагулку, адразу завярнуў яе назад у будынак і зачыніў дзьверы. Яна пасьпела толькі высака падняць сына й паказаць мне сваё шчасьце. Пазьней, падняўшыся да высока паложанага ваконца, пабачыла я Вэру ў вакне гарадзкой турмы, што знаходзілася насупраць нашага бараку. Асьцярожна, каб вартаўнік ня бачыў, падыходзілі да вакна. Кожны дзень маглі мы паглядаць на сябе здалёк. Перастуквaліся тут з суседзямі. Даведалася я, што ў гэтым жа бараку сядзіць Янка Жамойцін. Мучыў мяне ўсьцяж галаўны боль. Паклікалі мяне да лекара й палажылі ў шпіталь. Адтуль магла я бачыць Вэру яшчэ часьцей. Выводзілі нас на доўгія прагулкі, і адтуль добра было відаць вокны турмы, у якой сядзела Вэра са Славікам.

[25] Верагодна, Пішчалаўскі замак, сёньня „Валадарка“. Аднойчы вывелі мяне з камэры, пасадзілі ў чорны воран і павезьлі немаведама куды. Сядаючы, пабачыла я, што сядзіць у воране й Вэра са Славікам. Везьлі нас доўга-доўга. Вэра, як і я, думала, што вязуць нас на расстрэл: нас часта страшыў расстрэлам сьледчы. А я думала: „Па вас усяго можна спадзявацца“. І ўяўляла сабе, як вядуць мяне на расстрэл, як страляюць у мяне й як я мёртвая падаю. Вось і цяпер былі мы пераканаыя, што выбівае апошняя гадзіна нашага жыцьця. Прывезьлі нас у другі канец гораду і ўвялі ў вялікі будынак суду. Тут адбываўся суд над Янкам Жамойціным. Мы былі сьведкамі. Засудзілі Янку на 25 гадоў лягеру. Тады я першы раз убачыла Славіка й нават трымала яго на руках. У справе Янкі запыталіся нас толькі, ці мы яго знаем і што можам аб ім

сказаць. Ясна, што мы стараліся падаць яго як найлепшага на сьвеце чалавека. Ізноў адвезьлі нас на сваё месца ў гарадзкой турме.

[**Этапы**
*Прысуд. — Бутыркі. — Горкі. — Тайшэт*]
Нарэшце прыйшоў прысуд з Масквы. Далі нам па 10 гадоў *исправительного лагеря*. Зь якой радасьцю паказвала мне Вэра 10 пальцаў праз вакно, бо яна, як і я, спадзявалася горшага. Хоць у той час было фактычна ўсё роўна: атрымаў 5 гадоў, 10 ці 25 — ніхто зь лягеру дахаты не варочаўся.
Узялі нас на этап разам. Увялі ў цягнік і разьмясьцілі на нарах. Вэры са Славікам далі месца на верхніх нарах, дзе ня можна было нават сесьці. Усю дарогу трэ было ляжаць. У вагоне было задушна, і Славік увесь час плакаў. Для дзіцяці не далі чыстых полак ані адпаведнай яды. Мусіў есьці тое, што й дарослыя — салёную рыбу й чорны сухі хлеб. Шчасьце, што Вэра мела многа малака ў грудзях.
Прывезьлі нас у Маскву на Бутыркі. Гэта быў перасылачны пункт: людзей маса, бруд кругом такі, што апісваць непрыемна. Адразу тут з Вэрай разлучылі, аднак на яе гарачыя просьбы прывялі мяне да яе. І тут мы прабылі разам тыдзень. Магла я цешыцца Славікам і пабачыла, які зь яго слаўны й мудры <разумны> хлопчык. Было тут шмат матак зь дзецьмі, а кожны вартаўнік, праходзячы міма, затрымліваўся толькі каля Славіка й зь ім гуляў.
Ехалі мы разам з Вэрай да Горкага. Тут разам зь ёй і Славікам павялі мяне мыцца ў лазьню. На дварэ быў мароз і холад, а ў лазьні так жа холадна, як на дварэ. Страшна было разьдзецца, каб не прастудзіць дзіцяці й сябе. Вартаўнікі падганялі хутчэй ісьці мыцца, а ў лазьні людзей, як селядцоў у бочцы, да таго пара й дым рэзалі вочы. Славік плача, і мы плачам, гледзячы на яго. Няма дзе прытуліцца, дзе апёрціся. Вымыліся й выйшлі. Тут нас з Вэрай разьдзялілі. Павялі яе са Славікам у адную турму, а мяне ў другую. І больш мы ўжо ня бачыліся. Як я пасьля пачула з тэй другой турмы, у якую пасадзілі Вэру, мусіла яна у той самы дзень яшчэ раз ісьці мыцца ў лазьню са Славікам.
У лазьні я вельмі прастудзілася, мела гарачку, кашляла, балела мне горла. У такім стане павезьлі мяне ў далейшую дарогу ў

кірунку Іркуцкай вобласьці. Ехалі вельмі доўга; сёньня сказаць дакладна не магу, колькі часу былі мы ў дарозе, — хіба цэлы месяц. У вагоне былі нары з дошак, а тыя, хто не дастаў месца на нарах, сядзелі на мокрай падлозе. Давалі нам па дарозе рыбу, хлеб і ваду. Раз у суткі адкрывалі дзьверы й выпускалі за сваёй патрэбай. Усё трэба было рабіць на загад. Многа ехала нас, жанчын розных нацыяў. Найбольш было ўкраінак і найбольш іх сядзела на мокрай падлозе. Я мела месца на нарах каля грузінак. Не магла, аднак, глядзець, як мучацца на падлозе ўкраінкі й кожную ноч уставала й саступала сваё месца якой-небудзь жанчыне з падлогі. Не падабалася гэта грузінкам, бо, устаючы, я іх будзіла, і таму яны былі на мяне злыя. Разам з намі ехала шмат і блатных (крыміналістых).
На перасылачным пункце [ў Тайшэце] спаткалі мы шмат немак. Былі між намі, апрача ўкраінак, літоўкі, латышкі, эстонкі, полькі, карэйкі й кітайкі, японкі, вэнгеркі, чэшкі, грузінкі й расейкі, пераважна масквічкі. Калі нас прывезьлі ў Тайшэт, быў такі вялікі мароз, што адразу некаторыя паадмаражалі сабе насы. На шчасьце, як выяжджалі з Варшавы, дазволілі былі мне заехаць на кватэру, дзе я была затрымалася, і ўзяць з шафы сп-ні Торбкі (?) некалькі цёплых рэчаў і цёплыя боты з тым, што яна возьме такую ж колькасьць маіх рэчаў, пакінутых у Бэрліне. Пакінула я для яе сьпісок узятых рэчаў. Прапала б зусім на Сібіры, калі б гэтага не зрабіла.
Веру зь дзіцем павезьлі ў Казахстан; быў мароз і сьцюжа, а нідзе яе зь дзіцем прыняць не хацелі: мусіла езьдзіць ад аднаго лягеру ў другі ў адкрытай машыне зь дзіцем на руках па 60 км завеяй і марозам. 7 кілямэтраў ішла пехатой, несучы валізку й Славіка на руках, ступаючы па сьнезе й падаючы ад перамучаньня.

**[Калёнія 09**
*Пачатак лягернага жыцьця. — 1-я катэгорыя. — Лесапавал. — Гіпэртанія й ружа*]
З Тайшэту павезьлі мяне зь іншымі жанчынамі ў лягер. Увялі ў барак вечарам. Уражаньне зрабіў ён страшнае. Пасярэдзіне яго стаяла печ. Пад сьценамі кругом зьнізу й зьверху былі нары. Цемру асьвячала маленькая лямпачка-капцілка. Днявальнай бараку была старэйшая жанчына, расейка, вельмі крыклівая. Далі нам месца спаць на сеньніку, напханым саломаю, без

падушкі. Прыкрыцца далі стары брудны коц. Не магла я заснуць ад холаду. На другі дзень далі нам вопратку — бялізну, сукенку, ватнік, брудныя палатаныя штаны й такі ж брудны бушлат, а яшчэ валёнкі — кожны іншы: адзін высокі й вялікі, другі кароткі й малы, адзін карычневы, а другі шэры. На галовы далі салдацкія шапкі. Апранулі мы гэта й сталі да сябе непадобныя. Ня можам пазнаць адна другой. Вывелі на работу. А тут чую — нехта кліча мяне па імені. Пытаюся: „Як вы мяне пазналі?“ А яна адказвае па-польску. Была я падпаясана поясам ад свайго хатняга халата, і таму [жанчына тая] мяне пазнала. Загадалі нам сьнег адкідаць. На дварэ быў вялікі мароз і сьцюжа. А перад тым завялі нас у сталоўку на сьнеданьне. Было там парна й цёмна: асьвятлялі капцілкі. Далі нам па місцы аўсянага супу й па кусочку хлеба. Аўсянку такую мы елі тры разы дзённа — фактычна ня елі, а пілі зь місак, бо лыжак нам не далі. Часамі давалі дробную салёную рыбку.
Пры „камісоўцы“ далі мне 1-ю катэгорыю, г.зн. залічылі да самых сільных і здаровых, і паслалі на калёнію 09, дзе працавалі на лесапавале. На мой моцны галаўны боль ніхто не зварочваў увагі. Ды я й сама ня ведала, якая прычына майго болю. Як пасьля трох гадоў аказалася, была я хворая на гіпэртанію, а ніхто ніколі ня мераў мне ціску. Захварэла я на гэтую хваробу яшчэ ў турме ад недасыпаньня й вечнага напружаньня нэрваў. Пра такую хваробу я ніколі ня чула й не дамагалася зьмерыць ціску. Думала, што ў мяне мігрэнь і ўсьцяж прымала парашкі на супакаеньне болю, а яны не памагалі. У такім стане мусіла ісьці вялікім марозам валіць лес: сьпілоўваць грубыя сосны, расьсякаць іх сякераю, ладаваць гатовыя дровы на машыны. У лягеры нашым былі толькі жанчыны. Трэба было выканаць норму, хто яе ня выканаў, даставаў менш хлеба. Ясна, што я нормаў не выконвала і ўсьцяж была на „штрафным“ [пайку]. Была такая галодная, што аж плакаць хацелася. У нашым лягеры не было студні. Ваду прывозілі з ракі за 12 км ад лягеру. На гэтай рацэ спэцыяльныя брыгады дзень і ноч выразалі велізарныя кавалкі лёду, прывозілі ў лягер і растоплівалі. З гэтай вады варылі страву, мылі бялізну й такой вадой мыліся ў лазьні. Можна ўявіць, якая яна была цэнная й як зь ёю лічыліся. Калі каторая з нас хацела піць, то ў якім слоіку растоплівала сьнег. Так працуючы, я схудала й аслабела, захварэла на запаленьне вуха:

мела нарыў у вуху, павышаную тэмпэратуру й невыносны галаўны боль. Калі пайшла ў санчасьць прасіць звальненьня ад працы, не атрымала яго. Пазьней напух у мяне нос і зноў павысілася тэмпэратура. Усе казалі, што гэта ружа[26]. Гэтым разам таксама пайшла ў санчасьць прасіць звальненьня ад працы. Прыходжу й кажу:
— І магу я з такім носам і ў такі вялікі мароз ісьці на работу?!
А мне на гэта працаўніца санчасьці, латышка Пэтэрсон, адказвае:
— Вы же носом работать не будете.

[26] Ружа — рожа ці завушніца (краснуха).
Завязала я нос хустачкай і пайшла працаваць. Пасьля гэтага сказала сама, што памірaць буду, а не пайду больш ніколі ў санчасьць прасіць звальненьня ад працы.
Выводзілі нас на працу пяцёркамі. Трэ было ісьці цесна адна пры аднэй, не ступіўшы кроку ўлева ці ўправа, інакш лічылі за пабег і маглі расстраляць. Побач нас ішлі сабакі. На бушлатах былі панашываныя нумары, якія можна было прачытаць здалёку. Мой нумар быў АВ-4. У лесе расстаўлялі калкі, за якія ня можна было выйсьці. Хто б знайшоўся за вызначанай граніцай — расстралялі б. Аднойчы вартаўнік сказаў адной жанчыне прынесьці нешта, што ляжала на вызначанай граніцы. Калі яна пайшла па тую рэч і аказалася на граніцы, ён выстраліў і забіў яе. Пасьля сказаў начальству, што яна хацела ўцякаць. Быў чагось на яе злы й застрэліў.
Працавалі мы ад цямна да цямна, у буднія дні і ў нядзелі. Часта цэлы дзень бязь цёплай яды. Тады даставалі падвойную порцыю супу за абед і вячэру. Бывала, варочаліся зь лесу ў лягер такія змучаныя, што ледзь ногі цягнулі ды чуць маглі на свае нары ўзьлезьці. Ноччу, калі толькі пасьпелі заснуць, будзілі нас на разгрузку вагонаў. Надышлі якраз вагоны з мукой ці чымсьці іншым, і трэба было іх разгрузіць. Загадвалі браць на плечы мяшок і несьці яго. Ясна, што такога мяшка не магла я крануць зь месца, і зноў бяда была — крычалі на мяне й карцэрам страшылі. І так правёўшы цэлую ноч, рана мусілі ісьці на работу ў лес. Былі вялікія маразы, і мы мерзьлі. Завязвалі хустачкамі сабе насы, каб іх не адмарозіць. Ад дыху хустка рабілася мокрая, а пасьля замярзала й націрала нос. Раз на дзесяць дзён вадзілі нас мыцца ў лазьню. Таўкліся мы адна

каля другой, як селядцы ў бочцы. У норах нашых былі клапы й ноччу не давалі спаць. Парылі іх, але хутка яны ізноў аджывалі. Нанач баракі замыкалі. За сваёй патрэбай хадзілі ў парашу — вялікую кадзь, якая стаяла каля дзьвярэй. А яшчэ горш было, калі ў лягеры захварэлі на дызэнтэрыю. І я хварэла на гэтую хваробу.

Брыгадзірамі нашымі былі блатныя, якія мелі аказію пазьдзекавацца з палітычных, якіх яны не любілі й за нішто ўважалі. Палітычныя вязьні былі перамешаныя з крыміналістымі — рознымі зладзеямі й забойцамі. Горш было, калі выпала каму спаць каля блатной (крыміналісткі).

Вельмі часта загадвалі нам пераходзіць з аднаго бараку ў другі. Тады мы хапалі свае рэчы й беглі ў іншы барак, каб заняць лепшае месца. Часта, калі каму з палітычных удалося дабегчы й заняць тое лепшае месца, то прыходзіла блатная й сілай выкідала. А так было важна, хто каля каго спаў.

[**Па лягерох**

*Адпачынак. — Пад Божай апекаю. — Голад. — Сяброўствы. — Песьні. — Лазьня. — Сяньнік. — Машкара. — Манашка. — Калодкі. — Сны. — Стася. — „Камсамольская“ будоўля. — Хваробы. — 4-я катэгорыя*]

На калёніі 09 была я нядоўга. Прыехала лекарская камісія й мяне залічыла да слабых. Паслалі на адпачынак. Як выглядаў наш адпачынак на новым месцы? Працы на норму мы там не выконвалі. Забясьпечыць лягер дровамі мусілі самі. Не было тут ніякіх машынаў, і прыходзілася прыносіць дровы на сваіх плячах. Так два разы да абеду ішлі мы ў лес 3 км пехатой, пілавалі дровы, бралі чуркі на плечы й несьлі іх у лягер. Яшчэ два разы туды й назад ішлі й па абедзе: разам — 24 км у дзень зь цяжарам на плячах. Ад такога адпачынку ледзь на нагах я стаяла. Хадзілі таксама на станцыю (7 км ад лягеру) па муку, якую несьлі, паклаўшы на палку, удзьвёх на плячах. Была я слабая й ніяк не магла скрануць мяшка зь месца. Вартаўнік крычаў на мяне, штурхаў, біў кулаком па галаве, але нічога не памагала — мяшка ўзяць на плечы я не магла. Калі мы вярнуліся ў лягер, сказаў начальству, што я працаваць не хацела. Загадалі пасадзіць мяне ў карцэр. Аднак не пасадзілі, бо сказала я вартаўніку, які адмыкаў карцэр, што я вельмі хворая. Ён завёў у санчасьць — там праверылі й адпусьцілі.

У гэтым лягеры перажыла я нешта вельмі прыемнае й адчула над сабою апеку Божую. Хоць няраз я кепска чулася, ніколі ў санчасьць не хадзіла, і ніхто мяне там ня знаў. Аднак аднаго дня, вярнуўшыся з работы змучаная да апошняй сілы, паваліўшыся на свае нары, каб адпачыць, раптам зь іх сарвалася й пабегла ў санчасьць, кіраваная нейкай вышэйшай сілай. У санчасьці сядзела некалькі чалавек, адзін у афіцэрскай форме. Накіравалася я проста да гэтага афіцэра, кажучы:
— Господин доктор, я не больная, но очень устала и прошу дать мне один день отдыха.
Адкуль я ведала, што гэта доктар, сама ня ведаю. Ён загадаў мне разьдзецца й выслухаў мяне.
— Вы, — кажа, — просите дать вам один день отдыха, а я даю вам две недели. Идите в барак и завтра на работу не выходите.
Падумала я, што ён зь мяне сьмяецца, і ня кратаюся зь месца. Як гэта можа быць! На 09 калёніі была я так моцна хворая, мела тэмпэратуру, і ніхто мяне з працы ня звольніў, а тут даюць два тыдні адпачыць. Стаю, ня веру, што гэта праўда, і не кранаюся зь месца.
— Идите и отдыхайте.
Вярнулася я ў барак і ня ведаю, што рабіць. Зажартавалі зь мяне ў санчасьці ці сапраўды далі аж два тыдні адпачынку? Пра тое расказала адной сяброўцы. І што я пачула! У гэты дзень клікалі ў санчасьць усіх слабых і давалі кожнай два тыдні адпачынку. Значыць, і мне далі. А я пра нішто ня ведаючы, кіраваная якойсьці сілаю, сама пайшла туды, хоць дала была сабе слова ніколі не хадзіць у санчасьць.
Была вясна, яшчэ машкара не паявілася й я адпачывала; яшчэ ў тым часе прыйшла пасылка ад цёці, і я вельмі ўзмоцнілася. Пасьля двух тыдняў прадоўжылі мой адпачынак яшчэ на два тыдні.
У адпачынкавым лягеры перажылі мы страшны голад. Не прывезьлі на час прадуктаў і ня стала чаго есьці. Гэта было нешта страшнае. Давалі нам толькі нейкую мутную поліўку. Не было ні хлеба, ні бульбы — нічога.
Хачу тут сказаць, што ў турме й лягеры я вельмі многа малілася. Старалася сябраваць зь людзьмі, якія моцна верылі ў Бога. Шкадавала вельмі, што, будучы на волі, так мала цікавілася справай свае веры, не чытала рэлігійных кніг, не імкнулася паглыбіць сваю веду. І вось, трапіўшы ў лягер,

адразу ж, гэтага самага дня спаткалася зь вельмі пабожнай і цікавай жанчынай, якая сядзела за веру ў Бога. Была гэта масквічка-піяністка. Бацька яе быў паляк, а маці — француска. Называлася яна Зоф'я Эйсмант. Знала яна добра Эвангельле й прачытала многа рэлігійных кніг. Вось яна пачала рабіць мне рэлігійныя даклады й падтрымліваць мяне на духу. Як толькі станавілася мне невыносна цяжка на сэрцы, я бегла да яе й супакойвалася. Такой, як яна, была й яе прыяцелька Кузьняцова зь Ленінграду, якая таксама сядзела за свае рэлігійныя перакананьні. Я запрыязьнілася й зь ёй, але ўжо на іншай калёніі, расстаўшыся з Эйсмант.

У лягеры я старалася ня траціць дарма часу й па меры магчымасьці паглыбляць сваю веду. Так я зблізілася з украінкай — старэйшай жанчынай, настаўніцай расейскай мовы й літаратуры. На работу ішла зь ёй у аднэй пары, а ідучы, задавала ёй розныя пытаньні, а яна мне адказвала. Дзякуючы ёй, бліжэй пазнаёмілася з расейскімі клясыкамі. Яна ўмела доўгія вершаваныя творы напамяць. Ішла й мне дэклямавала. І яна, і Эйсмант былі вельмі прыгожыя. Дружыла я зь літоўкамі й полькамі. Пазнаёмілася з дачкой прафэсара Віленскага ўнівэрсытэту Анеляй Дзявульскай. Яна вельмі мужна зносіла ўсе цяжкасьці лягернага жыцьця, хоць была слабая й сядзела доўга. Была там і вучаніца праф. Іваноўскага — інжынэр па прафэсіі, полька Гражына Ліпіньская, цікавая жанчына, вялікая прыяцелька беларусаў. Матка яе, Сакалоўская, была пісьменьніцай. Са сп-няй Гражынай мы былі вельмі блізка й часта гутарылі. (І Анеля Дзявульская, і Гражына Ліпіньская жывуць цяпер у Варшаве.) Між іншым мушу сказаць, што Ліпіньская сядзела ў турме разам з Ларысай Геніюш і нашай настаўніцай беларускай мовы з гімназіі сп-няй Аленай Сакаловай-Леканд.

Нейкі час побач мяне спала Марыя Гэрман зь Вільні. Яна мела фэнамэнальную памяць і вельмі прыгожа расказвала прачытаныя кнігі. Умела на памяць шмат доўгіх беларускіх твораў. Вярнуўшыся зь лягеру, жыла пад Варшавай у старэчым доме ў Хыліцах, там і памёрла.

Жыла я добра з савецкай беларускай Марыяй Івановай — географам, жонкай савецкага капітана.

Зблізілася я з Бухарына жонкай. Ад яе вучылася ангельскае мовы. Нам забаранялі вучыцца чужых моваў, таму рабілі мы

гэта пакрыёму, хаваючыся. Другой маёй настаўніцай ангельскай мовы была праўдзівая ангелька з вышэйшай асьветай. Яна вельмі ахвотна мяне вучыла, але што ж, — калі пачыналі мы лекцыю, мне так моцна пачынала балець галава, што мусілі перапыняць вучобу.
Дружыла я таксама з Галінай Кобяк, полькай з Баранавіч. Яна, як і я, мела вельмі высокі ціск. Не дачакалася волі — памерла перад канцом свайго *сроку*. Сьмерць яе я вельмі перажывала. Дома ў яе быў муж і дзеці. Перад выхадам на волю рыхтавала яна для іх розныя падарункі: рабіла шыдэлкам <кручком> розныя каўнерыкі, ашлякоўвала хустачкі, шыла шапачкі. Паміралa ў нас раптоўнай сьмерцяй многа. Толькі й чуваць было аб нечыяй сьмерці. Адна нагнулася мыць падлогу і ўпала мёртвай. Другая павалілася, несучы дровы, трэцяя павалілася, адкідаючы сьнег і г.д.
Мне вельмі было шкада прыгожай маладой літоўкі, засуджанай толькі на 5 гадоў. Увесь час ня мела яна весткі ад бацькоў і калі нарэшце атрымала, памёрла, шчыпаючы сьлюду. Паміралі ўсе ад высокага ціску крыві, і я была на такую сьмерць прыгатоўленая.
Нас часта перавозілі з аднаго лягеру ў другі. Пасьля адпачынку трапіла я ў лягер, дзе працавалі на сьлюдзе.
Не было ў нашых лягерах сьведамых беларусак. Не лучыліся беларускі ў групы, як гэта рабілі іншыя нацыі. Не было чуваць беларускіх песень. Аж іншыя разьлягаліся на ўвесь лягер. Сумна было ў час гадавых сьвятаў, калі розныя нацыянальныя групы кожная сабе адзначалі сьвята. Можа, падзел беларусаў на каталікоў і праваслаўных быў віною гэтага. Ува ўсякім выпадку, не было з кім сустрэцца й адсьвяткаваць сваё сьвята, не было з кім пасьпяваць свае песьні. Інакш было ў Казахстане ў лягеры, дзе была Вэра. Там беларускі тварылі асобную групу, разам сьвяткавалі свае сьвяты й адна другой памагалі. Іх ня так часта перакідалі зь лягера ў лягер. А ў нас што пару месяцаў бралі на этап і разлучалі з тым, з кім чалавек пасьпеў запрыязьніцца.
Найбольш у лягеры было ўкраінак. Яны часта вельмі прыгожа сьпявалі. Як быў добры вартаўнік, то дазваляў сьпяваць. Песьні ўпрыгожвалі працу на сьлюдзе ўночы. Пад гукі песень лягчэй працавалася. Ах, як я любіла, калі яны сьпявалі. Некаторыя мелі такія прыгожыя галасы. Сьпявалі песьні старыя й новыя,

уложаныя вязьнямі. Сумныя былі гэтыя песьні. У іх расказвалі пра сваю цяжкую долю, пра сум па бацькаўшчыне й роднай хаце.
Працавалі мы на дзьве зьмены. Адзін тыдзень выходзілі на работу наноч, а другі тыдзень працавалі днём. Працуючы ўсю ноч, часта ня клаліся спаць днём, бо мусілі ісьці на нейкую іншую работу. Трэба было сьнег адкінуць або дроў напілаваць ці вагоны разгружаць.
Часамі выпадалі вольныя нядзелі, але не для мяне: мела я няшчасьце кожную такую нядзелю ісьці тапіць лазьню. Гэта была для мяне вельмі цяжкая работа. Калі загадвалі брыгадзірцы даць некалькі чалавек да працы ў лазьні для гарнізону, яна першым называла маё прозьвішча. Чаму яна заўсёды пачынала ад мяне, ня ведаю. Можа таму, што я была слабая й ня ўмела бараніцца, а можа таму, што не атрымлівала пасылак і не было чым адкупіцца. Ішло нас туды паліць лазьню пяць ці шэсьць асоб. Трэ было напілаваць і насячы дроваў, напаліць печы й вымыць падлогі, а найгоршая работа — наліць вады ў тры ці чатыры аграмадныя кадзі. Ваду выцягвалі абледзянелым вядром з такой жа абледзянелай студні, зруб якой быў пры самай зямлі. Стаялася над студняй, як над якойсьці *пропасьцю*. Шост таксама быў абледзянелы. Вось адна з нас, найчасьцей я, стаяла на лёдзе пры студні й выцягвала вядром ваду. Выцягнуўшы вядро, падымала яго ўверх, дзе стаяла іншая сяброўка па няшчасьці ды ўлівала ваду ў жолаб, па якім вада цякла ў кадзі. Як падымалі ўверх вядро, вада разьлівалася, абліваючы рукі й грудзі. Хутка на мне ледзянелі рукавіцы й вопратка. Стоячы над студняй, я дрыжэла ад страху, каб не пасьлізнуцца й не паляцець у глыбокую яму.
Часам восеньню вазілі нас на работу на *сельхозе*. Пераважна выбіралі бульбу. Калі я ехала першы раз на сельхоз, сказалі нам усім забраць з сабою апарожненыя сеньнікі. Як мы прыехалі на месца, нам загадалі здаць сеньнікі, каб напхаць іх саломаю. Калі сеньнікі напхалі, я кінулася шукаць свайго — бегала ад аднаго да другога й нідзе знайсьці не магла. Тым часам усе сеньнікі пахапалі, і я засталася безь нічога, бо мой нехта забраў. Напэўна, той нехта не прывёз свайго пустога. Усе пасьпелі ўвайсьці ў будынак і заняць сабе месца для спаньня на зямлі. Калі я туды ўвайшла, на зямлі не было ўжо вольнага месца, нават каб прысесьці. І так засталася я, наіўная, бязь

месца. Завялі мяне тады ў пражарку. Гэта была малая каморка, у якой сушыліся мокрыя бушлаты й валёнкі. І легла я на голай падлозе пад мокрай вопраткай у духаце й сырасьці.
Працавалі на полі ад цямна да цямна. Бульбу выбіралі з-пад сьнегу. Брыгадзірка ішла ззаду й падганяла ды правярала, ці чыста выбіраем. Былі мы такія галодныя, што елі сырую бульбу. Вярнуўшыся з поля, мылі рукі сьнегам. Аднаго году спалі мы ў бараках, у якіх пад нарамі стаяла вада.
Было ў лягеры шмат манашак, якія адмаўляліся ад працы. „Ня будзем на сатану працаваць“, — казалі яны. Помню такі выпадак. Вывелі манашку з карцэра ў кайданках на руках і павялі з намі на работу. Ветру не было, і таму паветра стаяла густое ад машкары. Машкара заўсёды зьяўлялася 15 чэрвеня й мучыла нас да 15 кастрычніка. Яна была горшая ад марозу, бо залазіла ўсюды й так моцна й балюча кусала, што цяжка было вытрываць. На работу мы выходзілі ў накамарніках. Да таго плялі вянкі зь зялёных галінак і надзявалі на галаву. Ідучы на работу, я часта думала, чаму нас ніхто не сьфільмуе. Ад машкары былі ў нас апухшыя твары, рукі й ногі.
Аднаго разу прывялі нас разам з манашкай у лес і загадалі працаваць. Манашка ад работы адмаўлялася, а вартаўнік пастанавіў яе прымусіць: загадаў ёй зьняць кашулю, узяць у рукі калодку й хадзіць кругом палянкі. На яе голыя плечы насела машкары й так пакусала, што пачала цячы кроў. А яна ішла з калодкай у руках і не магла машкары адганяць. Наканец паваліласа й зь зямлі не падымалася. Толькі было чуваць, як яна паўтарала: „*Господи, прости ему*“. Вартаўнік пастанавіў падняць яе зь месца, але гэта не ўдавалася. Тады паклікаў ён мяне й загадаў падняць манашку:
*— Если вы ее не поднимете, будете сами так, как она, ходить раздетой.*
Пачала я прасіць яе, каб пашкадавала мяне ды ўзьнялася, але яна мяне не паслухала. Вартаўнік сам падняў яе, загадаў стаць пад дрэвам, а нам разысьціся на бакі. Наступна ўзяў у рукі стрэльбу й выстраліў, але не ў манашку, а ўбок.
Часта, як мы несьлі дровы на плячах, вартаўнікі загадвалі зьняць накамарнікі й затрымацца на месцы з калодкамі на плячах. Кусала нас машкара, а яны любаваліся.
Калі мы хадзілі ў лес па дровы, то бралі [ў лесе] падрыхтаваныя калодкі з кучы. Кожная старалася схапіць

найлягчэйшую калодку. Ясна, што лягчэйшыя калодкі расхоплівалі наймацнейшыя, бо яны першыя дабягалі да кучы й сілаю адпіхалі слабейшых. Мне заўсёды даставалася найцяжэйшая калодка. І вось, падняўшы яе на плечы, адставала я ад іншых. Вартаўнікі на мяне крычалі, білі па галаве, страшылі расстрэлам, а я ніяк не магла прысьпяшыць кроку. Аднойчы за тое, што я адстала ад іншых, адзін вартаўнік, прывёўшы нас у лягер, калі ўсе скінулі свае калодкі з плячэй, загадаў мне са сваёй калодкай прайсьціся некалькі разоў кругом лягернага двара. Ад перамучаньня я павалілася на зямлю й самлела.

Часта ў лягеры былі эпідэміі. Як вышэй я ўспамінала, хварэла я разам зь іншымі на дызэнтэрыю. Хварэла часта й на грыпу. Помню, паявілася страшная грыпа. Тых, што захварэлі, забіралі ў шпіталь, аднак у шпіталі не хапіла месца для ўсіх. Калі я захварэла, загадалі мне ўзяць сяньнік ды коц і павялі ў гігіенічны пакой, дзе на падлозе, адна пры адной, ляжалі хворыя. Вартаўнік загадаў мне легчы на падлозе, але на падлозе не было месца й нагу паставіць. А ён крычыць: „Кладись!“ Але як — адна на другую? Не магла я легчы. Тады далі мне месца на стале. Мела я высокую тэмпэратуру й сільны галаўны боль. Лячэньне палягала на абніжэньні тэмпэратуры. Зьбіўшы парашкамі гарачку, хворага са шпіталя выпісвалі. Фактычна гэта быў не шпіталь, а толькі пакой для хворых пры санчасьці; калі ў ім [хворыя] не зьмяшчаліся, займалі гігіенічны пакой.

Ня ўсе ў лягеры працавалі цяжка. Лягчэйшую работу мелі брыгадзіры, працаўнікі санчасьці, бібліятэкі, капцёркі, гігіенічнага пакою. Яны былі лепш апранутыя, глядзелі на іншых звысока, пачуваліся лепшымі. Іх называлі *прыдуркамі*. Большасьць зь іх падслухоўвалі, пра што гутараць вязьні, даносілі начальству. Такіх даносчыкаў называлі *стукачамі*. Розныя пагалоскі пра амністыю ці пра новую вайну, якая вызваліла б нас ад лягера, называлі *парашамі*. Гэтыя парашы падтрымлівалі нас на духу. Былі частыя амністыі для блатных, але не для нас.

Мне часта сьніліся прарочыя сны, у якія я моцна верыла. Адзін сон растлумачыла я так, што ў 1955 годзе выйду на волю, таму й чакала гэтага году. Так і сталася. У 1955 годзе я выйшла на волю.

Неяк дзень за днём, ці лепш сказаць, ноч за ночай бачыла я ўва сьне сястру сваю Вэру, вельмі сумную й адну, бяз Славіка. Дзівілася я, чаму пры ёй няма сына. Урэшце ня вытрымала я й пытаю:
— Дзе Славік, чаму ты безь яго?
А яна на запытаньне не магла адказаць. Паўтарала толькі:
— Славік, Славік, Славік....
І я зразумела па яе міне, што Славік памёр, а яна ня можа выгаварыць гэтага слова. І вось я атрымала ліст ад цёці Гэлькі з паведамленьнем аб сьмерці Славіка. Гэтая вестка зусім вывела мяне з раўнавагі: схаваўшыся за барак, я пачала плакаць і дзёрці да крыві твар і рукі. Калі прыйшла наглядчыца, я назвала яе забойцай. Крычала:
— Гэта вы яго забілі, замардавалі нявіннае дзіця.
Я да таго разышлася, што мяне хацелі пасадзіць у карцэр. Аднак да гэтага не дайшло. Начальнік, да якога мяне прывялі, прачытаўшы атрыманы мною ліст, адпусьціў мяне. І ад гэтага часу пачаў мяне заўважаць у лягеры, а прыйшоўшы ў барак, заўсёды пытаўся мяне, ці перастала ўжо плакаць.
Здарыўся быў у нашым лягеры такі выпадак. Адна літоўка-настаўніца, якая працавала кавалём (называлася яна Стася), выйшла зь лягера адна, каб навастрыць пілы брыгадзе, што працавала ў лесе. Ідучы лесам, яна зьбілася з дарогі й заблудзіла. Кідаючыся то ў адзін, то ў другі бок, адышла ад лягера 30 км. А тут вечар настаў і надышла бура зь перунамі. Было лета, і яна выйшла ў аднэй сукенцы. У лягеры паднялі алярм. Думалі, што яна ўцякла. (За гэта каралі расстрэлам.) Пачалі шукаць. Выйшаў на пошукі цэлы гарнізон, і ня толькі нашага лягеру, але й суседніх. Шукалі цэлую ноч і цэлы наступны дзень. Знайшлі на другі дзень пад вечар — прамокшую й ледзь жывую. У лесе было поўна дзікіх зьвяроў, машкары ды камароў — бязь ліку. Ацалела яна дзякуючы таму, што натрапіла па дарозе на недапаленае вогнішча. Пры ім затрымалася й пачала падкідаць дровы да агня. Кругом выліся зьвяры. Да яе прыбліжаўся рысь (відаць было яго сьляды), але не пасьпеў накінуцца на ахвяру. Знайшоў яе адзін жаўнер, едучы на кані, і на кані ж прывёз яе ў лягер. Усім яна расказвала, якое пекла перажыла праз ноч у лесе, страціўшы надзею на тое, што яе нехта знойдзе.
Уцячы зь лягеру было немагчыма. Зімой кожны сьмялок замерз

бы ад марозу, а летам заела б машкара й дзікія зьвяры. Усё ж знаходзіліся такія, хто спрабаваў уцячы. Нам часта чыталі аб спробах пабегу й аб расстрэле ўцекачоў.
У часе працы на сьлюдзе чыталі нам газэты, пераважна „Московскую правду“. Аднойчы пачалі нам чытаць, як камсамольцы паехалі дабравольна на Ангару й збудавалі на гэтай рацэ электрастанцыю. Чуючы гэтуюману, [людзі] ў цэху ўзьнялі крык. Шмат хто з прысутных тут працавалі на пабудове гэтай электрастанцыі й ведалі, колькі вязьняў загінула пры гэтай працы. Акрамя вязьняў, ніхто іншы гэтай электрастанцыі не будаваў. У цэху крычалі:
— І я там была...
— І я таксама...
— А ніякіх камсамольцаў ня бачылі.
Цярпелі мы зімой ад сільных маразоў, летам ад сьпякоты, машкары й камароў, а зімою й летам ад голаду. Не хапала нам нават хлеба. Лягчэй жылося тым, хто атрымліваў пасылкі. Ведаючы, што, акрамя мяне, знаходзяцца ў заключэньні мае браты й Вэра, напісала я цёці, каб мне нічога не прысылала, бо ўсяго мне хапае. Хацелася, каб лепш цёця дапамагла братом, якія даўжэй ад мяне былі ў лягеры. А была такая галодная, што калі, працуючы ў гарнізоне, убачыла лісточкі капусты, якія плавалі ў вядры, то падышла да гэтага вядра, лісткі выцягнула й зьела. А вядро гэтае было з бруднымі памыямі, і я ня ведала, хто што ў яго рабіў ці кідаў. Пра гэта я й ня думала. Як я ўжо ўспамінала, часта мне прыходзілася быць на штрафным за невыкананьне нормы. Помню, неяк вечарам стаю я галодная пры печцы ды ўздыхаю: „Божа мой, Божа, да чаго я дажыла! Ужо й хлеба мне не хапае“. У гэты момант падышла да мяне адна расейская жанчына зь Ленінграду, *Надежда Ивановна Тимофеева*, ды кажа:
— Я слышала, что вы на штрафном, так возьмите мою пайку хлеба.
І сілай упіхнула мне сваю пайку, хоць сама таксама пасылак не атрымлівала. Добрая была кабета. У часе блякады Ленінграду страціла адзінага сына.
Праца на сьлюдзе не была здаровай. Цэлы дзень ці ноч трэба было ўдыхаць сьлюдзяны пыл. Шмат хто хварэў на гіпэртанію, як і я. Галаўны боль узмацняўся, і часам я не магла вытрываць болю. Часамі не магла павярнуць галавы ў другі бок або

ступіць кроку: кожны балючым уколам аддаваўся ў мозг. Кожны дзень хадзіла пасьля працы ў санчасьць і прасіла, каб мне далі парашок ад галаўнога болю. Аднойчы ў часе працы на сьлюдзе так разбалелася галава, што я перапыніла работу й выйшла з бараку на паветра. За мной выбегла брыгадзірка й пачала крычаць, гонячы назад у цэх. А ў мяне вочы мутныя й не магу падняцца зь месца. Загадала яна ісьці ў санчасьць. Далі мне парашок, але ён не памог. Праз гадзіну я зноў зьявілася ў санчасьць па парашок. Пачалі крычаць, што нядаўна мне ўжо давалі. На маё шчасьце, была ў санчасьці вольная лекарка. Запыталася яна, ці мералі мне калі-небудзь ціск крыві. На мой адмоўны адказ, узяла яна апарат і зьмерала. Рукі ў яе затрэсьліся, бо, напэўна, ціск быў вельмі высокі. Яна не магла знайсьці маёй карты — так у яе дрыжалі рукі; загадала ісьці ў барак, легчы ў пасьцель і не выходзіць заўтра на работу. Чуючы, што я сплю на верхніх нарах і не змагу ўзлезьці наверх, загадала паклікаць майго брыгадзіра, каб палажыць мяне на ніжніх нарах. Калі брыгадзірка сказала, што на ніжніх няма месца, бо там сьпяць самыя хворыя й інваліды, доктар адказала:

— Я знаю вашу брыгаду. У вас адзін хворы чалавек, і гэта Катковіч.

Хутка пасьля гэтага адправілі мяне ў шпіталь. Была я там два месяцы. Ад часу да часу й там хадзілі мы на працу. Аднойчы позьнім вечарам мы пайшлі ў кухню чысьціць бульбу. Далі нам там зьесьці па куску рыбы. Я так <атрулася> гэтай рыбай, што расхварэлася, і паднялася ў мяне вельмі высокая тэмпэратура. Пампавалі мне жывот і ноччу, што некалькі гадзін, давалі па тры парашкі. Падлячыўшы мяне крыху, выпісалі са шпіталя, даючы 4-ю катэгорыю — інвалідзкую. Так з катэгорыі 1-й пераскочыла я адразу на 4-ю, якую павінна была мець ад самага пачатку, г.зн. ад прыезду ў лягер. Ці хто паверыць, што з такім высокім ціскам я валіла й карчавала лес, разьбіваючы замерзлую зямлю кіркай, працавала на сельхозе й на сьлюдзе. Як вярнулася са шпіталю, далі мне працу лягчэйшую. Трапіла ў хлебарэзку. Тут мела пад дастаткам хлеба. Так працавала я сем месяцаў, пакуль не перавялі мяне на іншую калёнію, на якой ізноў пайшла на сьлюду. Ізноў чулася вельмі кепска й цярпела ад сільнага галаўнога болю.

**Пасьля сьмерці Сталіна**

[*Вэра й Франак. — Джэзказганскае паўстаньне. — На волю*]

У гэтым часе прыехалі да нас Вэрыны сяброўкі з Казахстану. Бачачы, у якім цяжкім стане я знаходжуся, напісалі яны ліст да Вэры й да майго малодшага брата Франка ў Варкуту. Аказалася, ім лепш паводзілася, чым мне. Так Вэра й Франак пачалі мне памагаць. Вэра прысылала пасылкі, а Франак грошы, хоць абое былі, як і я, вязьнямі. Дзякуючы іх помачы я стала на ногі й не памерла ў лягеры, як было зь іншымі.

Вэра знаходзілася ў Казахстане: Карагандзінская вобласьць, Кінгірскі раён, с/с Джэзказган. У яе лягеры былі крыху лепшыя ўмовы, чым у нашым. Прынамся, не перакідалі іх з аднаго ў другое месца. Спачатку й яна цяжка працавала на каменяломах. Пазьней, беручы пад увагу яе слабое здароўе, далі ёй работу ў пашывачнай. Шылі яны сукенкі ды іншую вопратку для вольных жанчын. Нават з Масквы прыяжджалі да іх элеганткі, каб заказаць сабе сукенку. Супакоіўшыся крыху пасьля сьмерці Славіка, яна ня чулася так кепска.

Перажыла яна лягерны бунт, які скончыўся страшнай трагедыяй.

Побач зь іхным лягерам быў лягер для мужчын, мясьцілася ў ім, здаецца, 10 тысяч вязьняў. Мужчыны пачалі дамагацца, каб хоць раз на месяц дазволілі ім адведваць сваіх блізкіх у жаночым лягеры. У некаторых [у жаночым лягеры сядзелі] жонкі, сёстры ці маткі. Калі іх дамаганьні засталіся без адказу, пастанавілі мужчыны ўвайсьці ў жаночы лягер сілаю. Пачалося ўсё, калі прывязьлі да мужчын вялікую колькасьць блатных. Яны гэты бунт распачалі. Выйшлі грамадою разьбіваць мур, які акружаў жаночы лягер. У іх стралялі, яны падалі мёртвыя, а ўсё ж ішлі наперад і прарваліся ў жаночы лягер, выгналі вартаўнікоў і ўзялі ў свае рукі ўладу. Трымаліся 40 сутак, пакуль не сьцягнулі войска з танкамі. Ноччу, калі ўсе спалі, [вайскоўцы] пад'ехаўшы на танках, пастралялі вартавых на вышках і ўварваліся ў лягер. Стралялі з кулямётаў у баракі, і калі сарваныя са сну людзі выбягалі з гаручых баракаў, ехалі па іх танкамі. Кроў лілася ручаямі. Перажылі вязьні дантэйскае пекла. Усіх правадыроў бунту расстралялі. Гінулі пад танкамі ні ў чым не вінаватыя вязьні. Патушыўшы бунт, разаслалі вязьняў ува ўсе бакі Сібіру. Частка трапіла і ў мой лягер. Вэра засталася на старым месцы й далей працавала ў пашывачнай.

Яна цудам ацалела. Мала не хапіла таго, каб яе пераехаў танк. Быў бунт вязьняў і ў Варкуце, дзе знаходзіўся мой брат Франак. Колькі надзеі на вызваленьне прынесла вестка пра сьмерць Сталіна! У лягерох наступілі зьмены на лепшае. Пачалі мы атрымліваць грошы за работу, зарганізаваліся розныя гурткі: вывучэньня чужых моваў, вязаньня, шыцьця й крою й т. д. Паявіліся *ларкі,* дзе можна было купіць якія-небудзь прадукты. Далі больш хлеба, і перасталі мы галадаць. Пачалі пісаць просьбы аб перагледжаньні нанова справы. Напісала й я за сябе ды за Вэру.
Паступова выпушчалі на волю. Першыя пайшлі немцы. Дачакалася й я гэтага радаснага дня. Раней, чым мяне адпусьцілі, атрымала тэлеграму ад Вэры: „Еду дамоў, чакаю цябе“. Паехала я месяц пасьля яе. Сказалі мне ісьці афармляцца на другі дзень Калядаў 1955 году. Выхадзіла на волю „*со снятием судимости и поражения в правах*“, г.зн. апраўдалі. Я мела грошы й магла варочацца на бацькаўшчыну пасажырскім цягніком з усімі выгадамі й месцам для спаньня. Ізноў ехала праз Маскву і ў ёй перасядала на другі цягнік. Праз тыдзень дабралася.

**У родным Будславе**
Прыехала ноччу. Не хацела чакаць на станцыі да раніцы й, пакінуўшы свае клумачкі ў нейкай хаце, пайшла ў мястэчка. Было цёмна, і я зьбілася з дарогі. Ішла полем у сьнязе па пояс. Выйшла дзесь каля двара Аскеркі. Убачыла касьцёл і накіравалася ў яго бок. Дайшоўшы да мястэчка, затрымалася каля касьцёла й, узышоўшы на высокі ганак, укленчыла насупраць аўтара й абраза Маці Божай, дзякуючы Богу за шчасьлівы паварот зь няволі[27]. Пасьля пайшла да цёткі Гэлькі. Пастукала ў вакно й адазвалася. Выбегла цёця зь дзядзькам мяне спаткаць. А я стаю абарваная й да сябе непадобная. Убачыўшы мяне такую, дзядзькі <дзядзька й цётка> заплакалі. Супакояцца крыху, а глянуць на мяне — і зноў заплачуць. Вэры не было дома. Яна гасьціла ў Крывічах у сваёй сьвякрухі. Паеўшы крыху, палажылася я спаць на пасьцель, якую хутка падрыхтавала мне цёця. Лягла я на падушку — першы раз пасьля шасьці гадоў, прыкрылася не бушлатам і брудным коцам, як дагэтуль, а пярынай. Папросту ня верылася, што так выгадна сьпяць людзі на сьвеце.

[27] Абраз Будслаўскай Маці Божай лічыцца цудадзейным. Апошнім часам аднавілася традыцыя паломніцтва да гэтага абраза.
Пачалі прыходзіць крэўныя й знаёмыя. Расказам не было канца. Хутка й Вэра вярнулася з Крывічоў. Нарэшце мы зь ёй спаткаліся ізноў. Яна ўмела шыць, і мы адразу заняліся шыцьцём. Вэра кроіла, дапасоўвала, а я абкідвала швы, падшывала, прышывала гузікі. Цёця наша распальвала жалезка <прас>, разьдзьмухвала яго й падавала нам. Прытым цешылася нашай работай і кліенткамі, якіх мы мелі вельмі многа. З усёй [Маладэчанскай] вобласьці ехалі да нас савецкія элегантткі заказаць сабе сукенкі. І тыя сукенкі нам надзіва ўдаваліся. Усе былі задаволеныя, і слава аб нашым шыцьці разыходзілася далей і далей. Як жа цёця з гэтага цешылася! Дарагая наша цёця Гэлька, дзякуючы якой я выйшла на волю, бо, калі б яна не прыслала была мне пасьведчаньня зь сельсавету, што прыме мяне да сябе й дасьць утрыманьне, мяне б на волю ня выпусьцілі. Было многа такіх у лягеры, якіх ніхто не хацеў прыняць да сябе, нават родныя дзеці, і тыя, адседзеўшы кару, ня мелі куды ехаць. Трэ было бачыць роспач гэтых людзей. Гадамі чакалі на хвіліну спатканьня зь дзецьмі, а яны іх прыняць не хацелі, да бацькоў родных не прызнаваліся. Пакуль жыў Сталін, ніхто дамоў не варочаўся. Адбыўшы кару, [чалавек] выходзіў за вароты лягера й пачынаў жыць нанова, ня надта аддаляючыся [ад месца зьняволеньня]. Так, выпусьцілі на волю адну польку са Львова, Гросэк (?), якая была інвалідам і мела вельмі слабое здароўе, яна, выйшаўшы за агароджу лягера, села пад плотам, ад лягеру не адыходзячы. Нейкія вольныя полькі гэта ўбачылі й ёй заапекаваліся. Пастараліся адаслаць яе ў Польшчу. Там яна хутка памерла. Будучы ў Будславе, сустрэліся мы зь Мецькам Чантарыцкім[28], які, так як і мы, вярнуўся з савецкага лягеру. Ён адседзеў 10 гадоў на Калыме. Цяпер Мецька жыве ў Рыгораве каля Вільні. Браты мае вярнуліся ў Будслаў раней за мяне. Аднак калі мы прыехалі, іх не было ў родным мястэчку. Пётрусь з жонкай знаходзіўся на працы ў Фінляндыі*****, а Франак — у жонкі за Даўгінавам. Празь нейкі час і яны прыехалі. Апавяданьням не было канца.

[28] З Чантарыцкіх паходзіць маці паэта Славаміра Адамовіча.

***** Верагодна, у Карэла-Фінскай ССР.
У той час у Будславе знаходзілася й Паўліна Мядзёлка. Працавала яна настаўніцай у будслаўскай школе. Хаця ёй матэрыяльна паводзілася добра, нікому з нас яна ані разу не прыслала пасылкі, да нікога з нас не напісала ліста. Пры сустрэчах зь ёю мы заўсёды спрачаліся. Яна хваліла жыцьцё ў Савецкім Саюзе, а мы ёй пярэчылі. Дзівілася з нашай моцнай веры ў Бога. Расставаліся мы зь ёй вельмі знэрваваныя й пастанаўлялі ніколі яе больш не адведваць. Празь нейкі час ізноў спатыкаліся й зноў спрачаліся. І сёньня не разумею, чаму яна была такая. Яе роднага брата бальшавікі расстралялі ў 1937 годзе за перапіску з бацькамі, якія жылі ў Польшчы. Паміма таго, што яна была цэлым сэрцам адданая савецкай уладзе, зьяўлялася яна вялікай патрыёткай беларускага народу. Гутарыла яна толькі па-беларуску, вельмі прыгожа прамаўляла, дырыгавала хорам, які сьпяваў толькі беларускія песьні. Хвалявалася, калі бачыла па-расейску напісаную аб'яву на дошцы, што стаяла на рынку. Тады брала анучу ў рукі, ішла да дошкі, як ніхто ня бачыў, і сьцірала расейскі надпіс. Гэту самую аб'яву пісала па-беларуску. Увайшоўшы ў кнігарню й бачачы, што на першым месцы ляжаць расейскія кнігі, загадвала палажыць на бачнае месца кнігі беларускія. Многа рабіла такіх учынкаў, якія сьведчылі пра вялікую яе любоў да беларускае мовы й народу.

**Эпілёг**

У Будславе мы доўга не затрымаліся: прыйшлі нам выклікі з Польшчы, і мы паехалі туды. Веру выклікаў да сябе ейны муж, а мяне — стрыечны брат Юзік Таргоньскі. Выехалі мы з Будслава ў кастрычніку 1957 году. Вэра накіравалася ўва Ўроцлаў, а я — у Ольштын.
Будучы ў Будславе, мала каго спатыкала са старых знаёмых. Мястэчка ў міжчасе разраслося, але жыхарамі яго былі новыя людзі, пераважна тыя, што прыехалі з акалічных вёсак. Шмат хто выехаў быў у Польшчу на так званыя *Ziemie odzyskane*[29]. На гэтыя землі варочаліся й вывезеныя бальшавікамі ў далёкі Сібір ці Казахстан жыхары Будслава. Наш дзядзька Адольф вярнуўся зь сям'ёй, хоць ня цэлай, у Слупск. У Казахстане засталася Валіна першая дачка, якая там памёрла. Васілевічы прыехалі ў Цеханаў. Таксама ня ўсе, бо старая Васілевічыха памёрла ў

Казахстане. Не вярнуўся назад зь Сібіру малодшы сын Краўчонкаў Юзік. Памёрла на Сібіры Анця Грышкевіч. Не было між жывымі Генюся Чантарыцкага, Франі Грышкевічыхі, Чэся Васілевіча. Апошняга забралі бальшавікі, як толькі прыйшлі ў Будслаў, і сьлед па ім загінуў. Ян Краўчонак ад заканчэньня вайны да сёньняшняга дня знаходзіцца ў Польшчы ў шпіталі для псыхічна хворых. Жывуць у Польшчы Юзя Чантарыцкая й Тамаш Грышкевіч. Загінуў у Савецкім Саюзе Ўладзіслаў Альшэўскі. Памёр у дарозе на Сібір сакратар гміны Жалундкевіч.

[29] *Ziemie odzyskane* (*польск.* вернутыя землі) — усходненямецкія тэрыторыі, якія пасьля другой сусьветнай вайны паводле рашэньня саюзьнікаў адышлі Польшчы як кампэнсацыя за Заходнюю Беларусь і Заходнюю Ўкраіну. Дарэчы, гэтыя тэрыторыі засяляліся пераважна т.зв. рэпатрыянтамі, сярод якіх было шмат беларусаў і ўкраінцаў, што ратаваліся ад бальшавізму.

Адведваў нас у Будславе кс. Антон Дулінец, які таксама доўгія гады быў на Сібіры й вярнуўся з „раю“ амаль што разам з намі. Ён знаў амаль усіх ксяндзоў-беларусаў і сам быў беларусам. Казаньні ў касьцеле гаварыў па-польску, але ўводзячы цэлыя беларускія сказы. Ужо ён не жыве, памёр па дарозе з плябані ў касьцёл. Упаў і больш не падняўся. Гэта здарылася пасьля нашага выезду ў Польшчу.

Цяжка было нам пакідаць роднае мястэчка ды расставацца з братамі й дзядзькамі. Заставаліся ў Будславе магілы нашых дарагіх бацькоў.

Сьвятой памяці Эдвард Будзька, залаты чалавек, і ягоная сям’я праз усе гады маёй вучобы ў гімназіі ды на ўнівэрсытэце памагалі мне матэрыяльна ды ў цяжкіх хвілінах падтрымлівалі на духу. Цяпер дарогі нашыя разышліся, але працягваецца надалей прыязь, доказы якой маю на кожным кроку: і надалей апякуецца мною, як сваёю, сям’я Будзькавых. Адплачваю ім за ўсё гарачай малітвай, бо толькі так магу адудзячыцца за іх добрае сэрца, за памяць пра мяне. Адначасна застаюся такой, як была ў Вільні, — шчырай беларускай, якая нэрвуецца й церпіць, калі пачуе хаця б насьмешку зь беларускае мовы ці народу. А які боль задае сэрцу вестка пра мучаніцкую сьмерць якога-небудзь дзеяча беларускага, гэтага й апісаць немагчыма.

*Публікацыя Ілоны Ўрбановіч-Саўкі й Зьмітра Саўкі*

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

---

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

**Віталь Стахіевіч**
**Kasia**

---

Кася Камоцкая.
Мне падабаецца Кася Камоцкая.
Прывабная жанчына
З сумнымі вачыма.
Мне падабаецца Кася Камоцкая
Як прывабная жанчына
З сумнымі вачыма,
Якіх я ніколі ня бачыў.

Голас.
Самотны сіпаты голас.
Мяне непакоіць голас
Спадарыні Касі Камоцкай,
Таму што ён вельмі прыгожы,
Бо гэта пытаньне густаў,
Да таго ж мне падабаецца
Самотны сіпаты голас
Прывабнай жанчыны
Спадарыні Касі Камоцкай.

І песьні.
Я вельмі люблю песьні.
У песьнях гучыць адзінота.
А часам, калі сьпявае
Спадарыня Кася Камоцкая,

У тых песьнях гучыць адзінота.
Мне падабаюцца песьні,
Якія сьпявае Кася
Самотным сіпатым голасам.

І словы.
Лянівыя добрыя вершы,
Калі іх уважліва слухаць.
Нічога ня вартыя песьні,
Якія сьпявае Кася,
Бязь вершаў, якія складае
Прывабнай таемнай жанчыне
Спадар Міхал Анемпадыстаў.



Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

**Андрэй Хадановіч**
**Готыка**

---

Плынь уражаньняў сьвежых
змывае ізь зьвілінаў цьвіль.
Па байніцах і вежах
пазнаеш вялізарны стыль.
Сьвет аплатак і ружаў
сыгналы
здалёк табе шле.
Ты слухмяна напружыў
каналы
ўспрыманьня, але
недасяжныя шпілі
ды вычварныя вітражы —
ўсё ў вялізарным стылю
даводзіць, што ты тут чужы.
Нават замак душы
не пакіне надзей на заручыны:
ты чужынец на мшы,
недаверак, прафан, недалучаны.
На драўляным касьцёле
насеньне гвалтоўных гадоў
прарасьце, ды ніколі
ня ўгледзіш пладоў, пагатоў
без патрэбы прымус
ды прынука,
покуль хлус,

ашуканец, манюка
лухту адмыслова
вярзе, —
па-за ёю ні гука,
ні слова,
ты Страцім-Сэнс-Санс sans
paroles, балазе
з сама першага дотыку
ўсё ж адчуваеш прыемнасьць
закаханасьці ў готыку —
нават бяз мар пра ўзаемнасьць.

*Дэмбна Тарноўскае, верасень 1999*
*Зь нізкі “З замку ў замак*
*(галіцкі дывэртысмэнт-II)”*

[image]
[image]


Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 13-07-2000**

# Джэрам Чарын
# Чарнавокая задумлёнка з Магілёва

[ I. Ліст з Магілёва ] [ II. Бэмбі ] [ III. Лішай ]
[ IV. Дзіця пустыні ] [ V. Мадам Кюры ] [ VI. Уаят Ірп ]

*Прысвячаецца Фэйгеле і Сяржанту Сэму*

## I
## Ліст з Магілёва

[image]

Мы ішлі па адной, потым па іншай вуліцы, падзіўныя істоты ў кароткіх штонцах і ягоная маці, такой уразлівай прыгажосці, што замірала ўсё ваколле; мы апыналіся ў нейкім прыпаволеным сусвеце, дзе жанчыны, мужчыны, дзеці, сабакі, каты і пажарныя са сваёй машыны глядзелі ёй услед з такім пажадам у вачах, што я пачуваў сябе бандытам, які скраў яе, і цягне на далёкую ад людскіх вачэй гару. У 1942-м мне было ўсяго пяць гадоў: нервовае хлапчанятка, няздольнае кранацца па складах уласнае прозвішча. Мама насіла манто з нейкага, прыдуманае і скроенае па ўласнай мадэлі Сэмам, маім бацькам, старшым майстрам у атэлье аднаго маладзенскага кажушніка. Тое манто бацька вынес кантрабандай з фабрыкі, прызначалася для марскога флоту. Майстэрня, дзе працаваў бацька, мела кантракт з ваенным міністэрствам: гэта забавязвалася пастачаць флоту кажушныя куфайкі, і адміралы і шараговыя матросы не пакляклі ад хвалі ў сваіх агромністых браняносцах.

Час быў цьмяны і рамантычны. Бронкс не меў да

**Джэрам Чарын** (1937) — выкладчык эстэтыкі кіно і паліцэйскага раману ў Амэрыканскім Прыгажосці, аматар амэрыканскіх прадмэтаў і ўсяго, што мае адносіны да амэрыканскай культуры, аўтар дзьвюх кніг, дзесяткаў артыкулаў (пра Нью-Ёрк і Галівуд), дзіцячых сваіх кніжак, коміксы. Мае вялікую

надзейна абараняла яго з боку Атлантычнага акіяну і, калі верыць чуткам, тут з нейкай падводнай лодкі мецца на гумавых шлюпках варожы дэсант, заняць каналізацыю і захапіць жэрці нашу родную зямлю. Але цягам нашых праходжанняў разу не бачыў ніводнага нацыста. Зрэшты, якія шанцы на поспех мог мець нейкі нацыст побач з бліскучай постаццю маёй Маці ў чарнабуркавым манто? Нарадзілася яна ў 1911 годзе, які Джынджэр Роджэрз ды Джын Гарлаў*, аднак да працы і чакай не мела аніякага дачынення: яна была цудоўнай задумлёнкай з Беларусі, чарнавокай і чарнявай.

* Джынджэр Роджэрз і Джын Гарлаў увялі моду надаваць валасам плацінавае адценне. *(Заўв. пер.)*

Мы рабілі тыя праходкі не дзеля прыемнай прагулянкі. Мы штодня хадзілі на пошту: мама спадзявалася ліста з беларускага гораду Магілёва, дзе жыхарыў яе брат-настаўнік, які выгадаваў яе пасля смерці маткі. Я не надта цяміў, чаму той ліст не мог прыйсці на скрынку, што вісела на нашым доме. Няўжо немцы авалодалі Магілёвам, змушаючы дзядзьку ліставацца праз затайненую сетку савецкіх падпольшчыкаў?

Калі мама пераступала парог пошты, загадчык гэтай установы заўсёды выходзіў з-за перабойкі ёй настрэчу. Гэта быў хваравіты чалавечак, які хадзіў у пантофлях і любіў сварыцца на падначаленых. Аднак з хлапчанём чарнавокай задумлёнкі ён паводзіўся надзвычай прыязна. Ён вёў мяне за перабойку і паказваў свае „скарбы“, велізорную паштовую сумку, дзе ўнавал ляжалі знежывелыя лісты, знябожанае, нікім не запатрабаванае майно, насычанае сакрэтамі і жарсцямі ўсёй планеты. Я ў дзве рукі шарыў у той гурбе, разглядваў карцінкі на марках і дыхаў водарам клею, а загадчык тым часам ціснуў руку маме. Але нават гэты чарадзей паштовай сувязі не патрапляў з’яўніць жаднюськага лісточка магілёўскага паходжання.

Вяртаючыся дадому, беручыся з пагорку на пагорак, яна ўся трымцела. Ішла яна, як п’яная. Менавіта гледзячы на маму, я ўведаў, якую пагібельную моц маюць успаміны. Ёй мажлівілася выжыць толькі пры ўмове атрымання вестак з Магілёва, але ў разгар вайны да яе не дападала стуль аніводнага слоўка; адно скрыні знежывелых лістоў уздымаліся між Беларуссю і

рэчы і „Чарнавокая задумлёнка з Магілёва“ (Dark Lady from Mogulev) (1997), які павядае пра мінулае задумлёнкай з аўтара, якое прайшло ў Бронксе, і пра ягоныя беларускія габрэйскія карані.

Бронксам, як горы.
Яна пачала паліць цыгарэты. Я мусіў навучыцца гасіць сернікі, якія падалі ў яе з рук, спохвату заляпваць далоньмі языкі полымца, якое, здавалася, спараджалася самой яе ступою. Я зганяў пыл са сценаў памялом, сачыў за мамінай гуссю, адчыняў духоўку і тыкаў у птушку зубатым відэльцам, каб упэўніцца, што яна ўжо такая, як любіць бацька: карычневая, хрумсткая, нежавальная.
Я ставіў на стол віскі, наліваў бацьку чарачку і ўсчынаў безупынную балбатню, задаваў яму найдурнейшыя пытанні, якія адно прыходзілі мне да галавы, з адзінай мэтай — перакрычаць маміна маўчанне. Але як толькі ён сыходзіў з дому, яна пачынала паводзіць сябе так, бы ёй тэлефанаваў ейны брат з Магілёва (хоць у нас нават не было тэлефона): яна то смяялася, то плакала, а руская мова яе гучала настолькі мілагучна, што, ужо дарэшты збіты з панталыку, я прасякнуўся верай, што мова — заўсёды — нараджаецца ў нейкай прывіднай тэлефоннай слухаўцы.
Ангельская ж маміна мова была вызбыта ўсялякай музыкі; такая няпэўная, урывістая, быццам крывым языкам вымаўленая. Ды я быў кемлівы смаркач. Я ўскарасквауся на тыя фразы, як на шурпатыя калоды, і выкладаў сусвету ўласныя сказы-песні: „У моры, мам, патопла шмат разбіты карабель“. Я ніколі не быў у моры. Але мне зусім нескладана было ўявіць сабе неаглядную Атлантыку, дзе, падобныя да кракадзілаў, марадзёрылі нямецкія падлодкі. Мама абяцала звазіць мяне ў Мангетэн, па той бок мосту, каб паглядзець на прышвартаваныя на Гудзоне параплавы, няздатныя ваяваць. Аднак ліст з Магілёва зацьміў усе яе мары, яна няздольнілася задумаць нават маленькае падарожжа.

Так мы і заселі на перамеле ў Бронксе. Мама сумнела ўсё болей. Яна магла з гадзіну, бы ўкапаная, прастаяць перад люстэркам, з румянамі ў адной руцэ і памадай у другой, падмалёўваючыся. Затым на яе нападалі слёзы, і салёныя цуркі пляжылі ўсю працу. Я хадзіў за ёю следам на пошту; людзі пазіралі на задумлёнку, на тыя падцёкі макіяжу на шчаках, што раллёй пралягалі на яе абліччы, хоць мо й ні трохі не змальвалі ейнай вабы — паштар ставаўся тады ўдвая больш абыходлівы.

„Кавы, спадарыня Чарын?“ — пытаўся ён. А кава, між іншым, даставалася няпроста. А я ласаваўся цукеркамі і кубачкамі шакаладу, ад якога таксама вакол рота заставаліся вусы. Ды мама зусім заняпала духам. Боль усё мацней пазначваў яе рытуал.
— Ліст з Магілёва?
— Прыйдзе, прыйдзе, спадарыня Чарын. Рускія лісты гэтым і адметныя. Яны заўжды ідуць марудна, аднак абавязкова даходзяць.
Яго пантофлі прытанчвалі вакол яе, ён кідаў суворыя позіркі на падначаленых, піруэціў з каўнічкам у руцэ, але мама амаль не заўважала яго. Бо зусім не дзеля заўсёдніцтва ў ягонай гасцёўні яна дзень пры дні кідала выклік расчараванню. Каб прычараваць яе, не выстарчыла б ніякіх смакошчаў свету.
Сам я, можна сказаць, згубіўся ў моры. Я мусіў усюды быць побач з мамай, мусіў распранаць яе, мусіў смажыць гусь для бацькі. Аднак, мне шанцавала таксама. Мне можна было не хадзіць у школу. Бронксаўскія пачатковыя школы былі зачынены. Страшэнна не ставала настаўнікаў, і нехта даўмеўся, што пяцігадовай малечы накшталт мяне найлепей пільнавацца дому, гуляць з кубікамі ды ляпіць з пластыліну. Але ляпіць з пластыліну мне папросту не было калі. Мне патрэбна было дбаць пра маму. Я мусіў даглядаць маму, мусіў чыніць цуды спакусы, толькі б яна пачувала сябе лепей, мусіў даводзіць бацьку, што яна здаровая, як дуб. Я паіў Сэма віскі і джынам. Калі ён уставаў з-за стала, ягоныя вочы былі ўжо, як шарыкі лато. Ён задаваў маме пытанні, але адказваў на іх я, і раз, і другі, і трэці, аж покуль не зарабляў лупня.
„Не лезь не ў сваё проса, Бэбі“.
Бэбі — толькі так ён і менаваў свайго сынка, чым моцна ўбольваў яго. Я не ўмеў ні чытаць, ні пісаць, аднак умеў слухаць радыё. Я вычуваў усе зводкі ваенных паведамленняў, ведаў, што брытанскія дэсантнікі выселі ў Афрыцы на танках-амфібіях, углыбіліся ў пустыню, з двух бакоў атачылі афрыканскі корпус Гітлера і добра далі яму пытлю. Я прасіў бацьку, каб ён называў мяне „радавым“ ці „малодшым сяржантам“, аднак ён так і не назваў мяне „радавым“ ні разу. Сяржантам быў тата, а не я. Шыццё кажушкоў для процьмы адміралаў пасобіла яму ўхіліцца ад выправы на вайну, але ў яго ўсё-такі мелася свая ўніформа: белая каска накшталт

сатэйніка і белая нарукаўная павязка, аздобленая мудрагелістым знакам адрознення (блакітным кругам з чырвоным трыкутнікам пасярэдзіне і мноствам белых палосак). Бацька прымаў чынны ўдзел у Грамадзянскай абароне, выконваў абавязкі паветранага чувача. Ён меў званне сяржанта і начным часам хадзіў па вуліцах ды сачыў за тым, каб кожнае вакно ў межах яго акругі было належна замаскавана чорнай запавесай. Калі з вакна праточвалася святло, ён свістком барабаніў у аканіцу і галёкаў: „Гей, разумнічак, зараз жа выключы святло! Каменданцкая гадзіна!“ Калі таго не выстарчала, ён падклікаў „бобікаў“ альбо выклікаў правінаваўцу ў штаб Грамадзянскай абароны. Мой бацька быў бездакорны чувач, няўмольны з кожным, хто час-часам замахваўся на яго мізэрную ўладу, гатовы бясстрашна сустрэць гнеў сваіх сяброў, суседзяў, усіх, хто не выконваў правілаў. Крый бог было яму заспець вас на вуліцы пад час вучэбнай трывогі, тут жа б запраторыў у першае-лепшае сутарэнне. Адныя не зважалі на яго, іншыя абураліся, чубіліся, валілі яго долу, пакуль не набягалі іншыя чувачы ці не выручаў які „бобік“. Не дзіва, што яшчэ ў 1942-м, на сыходзе толькі першага году свайго шчыравання, ён ужо ўдастоіўся медаля з рук спадара мэра Лагвардыі, начальніка Грамадзянскай абароны. Я пачуў Лагвардыю па радыё: „Мы маем у Брукліне і Бронксе ўласных ваяроў, бяззбройных адважнікаў, якія надзейна ахоўваюць тыл ад усякіх сабатажнікаў ды антыпатрыётаў. Што б я рабіў без сваіх чувачоў?“

А калі тата вяртаўся дахаты з сінюшна зацеклым вокам, зламаным свістком і моцна пагнёнаю белай каскай, даводзілася менавіта мне, Бэбі, ламаць галаву, дзе адшукаць меркурахром, пакуль апанаваная роспаччу мама неварухліва сядзела ў гасцёўні і мроіла пра рускую пошту. У такія моманты ўласнай пакуты ён выяўляў значна большую абыходлівасць, і тады яго перапэцканы твар ставаўся амаль павабны. Ён сціскаў мне руку і глядзеў на партрэт Франкліна Дэлана Рузвельта на сцяне, пакуль я ватным тампонам прамываў яму вока.

— Як думаеш, Бэбі, можа мне варта Прэзідэнту напісаць?

— Ён дужа заняты, тата, ён завалены пісьмамі. Чувач не мае права скардзіцца. Ягоныя скаргі выглядалі б як данос, праўда? І праз цябе пра Бронкс пайшла б кепская слава.

Зразумелая рэч, я не мог выказвацца так гладка і прыгожа. У

мяне прагучала ўсё прыблізна гэтак: „Ды кінь ты, тата, Прэза. У яго пісем хоць заежся. Лепш не рыпацца. У Бронксе стукачоў кокаюць“.
Тата выдатна разумеў мае нацякі.
„Ты дзе гэта ўбачыў стукача?“

Аднак ён ніколі не наважыўся б даць мне таўхуна пры Франкліну Дэлана Рузвельту на сцяне. А мама, нават цягам сваіх мройных вандровак, шторазу, як запальвала свечку, бласлаўляла Ф.Д.Р. Кроў, што цякла ў яе венах, цякла і ў нашых венах.
Ды тата і не змог бы напісаць Рузвельту. Ён быў гэткі ж непісьменны, як я, гэтаксама бездапаможны перад асадкай. Ён ледзьве патрапляў накрэмзаць пару слоў у сваіх рапартах у Грамадзянскай абароне. Таму ён моўчкі пакутаваў і залізваў раны; і ў Святыя Дні, калі мы спраўлялі госці ў офісе, ягоны твар усё яшчэ быў у сіняках. Мне трэ было апрануць маму, упэўніцца, ці не пацякла туш. Мы хадзілі не ў Адат Ісраэль, храм на Грэнд-Конкарс з белакаменнымі калонамі і вялізнымі бранзаванымі дзвярыма. У Адат Ісраэль хадзілі ўсе дактары ды адвакаты, усё мільянеры. Набажэнства там правілася па-ангельску. Памочнікам рабіна ў Адат Ісраэль быў мастак і паэт у адной асобе. Увечары ён вучыў малечу нашага кварталу. Мы клікалі яго Ленам. Ён быў закаханы ў чарнавокую задумлёнку. З тае прычыны ён і падхвальваў мяне, з тае прычыны і залічыў мяне ў свой клас. Ён хацеў, каб мы перайшлі ў Адат Ісраэль, але бацька сказаў, што нагі ягонай не будзе ў святыні, дзе няма кантара. Вось у чым недахоп ангельскай мовы: кантару не было чаго спяваць там, дзе правілася па-ангельску.
Мы хадзілі ў старую сінагогу ля ўзбярэжжа, стараветнае збудаванне, з якога вывальвалася цэгла. Са скляпенняў на людзей сыпаўся дробны друз. З пачатку вайны ў сінагозе адбыліся ажно тры пажары, і над „самазапальнай бомбай“, як мы менавалі яе, паўсякчасна вісла пагроза закрыцця. Затое ў нас меўся Гілбэрт Раговін, які некалі быў тут харыстам, а пасля вывучыўся ў пеўчай школе ў Цынцынаці, у штаце Агаё. Наш кантар мог бы зарабіць невядома колькі, калі б спяваў на Пятай Авеню, але ён трымаўся Бронксу. Ён быў шышкай Цынцынацкай Оперы. Калі ён не спяваў у нас, ён іграў іспанскіх цырульнікаў і мараканскіх каралёў-вар’ятаў.

Ён пашлюбіўся з Мэрылін Краўс, зоркаю оперы, і заўсёды прыводзіў яе за сабой у нашу развалюху-сінагогу. Была яна нейкай геркулесавай прыгажосці, росту метр восемдзесят. Рукі ў яе былі, як у рэгбіста, а статура гамотная і рыхлая. Калі яна ўздымалася па сходках, што вялі на жаночую галерэю, лесвіца так і лекацела пад яе ступой. На галерэі яе сустракаў натоўп фанатак оперы, якія віталі Мэрылін крыкамі „Дэздэмана, Дэздэмана“, а я сабе думаў, ці часам не была і Дэздэмана яшчэ адной чароўнай задумлёнкай з Беларусі.

Я меў прывілею, мне дазвалялася сядзець у купе з мамай ды іншымі жанчынамі, з увагі на тое, што мне было толькі пяць гадоў. Дэздэмана важка плюхнулася вобак нас на вузкую банкетку, усклала свае магутныя рукі на жывот і, як адзінаўладная каралева, запанавала на галерэі. Яна памахала кантару рукой; той быў у белым стыхіры, ён быў памкнуўся гэтаксама махнуць ёй, ды раптам заўважыў жанчыну, што сядзела вобак жонкі. Такое ўражанне, што яму заняло духі. Як тым пажарнікам, што ўпершыню пабачылі маму. Заблуканая ва ўласным сусвеце паштовых скрынак, мама нават не ўсміхнулася яму. Кантар быў адзін-адным; ён не здольваў пранікнуць за павалоку той пабожнасці, што засцілала яе чорныя вочы. Ён як стаяў у атачэнні дзетак-харыстаў, так і заспяваў. Не, ён быў не такі, як паштар, што танчыў у пантофлях. Ён быў ахоўца музыкі наагул. Першымі ж гукамі ён вырваў маму з яе одуму. Адна жанчына самлела. Мяне паслалі па нюхальную соль для яе…

Ён, з цыгарэтай у зубах, абапіраўся на парэнчу. Кантарам не давалі паліць у вялікія святы. Але Раговін меў права на ўсё. Дэздэманы з ім не было. Ёй прыйшлося вярнуцца ў іх нумар-люкс у „Конкарс Плаза“. Мы з мамай пайшлі з сінагогі следам за нашым сяржантам Сэмам, героем мясцовага значэння, знаным з увагі на свае подзвігі пры выкананні службовых абавязкаў авіячувача. Ён быў супрацоўнікам паліцыі спецыяльнага прызначэння, і на твары ў яго заставаліся сляды раненняў. Кантар павітаўся з ім. „Сяржанце, я хачу найняць вашага хлопчыка“.

Ніхто з нас ніколі не бачыў кантара так зблізку; з носу ў яго тырчэлі кароткія белыя валасінкі. А пахла ад яго дзіўна, як ад адной чырвонай кветкі ў заасадзе Бронксу.

— Тое вялікі гонар для мяне, — сказаў тата. — Але чым я магу

ўслугаваць вам? Хлопчыку ўсяго пяць гадоў. Працаваць яму яшчэ нельга. Азбукі ж ён таксама яшчэ не ведае.
— Гэта сумная гісторыя. Мая старэнькая мама проста нажом мяне рэжа, каб я завёў сабе дзіцёнка. Мне нічога не заставалася, як прыдумаць, быццам у мяне ўжо ёсць малое.
— Вы нахлусілі ёй, настаўніку?
— О, сорам. Але мама амаль сляпая, яна жыве ў бронксаўскім прытулку для састарэлых. Я абавязаны яе ашчаслівіць, пакуль яна яшчэ жывая.
Раговін затуліў твар насоўкай і зарыдаў. Я ніколі не бачыў, каб кантар плакаў. Яго слёзы былі такія буйныя, як маміны крышталёвыя завушніцы. Тата прайняўся жалем да яго. „Настаўніку, прашу вас… Мы пазычым вам нашага Бэбі“. Ён разгублена і ўгневана абярнуўся да мамы. „Ды зрабі ты хоць што! Як можна стаяць і глядзець, як кантар плача!“

Не ведаю, ці і ў тую хвілю мама думала пра Магілёў. Але яна ўсё ж на момант выйшла са свайго трансу і ўляпіла Раговіну аплявуху. Тата зніякавеў яшчэ болей… Ніхто не даваў жонкам чувачоў паўнамоцтваў учыняць крымінальныя акты. Цялесная ж знявага кантара ў грамадскай мясціне была болей як крыміналам, гэта быў грэх супроць Бога, Бога, які з усіх сваіх стварэнняў наймацней любіў кантараў. Бог багоміў цудоўныя спевы.
А мама тым часам уляпіла Раговіну яшчэ адну аплявуху. Раговіна тое ніколечкі не збянтэжыла. Я заўважыў, што ён усміхаецца, затуляючы рот рукой.
Бацька сціснуў кулакі. „Я заб’ю цябе“, — сказаў ён задумлёнцы.
— Сяржанце, — сказаў кантар, — не варта ажно гэтак правакаваць пані. Бо яна яшчэ мацней улепіць мне.
— Не разумею, — патрос галавою тата.
— Ды ўсё вельмі проста. Мая законная сядзела на трыбуне побач з пані. Размова завялася пра мяне…
— Трыбуна? Законная? Нічога не разумею.
Я таксама нічога не цяміў. Я не пачуў ад Дэздэманы і жаднага слоўка…
— Ёлуп, — сказала мама тату. — Ніякага прытулку няма, ніякай сляпой маці. Яго мама і жарэ, і жлукціць, як конь.
— Нічога не разумею.
Мама ўхапіла Раговіна за вялікі палец і тыцнула ім сабе пад

грудзі.
— Цяпер ясна? Кантар юрлівы і пажадлівы.
Раговін нагнуўся да мяне і пацалаваў мне ручку — рыхтык які еўрапеец ці богведама хто — і рэтыраваўся ў свой гатэль.
Мой бацька так шчыра вырабляў кажушныя камізэлькі, што ягоны шэф выправіў яго на тыдзень адпачываць у Флорыду.
Людзі за ваенным часам рэдка ездзілі на вакацыі: армія і флот манапалізавалі чыгунку дзеля пастачання людзей і прыпасаў. Тату выдалі спецыяльны пропуск, падпісаны самім Фрэнкам Ноксам, сакратаром Міністэрства Флоту. Пагудкі пра Флорыду дайшлі да мяне, бадай, крыху пазней — Маямі-Біч быў раем для кажушнікаў, і фабрыканты і іх лепшыя рабачаі раз у год цешыліся адпачынкам у таварыстве тамтэйшых выляжанак ды наезных чарнавокіх задумлёнак з Гаваны і Нью-Арлеану. І калі слова „выляжанка“ нарэшце ў мае шэсць ці сем гадоў стала для мяне нешта значыць, тады мне сталася ўцямная і прычына сварак паміж мамай і сяржантам Сэмам у звязку з ягонымі адведкамі гатэлю „Флеглер“. Яна папускала яму ў галаву туфлі, выплюхвала на зямлю парфуму, якую ён прывозіў ёй з Флорыды, шпургала ў агонь здымкі, прыхаваныя ім у патайной кішэні сваёй валізкі. Кожным разам ён вяртаўся невераемна загарэлы: рыхтычак вінавата-ўсмешлівы Кларк Гейбл.
Ды ў 1942 годзе чароўная задумлёнка не заўважыла б і сапраўднага Гейбла. Мама нават не зірнула, як ён пакаваў рэчы. Гэты абранец флоту так спяшаўся на вакацыі, што не ўзяў нават сваёй белай чувачовай каскі, мне ж на тыя дні, пакуль яго не будзе, даў на кішэнныя траты ажно пяць аднадаляравых банкнотак, цэлы скарбік. Я быў шчаслівы, што ён паехаў. Мне ўжо не патрэбілася прыгожа ўбіраць маму, паабліва вычыпурваць яе дзеля таты, хаваць ад яго яе тугу, смажыць яму гусь, падліваць яму віскі, каб ён не заўважыў зацятага мамінага маўчання.
У той жа дзень, калі тата паехаў, прыехаў мамін уздыхач. Я не ведаю, як інакш менаваць яго. Ён выдаваў сябе за майго дзядзьку, аднак у яго не было ані нашых скулаў, ані нашых слынных татарскіх вачэй. Ён не мог належаць да таго племені мангольскіх габрэяў, якое наводзіла жах на ўвесь Каўказ, аж пакуль яго не зваяваў Вялікі Тамэрлан. Чык Айзэнштат быў вясёлым рыжым мацаком, які некалі разам з мамай працаваў у жаночым атэлье ў Мангетэне. Яна была краўчыхай да замуства.

У яе была закаханая ўся майстэрня, з Чыкам улучна, але адзіна ён дагэтуль захаваў повязь з ёю яшчэ з тых даўняў, калі крамка спыніла сваё існаванне. Перад самай вайной ён балаголіў. Чык быў адзіным маім „сваяком“, які сядзеў у турме Сынг-Сынг. Зусім няблага мець у сям'і сякога-такога рэцыдывіста. Ён ведаў процьму ўсякіх баек пра самых слынных бандытаў. Як быў абазнаны і ў распарадку працы майго бацькі. І з'яўляўся акурат тады, калі сяржант Сэм быў у ад'ездзе.
Ён забраў нас пакатацца ў сваім „кадылаку“. Паводле закону, Чык не павінен быў ездзіць легкавіком. Бензін выдавалі пад норму, а паездкі без пільнай неабходнасці забараняліся. Але Чык купляў на чорным рынку і соваў генералам ды чыноўнікам флоту шаўковыя панчохі для іхных жанок. У яго мелася пасведчанне, якое ўпаўнаважвала яго вазіць „важных асобаў“, дактароў, да прыкладу, ці магнатаў ваеннай прамысловасці. Паліцыянты паглядалі на „кадылак“, коратка — на маму, усміхаліся і называлі мяне „Рузвельтавым піянерчыкам“.

Мы прыехалі ў Мангетэн, і Чык павёў мяне паглядзець параплавы, што драмалі ў порце, падобныя да здарожаных, зморaных паненак, і нечуваная, нязведаная дасюль туга апанавала мяне. Параплаў здаваўся нечым неверагодным, адбіткам свету, якога я, з Бронксу, не мог асягнуць. Адзіным мостам для мяне быў Чык.
Ён ніколі не важыўся падкупляць мяне, ніколі не дарыў мне дарагіх падарункаў, якія б выклікалі ў мяне пагарду да таты. Аднак ён завёў нас у адзіны беларускі рэстаран на Грэнд-Конкарс, у „Сумныя арлы“, дзе нам з усіх бакоў дагаджалі ягоныя хаўруснікі; ён так і млеў за тым сталом, абедаючы ў купе са сваёй падпольнай сям'ёю. Сынг-Сынг моцна высівіла ягоныя валасы, і выглядаў ён як намарнелы на вайне шляхціц. Ён пільна паглядзеў на маму, якая разгублена ўталопілася ў сваю талерку з пірагамі, і сказаў: „Нешта не так, Фэйгеле?“
Маму звалі Фані, але ўсе яе адаратары і сябры клікалі яе Фэйгеле, што, паводле майго татарскага слоўніка, азначала „птушачка“.
— Магілёў, — сказала мама.
Адно слова, і Чыку ўсё стала ясна.
— У цябе ж там брат-настаўнік. Ад яго няма лістоў. І ты ўжо думаеш немаведама што.

— Магілёў захапілі нацысты, — сказала яна. — У радыё казалі, Чыкі.
Чык пазіраў на маміну маркоту.
— Радыё почасту хлусіць, ты ж ведаеш. Гэта называецца прапагандай.
— Немцы плацяць радыё, каб яно хлусіла?
— Я не сказаў „немцы“. Можа, і Белы дом. Прэзідэнту і плаціць не трэба. Не разумееш? Прэзідэнт паведамляе пра адступленне, хоць ніякага адступлення не было. Тады Гітлер расслабляецца і пачынае верзці ўсякую лухту. Ну, а тады мы яго цоп, і ў карак. Мне не хацелася пярэчыць Чыку. Той, хто гандлюе на чорным рынку, ведае, што да чаго. Але я не верыў, што Рузвельт здольны хлусіць наконт Магілёва.
— Калі ліст існуе, Фэйгеле, я табе знайду яго.
Па абедзе мы рушылі на пошту. Загадчык хадзіў у пантофлях і скоса паглядаў то на маму, то на спекулянта, які гэтаксама шматзначна пазіркваў у адказ.
— Ці магчымае такое, спадару, каб нехта з вашых падначаленых паквапіўся на карэспандэнцыю?
— Немажліва, — сказаў паштар, — а Чык тым часам пхаў яму ў кішэні шаўковыя панчохі.
— Тады, можа, я пасоблю вам пашукаць той ліст. Недзе ж ды павінен ён ляжаць.
Яны перашарылі ўвесь пакой за перабойкай, праверылі змесціва ўсіх сумак, аднак ліста з Магілёва нідзе не было. „Мне вельмі шкада, спадарыня Чарын, — сказаў паштар. — Лісты з Расіі час-часам даходзяць да нас, а вось каб з Беларусі, дык і на показ не бывае“.
Фэйгеле захварэла. „Арлы вы мае сумныя“, — мармытала яна, вобмельгам паглядваючы то на Чыка, то на мяне. Агульны ўпадак. Яе агледзеў асабісты доктар Чыка і сказаў, што ён бяссілы перад разбітым сэрцам і стомленасцю пачуццяў. І параіў ёй з’ездзіць у дом адпачынку ў Кэтскілз, куды ён выпраўляў сваіх сама хворых пацыентаў.
— Док, — сказаў Чык, — яна не хворая. Фэйгеле — дзівосная жанчына. Яна чакае ліста з Магілёва.
— Дык вы ж чарадзей. Шаўковыя панчохі ў вас у руках проста родзяцца. Дык у чым справа, нейкі там ліст… За чым, урэшце, затрымка? Хто там у яе, каханак застаўся?
— Брат, — сказаў Чык.

У доктара вочы палезлі на лоб. „Вам не здаецца ненармальным, што ёй ажно ў такой ступені не стае брата?“ Чык схапіў яго за каршэнь. Мне шкада, што я тады не ведаў, як рызыкуе Чык пры гэтым. Доктар быў і асабістым доктарам Мэера Ланскі. Ён на заказ мафіі струціў ужо не аднаго чалавека. Гэта быў сама высокааплатны лекар у Бронксе.

Я прынёс ім па чарцы найлепшага бацькавага шнапсу. Потым Чык выклаў доктару сваю тэорыю наконт Фэйгеле і Мардэхая, якія паходзілі з роду дробных землеўласнікаў, з татарскага гораду Горадні, дзе нарадзіўся і Мэер Ланскі. Мардэхаю, старэйшаму, было дзесяць год, меліся яшчэ дзве меншыя сястрычкі — пяцігадовая Ганна і двухгадовая Фэйгеле, — калі маці памёрла. Бацька іхны паехаў сабакам сена касіць у Амерыку, дзе па скорым часе пачаў жыццё з чыстага аркуша. Дзесяцігадовы хлапчук не мог зберагчы сямейнай спадчыны. Ён мусіў пайсці ў наймы, стацца маленькім рабом, каб выгадаваць сясцёр. У пятнаццаць гадоў яго прадалі ў царскую армію, ён збег адтуль, „выкраў“ Ганну і Фэйгеле, схаваўся з імі ў балатах, а ў разгар расейскай рэвалюцыі асеў у Магілёве, не маючы ў кішэні ні дакументаў, ні скарынкі хлеба. Было яму шаснаццаць гадоў, і ён навучыўся красці. У эпоху, калі краіна стала прывіднаю, ён і сам стаўся зданню, аж пакуль не здолеў нанова стварыць самога сябе ў абліччы настаўніка. Ён перарабіў на сябе паперы аднаго камісара з аддзелу адукацыі, які скончыў жыццё самагубствам. Вучні класаў, што трапіліся яму спярша, былі нашмат старэйшыя за яго. Яму давялося падкупіць інспектара, што прыехаў з Менску: існаваў, так бы мовіць, царскі рэжым без цара, але нейкі савецкі начальнік сказаў казакам, што трэба любіць усіх татарскіх габрэяў. Мардэхай заашчадзіў крыху грошай і ў 1923 годзе здолеў вывезці Ганну з Беларусі. А вось Фэйгеле выехаць адмаўлялася. Ён просам прасіў яе. Інспектары ў любую хвіліну маглі выкрыць яго непісьменнасць. Ён не зможа спакойна дыхаць, пакуль не ўпэўніцца, што ягонай сястрычцы нічога не пагражае.
„Ды мне ж і так нічога не пагражае, пакуль я тут, з табой“, — заціналася яна.
Тады ён — а ён быў сухі, як жэрдка, усякчас на валаску ад сухотаў — заліваўся слязьмі. І ў 1927-м яна выехала ў Амерыку. Ён паабяцаў, што праз паўгоду далучыцца да яе,

аднак так і не прыехаў.
Яна ўлілася ў шэрагі ўцекачоў у Мангетэне, жыла з бацькам і мачыхай, якая папікала яе кожным кусам хлеба. Вучылася на вячэрніх курсах, працавала на краўца і няспынна думала пра Мардэхая. З бацькавага дому яна мусіла сысці. Акурат тады і ўзнік Сэм, кажушнік, які за ўвесь перыяд Вялікай Дэпрэсіі і дня не праседзеў без працы.
Фэйгеле выйшла за яго замуж, аднак нішто не магло ўдаволіць яе — ні дзеці, ні Бог, ні каханне — нішто, апроч лістоў, якія пабожліва ішлі з Магілёва.
Доктар смачна аблізаўся.
— Чыкі, ну, праўда, баба дзівосная, але пры чым тут ты? Ты ж ёй не муж, не брат, не бацька гэтага хлопчыка?
— Тое вас не абыходзіць, — сказаў Чык, які ўжо ап'янеў. — Я запаўняю пустоты, і гэта мяне задавальняе.
— Калі ты хочаш вярнуць яе да жыцця, дружа, табе трэба папросту падрабіць ліст… Так выштукаваць яго, нібы для царскай паліцыі.
— Сам ліст падрабіць не штука. А дзе я вазьму рускія маркі?
Доктар паляпаў мяне па галаве. „Дзе маміны лісты, малое?"
Я адвёў іх наўпрост да драўлянага куфэрка, прывезенага мамай з Беларусі; лісты ляжалі там. Чыка найбольш цікавілі маркі, якасць паперы, почырк Мардэхая. Доктар жа ўзяўся чытаць лісты: ён быў родам з Кіева і яшчэ збольшага памятаў рускую мову.
— Ды гэты чалавек — паэт, Чыкі.
Ён зачытаў некалькі абзацаў, аднак Чык спыніў яго.
— Самі сабе прачыталі, і добра, док.
— Ты што, дурны? Вершы пішуць для ўсіх.
— Так, але гэтыя лісты пісаліся толькі для Фэйгеле.
Кожная марка была па-свойму выяўная. Я ўбачыў беларускага беркута; татарскіх князёў і каралёў; бацюшку народаў Сталіна, які з галавы рыхтык нагадваў маржа. Доктар выняў з сумкі нажнічкі, каб выстрыгчы некалькі марак, але Чык не даў. Ён не мог нарабіць шкоды нечаму, што належала маме.
„Мне пара", — сказаў доктар, калі мы з Чыкам рушылі ў паперню; там я пасобіў яму выбраць блакітны канверт і пачак аркушоў, якія маглі б сысці за рускія. Затым мы пешшу вярнуліся ў „Сумныя арлы", адшукалі чалавека, які падахвоціўся абмяняць рускія маркі са свайго сямейнага

альбому на масла, яйкі і калумбійскую каву.
Чык улёг у працу, намагаючыся перайняць почырк Мардэхая. Час быццам загус вакол яго і ліста, які ён мерыўся напісаць. Доктар забыўся і пра жонку, і пра рэшту сваіх пацыентаў з Мэерам Ланскі ўлучна, каб скласці ліст з Магілёва, які меў пабачыць свет у Бронксе. Я гатаваў ім гарбату і насіў з „Сумных арлоў“ кававыя цесткі.
Чыку спатрэбілася цэлая гадзіна, каб почыркам Мардэхая ўдала вывесці па-руску „Дарагая Фэйгеле“ і прыступіць да першага абзацу. А як што Чык не збіраўся абцяжваць ліст жахлівымі падрабязнасцямі, трэ было асцярожна абысці тэму вайны.
„Толькі трохі голад мучыць, — напісаў ён на выкшталцонай рускай гаворцы і падпісаўся Мардэхаем. Ён заадрасаваў канверт, я наклеіў маркі, і мы тут жа, у гасцёўні, і пазасыналі, кожны ў сваім фатэлі.
Праз сон мне пачулася, што нехта стукае ў дзверы. Я ўстаў і з похісткам пайшоў адмыкнуць. Там, у пантофлях, з лістом у руках стаяў загадчык пошты. Ён быў немаладу як усхваляваны. „Спадарства, прыйшоў. Цуд, ісцівы цуд“. Чык пачаставаў яго нашым надзвычайным кававым цесткам, аблітым чорным шакаладам. „Смаката“, — сказаў ён. Ніхто не падзячыў яму за ліст, які прыйшоў у белым, моцна пакамечаным канверце без ніводнай маркі. Паштар пайшоў. Чык разарваў канверт, і мы рушылі наверх будзіць маму, каб уручыць ёй новы ліст з Магілёва.
Лёгкая, як сірэна (я ніколі не бачыў сірэнаў, дык мушу сабе выдумаць яе), яна ў начной кашулі падхапілася з пасцелі. Яна ела ліст вачыма, аднак адмовілася чытаць яго, пакуль не прыгатавала нам гарбаты. Доктар не мог ацяміцца ад перамены, што адбылася з ёю. На Фэйгеліны шчокі вярнулася чырвань. Яна схавалася ў сваім пакоі і зачыніла дзверы.
„Анёлы маглі б пазайздросціць такой істоце“, — прамовіў доктар. Мы, як сіроты, сядзелі і чакалі, калі мама зноў выйдзе да нас. Яна не пажадала дзяліцца з намі весткамі ад Мардэхая.
„Усё настаўнічае, — сказала яна пад развязку. — Але школы няма. Разбамбілі“.
Доктар вярнуўся да сваіх пацыентаў. Чык мусіў пакінуць горад. Бацька прыехаў з Маямі загарэлы, бы кіназорка, ды Фэйгеле выглядала куды больш ярка. Ён надзеў сваю каску і вярнуўся да патрулявання вуліц. Я ўяўляў, як ён за каменданцкім часам

цікуе, ці не праточыцца скуль непакорнае святло. Бедны сяржант Сэм, які так і не здолеў завалодаць ані цудоўнай задумлёнкай, ані ейным бліскам.

***далей — да часткі II „Бэмбі“***

[image]
[image]

**№ 3 (8) – 2000**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Web-майстар: **mk**
Copyright © 1998-2000 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **13-07-2000**